НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ
МАСВІЖ·1551
МАГІЛЕЎ·1911
ВІЦЕБСК·1940
МІНСК·1961

DEPARTMENT FOR ARCHIVES AND RECORDS KEEPING
OF THE MINISTRY OF JUSTICE OF THE REPUBLIC OF BELARUS

NATIONAL HISTORICAL ARCHIVES OF BELARUS

Series
«History, archeography, source studies»

Archivaryus

Collection of scientific papers and articles

Founded in 2001

Volume 12

Minsk
NHAB
2014

ДЭПАРТАМЕНТ ПА АРХІВАХ І СПРАВАВОДСТВУ
МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ АРХІЎ БЕЛАРУСІ

Серыя
«Гісторыя, архівазнаўства, крыніцазнаўства»

Архіварыус

Зборнік навуковых паведамленняў і артыкулаў

Выходзіць з 2001 года

Выпуск 12

Мінск
НГАБ
2014

УДК [930.22+94(476)«15/19»(082)]
ББК 79.3(Беи)+63.3(4Беи)41
А87

Серыя заснавана ў 1998 г.

Рэкамендавана да друку Вучоным саветам
Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі

Р э д а к ц ы й н а я к а л е г і я :
У. І. Адамушка, Ю. М. Бохан (галоўны рэдактар), *Г. Я. Галенчанка, В. Ф. Голубеў, У. М. Дзянісаў, Д. В. Лісейчыкаў, Д. Ч. Матвейчык, А. Я. Рыбакоў, А. Л. Самовіч, В. В. Урублеўскі (адказны рэдактар), М. Ф. Шумейка, Д. У. Яцэвіч*

Р э ц э н з е н т ы :
доктар філалагічных навук *А. І. Мальдзіс,*
кандыдат гістарычных навук *С. У. Жумар*

У адпаведнасці з загадам старшыні Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь ад 1 лютага 2012 года № 21 зборнік навуковых прац «Архіварыус» уключаны ў Пералік навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных навуках.

ISSN 2225-4412

© Дзяржаўная ўстанова
«Нацыянальны гістарычны
архіў Беларусі», 2014

Архівазнаўства

Г. М. Брэгер

Архіў маёнткаў Падкрывічы і Усцінаўшчына са збораў Каверскіх у бібліятэцы імя Гераніма Лапацінскага ў Любліне

У аддзеле рукапісаў Ваяводскай і гарадской публічнай бібліятэкі імя Гераніма Лапацінскага ў Любліне захоўваецца шмат цікавых дакументаў па гісторыі Беларусі. Між імі выдзяляецца даволі вялікі збор Каверскіх, які ўключае пераважна беларускія рукапісы. Бібліятэка атрымала гэты збор у дар ад Каверскіх недзе напачатку XX ст. Кароткае апісанне збору ўвайшло ў друкаванае выданне «Katałog rękopisów Biblioteki publicznej im. H. Łopacińskiego w Lublinie» (Dodatek 1–y. Lublin, 1917). Каталог быў складзены і падрыхтаваны да друку супрацоўнікам бібліятэкі А. Яваройскім.

Да збору Каверскіх належаць наступныя нумары рукапісаў: 1452, 1460–1469, 1478–1483, 1645–1726. Большая частка дакументаў паходзіць з дворскіх архіваў маёнткаў Падкрывічы, Усцінаўшчына, Каралін, Даўгінава, Шымкаўшчына, Сэрвач і інш. Найбольш поўны і цэльны сярод іх архіў маёнткаў Падкрывічы і Усцінаўшчына, які ахоплівае перыяд з 1582 да 1785 г. Гэта нумары рукапісаў 1647, 1648, 1668, 1673, 1675, 1683, 1700, 1701, 1710, 1711.

Маёнткі пад назвай Падкрывічы ўтварыліся ў канцы XVI ст. шляхам атрымання шляхцічамі Навагрудскага ваяводства Пантусовічамі і Полацкага ваяводства С. Глухоўскім пэўных зямель Яна Кішкі ў маетнасці Крывічы Ашмянскага павета ўзамен за свае колішнія ўладанні. Напачатку XVII ст. канчаткова сфарміраваліся два маёнткі Падкрывічы, якія на працягу XVII–XVIII стст. неаднаразова мянялі не толькі гаспадароў, але і свае назвы. Адзін з іх доўгі час належаў Глухоўскім, а ў канцы XVIII ст. перайшоў разам з засценкам Глухоўшчына да Цівінскіх. Другі маёнтак Падкрывічы, які пазней атрымаў назву Усцінаўшчына ад уладальнікаў сярэдзіны XVII ст. Усціновічаў, у канцы XVIII ст. належаў

троцкаму войскаму С. А. Вазгірду і быў далучаны як фальварак да галоўнага маёнтка Даўгінава. З канца XVIII ст. маёнткі ўваходзілі ў склад Вілейскага павета спачатку Мінскай, а потым Вілейскай губерняў Расійскай імперыі. У XIX ст. маёнткі, набытыя Каверскімі, былі аб'яднаны ў адзін, які атрымаў назву Клесін (у цяперашні час — вёска Клесіна Касцяневіцкага сельсавета Вілейскага раёна Мінскай вобласці). Трэба адзначыць, што Пантусовіч, адзін з уласнікаў маёнтка, у пачатку XVII ст. у розных дакументах згадваецца пад рознымі імёнамі: Герасім і Сарафін.

У дадзенай працы апісаны не ўсе дакументы архіва маёнткаў Падкрывічы і Усцінаўшчына, а толькі найбольш старажытныя — за канец XVI – XVII ст., якія ўваходзяць у рукапісы пад нумарамі 1647, 1668, 1700, 1701 і 1710. Большасць з рукапісаў уключаюць па некалькі або некалькі дзясяткаў дакументаў. Усе яны — гэта арыгіналы лістоў або тагачасныя выпісы з актавых кніг земскіх і гродскіх судоў і Галоўнага Трыбунала ВКЛ — напісаны на старабеларускай і старапольскай мовах. Да кірылічных дакументаў на старабеларускай мове ў другой палове XVIII ст. былі зроблены копіі з транслітэрацыяй лацінскімі літарамі, якія асобна не адзначаюцца ў нашым вопісе. Не захаваўся арыгінал дакумента № 9, ёсць толькі яго копія XVIII ст. Сярод дакументаў XVIII ст. для прыкладу прадстаўлены чатыры самыя цікавыя: два інвентары маёнтка Усцінаўшчына і рэестры дакументаў маёнткаў Падкрывічы і Усцінаўшчына. Дзякуючы згаданым рэестрам, можна даведацца пра іх змест, якія не захаваліся, асабліва за другую палову XVII ст. На кожным дакуменце прысутнічае адбітак імя ўладальніка калекцыі: «Стэфан Каверскі».

Да ўсіх апісаных дакументаў у нашым вопісе складзены падрабязныя загалоўкі паводле нормаў археаграфічнага апісання дакументаў, якія раскрываюць асноўны змест тэксту. Дакументы размешчаны ў храналагічным парадку і пранумараваны, пазначаюцца іх месца стварэння і дата. Дадаткова прыведзены ўсе спісы дакумента (арыгінал, выпіс з актавых кніг, копія і г.д.), на кожны спіс маецца спасылка на нумары сігнатуры і аркушаў, а таксама пазначана мова дакумента (стб. м. — старабеларуская; пол. м.– польская). Прозвішчы і імёны прыведзены ў тых формах, у якіх сустракаюцца ў дакументах, ад чаго нярэдка маюцца розначытанні (Молжыч-Мольжыч, Пантусовіч-Пунтасовіч-Пунтусовіч). Увогуле ў нашым вопісе прадстаўлены 58 загалоўкаў, якія ўключаюць 72 дакументы.

Архіў маёнткаў Падкрывічы і Усцінаўшчына

№ 1. Заменны ліст жамойцкага старосты, падчашнага ВКЛ Яна Кішкі на пяць валок зямлі ў маёнтку Крывічы Ашмянскага павета над ракой Сэрвач навагародскаму зямяніну Войне Сямёнавічу Пантусовічу за яго маёнтак у Сенне Навагародскага павета над ракой Уша. Іўе, 12.01.1582.

Арыгінал, стб. м. Сігн. № 1700, арк. 14–15.

Выпіс з кніг Навагародскага земскага суда. Навагародак, 12.11.1584, стб. м. Там жа, арк. 8–9.

№ 2. Ліст Я. Кішкі на пяць валок зямлі і аднаго мужыка ў маёнтку Крывічы, дадзены В. С. Пантусовічу, дзе ён сабе абярэ, узамен за яго маёнтак над ракой Ушой у Сенне. Іўе, 20.01.1582.

Арыгінал, стб. м. Там жа, арк. 2.

№ 3. Квітацыйны ліст Я. Кішкі В. С. Пантусовічу на пажыццёвае права карыстання дрэвам у Крывіцкай пушчы ў сувязі з атрыманнем заменай зямлі ў маёнтку Крывічы і папер на яе. Любча, 29.[12].1582.

Арыгінал, пол. м. Там жа, арк. 4.

№ 4. Заменны ліст Я. Кішкі В. С. Пантусовічу на 20 моргаў зямлі ў маёнтку Крывічы замест мужыка, дадзенага раней. Любча, 29.12.1582.

Арыгінал, стб. м. Там жа, арк. 6.

№ 5. Ліст Шчастнага Мікалаевіча Мядзведзя, крывіцкага панамесніка ў адсутнасці намесніка Мікалая Ваўка, абмежавання і падачы чатырох валок зямлі ў сяле Чарэшкі маёнтка Крывічы Молзе Іллічу Пантусовічу паводле ліста жамойцкага старосты, падчашнага ВКЛ Яна Кішкі. Крывічы, 12.06.1586.

Арыгінал, пол. м. Там жа, арк. 18.

№ 6. Заменны ліст віленскага кашталяна, берасцейскага старосты, быстрыцкага дзяржаўцы Яна Кішкі на чатыры валокі зямлі ў Цярэшкаўскім войтаўстве маёнтка Крывічы Ашмянскага павета навагародскаму зямяніну Молзе Іллічу Пантусовічу за яго маёнтак Сенненскі над рэкамі Уша і Балавеч Навагародскага павета. Любча, 20.04.1591.

Арыгінал, стб. м. Там жа, арк. 28–29.

Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ. Вільня, 25.05.1591, стб. м. Там жа, 22–23 адв.

№ 7. Ліст ашмянскага зямяніна Філона Нячаевіча Пантусовіча продажу ашмянскаму зямяніну Войне Пантусовічу свайго маёнтка Крывічы над ракой Сэрвач за 160 коп грошай. Вільня, 13.06.1594.

Арыгінал, стб. м. Там жа, арк. 32–33.

№ 8. Квіт ашмянскага вознага Яна Грабоўскага ўзнаўлення і апісання мяжы паміж землямі маёнтка ашмянскага зямяніна Молгі Ілліча Пантусовіча і землямі сялян сяла Чарэшкавічы маёнтка Крывічы віцебскага ваяводзіча Станіслава Кішкі. Цярэшкавічы, 17.07.1594.

Выпіс з кніг Ашмянскага гродскага суда. Мядзел, 24.07.1594, стб. м. Там жа, арк. 39.

№ 9. Ліст абмежавання зямель засценка Падкрывічы, аддзеленага ад маёнтка Крывічы, пры прадажна-дароўным лісце віленскага ваяводы, польнага гет-

мана ВКЛ Яна Кішкі на гэты засценак баярыну ЯКМ Полацкага ваяводства Себестыяну Глухоўскаму. Крывічы, 15.05.1601.

Копія XVIII ст. лацінскімі літарамі з арыгінала, стб. м. Сігн. № 1701, арк. 77–78 адв.

№ 10. Ліст ашмянскага зямяніна Цімафея Валянтынавіча Пантусовіча-Мольжыча продажу свайму брату ашмянскаму зямяніну Герасіму Валентынавічу Пантусовічу–Мольжычу сваёй часткі маёнтка Крывіцкага пад Цярэшкамі за 120 коп грошай. Крывічы, 06.02.1610.

Арыгінал, стб. м. Сігн. № 1700, арк. 37–38.

Выпіс з кніг Ашмянскага земскага суда. Мядзел, 09.02.1610, стб. м. Там жа, арк. 45–46.

№ 11. Квіт ашмянскага вознага Анікея Невяровіча падачы ва ўласнасць Г. В. Пантусовічу–Молжычу часткі маёнтка Крывіцкага пад Цярэшкамі, прададзенай яму братам Ц. В. Пантусовічам-Молжычам. Без месца, 06.02.1610.

Выпіс з кніг Ашмянскага земскага суда. Мядзел, 09.02.1610, стб. м. Там жа, арк. 44.

№ 12. Ліст ашмянскіх зямянаў Гарасіма Молжыча Ілліча Пантусовіча і яго жонкі Марыны Самуйлаўны Заблоцкай продажу ашмянскаму зямяніну Себестыяну Глухоўскаму і яго жонцы Ганне Рагазянцы свайго маёнтка Крывічы за 300 коп грошай. Крывічы, 15.05.1612.

Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ. Вільня, 15.06.1612, стб. м. Там жа, арк. 49–50 адв.

№ 13. Інтрамісійны квіт ашмянскага вознага падачы ва ўласнасць С. Глухоўскаму і яго жонцы Г. Рагазянцы маёнтка Крывічы, прададзенага ім Г. М. Пантусовічам і яго жонкай М. С. Забоцкай. Без месца, 15.05.1612.

Выпіс з кніг Ашмянскага гродскага суда. Мядзел, 20.05.1612, стб. м. Там жа, арк. 48.

№ 14. Ліст ашмянскага зямяніна Войны Сямёнавіча Пантусовіча і яго жонкі Галены Сямёнаўны Лепяшчанкі продажу ашмянскаму зямяніну Сарафіну Пантусовічу-Молжычу і яго жонцы Марыне Заблоцкай маёнтка Падкрывічы над ракой Сэрвач за 300 коп грошай. Падкрывічы, 02.02.1614.

Арыгінал, пол. м. Сігн. № 1701, арк. 18–19.

Выпіс з кніг Ашмянскага земскага суда. Мядзел, 08.02.1614, стб. і пол. м. Там жа, арк. 4–5.

№ 15. Ліст С. Пантусовіча-Молжыча і яго жонкі М. Заблоцкай В. Пантусовічу і яго жонцы Г. Лепяшчанцы на пажыццёвае трыманне чацвёртай часткі маёнтка Падкрывічы. Падкрывічы, 06.02.1614.

Выпіс з кніг Ашмянскага земскага суда. Мядзел, 08.02.1614, стб. і пол. м. Там жа, арк. 14–15.

№ 16. Квіт ашмянскага вознага Фёдара Левашковіча падачы ва ўласнасць С. Пантусовічу-Молжычу і яго жонцы М. Заблоцкай маёнтка Падкрывіцкага, прададзенага ім В. С. Пантусовічам і яго жонкай Г. С. Лепяшчанкай. Падкрывічы, 07.02.1614.

Арыгінал, стб. м. Там жа, арк. 2–2 адв.

Выпіс з кніг Ашмянскага земскага суда. Мядзел, 08.02.1614, стб. м. Там жа, арк. 10–10 адв.

№ 17. Квіт ашмянскіх возных Цімафея Левашковіча і Самуэля Дэмбкоўскага падачы ў пажыццёвае трыманне В. С. Пантусовічу і яго жонцы Г. С. Лепяшчанцы чацвёртай часткі маёнтка Падкрывічы паводле ліста Гарасіма Молжыча-Пантусовіча і яго жонкі М. Заблоцкай. Без месца, 24.04.1615.

Выпіс з кніг Ашмянскага гродскага суда. Мядзел, 15.05.1615, стб. м. Там жа, арк. 22–22 адв.

№ 18. Скарга Войны Пунтусовіча на Себестыяна Глухоўскага і яго жонку Ганну Рагазянку аб захопе зямлі Соін, якую скаржніку ў 1600 г. пакінулі нябожчыкі Молга Ілліч Пунтасовіч і яго жонка Арына Уланаўна ад свайго маёнтка Падкрывічы за 5 коп грошай.

Выпіс з кніг Ашмянскага гродскага суда. Ашмяна, 04.08.1615, стб. м. Сіген. № 1647, арк. 2–2 адв.

№ 19. Скарга Гарасіма Молжыча і яго жонкі Марыны Заблоцкай на Войну Пантусовіча і яго жонку Галену Лепяшчанку аб нападзе на гай у Гараўцу маёнтка скаржнікаў Падкрывіцкага і парубцы дрэў.

Выпіс з кніг Ашмянскага гродскага суда. Ашмяна, 01.05.1616, стб. м. Сіген № 1701, арк. 25.

№ 20. Дароўны ліст ашмянскага зямяніна Себестыяна Глухоўскага жонцы Ганне Рагазянцы на сваю палову маёнтка Падкрывічы, некалі сумесна з жонкай набытага ў ашмянскага зямяніна Гарасіма Мольжыча. Падкрывічы, 10.11.1617.

Арыгінал, пол. м. Там жа, арк. 27–27 адв.

Выпіс з кніг Ашмянскага земскага суда. Мядзел, 13.02.1618, стб. і пол. м. Там жа, арк. 43–44.

№ 21. Квіт ашмянскага вознага Васілея Невяровіча аб падачы Г. Рагазянцы паловы маёнтка Падкрывічы ва ўласнасць, а паловы — у пажыццёвае трыманне паводле ліста яе мужа С. Глухоўскага. Без месца, 03.02.1618.

№ 22. Дэкрэт Ашмянскага земскага суда ў справе В. Пантусовіча і яго жонкі Г. Лепяшчанкі з С. Мольжычам-Пантусовічам і яго жонкай М. С. Заблоцкаўнай аб выдзеле чацвёртай часткі з маёнтка Падкрывіцкага і аб спрэчных 20 моргах зямлі.

Выпіс з кніг Ашмянскага земскага суда. Мядзел, 09.02.1618.

Першы экзэмпляр, выдадзены В. Пантусовічу. Стб. м. Там жа, арк. 49–50.

Другі экзэмпляр, выдадзены С. Мальжычу-Пантусовічу. Стб. м. Там жа, арк. 37–38.

№ 23. Адпраўчы ліст ашмянскіх земскіх ураднікаў — Яна Корсака, сакратара ЯКМ, суддзі, Станіслава Аляксандравіча Свірскага, падсудка, і Станіслава Унучка, пісара, аб накіраванні ашмянскага вознага Самуэля Думбкоўскага для нагляду за выдзелам Войне Пантусовічу і яго жонцы Галене Лепяшчанцы чацвёртай часткі з маёнтка Падкрывіцкага Серафіна Молжыча-Пантусовіча і яго жонкі Марыны Заблоцкай паводле дэкрэта Ашмянскага земскага суда. Мядзел, 09.02.1618.

Арыгінал, стб. м. Там жа, арк. 35.

№ 24. Скарга Гарасіма Молжыча і яго жонкі Марыны Заблоцкай на Войну Пантусовіча і яго жонку Ганну Лепяшчанку аб захопе і араннi Нівы Кульбачынскай маёнтка скаржнікаў Падкрывіцкага.

Выпіс з кніг Ашмянскага гродскага суда. Ашмяна, 08.05.1618, стб. м. Там жа, арк. 30–30 адв.

№ 25. Угодлівы ліст (пастанова) суддзяў палюбоўных у справе выдзелу Гарасімам Молжычам чацвёртай часткі з свайго маёнтка Падкрывіцкага ў пажыццёвае трыманне Войне Пантусовічу і спрэчцы між імі аб 20 моргах Нівы Кульбачынскай. Без месца, 15.05.1618.

Арыгінал, пол. м. Там жа, арк. 33.

№ 26. Выездчы ліст камісараў Войцеха Свентарэцкага і Адама Харэевіча асведчання немагчымасці выдзелу чацвёртай часткі з маёнтка Падкрывіцкага паводле дэкрэта Ашмянскага земскага суда і ўгодлівага ліста ў справе В. Пантусовіча з С. Мальжычам у сувязі з адсутнасцю мерніка. Без месца, 15.05.1618.

Арыгінал, пол. м. Там жа, арк. 41.

№ 27. Дэкрэт Ашмянскага земскага суда ў справе Войны Пантусовіча і яго жонкі Галены Лепяшчанкі з Сарафінам Пантусовічам і яго жонкай Марынай Заблоцкай аб нежаданні апошнімі выдзеліць ім чацвёртую частку маёнтка Падкрывіцкага ў пажыццёвае валоданне паводле лістоў-запісаў і мінулага дэкрэта таго ж суда.

Выпіс з кніг Ашмянскага земскага суда. Мядзел, 11.02.1619.

Першы экзэмпляр, выдадзены В. Пантусовічу, стб. м. Там жа, арк. 60–61.

Другі экзэмпляр, выдадзены С. Пантусовічу, стб. м. Там жа, арк. 53–55.

№ 28. Ліст ашмянскіх зямянаў Гарасіма Молжыча–Пантусовіча і яго жонкі Марыны Заблоцкай заставы ашмянскім зямянам Стэфану Усціновічу і яго

жонцы Галене Карпаўне маёнтка Падкрывіцкага на тры гады ў суме 800 коп грошай. Падкрывіцкі, 02.02.1629.

Арыгінал, стб. м. Там жа, арк. 68–69.

Выпіс з кніг Ашмянскага земскага суда. Мядзел, 03.11.1629, стб. м. Там жа, арк. 74–75.

№ 29. Інтрамісійны квіт ашмянскага вознага Яна Міневіча падачы С. Усціновічу і яго жонцы Г. Карпаўне маёнтка Падкрывіцкага ў застаўное трыманне на тры гады ў суме 800 коп грошай паводле ліста Г. Молжыча-Пантусовіча і яго жонкі М. Заблоцкай. Без месца, 02.02.1629.

Выпіс з кніг Ашмянскага гродскага суда. Мядзел, 12.02.1629, стб. і пол. м. Там жа, арк. 65–65 адв.

№ 30. Ліст ашмянскай зямянкі Ганны Рагазянкі Себестыянавай Глухоўскай продажу сыну Мікалаю Глухоўскаму і яго жонцы Галене Цяпінскай за 200 коп грошай свайго маёнтка Падкрывічы, некалі набытага разам з мужам у Гарасіма Мольжыча. Падкрывічы. 16.08.1633.

Арыгінал, пол. м. Там жа, арк. 79–80.

Выпіс з кніг Ашмянскага земскага суда. Мядзел, 03.11.1633, стб. і пол. м. Там жа, арк. 81–82.

№ 31. Дароўны ліст ашмянскага зямяніна Мікалая Глухоўскага жонцы Галене Цяпінскай на пажыццёвае валоданне маёнткам Падкрывічы і на 400 коп грошай, забяспечаных на гэтым маёнтку. Падкрывічы, 08.02.1638.

Арыгінал, пол. м. Там жа, арк. 85–85 адв.

Выпіс з кніг Ашмянскага земскага суда. Мядзел, 11.02.1638, стб. і пол. м. Там жа, арк. 84–84 адв.

№ 32. Інтрамісійны квіт ашмянскага вознага Яраша Прасмыцкага падачы Г. Цяпінскай у пажыццёвае валоданне маёнтка Падкрывічы паводле ліста яе мужа М. Глухоўскага. Без месца, 09.02.1638.

Выпіс з кніг Ашмянскага гродскага суда. Мядзел, 11.02.1638, стб. м. Там жа, арк. 83.

№ 33. Скарга ашмянскага зямяніна Стэфана Усціновіча аб збеглым з маёнтка і сяла Падкрывічы Ашмянскага павета разам з сям'ёй і маёмасцю падданым Фёдару Савічу, які пасяліўся ў маёнтку Дзядзілавічы Мінскага ваяводства Казіміра Трызны.

Выпіс з кніг Ашмянскага гродскага суда. Мядзел, 03.04.1644, стб. м. Там жа, арк. 88.

№ 34. Скарга С. Усціновіча аб збеглым з маёнтка і сяла Падкрывічы разам з сям'ёй і маёмасцю падданым Фёдару Дземідовічу, які невядома дзе пасяліўся.

Выпіс з кніг Ашмянскага гродскага суда. Мядзел, 13.02.1646, стб. м. Там жа, арк. 90.

№ 35. Ліст ашмянскіх зямянаў Міхала Шымковіча і яго жонкі Зофіі Станіславаўны Гірскай продажу за 200 коп грошай Мікалаю Глухоўскаму і яго жонцы Галене Цяпінскай двух падданых з сем'ямі і маёмасцю з маёнтка Апанасаўшчына-Іжа, якіх атрымала пры падзеле з сястрой Ганнай Гірскай Юр'евай Малахоўскай і перасяліла ў маёнтак мужа М. Шымковіча Яцковічы-Рэвечынскія-Рэчыпоўскія. Яцковічы, 10.05.1648.

Арыгінал, пол. м. Там жа, арк. 99–100.

№ 36. Ліст на прызнанне ліста М. Шымковіча і яго жонкі З. С. Гірскай продажу М. Глухоўскаму і яго жонцы Г. Цяпінскай двух падданых з маёнтка Апанасаўшчына-Іжа. Яцковічы, 10.05.1648.

Арыгінал, пол. м. Там жа, арк. 101–101 адв.

№ 37. Інтрамісійны квіт ашмянскага генерала Дмітра Карасоўскага падачы М. Глухоўскаму і яго жонцы Г. Цяпінскай двух падданых з сем'ямі і маёмасцю з маёнтка Апанасаўшчына-Іжа, прададзеных ім за 200 коп грошай М. Шымковічам і яго жонкай З. С. Гірскай, якія дасталіся апошняй пры падзеле з сястрой Ганнай Гірскай Юр'евай Малахоўскай. Без месца, 10.05.1648.

Выпіс з кніг Ашмянскага гродскага суда. Мядзел, 12.05.1648, стб. м. Там жа, арк. 97.

№ 38. Квітацыйны ліст ашмянскага зямяніна Лаўрына Качаноўскага, стрыечнага брата нябожчыцы Галены Карпаўны, жонкі нябожчыка Стэфана Усціновіча, брату апошняга Яну Усціновічу аб адсутнасці прэтэнзій на маёнтак Молжынскі Падкрывіцкі. Порса, 30.10.1648.

Арыгінал, пол. м. Там жа, арк. 92–92 адв.

№ 39. Квітацыйны ліст ашмянскай і мінскай зямянкі Ганны Маліноўскай Стэфанавай Усціновічавай аб атрыманні ад швагра ашмянскага зямяніна Яна Усціновіча 500 злотых і рухомых рэчаў, запісаных ёй нябожчыкам мужам Стэфанам Усціновічам, узамен за маёнтак Падкрывічы. Падкрывічы, 22.11.1648.

Арыгінал, пол. м. Сігн. № 1647, арк. 3–4.

№ 40. Затылак ліста на прызнанне ў Ашмянскім земскім судзе ў Мядзелі ў 1649 г. квітацыйнага ліста Ганны Маліноўскай Стэфанавай Усціновічавай брату яе мужа, нябожчыка, Яну Усціновічу аб атрыманні ад яго 500 злотых і адсутнасці прэтэнзій на фальварак Падкрывіцкі. Без месца, [22.11.1648 г.].

Арыгінал, пол. м. Сігн. № 1701, арк. 93–93 адв.

№ 41. Інтрамісійны квіт ашмянскіх генералаў Аляксандра Рудзеўскага і Мікалая Сельмяновіча падачы ва ўласнасць Яну Усціновічу фальварка Падкрывічы–Мольжына па выплаце грошай братавай Ганне Маліноўскай

Стэфанавай Усціновічавай паводле тастамента яе мужа-нябожчыка. Без месца, 22.11.1648.

Выпіс з кніг Ашмянскага гродскага суда. Мядзел, 27.11.1648, стб. і пол. м. Там жа, арк. 95.

№ 42. Квіт ашмянскага генерала Юрыя Савіцкага пільнасці па просьбе Яна Усціновіча аб нез'яўленні ў канцылярыю Ганны Маліноўскай Стэфанавай Усціновічавай для прызнання ў актах свайго квітацыйнага ліста аб адсутнасці прэтэнзій на фальварак Падкрывіцкі на карысць Я. Усціновіча. (Мядзель), 03.07.1649.

Выпіс з кніг Ашмянскага земскага суда. Мядзел, 03.06.1649 (трэба — 03.07.1679. — Г. Б.), стб. і пол. м. Там жа, арк. 103.

№ 43. Квіт ашмянскага генерала Юрыя Савіцкага пільнасці па просьбе Мікалая Глухоўскага аб нез'яўленні ў канцылярыю Паўла Ляскоўскага для прызнання ў актах угодлівай квітанцыі. (Мядзел), 03.07.1649.

Выпіс з кніг Ашмянскага земскага суда. Мядзел. 03.07.1649, стб. і пол. м. Там жа, арк. 104.

№ 44. Скарга Яна Усціновіча, ашмянскага зямяніна і служэбніка полацкага ваяводы, вялікага гетмана ВКЛ Януша Кішкі аб збеглым з яго маёнтка Падкрывічы падданым Пракопу Дземідовічу разам з сям'ёй і маёмасцю.

Выпіс з кніг Ашмянскага гродскага суда. Мядзел, 21.01.1652, стб. м. Там жа, арк 111.

№ 45. Ліст Яна Усціновіча аб перазаставе маёнтка Падкрывічы-Мольжына ў суме 800 коп грошай браслаўскаму стольніку Пятру Рудоміне-Дусяцкаму з жонкай Гальшкай Сулістроўскай. Застаўное права на яго атрымаў пасля смерці брата Стэфана Усціновіча, які некалі ўзяў маёнтак заставай ад Гарасіма Мольжыча-Пантусовіча. Падкрывічы-Мольжына, 13.02.1653.

Арыгінал, пол. м. Там жа, арк. 106–106 адв.

Выпіс з кніг Ашмянскага земскага суда. Мядзел, 20.02.1664, стб. м. Там жа, арк. 108–109.

№ 46. Ліст полацкага ваяводы, вялікага гетмана ВКЛ Януша Кішкі Мікалаю Глухоўскаму, уласніку маёнтка Падкрывічы, аб вяртанні апошняму зямель, захопленых яго падданымі сяла Цярэшкі маёнтка Крывічы, і ўрэгуляванні мяжы між маёнткамі паводле даўніх дакументаў. Крывічы, 05.09.1653.

Арыгінал, пол. м. Там жа, арк. 115.

Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ выпіса з кніг Мінскага гродскага суда ад 21.01.1654. Вільня, 02.05.1670, стб. і пол. м. Там жа, арк. 122–123.

№ 47. Ліст полацкага ваяводы, вялікага гетмана ВКЛ Януша Кішкі на прызнанне ў Ашмянскім земскім судзе ў Мядзелі свайго ліста Мікалаю Глухоўскаму наконт спрэчных зямель. Крывічы, 5.09.1653.

Выпіс з кніг Мінскага гродскага суда. Мінск, 21.01.1654, стб. і пол. м. Там жа, арк. 120–121.

Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ выпіса з кніг Мінскага гродскага суда ад 21.01.1654. Вільня, 02.05.1670, стб. і пол. м. Там жа, арк. 112–113.

№ 48. Ліст браслаўскага стольніка Пятра Рудоміны-Дусяцкага і яго жонкі Гальшкі Сулістроўскай перазаставы ашмянскаму зямяніну Яну Казакевічу фальварка Падкрывічы-Усцінаўшчына, а таксама вёскі ад уласнага маёнтка Сухаборскі ў суме 2000 злотых на адзін год. Жара, 09.05.1654.

Арыгінал, пол. м. Там жа, арк. 117–117 адв.

№ 49. Інвентар падданых сяла Дабровічы (маёнтка Сухі Бор), складзены пры падачы ў застаўное трыманне ад браслаўскага стольніка Пятра Рудоміны-Дусяцкага Яну Казакевічу. Без месца, 15.05.1654.

Арыгінал, пол. м. Там жа, арк. 119.

№ 50. Скарга ашмянскай зямянкі Галены Чапінскай Мікалаевай Глухоўскай ад імя свайго і сыноў Стэфана, Яна, Аляксандра і Казіміра Глухоўскіх на Пятра, Рамана і Андрэя Шантыраў, зямянаў маёнтка Глыбокае люблінскай кашталянавай (Ганны Зофіі з Зяновічаў Францішкавай Жэбрыдоўскай), аб нападзе 04.02.1660 падчас маскоўскай войны на яе маёнтак Падкрывічы, абрабаванні маёмасці і выправаджэнні яе мужа Мікалая Глухоўскага да маскоўскіх ваявод у Полацк.

Выпіс з кніг Ашмянскага гродскага суда. Мядзел, 01.10.1660, стб. і пол. м. Сігн. № 1668, арк. 1–2 адв.

№ 51. Рэестр рухомых рэчаў, жывёлы і збожжа, захопленых маскоўскімі казакамі падчас нападу на маёнтак Падкрывічы паноў Глухоўскіх.

Выпіс з кніг Ашмянскага гродскага суда. Мядзел, 01.10.1660, стб. і пол. м. Там жа, арк. 2–3 адв.

№ 52. Скарга ашмянскай і віленскай зямянкі Ганны Буйніцкай Адамавай Рагінскай аб знішчэнні падчас вайны дакументаў на маёнткі, дадзеныя Янушам Кішкай.

Выпіс з кніг Ашмянскага гродскага суда. Мядзел, 06.12.1661, стб. і пол. м. Сігн. № 1710.

№ 53. Пастанова (дэкрэт адкладовы) Галоўнага Трыбунала ВКЛ аб перанясенні разгляду справы Мікалая Глухоўскага са старадубскім старостам Пятром Рудомінай-Дусяцкім на іншы тэрмін у сувязі з абраннем апошняга паслом на вальны сойм ад Старадубскага павета. (Вільня), 11.08.1668.

Арыгінал, стб. м. Сігн. № 1701, арк. 124.

№ 54. Аповед Аляксандра Эсткі, умацаванага непаўналетніх Сымона і Ераніма Глухоўскіх, што бацька апошніх Ян Глухоўскі памёр, не пакінуўшы тастамента. Вусным распараджэннем Ян прызначыў сваім дзецям апекунамі

свайго бацьку Мікалая Глухоўскага і свайго брата Казіміра Станіслава Глухоўскага, што зацвердзіў Галоўны Трыбунал ВКЛ.

Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ. Мінск, 29.01.1678, стб. м. Там жа. арк. 125–126.

№ 55. Інвентар фальварка Усцінаўшчына, складзены пры перадачы ў арэнду на адзін год за суму 400 злотых ад Тэрэсы Косаваўны Фабіянавай Козелавай-Паклеўскай, дзісенскай старосцінай, Цыпрыяну Мерле. Усцінаўшчына, 23.04.1716.

Копія, пол. м. Сігн. № 1647, арк. 7–8.

№ 56. Інвентар фальварка Усцінаўшчына, складзены пры перадачы ў застаўное трыманне ў суме 5000 злотых ад дзісенскага старосты Фабіяны Козела-Паклеўскага і яго жонкі віцебскай гараднічанкі Тэрэсы Косаваўны Антонію Палуцкаму і яго жонцы Ганне Каралькевічаўне. Усцінаўшчына, 23.04.1717.

Арыгінал, пол. м. Там жа, арк. 9–10.

№ 57. Рэестр дакументаў на фальварак Падкрывічы або Усцінаўшчына за 1610–1769 гг. Стэфанполь, 24.08.1780.

Арыгінал, пол. м. Там жа, арк. 65–68 адв.

№ 58. Два рэестры дакументаў на маёнткі Усцінаўшчына і Падкрывічы за 1710–1749 гг. і 1582–1780 гг., кампартаваных (прадстаўленых) у Лідскі земскі суд па справе троцкага войскага Стэфана Алаізія Вазгірда з рознымі асобамі. Без месца, 24.08.1780.

Арыгінал, пол. м. Там жа, арк. 73–77.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 05.09.2014

Г. Дручкус

Основание Центрального государственного архива Литвы (1918–1921 гг.)

Сразу после восстановления независимого Литовского государства в 1918 г. начали создаваться соответствующие государственные институции и учреждения. В числе таких учреждений был и Центральный государственный архив Литвы (ЦГАЛ). Процесс его формирования проходил во втором по величине городе страны — Каунасе, который из-за сложившихся обстоятельств стал временной столицей государства.

Библиография по этой теме весьма скромная [1; 2; 3; 5; 6; 7; 8; 12; 13; 23; 24, p. 3–37; 29].

Задачи исследования — на основе первичных источников дополнить данные предыдущих исследований, выяснить причину и проследить процесс создания ЦГАЛ, вспомнить деятелей, стоявших у истоков образования архивов независимого государства. Также важным представляется узнать, какие обстоятельства влияли на этот процесс, какой в указанное время существовал подход к архивам и архивным документам, их сохранению и использованию.

В конце 1917 г. Государственный совет учредил комиссию по делам архивов [20, p. 182]. Из протоколов Литовского государственного совета очевидно, что вопросы архивов и архивных документов привлекали внимание членов совета [17; 20].

Другой важный источник для изучаемой темы — Известия Временного правительства, в которых опубликованы важные документы для изучаемой темы: «Закон о государственной археологической комиссии» [27], «Правила государственной археологической комиссии» [28], указ министра просвещения об учреждении ЦГАЛ [4] и др.

Особо важными являются документы Государственной археологической комиссии [25], которые свидетельствуют о мерах, принятых членами комиссии для поиска и сохранения архивных документов, а также учреждения архива и т.п.

Самый многочисленный комплекс документов по истории ЦГАЛ — фонд ЦГАЛ, хранящийся в Литовском центральном государственном архиве (ЛЦГА) [18]. Всего — 425 дел (единиц хранения). К сожалению, сведений о начале существования ЦГАЛ в этих документах встречается немного. Некоторые из них по изучаемой теме также хранятся в ЛЦГА, в фондах Кабинета министров [15] и Министерства просвещения [14]. В национальной библиотеке им. М. Мажвидаса, в отделе редких книг и рукописей хранится важный документ — доклад секретаря Государственной археологической комиссии К. Яблонскиса о ГАК и ее деятельности [22]. Еще несколько ценных документов хранятся в отделе рукописей Академии наук Литвы [19] и Каунасском окружном архиве [9].

Как известно, 21 сентября 1917 г. Вильнюсская конференция образовала Совет Литвы (позже переименован в Литовский государственный совет) [20, л. 8]. Уже 16 января 1918 г. во время XII заседания 4-й сессии принято постановление, в соответствии с которым Й. Басанавичюсу и А. Петрулису было поручено заняться архивами [20, л. 282]. Несколько позже комиссия по архивам пополнилась еще одним членом — Н. Биржишкой [20, л. 242]. К сожалению, о ее деятельности сведений сохранилось очень мало.

28 мая 1919 г. учреждена Археологическая комиссия, которая, прежде всего, стала заботиться о сохранении архивных документов и, в особенности, архива Управления Ковенской губернии [22, л. 2; 24, p. 3; 26, л. 11].

28 августа 1919 г. принят закон Государственной археологической комиссии [27]. По этому закону комиссия стала государственным учреждением и получила официальные полномочия заниматься созданием архива и охраной архивных документов.

Принятие закона, а несколько позже и правил комиссии создали юридическую основу для архивной деятельности. Материальной предпосылкой для ускорения процесса учреждения государственного архива Литвы послужили денежные средства, выделяемые Государственной археологической комиссии как государственному учреждению.

Уже 11 сентября 1919 г. [1] комиссия повторно официальным письмом обратилась к коменданту города Каунаса и Каунасского уезда с убедительной просьбой доставить архивные документы в архив Археологической комиссии, «поскольку по сей день приходиться видеть, как в магазинах товары скручивают в архивные бумаги» [26, л. 11]. Еще раз по этому поводу комиссия обратилась к коменданту 11 января 1920 г. [26, л. 230]. В то же время (17 января 1920 г.) комиссия обратилась в Министерство иностранных дел по поводу возвращения архивных документов, оказавшихся в других странах [26, л. 233]. Такое поведение свидетельствует о профессиональном отношении членов Археологической комиссии к архивному наследию страны.

Вначале Археологическая комиссия не имела помещения для хранения собранных уцелевших документов. Некоторое время документы частями хранились в городском музее, духовной семинарии, квартире Константинаса Яблонскиса, который в то время исполнял обязанности секретаря и был ответственен за архив [26, л. 11, 45].

Наконец, после нескольких месяцев переписки, 28 октября 1919 г. Археологическая комиссия получила официальное письмо, в котором, в частности, писалось, что министр внутренних дел согласен передать в ведение комиссии архив бывшего Управления Ковенской губернии с 1 ноября 1919 г. (с архивариусами Жукаускасом и Войткевичем). Приемпередача были назначены на период от 31 октября до 3 ноября и состоялись в помещениях Министерства иностранных дел [26, л. 119]. Принять архив был уполномочен К. Яблонскис.

Археологическая комиссия также приняла сохранившиеся документы Управления Ковенской губернии, остатки документов канцелярии ковенского губернатора, жандармерии и центрального телеграфа из Министерства внутренних дел [22, л. 2].

Помещения для архива были выделены по адресу Большая Татарская № 17 (ныне — ул. И. Канта). Это те самые помещения, в которых раньше размещался архив Управления Ковенской губернии (т.е. архив

[1] Первое обращение состоялось в июне 1919 г.

губернских учреждений). Здание (некоторые исследователи указывают № 15) по договору с Ковенской городской управой построил в 1898 г. некий Ноах Лапин. Со времени постройки строение было сдано им в аренду указанному учреждению [21].

Получив помещения для архива, Археологическая комиссия стала ходатайствовать о поступлении средств для проведения их ремонта и выплаты заработной платы двоим сотрудникам архива.

19 мая 1920 г. ситуация усложнилась. Владелец дома Н. Лапин обратился в этот день к Археологической комиссии с требованием заплатить за пользование помещениями за весь период до мая 1920 г. На случай желания комиссии пользоваться помещениями в будущем он предусмотрел вариант подписания договора на аренду с ежегодной выплатой по 3000 ост-рублей арендной платы [26, л. 196].

Напряженную ситуацию еще более осложнило то обстоятельство, что после подписания мирного договора 12 июля 1920 г. между Литовским и Российским государствами в Литву стали возвращаться эвакуированные в глубину России во время войны архивные документы. Первый железнодорожный транспорт с ними прибыл в Каунас 9 июля 1921 г. [24, p. 6]. К этому времени уже был подобран для архива VII форт. Поспешно произведен ремонт, и 11–12 октября директор Центрального архива Казимерас Олека принял помещения от Министерства обороны. Процесс основания Центрального государственного архива был завершен 19 октября 1921 г., когда министр просвещения Казис Бизаускас утвердил устав архива [4; 24, p. 6].

Несколько замечаний о том, кого следует считать первым руководителем ЦГАЛ. В правилах Государственной археологической комиссии, утвержденных министром просвещения 27 января 1920 г., указано, что при Археологической комиссии организуется Центральный исторический архив Литвы, а один из членов комиссии должен исполнять обязанности заведующего архивом [28]. Вплоть до 20 октября 1920 г. на этой должности оставался сотрудник ГАК К. Яблонскис [26, л. 129 об.]. Из-за сложившихся обстоятельств он отказался от этой работы, и вплоть до 1 сентября 1921 г. обязанности заведующего архивом, по нашим сведениям, исполнял председатель Государственной археологической комиссии профессор Эдуардас Волтерис, который с 23 января 1920 г. уже был назначен директором Каунасского городского музея [11; 16]. Указом министра просвещения от 1 сентября 1921 г. директором ЦГАЛ назначен К. Олека [24, p. 6]. Стоит отметить, что он стал директором за полтора месяца до официального основания ЦГАЛ.

Обстоятельства для основания Центрального государственного архива Литвы были весьма неблагополучны. Высшие органы власти хотя и понимали важность учреждения архива, но не уделяли этому должно-

го внимания. Поэтому главная заслуга в создании ЦГАЛ принадлежит небольшой группе деятельных интеллектуалов, которые осознавали значение архивов и необходимость их сохранности.

Только своими силами Государственная археологическая комиссия вряд ли смогла основать ЦГАЛ. Обстоятельствами к этому послужили, во-первых, конфликт из-за величины арендной платы с владельцем здания, где архив практически существовал с осени 1919 г.; во-вторых, массовое возвращение архивных документов, которые были вывезены из Литвы в глубь России после подписания мирного договора между Литвой и Россией 12 июля 1920 г., в результате чего архивные документы просто не где было разместить.

Первым директором ЦГАЛ в соответствии с официальным указом министра просвещения от 1 сентября 1921 г. стал К. Олека. Однако следует назвать лиц, которые до этого исполняли обязанности руководителей архива и внесли значительный вклад в его создание. Это председатель ГАК профессор Эдуардас Волтерис и сотрудник Археологической комиссии Константинас Яблонскис.

Тот факт, что ЦГАЛ был учрежден указом министра просвещения, а не постановлением Кабинета министров, свидетельствует об определенном отношении высших властей молодого Литовского государства к архивам и архивному наследию.

Источники и литература

1. Ягелевичус, С. Архивы Литвы в годы Первой мировой войны // История. — Вильнюс, 1991. — Т. 32. — С. 95–104.
2. Archyvai // Lietuviškoji enciklopedija. — Kaunas, 1933. — T. 1. — P. 961–967.
3. Bederis, L. Dokumentų saugykloms 250 metų // Komjaunimo tiesa (Комсомольская правда). — 1963. — vasario 26. — P. 1.
4. Centralinis Valstybės Archyvas // Vyriausybės Žinios (Известия правительства). — 1921. — spalio 28. — Nr. 7. — P. 1–2.
5. Iš Centralinio Valstybės Archyvo Veikimo // Lietuvos aidas. — 1937. — sausio 12. — Nr. 14 (3229).
6. Girčytė, V. Archyvai Kaune dvidešimtojo amžiaus pirmojoje pusėje // Lietuvos archyvai. 75eri metai nuo Centralinio valstybės archyvo įkūrimo (Литовские архивы. 75 лет со дня основания Центрального государственного архива). — Vilnius, 1996. — T. 7. — P. 38–42.
7. Jegelevičius, S. Centrinio valstybės archyvo kūrimasis Kaune // Istorija. — Vilnius, 1974. — T. 15. — Sąs. 1. — P. 47–61.
8. Jegelevičius, S. Lietuvos archyvai: penkiasdešimt sovietmečių. Laimėjimai ir praradimai // Lietuvos archyvai. — Vilnius, 1998. — T. 10. — P. 341–350.
9. Kauno apskrities archyvas (Каунасский окружной архив, далее КАА). — Ф. 66. — Оп. 1. — Д. 10239/1920, 9523/ 1920, 1283/1933, 36455/1923, 3941/1940, 5097/1920, etc.

10. КАА. — Ф. 219. — Оп. 1. — Д. 7.
11. КАА. — Ф. 219. — Оп. 3. — Д. 714. — Л. 2.
12. Keršytė, N. Centrinis valstybės archyvas 1921–1940 metais // Lietuvos istorijos metraštis. — 1995 metai. — Vilnius, 1996. — P. 341–350.
13. Kuckailienė, G. Lietuvos TSR Centrinio valstybinio archyvo Kaune istorija. Rankraštis. Bez datos.
14. Lietuvos centrinis valstybės archyvas (Литовский центральный государственный архив; далее LCVA). — Ф. 383 (Министерство просвещения Республики Литвы).
15. LCVA. — Ф. 923 (Кабинет министров).
16. LCVA. — Ф. 383. — Оп. 8. — Д. 212. — Л. 25–26.
17. LCVA. — Ф. 1014 (Протоколы заседаний Совета Литвы).
18. LCVA. — Ф. 1378 (Центральный государственный архив Литвы).
19. Lietuvos Mokslų Akademijos Bibliotekos Rankraščių Skyrius (Библиотека Академии наук Литвы им. Врублевских, отдел рукописей; далее LMAB RS). — F. 256. — 812–815.
20. Lietuvos Valstybės Tarybos protokolai 1917–1918. — Vilnius, 1991.
21. Lukšionytė–Tolvaišienė, N. Gubernijos laikotarpis Kauno architektūroje. Svarbiausi pastatai ir jų kūrėjai (1843–1915). — Kaunas, 2001. — P. 84.
22. Nacionalinės M. Mažvydo bibliotekos retų spaudinių ir rankraščių skyrius (Отдел рукописей Национальной библиотеки Литвы имени М. Мажвидаса). — Ф. 57. — Оп. 1. — Д. 153. — Л. 1–2.
23. Prapuolenis. Archyvai ir jų tvarkymas. — Kaunas, 1936.
24. Tamašauskas, K. Centralinio valstybės archyvo įsteigimas ir pirmieji jo veiklos metai // Lietuvos archyvai. 75eri metai nuo Centralinio valstybės archyvo įkūrimo (Литовские архивы. 75 лет со дня основания Центрального государственного архива). — Vilnius, 1996. — T. 7.
25. Valstybės archeologijos Komisija, Kultūros paveldo departamento archyvas (Государственная археологическая комиссия, архив Департамента культурного наследия, далее VAK KPDA). — Ф.1.
26. VAK KPDA. — Ф. 1. — Оп. 1. — Д. 9.
27. Valstybės Archaiologijos Komisijos Įstatymas (Закон о государственной археологической комиссии) // Laikinosios Vyriausybės Žinios (Известия Временного правительства). — 1919. — rugpjūčio 28. — Nr. 11. — P. 1.
28. Valstybės Archajologijos Komisijos Taisyklės (Правила государственной археологической комиссии) // Laikinosios Vyriausybės Žinios (Известия Временного правительства). — 1920. — kovo 20. — Nr. 25. — P.1.
29. Zilberis, E. Archyvų statybos 40-metis / E. Zilberis, S. Serafinienė // Kauno tiesa. — 1958. — birželio 3. — P. 4.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 08.09.2014

Публікацыя і археаграфічная апрацоўка архіўных дакументаў

В. Ф. Голубеў

Два дакументы пра валочную памеру ў маёнтку Зэльва (Вялікая Зэльва) Мікалая Крыштофа Радзівіла

Эканамічны ўздым у Беларусі ў другой палове XVI – першай палове XVII ст. у многім быў звязаны з правядзеннем так званай Вялікай аграрнай рэформы (валочнай памеры). Памеру ў 1530-х гг. распачала ў сваіх уладаннях вялікая княгіня і каралева Бона Сфорца, а ў 1550-х гг. яе сын вялікі князь Жыгімонт Аўгуст правёў аграрныя пераўтварэнні ў дзяржаўных уладаннях.

Рэформа ў многім была выклікана ростам попыту на збожжа ў краінах Заходняй Еўропы, адным з галоўных пастаўшчыкоў якога было Вялікае Княства Літоўскае. Каб павялічыць вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі, была распрацавана праграма па рэарганізацыі сістэмы землекарыстання і абкладання сялян павіннасцямі, якая знайшла сваё найбольш поўнае адлюстраванне ва «Уставе на валокі» ад 1 красавіка 1557 г. [1].

Галоўным у рэформе Боны Сфорцы быў дакладны ўлік зямлі і праверка правоў на карыстанне зямлёй не толькі сялянамі і гараджанамі, але і шляхтай. У дзяржаўных уладаннях акрамя ўліку і размеркавання зямлі вызначалася асноўная форма рэнты, на якой засноўвалася гаспадарка маёнтка (паншчына, чынш ці даніна), уніфікаваліся сялянскія павіннасці. Планавалася як пашырэнне старадаўніх гаспадарак («двароў»), якія былі прызначаны для матэрыяльнага забеспячэння прадстаўнікоў дзяржаўнай адміністрацыі на месцах, так і стварэнне новых гаспадарак, заснаваных на працы прыгонных сялян і арыентаваных на вытворчасць

збожжа на продаж, — фальваркаў. У адпаведнасці з «Уставай на валокі» фальваркі ствараліся пераважна на ўрадлівых землях у блізкіх да сплаўных рэк рэгіёнах: «Фольварки хочем мети абы везде становены, яко наболшы быти могут, пры каждых замках и дворех нашых, окром где бы кгрунты злые и непожытоточные были…» [2].

У якасці меры плошчы і адначасова адзінкі абкладання сялян павіннасцямі ўводзілася валока (30 моргаў, ці 21,36 га). Там, дзе ствараліся фальваркі, асноўнай сялянскай павіннасцю станавілася адпрацовачная (паншчына, служба цяглая) — 2 дні на тыдзень з валокі (і разнастайныя дадатковыя павіннасці). У мясцінах, якія знаходзіліся далёка ад гандлёвых шляхоў, што вялі на захад, альбо там, дзе зямля была неўрадлівая, у якасці асноўнай павіннасці сялян уводзілася грашовая рэнта (асада) — 30 грошаў з валокі (і разнастайныя дадатковыя павіннасці). У дзяржаўных уладаннях усходу Беларусі асноўнай павіннасцю насельніцтва заставалася даніна. Праўда, пры правядзенні рэформы тут даніна пачала ацэньвацца і ў грашовым эквіваленце.

Пры правядзенні памеры ў дзяржаўных уладаннях мернікі кіраваліся «Уставай на валокі». На падставе гэтага дакумента рэвізорамі ці камісарамі распрацоўваліся Уставы для канкрэтных дзяржаўных уладанняў. Складалі Уставы для сваіх уладанняў і некаторыя прыватныя ўласнікі, якія па прыкладу гаспадара пачалі праводзіць адпаведныя рэформы ў сваіх уладаннях [3].

Радзівілы мелі ў трыманні за службу значныя дзяржаўныя маёнткі і добра ведалі, як праводзілася аграрная рэформа ў дзяржаўных уладаннях, яе станоўчыя вынікі і часта ўводзілі такі ж ці падобны парадак у сваіх маёнтках. Да таго ж вядома, што адна з цэнтральных постацей роду Радзівілаў сярэдзіны XVI ст. Мікалай Радзівіл Чорны (1515–1565 гг.) удзельнічаў у складанні «Уставы на валокі» і нават узначальваў дзяржаўную камісію па правядзенні валочнай памеры ў гаспадарскіх уладаннях. Натуральна, што здабыты на дзяржаўнай службе вопыт эканамічнага рэфармавання ён выкарыстоўваў у сваіх уладаннях, перадаваў дзецям і родзічам.

Сын Мікалая Радзівіла Чорнага Мікалай Крыштоф Радзівіл (1549–1616 гг.) атрымаў у спадчыну бацькоўскія ўладанні, пры рэфармаванні якіх актыўна выкарыстоўваў вопыт правядзення аграрнай рэформы і ў радзівілаўскіх і ў дзяржаўных уладаннях. Ужо публікаваліся «Рэестр памеры» ва ўладанні Крыштофа Радзівіла Лебедзева Ашмянскага павета ў 1575 г. [4] і «Устава Мікалая Крыштофа Радзівіла сялянам вёскі Раковічы Навагародскага павета» 1587 г. [5].

Падчас працы ў аддзеле рукапісаў бібліятэкі Акадэміі навук Літвы імя Урублеўскіх удалося выявіць шэраг раней не ўведзеных у навуковы ўжытак дакументаў па гісторыі правядзення валочнай памеры ва ўла-

даннях Мікалая Крыштофа Радзівіла Сіроткі. Сярод іх два лісты аб ходзе памеры ў радзівілаўскім маёнтку Зэльва (Вялікая Зэльва), датаваныя 25 мая 1573 г. Гэта ліст Мікалая Крыштофа Радзівіла на пацвярджэнне адмены падчас валочнай памеры ў маёнтку Зэльва шляхцічам Івану і Юрыю Данілевічам [6] і ліст на адмену зямель падчас правядзення памеры шляхцічу Юрыю Каспровічу [7].

Згаданыя дакументы ўяўляюць значную гістарычную каштоўнасць як унікальныя дакументы па правядзенні валочнай памеры ў прыватных уладаннях на тэрыторыі Беларусі і ў прыватнасці аб землеўладкаванні падчас рэформы. Вядома, што яшчэ Бона Сфорца для звядзення ў адзіны комплекс сваіх зямельных уладанняў увяла практыку прымусовага абмену цераспалоснай са сваім ворывам зямлі памежных шляхецкіх маёнткаў. Узамен шляхта атрымлівала зямельную кампенсацыю — адмену. Часта падчас такога абмену праводзілася праверка дакументаў шляхты на шляхецтва і на права валодання зямлёй.

Падобнае практыкавалася і ў дзяржаўных уладаннях, і, як мы бачым, ва ўладаннях князёў Радзівілаў.

Так, у першым разглядаемым лісце, які напісаны ад імя Мікалая Крыштофа Радзівіла князя на Альцы і Нясвіжы, маршалка дворнага Вялікага Княства Літоўскага, адзначана, што ў маёнтку Зэльва ў перыяд правядзення валочнай памеры «для лепшого поряд*к*у и выпростова*н*я волок мусели есмо те*ж* кгру*н*ты шляхты н/а/шое зельвенское в померу прин*я*т*и,* а и*м* за не о*т*мену слу*ш*ную дати» [6, арк. 1]. Замест зямлі зямян Івана і Юрыя Данілевічаў, якая была ўключана ў агульны зямельны масіў Радзівілаў, рэвізор Ваўрынец Кернажыцкі даў ім адмену «на два кони ку шляхецко*й* военъно*й* службе именья пятнад*ц*ать волокъ».

Акрамя таго, у тэксце згадваюцца імёны Юрыя Іванавіча Іллініча, маршалка дворнага, старасты берасцейскага і лідскага, зэльвенскага намесніка Курылы, каморніка Ждана, радзівілаўскага служэбніка Троскі, які да таго трымаў дварэц (маёнтак) Трошчынскі. Называюцца таксама паны Няміра і Барадыня, уладанні якіх межавалі з радзівілаўскімі, пан Чырскі, Каспровіч, а таксама Цімоша Цішэвіч, Кавінчыц Ніканаў, Яўсей Бундзевіч, Пухаеў, Касцюкоў, Дзянісаў. Згаданы валокі «Малашкоўскія і Чывіроўскія», «Горненскія», селішча Тарасаўскае і Малашкоўскае, каралеўскае сяло Дзіргілеўскае, радзівілаўскае сяло Юрэвіцкае і зэльвенскае сяло Дарагічынскае, рэкі Зэльва і Крэмяніца. Адзначана, што зямяне Іван і Юрый Данілевічы: «маютъ они то*г*о уживати и во*д*ле подоба*н*я своего будовати прибавляти, не будучи пови*н*ни жа*д*ного плату ани пови*н*ности полнити толко службу земскую военъную ку потребе речи поспо*л*ито*й* и наше*й* яко и инъшая шляхта н/а/ша» [6, арк. 1].

Другі ліст, таксама складзены ад імя Мікалая Крыштофа Радзівіла, адзначае наданне «адмены слушнай» зэльвенскаму шляхцічу Юрыю

Каспровічу «водле квитовъ ревизора н/а/шого тамошнего вавринца керножицкого и привильевъ о*т* про*д*ковъ нашихъ даны*х*» [7, арк. 1]. Але Юрый Каспровіч «жадного привилья на именье свое не указалъ, а вшако*ж* и*ж* пере*д* нами оповеданье поклал и*ж* ку то*т* привилей згорелъ и присегу телесную вчинилъ» [7, арк. 1]. Мікалай Крыштоф Радзівіл зацвердзіў гэтую адмену і рэвізор Ваўрынец Кернажыцкі ў адпаведнасці з «… особливы*м* росказаньe*м* устны*м* и писаны*м* его м/и/л/ос/ти листовы*м* абыхъ пано*м* земяно*м* шляхте его м/и/л/ос/ти зельвенско*й* на до*м* ко*ж*дому с нихъ, то есть на два кони ку шляхецко*й* военъно*й* службе именья пятна*д*цать волокъ з ласки его кн/я/жачое м/и/л/ос)ти подалъ…» [7, арк. 1]. Праведзена, як і ў папярэднім лісце, апісанне абмежавання вылучаных зямель і сенажацей.

Дакументы арыгінальныя, напісаны на пергаміне памерам 55,5 на 24 см. на старабеларускай мове, абодва падпісаны Мікалаем Крыштофам Радзівілам.

На адным лісце ў выдатным стане захавалася пячатка з асновай з жоўтага воску з добрай выявай арла. Сама пячатка замацавана на чырвона-зялёным шнуры [6]. На другім лісце пячатка з асновай з белага воску, сам адбітак — з чырвонага. Замацавана на чырвоным шнуры [7].

У дадатку на мове арыгінала прыводзім тэксты абодвух дакументаў. Вынасныя літары перададзены курсівам.

Крыніцы і літаратура

1. Голубеў, В. Ф. Вялікая аграрная рэформа XVI ст. / В. Ф. Голубеў // Спадчына. — 1993. — № 4. — С. 63–78.
2. Белоруссия в эпоху феодализма. Сборник документов и материалов : в 3 т. (БЭФ). — Минск : Изд-во АН БССР, 1959. — Т. I : С древнейших времен до середины XVII века. — С. 219.
3. Спірыдонаў, М. Ф. Аграрная рэформа ў сярэдзіне XVI ст. / М. Ф. Спірыдонаў // Гісторыя сялянства Беларусі : у 3 т. / рэдкал. : В. І. Мялешка (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : Беларуская навука, 1997–2002. — Т. 1 : Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. / Я. Анішчанка [і інш.]. — С. 78–80.
4. Materyjały do dziejów rolnictwa w Polsce w XVI i XVII wieku poprzedzone wiadomością o życiu i pismach Jana Ostroroga wojewody Poznańskiego / Zebrał i opracował Wł. Chomętowski. — Warszawa: W drukarni Emila Skiwskiego, 1876. — S. 126–139.
5. Голубеў, В. Ф. Устава Мікалая Крыштофа Радзівіла сялянам вёскі Раковічы Навагародскага павета // Людзі і ўлада Навагрудчыны: гісторыя ўзаемадзеяння (да 500-годдзя надання Навагрудку прывілея на магдэбургскае права) : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; уклад. А. А. Скеп'ян, В. В. Даніловіч, А. Б. Доўнар; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]. — Мінск, Беларуская навука, 2013. — С. 134–139.

6. Lietuvos Mosklų Akademios Bibliotekos Rankraščių Skyrius (далее LMAB RS) — F. 2. Pergamentai rusų kalba — Bib. 55. — Ліст Мікалая Крыштофа Радзівіла на пацвярджэнне адмены падчас валочнай памеры ў маёнтку Зэльва шляхцічам Івану і Юрыю Данілевічам. 25.05.1573 г.
7. LMAB RS — F. 2. Pergamentai rusų kalba — Bib. 60. — Ліст Мікалая Крыштофа Радзівіла на пацвярджэнне адмены зямель падчас правядзення памеры шляхцічу Юрыю Каспровічу. 25.05.1573 г.

Дадатак

Дакумент 1

1573.05.25. — Ліст Мікалая Крыштофа Радзівіла на пацвярджэнне адмены, нададзенай у маёнтку Зэльва падчас валочнай памеры, шляхцічам Івану і Юрыю Данілевічам

Миколай криштофъ радзивилъ, княжа на олыце и несвижу, маршалокъ дворный вел/и/кого кн/я/зства ли/то/вского.

15° Pour honorer la mémoire de George Bialopiotrowicz, chancelier du Grand Duché de Lithuanie, homme de bien, dislingué par les vertus et les mérites civiques, mort en 1812, dont le corps est inhumé dans le cimetière de Nowogrodek, je destine un legs de quatre cents franks, qui doit être remis à la disposition du maréchal de la noblesse du district de Nowogrodek, pour lui faire élever un monument dans la dite cimetière, ci… 400

16° Voulant contribuer à élever un monument à Nowogrodek pour honorer la mémoire de feu Adam Mickiewicz notre compatriote et grand poète, je legue la somme de quatre cents franks, qui doit être remise à la disposition du maréchal de la noblesse de district de Nowogrodek, ci… 400

Total . . 13000

Je veux que les légataires nommés dans les paragraphes ci-dessus soient affranchis de toutes changes droit et frais judiciaiers, lesquelles doivent être payés du restants de mes fonds.

Pour exécuter toutes les dispositions, j'ai prié mon respectable compatriote M. Teophil Januszewicz, ancien Présidant de Gouvernement dans le Palatinat de Sandomir, démeurant à Paris, rue Vaneau N41, ce acceptant, que je nomme mon exécuteur testementaire avec la saisine légale, en l'autorisant à vendre à la Bourse de Paris un de mes titres de rente française trois pour cent, inscrit à mon nom sur le Grand-Livre, sous le N 36219 de la rente annuelle de six cent soixante franks, ainsi que quatre obligations belges quatre et demi pour cent, au porteur chaquen de quarante-cinq franks de rente produisant en tout par an cent quatre vingt franks. Je l'autorise à distribuer à légataires susnommés tous les legs, confornément aux dispositions de mon testement et à couvrir les frais d'un modèste service et enterrement, et je le prie en même temps de faire part de ma mort à ma femme et à mes deux fils, de les inviter tous les deux comme mes héritiers naturels, à recueillir ce que pourra rester après la distribution des legs et les frais d'enterrement, ainsi que tout mon avoir, tant à Nice, que là oú il se trouvera.

Si la mort me frappe dans l'émigration avant l'affranchissement de ma patrie, je désire être enterré là oú la plus grande partie de mes compatriotes émigrés polonais de 1831 reposent déjà, au cimetière de Montmartre dans le terrain que j'ai acheté à perpétuité le 28 mai 1861, dont la concession porte le N 428. Il est bien entendu que si je ne retourne pas en Pologne, et que si ma mort arrive ailleur qu'ici, mon corps sera transporté à Paris.

Ayant conservé la mémoire du passé, qui est toujours très chér pour moi, je regarde comme un devoir sacré d'exprimer ici à ma femme ma recconaissance éternelle, comme témoignages du Bonheur que j'ai constitualement éprouvé dans mon ménage avec elle durant les onze années de notre vie commune dans le pays, et je dois ce Bonheur à ses vertus privées. De même, j'exprime à ma femme ma reconnaissance pour sa constante sollicitude depuis mon émigration et pour le dévouement de toute sa vie consacrée au bien de mes enfants.

Je signe le présent testament ologràph
Paris, le vingt neuf mai mil huit cent soixante trois
Signé: Joseph Kaszyc
ancien maréchal de la Noblesse
du district de Nowogrodek

Пераклад

Складзена ў спадара Лавуаня, натарыуса, вуліца Канмартэн, 29, Парыж

Копія ўласнаручнага тастамента спадара Кашыца

Гэта мой тастамент

Я, Юзаф, сын Міхала Кашыца, былы маршалак шляхты Навагрудскага павета, будучы здаровы целам і духам, раблю ўласнаручныя тастаментавыя распараджэнні з выражэннем маёй апошняй волі.

Аддалены ад сваёй краіны, пазбаўлены рускім урадам маіх спадчынных уладанняў, якія называюцца Ятра і знаходзяцца ў Навагрудскім павеце, пакінуты без суцяшэння жыць са сваёй сям'ёй і не могучы са сваёй жонкай ацаніць ні нашы сродкі, што знаходзяцца на радзіме, ні сапраўднае становішча кожнага ў прыватнасці члена нашай сям'і, я абмяжоўваюся, у выпадку маёй смерці ў эміграцыі, распараджэннямі малой часткі маёмасці, якой я валодаю ў Францыі.

Галоўная мая маёмасць размешчана ў Публічным дэпартаменце Францыі пад тры працэнты, так званая рэнта запісана на маё імя ў Вялікую Кнігу.

Усе назвы каштоўных папер, якія належаць мне, знаходзяцца ў маім доме — набярэжная Масэна, 13, у Ніцы, — зачыненыя ў жалезную скрыню, якая адчыняецца з дапамогай чатырох літар, размешчаных наступным чынам: [: :].

Апрача вышэй згаданых сродкаў, я валодаю рухомай маёмасцю, якая напаўняе маё жытло на набярэжнай Масэна, 13, у Ніцы. Камісіянеры пяці апошніх гадоў даводзяць, што я заўжды плаціў грошы за ўсе пакупкі і ўсе пастаўкі.

Двое маіх сыноў, Канстанцін і Юльян Кашыцы [6], з'яўляюцца прамымі спадчыннікамі ўсёй маёмасці, пакінутай пасля маёй смерці. Я не сумняваюся, што яны не абвінавацяць мяне, як і мая жонка, якая так жадала адказаць на мае пачуцці і мае абавязкі, якімі я іх бачыў, што я хачу пасадзейнічаць, наколькі мне гэта дазваляюць мае сродкі, карысным установам, заснаваным нашай эміграцыяй, і аказаць дапамогу хаця б некалькім з маіх суайчыннікаў і асоб, якія найбольш мяне цікавяць. З гэтай мэтай я распараджаюся часткай маёй маёмасці наступным чынам:

Я даю і прызначаю:

1) Польскай школе [7], размешчанай у Бацінёль пад Парыжам, на бульвары Бацінёль, суму ў дзве тысячы франкаў, усяго…. 2000

2) пансіянату для дзяўчын [8], размешчанаму ў Атэлі Лямбэр [9], тысячу франкаў, усяго… 1000

3) польскаму ордэну сясцёр міласэрнасці Святога Вінцэнта дэ Поля пад абаронай Святога Казіміра [10], размешчанаму на вуліцы дэ Шавалерэ, вакзал Іўры, тысячу франкаў, усяго… 1000

---

[6] Верагодна, трэці сын Караль памёр да часу напісання тастамента. На момант смерці Кашыца, як паведамляў Я. Янушкевіч, з чатырох яго дзяцей у жывых заставаўся толькі адзін сын Канстанцін [Januszkiewicz E. Kaszyc Józef… — S. 389].

[7] Школа для дзяцей эмігрантаў з зямель былой Рэчы Паспалітай была адчынена ў 1842 г., у 1844 г. пераведзена ў будынак на бульвары Бацінёль, дзе знаходзілася да 1874 г. Мела рэпутацыю адной з найбольш карысных устаноў для эмігрантаў і таму прыцягвала ўвагу шматлікіх ахвярадаўцаў. У рэарганізаваным выглядзе дзейнічае да цяперашняга часу [Kalembka S. Wielka emigracja… — S. 260–261].

[8] Інстытут польскіх дзяўчын («Instytut Panien Polskich») быў утвораны пры Атэлі Лямбэр (гл. ніжэй) у 1844 г. паводле ініцыятывы жонкі Адама Чартарыйскага Ганны Сапегі. У ім вучылася да 50 вучаніц адначасова. Зачынены ў 1899 г. з-за фінансавых праблем [Kalembka S. Wielka emigracja… — S. 261].

[9] Атэль Лямбэр (фр. — Hôtel Lambert) — прыватны палац на востраве Святога Людовіка ў Парыжы, які ў 1843 г. быў выкуплены князем Адамам Чартарыйскім і ператвораны ва ўласную рэзідэнцыю. Тут жа збіраліся палітычныя прыхільнікі князя — эмігранты з кансерватыўна-ліберальнымі перакананнямі. У выніку і ўвесь палітычны лагер на чале з князем таксама атрымаў назву Атэль Лямбэр [Kalembka S. Wielka emigracja… — S. 117–128, 211–226].

[10] Прытулак імя Святога Казіміра, дзе служылі манахіні-полькі са Згуртавання яясцёр міласэрнасці імя святога Вінцэнта дэ Поля (а Паоло), быў прызначаны для састарэлых і нямоглых эмігрантаў з зямель былой Рэчы Паспалітай, сірот і г.д. Ад свайго адкрыцця ў 1846 г. ён размяшчаўся па адрасе: вуліца Шэвалерэ, 119, у Парыжы. Меў высокі аўтарытэт сярод землякоў як дабрачынная ўстанова, таму з'яўляўся частым аб'ектам увагі ахвярадаўцаў. Дзейнічае і ў цяперашні час [Kalembka S. Wielka emigracja… — S. 267; Szczepański J. Weterani powstań…].

4) у распараджэнне спадара Тэафіла Янушэвіча [11], каб ён выдаткаваў, як палічыць неабходным, на карысць пэўнай асобы альбо майго слугі, альбо маёй пакаёўкі, якія будуць у мяне на службе ў момант маёй смерці, альбо, урэшце, старым польскім эмігрантам 1831 года восемсот франкаў, усяго… 800

5) у распараджэнне шаноўных польскіх святароў, прымацаваных да касцёла Успення Багародзіцы ў Парыжы [12], на размеркаванне паміж хворымі палякамі, дзвесце франкаў, усяго… 200

6) у распараджэнне спадароў Станскага [13] і Карабевіча [14], польскіх медыкаў, кожнаму па дзвесце франкаў, для размеркавання паміж хворымі польскімі выгнаннікамі, што складае агулам чатырыста франкаў, усяго… 400

7) у распараджэнне спадара Пятра Гнаінскага [15], доктара медыцыны, які жыве ў Навагрудку, для размеркавання, як ён палічыць неабходным, паміж хворымі, пра якіх клапоціцца, незалежна ад іх рэлігійнага вызнання, сто сорак рублёў срэбрам, альбо шэсцьсот франкаў, усяго… 600

---

[11] Янушэвіч Тэафіл (1796, в. Няславіцы Сандамірскага ваяв. — 1876, Парыж) — масон, удзельнік паўстання 1830–1831 гг. у Сандамірскім ваяв., сябра падпольных арганізацый у Кракаве і эмігрыцыйных — у Францыі, удзельнік падзей Вясны народаў у Галіцыі ў 1848 г., адзін з заснавальнікаў і шматгадовы апякун Польскай школы ў Бацінёлі [Tyrowicz M. Towarzystwo Demokratyczne… — S. 252–253].

[12] Касцёл Успення Багародзіцы ў Парыжы (фр. — L'église Notre-Dame-de-l'Assomption de Paris) у 1844 г. быў перададзены парыжскім епіскапам польскім ксяндзам і Польскай каталіцкай місіі. Да цяперашняга часу з'яўляецца галоўным польскім касцёлам у Парыжы.

[13] Станскі Пётр-Каятан (1805, в. Вятровічы Сандэцкага пав. — 1879, Парыж) — доктар, удзельнік паўстання 1830–1831 гг., эмігрант у Францыі; меў высокую рэпутацыю сярод землякоў і французаў, дзякуючы чаму шмат зарабляў і знаходзіўся ў добрых адносінах з кансерватыўным лагерам, з'яўляўся аўтарам шэрагу навуковых прац [Konarska B. Stański Kajetan Piotr…].

[14] Карабевіч Эдмунд (1804, в. Міткуны Гродзенскай губ. — 1875, Парыж) — доктар, удзельнік паўстання 1830–1831 гг., эмігрант у Францыі, адзін з заснавальнікаў Польскай школы ў Бацінёлі, сябра некалькіх дэмакратычных арганізацый [Гарбачова В. Удзельнікі паўстання… — С. 172; Bielecki R. Słownik… — T. 2. — S. 313; Konarska B. Polskie drogi…– S. 304; Tyrowicz M. Towarzystwo Demokratyczne… — S. 306–308].

[15] Гнаінскі-Міткевіч Пётр (1799, Навагрудскі пав. — 1875, Навагрудак) — памешчык, доктар; з 1832 г. выконваў абавязкі навагрудскага павятовага доктара, надворны радца; за дачыненне яго жонкі да паўстання звольнены ў 1864 г. са службы [Гарбачова В. В. Беларускі падарунак… — С. 378–379].

8) у распараджэнне майго пляменніка Юзафа Казарына [16] для размеркавання, як ён палічыць патрэбным, паміж дваццаццю пяццю старымі сялянамі з Ятры, якія знаходзяцца ў найбольш прыкрым стане, суму ў шэсцьсот франкаў (альбо дваццаць пяць франкаў кожнаму), усяго… 600

9) спадару Мікалаю Залескаму [17] для яго асабістага выкарыстання дзве тысячы франкаў, усяго… 2000

10) спадару Юзафу, сыну Адама Міцкевіча [18], для таго ж тысячу франкаў, усяго… 1000

11) спадару Іаахіму Чарнышэвічу [19] для таго ж дзвесце франкаў, усяго…200

12) спадару Гераніму Незабытоўскаму [20] для таго ж дзвесце франкаў, усяго… 200

13) спадару Юзафу Гаціцкаму [21] для таго ж дзвесце франкаў, усяго…. 200

14) дзецям маёй пляменніцы Сакалоўскай, народжанай Казарын [22], дзве тысячы франкаў, усяго… 2000

---

[16] Асобу не ўдалося ідэнтыфікаваць.

[17] Залескі Мікалай (1798 ці 1806, Навагрудскі пав. — 1876, Парыж) — адвакат, удзельнік паўстання 1830–1831 гг., эмігрант, набліжаны да кансерватыўных колаў [Гарбачова В. Удзельнікі паўстання… — С. 146–147; Potrykowski J. Tułactwo… — T. 2. — S. 44].

[18] Міцкевіч Юзаф-Тэафіл-Рафал (1850, Парыж — 1938, Кістэрэам дэпартамента Кальвадо, Францыя) — малодшы сын паэта Адама Міцкевіча і Цэліны Шыманоўскай, піяніст, педагог, публіцыст, грамадскі дзеяч у Францыі; незадоўга да напісання тастамента Кашыца вярнуўся з Варшавы, дзе выхоўваўся пэўны час, у Парыж да брата Уладзіслава [German F. Mickiewicz Józef Teofil Rafał…].

[19] Чарнышэвіч Іаахім (каля 1791, Навагрудскі пав. ці м. Ляхавічы Слуцкага пав. — пасля 1856) — памешчык, удзельнік паўстання 1830–1831 гг., эмігрант, пасля 1856 г. прыняў амністыю і вярнуўся на радзіму, дзе знаходзіўся ў складаным матэрыяльным становішчы [Гарбачова В. Удзельнікі паўстання… — С. 354; Tyrowicz M. Towarzystwo Demokratyczne… — S. 107].

[20] Незабытоўскі Геранім (1807, в. Горка Слонімскага пав. — 1880, Парыж) — памешчык, удзельнік паўстання 1830–1831 гг., эмігрант у Францыі і Бельгіі, чыноўнік у Парыжы [Гарбачова В. Удзельнікі паўстання… — С. 251; Bielecki R. Słownik… — T. 3. — S. 202; Konarska B. Polskie drogi… — S. 353].

[21] Гаціцкі (Гаціскі) Юзаф (1802, м. Перасека Навагрудскага пав. — 1885, Труае дэпартамента Об, Францыя) — чыноўнік, удзельнік паўстання 1830–1831 гг., эмігрант у Францыі, дзе пэўны час служыў бухгалтарам; знаходзіўся ў складаным матэрыяльным становішчы [Гарбачова В. Удзельнікі паўстання… — С. 104; Гарбачова В. Паўстанне 1830–1831… — С. 84; Bielecki R. Słownik… — T. 2. — S. 139].

[22] Не ўдалося ідэнтыфікаваць асобу.

15) каб ушанаваць памяць Ежы Белапятровіча [23], канцлера Вялікага Княства Літоўскага, высакароднага чалавека, поўнага дабрадзейнасцяў і грамадзянскіх годнасцяў, які памёр у 1812 годзе і цела якога пахавана на могілках у Навагрудку, я прызначаю чатырыста франкаў, якія павінны быць перададзены ў распараджэнне маршалка шляхты Навагрудскага павета [24], каб ён узнёс помнік на загаданых могілках, усяго… 400

16) жадаючы пасадзейнічаць узвядзенню помніка у Навагрудку, каб ушанаваць памяць генія Адама Міцкевіча, нашага земляка і вялікага паэта, я запісваю суму ў чатырыста франкаў, якая павінна быць перададзена маршалку шляхты Навагрудскага павета, усяго… . . . 400

Усяго 13000

Я хачу, каб атрымальнікі спадчыны, названыя ў прыведзеных параграфах, былі вызвалены ад пакрыцця ўсіх векселяў і судовых выдаткаў, якія павінны быць аплачаны з рэшты маіх фондаў.

Каб выканаць усе распараджэнні, я прашу майго паважанага земляка спадара Тэафіла Янушэвіча, былога старшыню праўлення Сандамірскага ваяводства, які жыве ў Парыжы на вуліцы Вано, 41, згадзіцца на тое, каб я прызначыў яго выканаўцам тастамента, даючы яму права легальна дзейнічаць і прадаць на Парыжскай біржы адну з маіх пазіцый французскай рэнты на тры працэнты, запісаную на маё імя ў Вялікую Кнігу пад № 36219 з гадавым даходам у шэсцьсот шэсцьдзясят франкаў, а таксама чатыры бельгійскія аблігацыі на чатыры з паловай працэнта, якія прыносяць кожная па сорак пяць франкаў даходу, што агулам складае 180 франкаў у год. Я дазваляю яму размеркаваць вышэй названым атрымальнікам спадчыны ўсе запісы ў адпаведнасці з распараджэннямі майго тастамента і пакрыць усе выдаткі на сціплую службу і пахаванне, і я прашу ў той жа час паведаміць пра маю смерць маёй жонцы і двум маім сынам, запрасіць іх абодвух як маіх прамых спадчыннікаў забраць тое, што можа застацца пасля размеркавання запісаў і

---

[23] Белапятровіч Ежы (1740–1812, Вільня) — стражнік лідскі ў 1764 г., лоўчы лідскі ў 1771 г., суддзя гродскі навагрудскі ў 1780 г., пісар вайсковы літоўскі ў 1783–1787 гг., ротмістр у 1787 г., актыўны ўдзельнік паўстання ў 1794 г., сябра Судовай камісіі адукацыйных фундушаў з 1808 г., заснавальнік Таварыства дабрачыннасці ў Навагрудку ў 1810 г., прыхільнік Напалеона. Яго сын Ежы з 1839 г. жыў у эміграцыі ў Францыі [Mościcki H. Białopiotrowicz Jerzy…]. У Кашыца памылка — Белапятровіч быў не канцлерам ВКЛ, а начальнікам аддзела вайсковых патрэб у Цэнтральнай дэпутацыі ВКЛ у 1794 г.

[24] У час складання тастамента навагрудскім маршалкам з'яўляўся Уладзіслаў Брахоцкі (1816–1896) — былы ўдзельнік паўстання 1830–1831 гг., які ў 1864 г. часова высланы з радзімы за дапамогу паўстанцам у 1863 г. [Гарбачова В. В. Беларускі падарунак… — С. 370–372].

выдаткаў на пахаванне, а таксама ўсю маю маёмасць як у Ніцы, так паўсюль, дзе яна будзе знаходзіцца [25].

Калі смерць напаткае мяне ў эміграцыі да вяртання на маю радзіму, я жадаю быць пахаваным там, дзе ўжо спачывае найбольшая частка маіх землякоў — польскіх эмігрантаў 1831, — на могілках Манмартр [26], на дзялянцы, якую я купіў на вечнасць 28 траўня 1861 г. і якая мае нумар 428. Само сабой разумеецца, што калі я не вярнуся ў Польшчу і калі мая смерць прыйдзе ў іншым месцы, маё цела будзе перавезена ў Парыж.

Захоўваючы ўспаміны пра мінуўшчыну, якія заўжды для мяне вельмі дарагія, я лічу сваім святым абавязкам выразіць тут маёй жонцы бясконцую ўдзячнасць як сведчанне Шчасця, якое я цалкам спазнаў у маім шлюбе з ёй на працягу адзінаццаці гадоў нашага сумеснага жыцця на радзіме, і я абавязаны гэтым Шчасцем яе асабістым дабрадзейнасцям. Таксама я выражаю маёй жонцы маю пашану за яе няспынны клопат падчас маёй эміграцыі і за яе адданасць на працягу ўсяго жыцця, прысвечанага дабру маіх дзяцей.

Я падпісваю гэты ўласнаручны тастамент

Парыж, дваццаць дзявятага траўня тысяча восемсот шэсцьдзясят трэцяга года

Падпісана: Юзаф Кашыц

былы маршалак шляхты

Навагрудскага павета

Крыніцы і літаратура

1. Гарбачова, В. В. Беларускі падарунак Уладзіславу Міцкевічу / В. В. Гарбачова // Асоба і час: Беларускі біяграфічны альманах. — Вып. 2. — Мінск: Лімарыус, 2010. — С. 358–380.
2. Гарбачова, В. В. Паўстанне 1830–1831 гг. на Беларусі / В. В. Гарбачова. — Мінск: БДУ, 2001. — 198 с.; іл.
3. Гарбачова, В. В. Паўстанцы 1863 году на фотаздымках / В. В. Гарбачова // ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 123–126.
4. Гарбачова, В. В. Удзельнікі паўстання 1830–1831 гг. на Беларусі. Біябібліяграфічны слоўнік / В. В. Гарбачова. — Мінск: БДУ, 2004. — 400 с.

---

[25] Найбольш верагодна, што адзіны жывы ў 1868 г. сын Юзафа Кашыца Канстанцін не рабіў спроб атрымаць маёмасць пасля смерці бацькі, прынамсі нічога невядома пра яго выезды за мяжу пасля вяртання на радзіму са ссылкі за ўдзел у паўстанні 1863 г. [Гарбачова В. В. Беларускі падарунак… — С. 377–378; Гарбачова В. В. Паўстанцы 1863 году на фотаздымках… — С. 125–126].

[26] Пра пахаванні эмігрантаў на Манмартры гл.: Polacy pochowani na cmentarzu Monmartre…

5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей НГАБ). — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 1315. — Справа аб дваранскім паходжанні роду Кашыцаў. 25.08.1805–31.10.1895 гг. — 150 арк.
6. НГАБ. — Ф. 561. — Воп. 1. — Спр. 3. — Алфавітны спіс асоб, што ўдзельнічалі ў польскім паўстанні 1831 г. Ч. 2. К–П. 1832 г. — 200 арк.
7. НГАБ. — Ф. 1297. — Воп. 1. — Спр. 6588. — Справа паводле ўказа Урадавага Сената аб прывядзенні ў вядомасць правілаў для ліквідацыі даўгоў канфіскаваных маёнткаў удзельнікаў паўстання. 06.08.1832–23.09.1833 г. — 25 арк.
8. НГАБ. — Ф. 1430. — Воп. 1. — Спр. 3286. — Справа аб канфіскацыі маёнткаў асоб, што бралі ўдзел у польскім паўстанні. 30.09.1832–14.09.1833 г. — 50 арк.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (далей НГАБ у Гродна). — Ф. 1. — Воп. 4. — Спр. 546. — Справа аб перадачы канфіскаванага ва ўдзельніка паўстання 1831 г. Кашыца Юзафа маёнтка Ятры Навагрудскага павета ў бессправаздачнае кіраванне адміністратару Залескаму. 1836 г. — 22 арк.
10. НГАБ у Гродна. — Ф. 1. — Воп. 10. — Спр. 97. — Справа паводле прашэння жонкі ўдзельніка паўстання 1830–1831 гг. Кашыцавай Соф'і аб вяртанні ёй канфіскаванага маёнтка Ятры Навагрудскага павета. 1832–1834 гг. — 90 арк.
11. НГАБ у Гродна. — Ф. 1. — Воп. 27. — Спр. 76. — Справа аб вызначэнні ступені ўдзелу ў польскім паўстанні 1831 г. памешчыкаў Навагрудскага павета Кашыца і Грыцкевіча. 1832 г. — 9 арк.
12. НГАБ у Гродна. — Ф. 4. — Воп. 1. — Спр. 49. — Перапіска з віленскім губернатарам пра падзеі паўстання 1830 г. у Навагрудскім павеце. 07.07.1831–14.08.1831 г. — 55 арк.
13. НГАБ у Гродна. — Ф. 4. — Воп. 1. — Спр. 134. — Перапіска з віленскім генерал-губернатарам пра залічэнне ў ваенныя кантаністы дзяцей удзельнікаў паўстання 1830 г., што загінулі без звестак і ўцяклі за мяжу. 09.08.1832–18.11.1833 г. — 22 арк.
14. НГАБ у Гродна. — Ф. 4. — Воп. 1. — Спр. 191. — Спісы ўдзельнікаў паўстання 1830 г. у Гродзенскай губерні і рашэнні [Гродзенскай следчай] камісіі аб прыцягненні іх да адказнасці паводле ступені вінаватасці. 1832 г. — 246 арк.
15. НГАБ у Гродна. — Ф. 5. — Воп. 1. — Спр. 12. — Перапіска з губернскімі ўстановамі аб прэтэнзіях на канфіскаваную маёмасць удзельніка паўстання 1831 г. Юзафа Кашыца. 11.08.1837–20.02.1839 гг. — 54 арк.
16. Радзюк, А. Р. Канфіскацыя прыватнай уласнасці на Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст.: Дыс. … канд. гіст. навук: 07.00.02 / А. Р. Радзюк. — Мінск, 2006.
17. Швед, В. В. Кашыц Язэп / В. В. Швед // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. — Т. 4 / Рэдкал. Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск: БелЭн, 1997. — С. 158.

18. Biblioteka Jagiełłońska (далей — BJ). — Rkps. 7854 IV. — Autografy nowsze ze zbioru Władysława Górskiego. XIX w.
19. BJ. — Rkps. 9166 IV. — Papiery związane z działalnością polityczną i społeczną Józefa Bohdana Zaleskiego oraz różne dotyczące spraw osobistych.
20. Biblioteka Polska w Paryżu (далей — BPP). — Rkps. 471. — Papiery emigrantów. Litera „J".
21. BPP. — Rkps. 477. — Papery emigrantów. Litera „K".
22. Bielecki, R. Słownik biograficzny oficerów powstania listopadowego / R. Bielecki. — T. 1. — Warszawa: Wydawnictwo Trio, 1995. — 410 s.: il.; T. 2. — Warszawa: Wydawnictwo Neriton, 1997. — 405 s.; T. 3. — Warszawa: Wydawnictwo Neriton, 1998. — 431 s.
23. Hoffman, K.B. Pamiętnik zemigracji / wyd. E. H. Nieciowa // Rocznik biblioteki Polskiej Akademii Nauk w Krakowie. — 1966. — R. 12. — S. 231–350.
24. Gadon, L. Z życia Polaków we Francji. Rzut oka na 50-letnie koleje Towarzystwa Historyczno-Literackiego w Paryżu. 1832–1882 / L. Gadon. — Paryż: Biblioteka Polska [etc.], 1883. — 169 s.
25. German, F. Mickiewicz Józef Teofil Rafał / F. German // Polski słownik biograficzny. — T. XX. — Wrocław [etc.]: Zakład Narodowy imienia Ossolińskich; Wydawnictwo PAN, 1975. — S. 708–710.
26. Goszczyński, S. Dziennik Sprawy Bożej / opr. Z. Sudolski i in. — T. 1–2. — Warszawa: Instytut Wydawniczy Pax, 1984.
27. Januszkiewicz, E. Kaszyc Józef / E. Januszkiewicz // Rocznik Towarzystwa Historyczno-Literackiego w Paryżu. — R. 1868. — Paryż: Księgarnia Luxemburgska, 1869. — S. 383–389.
28. Kalembka, S. Wielka Emigracja. 1831–1863 / S. Kalembka. — Toruń: Wydawnictwo Adam Marszałek, 2003. — 434 s.
29. Kasznik, A.H. Polityka finansowa monarchii lipcowej wobec emigracji polskiej / A. H. Kasznik // Studia historyczne / Polska Akademia Nauk — Oddział w Krakowie, Komisja Historyczna. — R. 16. — № 4(63). — Kraków: Secesja, 1973. — S. 495–521.
30. Konarska, B. Polskie drogi emigracyjne. Emigranci polscy na studiach we Francji. 1832–1848 / B. Konarska. — Warszawa: Państwowe Wydawnictwo Naukowe, 1986. — 487 s.: il.
31. Konarska, B. Stański Kajetan Piotr / B. Konarska // Polski słownik biograficzny. — T. XLII. — Warszawa–Kraków, 2003–2004. — S. 256–258.
32. Lutzowa, H. Kaszyc Józef / H. Lutzowa // Polski słownik biograficzny. — T. 12. — Wrocław [etc]: Zakład narodowy imienia Ossolińskich, Wydawnictwo PAN, 1966–1967. — S. 212–213.
33. Mickiewicz, A. Dzieła / A. Mickiewicz. — T. 15. — Listy. Cz. 2. — Warszawa: Czytelnik, 1955. — 701 s.
34. Mickiewicz, W. Żywot Adama Mickiewicza podług zebranych przez siebie materyałów oraz z własnych wspomnień / W. Mickiewicz. — T. 1–4. — Poznań: W drukarni Dziennika Poznańskiego, 1894.

35. Mościcki, H. Białopiotrowicz Jerzy / H. Mościcki // Polski słownik biograficzny. — T. 2. — Kraków: Nakładem Polskiej Akademii Umiejętności, 1936. — S. 15–16.
36. Muzeum Adama Mickiewicza (далей MAM). — Rkps. 1018. — Rękopisy z lat 1831–1888. Pisma i listy do Ignacego Domeyki.
37. MAM. — Rkps. 1112. — Zbiór dokumentów, rozmaitych świadczeń, nominacyi i notatek biograficznych. (Teka Józefa Kaszyca). (brak paginacji).
38. Polacy pochowani na cmentarzu Monmartre oraz Saint-Vincent i Batignolles w Paryżu / pod red. A. Biernata i S. Górzyńskiego; [aut.] Bielecki R. [et al.]. — Warszawa: DiG, 1999. — 330 s.
39. Potrykowski, J. A. Tułactwo polaków we Francji. Dziennik emigranta / wyd. A. Owsińska. — T. 1–2. — Kraków: Wydawnictwo literackie Kraków, 1974.
40. Straszewicz, J. Les Polonais et les Polonaises de la revolution du 29 november 1830, ou portraits des personnes qui ont figuré dans la dernière guerre de l'independense polonaise, accompagnés d'une biographie pour chaque portrait / J. Straszewicz. — Paris: A. Pinard, 1832.
41. Szczepański, J. Weterani powstań narodowych w Zakładzie św. Kazimierza w Paryżu / J. Szczepański. — Warszawa: DiG, 2011. — 247 s.
42. Tyrowicz, M. Towarzystwo Demokratyczne Polskie. Przywódcy i kadre członkowskie. Przewodnik bio-bibliograficzny / M. Tyrowicz. — Warszawa: Książka i Wiedza, 1964. — 874 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 01.08.2014

Ю. В. Нестерович

Оптимизация терминов «публикация архивного документа», «публикация документа национального архивного фонда», «публикация исторического документа»

Построение системы терминов научной дисциплины предполагает экспликацию (уточнение логико-эпистемологическими методами) соответствующих понятий [1; 2]. При построении терминосистемы археографии востребована оптимизация терминов «публикация архивного документа» (АД), «публикация документов национального архивного фонда» (НАФ), «публикация исторического документа» (ИД). Она коррелятивна, с одной стороны, экспликации понятий публикации, опубликования, издания; с другой, экспликации понятий АД, НАФ и ИД. Экспликации понятия архивного документа препятствует неоткоррелированность таксономии документа и архивного документа, полисемии термина «документ» [3].

В отечественной научной литературе дан анализ правового аспекта понятия документов НАФ. Утверждается: «в итоге понятие (т.е. термин. — *Ю. Н.*) «документы НАФ» стало практически безразмерным и синонимичным понятию (термину. — *Ю. Н.*) «документы»» (в логике принято понятие равнозначимости понятий, в семантике — понятие синонимии терминов). Предлагается использовать в законодательстве взамен однозначного термина «документы НАФ» полисемичный термин «документы» [4]. По отношению к понятию ИД констатируется, как правило, что оно «уже» по объему понятия исторического источника (ИИ), но когда дело доходит до определений, они даются «расплывчато» либо вообще опускаются [5].

Употребление усечения «публикация документа» взамен терминов «публикация исторического документа», «публикация архивного документа» в тех случаях, когда из контекста однозначно неясен денотат (предметное значение), методологически недопустимо. Одно дело, когда усечение «публикация документа» употребляется в методических разработках, в название которых входит термин «исторический документ» (например, в издании «Правила издания исторических документов в СССР»), что предполагает полный термин «публикация исторического документа». Такого же рода контекст имеет место и в названии структурного подразделения. Например, название «отдел публикации документов» в НИАБ подразумевает, что отдел занимается публикацией исторических документов, учитывая наличие слова «исторический» в названии госучреждения «НИАБ». Другое дело, когда денотат усечения «публикация документа» из контекста не выводим.

Оптимизацию термина «архивный документ» затрудняет наличие различных трактовок архивного документа. Трактовку архивного документа как документа, точней — продукта деятельности с закрепленной информацией (ПДЗИ), взятого на (временное, постоянное) архивное хранение, характеризуем как «узкую» (именно такая трактовка обосновывается в концепции трансформации документа в ИИ [6]). Ей противостоит «широкая» трактовка, допускающая отнесение к архивным документам ПДЗИ, не взятых на архивное хранение, в том числе выполняющих оперативные служебные функции, не утративших целевое назначение документов. Она противоречива тем, что в качестве архивных документов следует идентифицировать и документы, взятые на архивное хранение и не взятые. Тем самым одни и те же ПДЗИ (как оперативные документы, так и утратившие оперативные функции), например заявление, могут идентифицироваться и как документы, и как архивные документы. В определении термина «архивный документ» в ГОСТ Р 51141–98 — «документ, сохраняемый или подлежащий сохранению в силу его значимости для общества и равно имеющий ценность для

собственника» [7], понятия значимости для общества и ценности для собственника не раскрываются. Соответственно критерии обретения статуса архивного документа не определены. Тем самым к архивным документам приемлемо относить и ПДЗИ («документы»), выполняющие оперативные функции, в частности имеющие административно-хозяйственное значение. В СТБ 2059–2013 внесена дефиниция: «архивный документ — документ, имеющий ценность, сохраняемый или подлежащий сохранению в архиве» [8]. Опуская логическую невыверенность ее, отметим, что в сравнении с определением термина «архивный документ» в ГОСТ Р 51141–98 в отечественном стандарте вовсе устранены субъекты значимости-ценности документа, хотя уточнено место сохранения документов. Вследствие наличия конструктов сохраняемости ПДЗИ («документов») в архивном учреждении, подлежащих архивному хранению, более точным дефиниендумом в данной дефиниции будет термин «документ НАФ».

В дефиниции архивного закона Республики Беларусь 2011 г. «архивный документ — документ с зафиксированной на нем информацией, независимо от вида ее носителя, хранящейся в архиве в силу его значимости для граждан, общества и государства», отсутствует смешение понятий архивного документа и документа НАФ. Термин «документ НАФ» определяется в нем как «архивный документ, а также документ с зафиксированной на нем информацией, независимо от вида ее носителя, подлежащий сохранению в силу его значимости для граждан, общества и государства». Определенная избыточность изложения в дефиниенсе, производимая наличием оборота «с зафиксированной на нем информацией, независимо от вида ее носителя», ведет к противоречию (учитывая принятость моделирования документа в технологическом аспекте как информации, зафиксированной на носителе данных), поэтому не будем принимать ее в расчет. Из статьи № 9 Закона «Состав НАФ Республики Беларусь», в которой представлены субъекты собирания документов НАФ, вытекает, что ими выступают «предприятия, учреждения, организации, существующие и существовавшие на территории Республики Беларусь и за ее пределами» [9], в случае, разумеется, отождествления субъектов сохранения и собирания документов.

Для соразмерного раскрытия понятия представляется целесообразным различать субъект, обеспечивающий сохранение документов НАФ (каковым является государство), и субъекты собирания ПДЗИ, относимые к документам НАФ. Принимая во внимание необходимость выработки в науке непротиворечивой корреляции понятий документа и архивного документа в междисциплинарном поле, оптимизация термина «документ НАФ» представляется как исключение из его денотата документов, выполняющих оперативные функции в соответствии со

своим целевым назначением. Это соответствует корреляции понятий, выработанной в концепции трансформации документа в исторический источник. Определяя логически, понятие НАФ, представленное в архивном законе Республики Беларусь 2011 г., — собирательное понятие. Понятие же документа НАФ в нем таковым не является. Это позволяет избегать противоречий в изложении. При употреблении термина «публикация документов НАФ» терминоэлемент «документы НАФ» имеет значение элементов состава НАФ, принимая терминологию данного закона (наличию в нем термина «состав НАФ»). Данный термин в указанном значении имеет иной логический статус — общего несобирательного относительного понятия. Вместе с тем употребление термина «публикация документов НАФ» для описания явлений эдиции будет недостаточно точным, поскольку его приемлемо интерпретировать как введение в общественный оборот через издание и архивного документа, и ПДЗИ, являющегося учтенной единицей конкретного НАФ, подлежащей архивному хранению.

Экспликацию понятий, обозначаемых терминами «публикация исторического документа», «публикация архивного документа», «публикация документов национального архивного фонда», затрудняет неоткоррелированность в книговедении, издательском деле понятий, обозначаемых «публикация», «издание». Синонимия в литературе по археографии терминов «публикация (исторического) документа», «публикация памятника (письменности)», «публикация текста документа», «публикация (исторического) источника», «издание исторического документального текста» и прочее отмечается в работе Е. М. Добрушкина «Основы археографии» (1992) [10, с. 9, 31]). Экспликацию последних двух понятий затрудняет, кроме того, неустойчивость в архивоведении и архивистике денотата терминов «архивный документ» и «документ НАФ» и вытекающая из этого их неоткоррелированность. Н. Б. Зиновьева употребляет усеченный (от термина «публикация документов») термин «публикация», определяя его как «представление документа, доступного для массового пользования» [11, с. 77] (модифицируя определение термина, данное в ГОСТ 7.0–99 — «документ, доступный для массового использования»). Однако в данном случае усечение термина недопустимо даже при «широкой» трактовке документа, учитывая, что соответственно ей к документам относят, в частности, музейные экспонаты. Модификация формулировки не устраняет логическую невыверенность: получается, что представляются лишь документы, доступные для массового использования. Тем самым игнорируются секретные документы, документы, предназначенные для служебного пользования. Изложение соразмерно было бы вести о «представлении» (т.е. тиражировании и доведении до пользователя) документа, доступном для поль-

зователя. Термин «публикация документов», сам являясь усечением термина «публикация исторических документов», двусмыслен, неадекватен и недостаточно точен. Он двусмыслен, поскольку из его употребления вовсе не следует, что имеется в виду публикация результатов эдиторской работы (публикация, осуществляемая в соответствии с нормами эдиции). Он неадекватен наиболее принятым сегодня в документоведении трактовкам документа (комплекса информации и носителя информации; информации, зафиксированной на носителе и включающей идентифицирующие атрибуты — «реквизиты»). Он неточен, поскольку осуществленная эдитором публикация ИД включает не только переданный в соответствии с нормами археографии вводимый в оборот (в том числе и повторно) исторический текст, а и научно-справочный аппарат (НСА), охватывая в необходимых случаях описание печатей, филиграней. П. А. Левчик, кстати, употребляет не усеченный термин — «публикация документа», определяя его как «доведение содержания документа до сведения общественности посредством печати, радио, телевидения или его издание» [12, с. 57] (модернизируя второе значение термина, данное в справочном издании 1968 г. [13, с. 42]). Тем самым публикациями документов предстают не только результаты тиражирования вводимых в общественный оборот ПДЗИ, а и результаты речевой деятельности. Частичным синонимом термина «публикация документа» выступает термин «издание документа». В наличии смешение понятий доведения до пользователя содержания документа (и шире — ПДЗИ) и опубликования его, интерференции понятий тиражирования ПДЗИ и трансляции записи. Опубликование предполагает включение в издание, а наличествующие в издании выходные данные (как часть его выходных сведений), как и НСА, сопровождают [1] публикуемый документ.

В Закон Республики Беларусь 2000 г. «О нормативных правовых актах Республики Беларусь» термины «принятие, издание нормативного правового акта» употребляются в качестве синонимов в значении «доведения нормативного правового акта (далее — НПА) до всеобщего сведения путем воспроизведения текста» в официальных изданиях. Для обозначения понятия введения НПА в общественный оборот через печатное издание используется терминоэлемент «опубликование» (но не терминоэлементы «издание» и «публикация», как в литературе по археографии) и термин «опубликование НПА». Между тем в рамках теоретического документоведения НПА идентифицируются как доку-

---

[1] В. П. Козлов заимствует из текстологии в терминосистему археографии термин «сопровождение», употребляя его взамен термина «НСА» [15, с. 24–25]. При этом упускается из виду, что ИД в издании сопровождает не только НСА, а и выходные данные.

менты. Коррелируя базисные понятия археографии и смежных научных дисциплин в междисциплинарном поле, оптимальным представляется обозначать термином «издание документов» распространяемый в социальной среде продукт издательской деятельности, включающий оперативные документы, тиражированный на традиционных либо электронных носителях данных, либо включенный в электронный информационный ресурс для пользования в компьютерной сети, выпуск которого санкционирован издательством. Термином «издание исторических документов» целесообразно называть аналогичный продукт, включающий ИД. В этом случае термины «опубликование документа, ИД» означают введение документа, ИД в общественный оборот. Термины «публикация документа, ИД» означают тиражируемый (распространяемый) через издание документ или ИД в комплексе с выходными сведениями и справочным аппаратом издания.

Необходимость экспликации понятия ИД, при оптимизации термина «публикация ИД», затрудняется невыясненностью в науке денотата термина «исторический документ». Характерной является банальная констатация: «понятие ИИ в науке шире понятия ИД» [5]. При этом сложным делом оказывается и формулирование смыслового значения его. Нередко он употребляется как усечение. Так, В. Л. Носевич исходит из того, что в исторической науке документ трактуется «прежде всего как материальный носитель с зафиксированной информацией о прошлом» [14, с. 133–134]. Оборот «прежде всего» здесь сам по себе указывает на многозначность денотата. Изложению об «информации о прошлом» в рамках исторической науки соответствует употребление именно термина «исторический документ». Конструкт «носитель с зафиксированной информацией о прошлом» неясен и препятствует образованию смыслового значения термина — служить ПДЗИ, участвовать в формировании знаний об исторических событиях, явлениях, которые создаются главным образом не способом фиксирования информации о прошлом, а записи данных, которые впоследствии выступают в качестве источника ретроспективной информации.

В «Архіварыусе» (вып. 11, 2013) мы уточнили понятие исторического документа, исходя в качестве предпосылочного знания из концепции трансформации документа в ИИ [6]. Предпосылкой оптимизации термина «публикация ИД» служит корреляция его с понятиями, обозначаемыми «текст», «запись», «произведение». Сложность корреляции обусловлена тем, что эти понятия нуждаются в экспликации, которая затруднена многозначностью обозначающих их терминов (это отмечается нами по отношению к понятию текста) [6]. Необходимость такой корреляции возникает вследствие того, что термины «текст исторического источника», «текст исторического документа» в случае придерживания

синонимии терминоэлементов «исторический источник» и «исторический документ» представляются противоречивыми.

Учтем, что в литературе по теоретическому источниковедению термины «текст» и «(письменный исторический) источник» употребляются зачастую в эквивалентном значении. Например: «начальным пунктом установления подлинности рукописного текста является прочтение текста и понимание буквального смысла источника, чтобы прочесть и уяснить содержание источника» [17, с. 124]. Между тем понятия ИИ и текста не имеют общих признаков. Отличительным признаком понятия ИИ выделяют признак «отражения исторических процессов». Избежанию противоречий послужит применение системно-структурного подхода, моделирование ИИ, через выделение структурных уровней. Такой подход применялся нами при моделировании документа, сообщения [3], данных [18]. В этом случае для обозначения континуума графических знаков письма, составляющих текст документа, законодательного акта, творческого материала и т.д., выступающих в качестве ИИ, востребован термин «исторический текст». Для обозначения такого континуума в комплексе с вложенным в него семантическим содержанием востребован термин «историческое произведение». Понимание ИД как опубликованного документа, законодательного акта, творческого материала неточно. Это становится особенно очевидным при осуществлении эдиции ИИ. Эдиция ИИ может включать передачу текста, содержания публикуемого архивного документа, который ранее имел статус документа, законодательного акта, творческого материала и т.п., описание элементов, не относящихся к тексту и вложенному в него содержанию (печатей, филиграней и др.). В соответствии со сложившимся в источниковедении пониманием ИИ, обоснованием понятия ИД логическим видом по отношению к понятию ИИ, выделением для ИД структурных уровней, в качестве ИД приемлемо рассматривать текст публикуемого обособленного ПДЗИ, функционировавшего в качестве документа, законодательного акта, творческого материала, т.е. текст в комплексе с содержанием и всеми знаковыми средствами.

Предпосылкой оптимизации термина «публикация ИД» служит и непротиворечивая диалектика логических понятий единичного, частного и обособленного предмета. Следует учитывать, что в отличие от документа, законодательного акта, могущих иметь стадиальные формы (проект — подлинник — дубликат — заверенная копия), в отличие от произведения, которое может реализовываться в ряде текстов, архивный документ — обособленный, не обязательно единичный ПДЗИ, могущий иной раз составлять дело архивного фонда. В архивном деле при работе с архивными документами в зависимости от особенностей хранения, использования, формата архивных документов различают рабочий,

резервный, страховой, пользовательский архивный ЭД (электронный документ). В. И. Тихонов употребляет усечения терминов (вследствие «выпадения» терминоэлемента «архивный») — «рабочий, резервный экземпляр ЭД», «ЭД в страховом, пользовательском формате» [19]. В любом случае экземпляры обособленного архивного ЭД, утратившего оперативные функции в социальной деятельности и служебную значимость для деятельности учреждений, адекватно рассматривать как ИД — взятый для опубликования архивный документ, имеющий особенности хранения, использования, формата.

Таким образом, термины «публикация архивного документа», «публикация документов НАФ», «публикация исторического документа» неоднозначны. Оптимум терминов «публикация архивного документа», «публикация документов НАФ» устанавливаем на основе экспликации понятий публикации, опубликования и издания, корреляции содержания терминов «архивный документ», «документ НАФ» в Законе Республики Беларусь 2011 г. В нем документ НАФ трактуется как архивный документ либо учтенный ПДЗИ, подлежащий архивному хранению. Архивный документ предстает ПДЗИ, взятым на архивное хранение, элементом архивного фонда, выступающим объектом комплекса архивных работ, осуществляемых в архивном учреждении. Соответственно этому термин «публикация архивного документа» определяем как введенный в общественный оборот через печатное либо электронное издание архивный документ, т.е. (имеющий историческую ценность, культурную значимость для конкретного государства и представляющей его нации (наций)) ПДЗИ, взятый на архивное хранение. Термин «публикация документов НАФ» — как введенный в общественный оборот через издание архивный документ либо учтенный ПДЗИ, подлежащий архивному хранению.

Рассматривая ИД объектом эдиторской деятельности, термин «публикация исторического документа» (а также производную от него грамматическую форму «историко-документальная публикация») следует употреблять в значении ПДЗИ, представляющего собой вводимый в общественный оборот через печатное либо электронное издание ИД. Термины «эдиторская, археографическая публикация» — в значении публикации ИД, подготовленной эдитором в соответствии с нормами, вырабатываемыми археографией. Такая публикация обязательно сопровождается НСА и выходными данными издания. Термины «издание документа, документов» для обозначения таких понятий употреблять неадекватно. Вместе с тем термины «эдиторское, археографическое издание» соразмерно употреблять для обозначения издания, объектом опубликования в котором взят ИД либо комплекс ИД.

Источники и литература

1. Лейчик, В. М. Терминоведение: Предмет, методы, структура / В. М. Лейчик. — М.: ЛИБРОКОМ, 2009. — 236 с.
2. Нестерович, Ю. В. Предпосылки формирования терминосистемы документоведения (обзор) / Ю. В. Нестерович // Научно-техническая информация. — Сер. 1. — 2013. — № 8.
3. Нестерович, Ю. В. Труды по экспликации базисных понятий научных теорий / Ю. В. Нестерович. — Т. 1: Экспликация базисных понятий документоведения и инфософии. — Минск: ГНУ «Институт истории НАН Беларуси», 2010. — 312 с.
4. Рыбаков, А. Е. Понятие «документы Национального архивного фонда» в контексте правового оформления системы управления документами и архивами в Республике Беларусь / А. Е. Рыбаков // Историческое наследие Беларуси: выявление, сохранение и изучение. Матер. межд. Науч. конф., посвященной 90-летию Государственной архивной службы Республики Беларусь, 85-летию Национального архива Республики Беларусь и 25-летию кафедры источниковедения БГУ (Минск, 17–18 мая 2011 г.). — В 2-х ч. Ч. 2. — Минск: БелНИИДАД, 2013.
5. Рыбаков, А. Происхождение и эволюция термина «документ» / А. Рыбаков // Архивы и делопроизводство. — 2013. — № 5.
6. Нестерович, Ю. В. Концепция трансформации документа в исторический источник и корреляция понятий исторического источника и исторического документа / Ю. В. Нестерович // Архіварыус. Зб. нав. паведамл. і арт. — Вып. 11. — Мінск: НГАБ, 2013.
7. ГОСТ Р 51141–98: Делопроизводство и архивное дело. Термины и определения. Издание официальное. — М.: Госстандарт, 1998. — 6 с.
8. СТБ 2059–2013. Делопроизводство и архивное дело. Термины и определения. Издание официальное. — Минск, 2013.
9. Закон Республики Беларусь «Об архивном деле и делопроизводстве в Республике Беларусь» от 25 ноября 2011 г. № 323–З // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. — 2011. — № 136.
10. Добрушкин, Е. М. Основы археографии. Учеб. пособие / Е. М. Добрушкин. — М.: РГГУ, 1992.
11. Зиновьева, Н. Б. Документоведение: учебн.-метод. Пособие / Н. Б. Зиновьева. — М., 2001.
12. Левчик, П. Словарь документоведа. «П» / П. Левчик // Архивы и делопроизводство. — 2003. — № 4.
13. Краткий словарь архивной терминологии. — М., 1968.
14. Носевич, В. Электронные документы и инфомационные ресурсы / В. Носевич // Архивы и делопроизводство. — 2000. — № 2.
15. Козлов, В. П. Теоретические основы археографии с позиций современности / В. П. Козлов // Отечественные архивы. — 2001. — № 1.
16. Нестерович, Ю. В. К вопросу о построении терминосистемы археографии: очерк по экспликации понятия стандартной передачи текста пуб-

ликуемого исторического источника / Ю. В. Нестерович // Архіварыус. Зб. нав. паведамл. і арт. — Вып. 10. — Мінск: НГАБ, 2012. — С. 78–86.
17. Грицкевич, В. П. Теория и история источниковедения. Пособие для студ. гуманит. факульт. / В. П. Грицкевич, С. Б. Каун, С. Н. Ходин. — Минск: БГУ, 2000.
18. Нестерович, Ю. В. Базисная теоретическая схема информологии и экспликация понятия документированной информации / Ю. В. Нестерович // Научно-техническая информация. Сер.1. — 2013. — № 10.
19. Тихонов, В. И. Принципы архивного хранения электронных документов / В. И. Тихонов // Вопросы архивоведения. — 2004. — № 3–4.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 27.01.2014

Н. У. Сліж

Тастамент гарадзенскага радцы Фёдара Багдановіча 1640 г.

На сённяшні дзень вывучэнне дакументаў апошняй волі мяшчан Рэчы Паспалітай прадстаўлена шматлікімі публікацыямі [1]. Тастаменты гарадзенскіх мяшчан таксама разглядаліся ў гістарыяграфіі [8; 19; 24; 25; 27; 31]. Пры даследаванні дакументаў першай паловы XVII ст. намі аналізаваўся тастамент гарадзенскага радцы Фёдара Багдановіча. Аднак яго змест настолькі вылучаецца сярод іншых падобных крыніц, што варты асобнай даследчыцкай працы і публікацыі [27, s. 306–312, 314].

Тастаменты з'яўляюцца важнымі гістарычнымі крыніцамі, якія прадстаўляюць шырокі спектр фактаў — ад рэлігійнага жыцця асобы да сацыяльных і палітычных з'яў у грамадстве. Аднак з-за таго, што яны мелі вызначаны фармуляр, часам цяжка адрозніць прынятую схему ад асабістай інфармацыі пра асобу [30].

Тастаменты адносяцца да прыватна-прававых дакументаў. У ВКЛ яны рэгуляваліся практыкай і Статутамі. Першыя артыкулы з указаннем парадку напісання тастаментаў былі ўключаны ў Статут 1529 г. Асобны раздзел, прысвечаны гэтаму віду дакумента, з'явіўся спачатку ў Статуце 1566 г. (раз. 8), а пасля дапрацоўваўся Статутам 1588 г. (раз. 9) [23; 31, s. 31–35]. Аднак у гарадах з магдэбургскім правам мяшчанскія тастаменты складаліся па Вейхбільду (Ius municipale) і Саксонскаму

[1] Гістарыяграфію па дадзенай тэматыцы гл.: [4, с. 9–17].

люстру (Speculum Saxonum) [2]. Апошні звод утрымліваў артыкулы па спадкаемстве, але не тычыўся тастаментаў, таму Вейхбільд быў асноўным прававым дакументам. Артыкул LXV вызначаў, што апошняя воля абвяшчалася ў здаровым розуме, пры 7 сведках, жонцы і нашчадках. Тастамент маглі засведчыць паўнавартасныя асобы, але не дзеці, жанчыны, глухія, нямыя, праклятыя, баніты. Тастастар / тастатарка мелі права размеркаваць маёмасць са згоды мужа (жонкі) і нашчадкаў. Адносна мужа або жонкі гэта дзейнічала, калі былі сумесныя ўладанні. У тастаменце фіксаваліся дарэнні, пазыкі, размеркаванне маёмасці.

Тастаменты XVII ст. складаліся пад уплывам свайго часу і былі неабходным элементам падрыхтоўкі да смерці. У сувязі з гэтым у іх прысутнічаў рэлігійны элемент [30]. Акрамя таго, гэты від складае адну з частак пісьмовай культуры мяшчанства і дапаўняе ўяўленне аб парадку вядзення справаводства ў канцылярыі [16].

Практыка права ў Гарадзенскім магістраце дазваляе казаць, што мяшчане вусна вызнавалі тастаменты пры ўраднікаў ці складалі іх самі. У апошнім выпадку дакумент пісаўся пісарам ці самім мешчанінам, замацоўваўся пячаткамі і подпісамі сведак, а пасля смерці актыкаваўся ў войтаўска-лаўніцкай кнізе. Паколькі большасць мяшчан была неадукаванай, то дамінавала першая форма выказвання апошняй волі [27].

Радца Фёдар Багдановіч належаў да мяшчанскай эліты, меў уплыў на сітуацыю ў горадзе. Таму для поўнай характарыстыкі гэтай асобы ў працы прадстаўлены яго паходжанне, тастамент і лёс дзяцей.

Паходжанне Фёдара Багдановіча. Фёдар Багдановіч паходзіў з сям'і гарадзенскага бурмістра Багдана Міхайлавіча і Маланні Пархвенаўны Грынашкевічаўны. Маці запісала Фёдару 3 валокі зямлі ў сяле Манчына ў 1619 г. і дом пры Прачысценскай царкве [9, спр. 1, арк. 152]. Сям'я была праваслаўная. У першай палове XVII ст. у асяроддзі мяшчан ВКЛ яшчэ працягваўся працэс фарміравання прозвішчаў, пераважна патранімічных. Так, імя па бацьку Фёдара, якое пішацца ў дакументах як Багдановіч або Багданкевіч, для яго нашчадкаў стала ўстойлівым прозвішчам з варыянтам напісання Багдановіч.

Пра Багдана Міхайлавіча захавалася не вельмі шмат звестак. У 1574, 1575 гг. ён фігураваў на пасадзе лаўніка [7; 17, sygn. 260, spr. 37, 59], у 1592, 1596 гг. — бурмістра [10, спр. 13, арк. 720–721], у 1599 г. — радцы [12, спр. 77, арк. 508 адв.]. У 1596 г. падаў у Гарадзенскі земскі суд пацвярджэнне фундацыйнага запісу для шпіталя пры Прачысценскай царкве, дадзенага Стэфанам Баторыем [1, с. 13–15; 10, спр. 14,

[2] Магістрацкія кнігі дазваляюць казаць, што лацінскай версіяй Вейхбільда і Саксонскага люстра карысталіся ў заходніх гарадах ВКЛ — Вільні, Коўне, Берасці, Гародні. Адносна іншых гарадоў ВКЛ патрабуецца даследаванне.

арк. 116 адв.–118]. Багдан класічна пачаў кар'еру з пасады лаўніка, а пасля здолеў стаць бурмістрам. Мяшчане, аднойчы патрапіўшы ў склад ураднікаў, заставаліся ў сферы кіравання да канца жыцця. Можна меркаваць, што прыкладна з 1570-х і да канца 1590-х гг. ён знаходзіўся на розных пасадах.

Багдан Міхайлавіч быў купцом і займаўся вывазам тавараў у Каралявец. У 1583 г. Ковенскі магістрат актыкаваў сведчанне каралявецкага купца Якуба Клені аб дастаўцы трох віцін з жытам. Дзве з іх належалі Багдану, а трэцяя — ковенскаму бурмістру Яну Дамініканіну. Рулявымі былі: на першай віціне бурмістра Мачуліс Бальчоіч, на другой — Юргіс Сплікойч, на трэцяй — Себасцян Жмойдзні. У дакуменце адзначалася пра недахоп двух лаштаў жыта [3].

Багдан забудаваў пляц на вуліцы Калючынскай, які пасля перайшоў яго сыну Фёдару [13, sygn. 306, k. 17]. Дачка Кацярына з нагоды заможнасці бацькі была выдадзена замуж за Якуба Якубавіча Гадлеўскага, шляхціча Лідскага павета. Яна ўнесла пасаг у памеры 200 коп літоўскіх грошаў. За гэта Кацярына 22 студзеня 1592 г. атрымала вена, як было прынята ў шляхецкім асяроддзі. Паводле Статуту ВКЛ 1588 г. яно складала 400 коп разам з прывенкам. Але са згоды яе бацькі і яе самой сума склала 200 коп і была запісана на маёнтку Казюлішкі Лідскага павета. Умовы гэтага вяноўнага запісу наступныя. Пасля смерці Я. Гадлеўскага нашчадкі павінны будуць выплаціць Кацярыне 200 коп. У выпадку яе ранейшай смерці і адсутнасці дзяцей у шлюбе пасаг вяртаўся бацьку, але пры наяўнасці нашчадкаў 200 коп адыходзілі ім. Кацярына не мела права самастойна адпісаць грошы без дазволу бацькі [4].

Такія шлюбы часам здараліся, бо па заканадаўстве ВКЛ, калі шляхціч жаніўся з мяшчанкай ці сялянкай, то яна і яе дзеці набывалі шляхецтва (Статут 1588 г., раз. 3, арт. 20). Заможныя мяшчане карысталіся гэтай магчымасцю, каб дзяўчаты мелі больш высокі статус і лепшы лёс, а таксама для наладжвання адносін са шляхецкім станам. Шляхту прывабліваліі багатыя пасагі мяшчанак. Міжаслоўныя шлюбы мелі месца ў розныя перыяды часу. Напрыклад, сын віленскага ваяводы і канцлера ВКЛ Мікалая Радзівіла — Станіслаў (пам. 1531), пенянскі і ўшпольскі староста, — ажаніўся з малодшай дачкой уплывовага і заможнага кракаўскага мешчаніна Якуба Бонера — Магдаленай [26]. У 1533 г. полацкі мешчанін Сямён Савіч быў жанаты з дачкой баярына Полацкага павета

---

[3] Каралявецкі купец склаў дакумент у прысутнасці гарадзенскіх мяшчан Грышкі Гранды, Івана Раманавіча 26 студзеня 1583 г. Імя яшчэ аднаго мешчаніна не атрымалася прачытаць з-за пашкоджанняў у дакуменце [29, арк. 18–19].

[4] Дакумент быў актыкаваны ў кнігах Лідскага суда 23 студзеня 1592 г., а 28 кастрычніка 1595 г. унесены ў кнігі Гарадзенскага земскага суда [10, спр.13, арк.720–721].

Марціна Проселка — Ганнай [3, с. 269]. Гарадзенскі мешчанін Ян Ілько выдаў сваю дачку замуж за шляхціча з Троцкага павета Івана Багдановіча Ворана (або Варону) [5].

Тастамент Ф. Багдановіча. Паходжанне ў многім вызначыла далейшы лёс Фёдара Багдановіча. Бацька здолеў даць яму добрую адукацыю. Фёдар валодаў старабеларускай, польскай і лацінскай мовамі. У Гародні займаў пасады лаўніка (1615), лентвойта (1627), бурмістра (1627, 1628, 1638), радцы (1617, 1633, 1639–1640) [6]. Па сутнасці, пачаўшы кар'еру лаўніка прыкладна ў 1615 г., Фёдар амаль да сваёй смерці быў у сістэме кіравання горадам.

Дакладная дата нараджэння Багдановіча невядома. Найбольш верагодна, што ён нарадзіўся прыкладна ў 1580-х гг., таму быў пахрышчаны ў веры грэчаскага закону. Адсутнасць дакументаў не дазваляе канкрэтна казаць, ці прыняў ён пасля яшчэ і ўніяцтва.

Найбольш поўную інфармацыю пра жыццё Фёдара Багдановіча прадстаўляе яго тастамент, складзены 12 ліпеня 1640 г. [гл. дадатак 1], актыкаваны ў войтаўска-лаўніцкі суд 8 жніўня 1640 г. [9, спр. 1, арк. 150–155]. Дакумент быў пададзены апекунамі: бурмістрам Стэфанам Гібулам, радцамі Станіславам Бельскім і Ярашам Высоцкім, сендыкам Адамам Цвіклічам. Выпіс атрымала жонка Марына Кішмановічаўна. Усе фармальнасці, неабходныя для законнасці тастамента, былі выкананы.

На момант напісання тастамента радца моцна хварэў, што і стала прычынай яго складання. Аб гэтым дадаткова сведчыць актыкацыя ліста куплі-продажу 16 ліпеня 1640 г. на бурмістраўска-радзецкім судзе. За Багдановіча дакумент падаў старшы лаўнік Войцех Болінскі. Фёдар прадаў Хведару Барсуковічу і яго жонцы Аўдоцці Селівонаўне за 60 коп літоўскіх грошаў палову валокі ў вёсцы Грандзічы, якую калісьці набыў у мешчаніна Ваўжынца Станіслававіча Казеневідовіча (23 чэрвеня 1640 г.) [9, спр. 1, арк. 147–148]. Хвароба часта выступала прычынай падрыхтоўкі да смерці, асабліва, калі доўгі час панавала над чалавекам. Хворыя часта складалі тастамент незадоўга да смерці. Радца, як і іншыя [31, s. 64], адзначыў, што няма нічога пэўнага як смерць. Акрамя таго, тастатар дэкларавaў, што дакумент складзены свядома і пры «здаровым розуме». Гэта згадка тыповая для многіх тастаментаў, бо надавала ім законнасць.

---

[5] Сведчанне з судовай справы 1539 г. [2, с. 15–16].

[6] Паколькі дакументы захаваліся фрагментарна, то перыяды знаходжання на пасадах могуць быць большыя. [9, спр. 1, арк. 1, 5, 12, 14, 18, 116 адв.-117адв., 144, 213 адв.–214 і інш.; 12, спр. 92, арк. 50; 17, sygn. 260, k. 1; 13, dz. XVIII, sygn. 307, k. 1; sygn.313, k. 27–32; 21, f. 16–207, l. 41].

Тастамент даволі разгорнуты і насычаны па змесце. Пачынаецца тыпова для свайго часу: «W imie Oyca y Syna y Ducha S. Amen. Jesus M(a)ria» [7]. Душу Багдановіч даручаў адзінаму ў Тройцы Богу. «Грэшнае цела» прасіў пахаваць па царкоўных абрадах у Прачысценскай царкве, якая на той час ужо была ўніяцкай. У гэтай царкве знаходзіўся сямейны склеп, дзе знайшлі спачын бацька, маці, жонка. Цела павінны былі ўбраць у блакітную фалендушовую дэлію, падшытую байкай, выпараўшы падшыўку і гузікі [31, s. 88]. На спачын душы прызначаўся саракавуст. Сваякі мусілі справіць абед для святароў і ўбогіх. На пахаванне прызначалася 60 злотых з продажу валокі ў Грандзічах. У выпадку недахопу грошай — прадаць 30 вазоў дроў і тарціцы каля 2 коп, а калі і гэтага не хопіць, то прадаць некалькі бочак збожжа. Дзве штукі зялёнага фалендуша для абіўкі сцен [8] прызначаліся на алтар Нараджэння Хрыста ў Прачысценскай царкве. Як вынікае з распараджэнняў, Багдановіч хацеў пахавання ў адпаведнасці са сваім статусам і заможнасцю. Гэта былі адны з самых вялікіх выдаткаў, згаданых у тагачасных мяшчанскіх тастаментах [27, s. 308]. Гарадзенскія мяшчане вельмі рэдка надавалі столькі ўвагі свайму пахаванню. Часцей проста выдаткоўвалі на яго грошы, зыходзячы са свайго матэрыяльнага становішча.

З войтаўска-лаўніцкай кнігі 1638–1644 гг. толькі ў гэтым тастаменце так падрабязна апісваліся пахаванне і выдаткі на яго. Таму тастамент Багдановіча больш падобны на шляхецкі, чым на мяшчанскі [9]. На той час у сям'і ўжо склаліся пэўныя рэлігійныя традыцыі. Іх не змяніў нават пераход Прачысценскай царквы ў падпарадкаванне ўніяцкаму мітрапаліту.

У дакуменце прасочваецца, што для Ф. Багдановіча важнае значэнне мела сям'я. Ён з цеплынёй і ўдзячнасцю згадвае маці. Багдановіч быў жанаты тры разы. Імя першай жонкі не адзначана. Шлюб адбыўся каля 1610 г. У ім нарадзіліся тры сыны — Пётр, Габрыэль і Мікалай. Другі раз радца ажаніўся з Агнешкай Лоеўшчанкай. Яны разам згадваюцца ў дакуменце за 1617 г. Чацвёрты сын Самуэль Ян паходзіў з гэтага шлюбу. Трэцяй жонкай стала Марына Кішмановічаўна. Яна была дачкой лаўніка (1638–1643) Даніэля Кішмановіча [9, спр. 1, арк 19 адв., 73 адв. і інш.]. У трэцім шлюбе нарадзіліся дзве дачкі — Агап'я і Аўдоцця. Старэйшы сын знаходзіўся на службе ў смаленскага кашталяна Юрыя Храптовіча. Самуэль Ян быў непаўналетнім. Бацька яго выправіў на адукацыю.

---

[7] Формула часта ўжывалася ў шляхецкіх тастаментах [31, s. 61].

[8] У XVII ст. сярод мяшчан было распаўсюджана дэкарыраваць сцены дамоў тканінай [15, s. 59–61].

[9] Параўнанне тастамента Ф. Багдановіча праводзіцца з тастаментамі гарадзенскіх мяшчан, якія зафіксаваны ў кнізе войтаўска-лаўніцкага суда за 1638–1644 гг. [9, спр. 1].

У тастаменце была просьба працягнуць яго вучобу. Найбольш верагодна, што ўсе сыны атрымалі адукацыю. Для мяшчан гэта мела важнае значэнне, бо дазваляла далей рабіць кар'еру ў магістраце.

Як вынікае з тастамента, з трэцяй жонкай склаліся добрыя стасункі. Падчас хваробы Фёдар атрымліваў ад яе дапамогу. Муж запісаў Марыне дом пры Прачысценскай царкве. Як добрую гаспадыню ён пакінуў яе кіраваць усёй маёмасцю да таго часу, пакуль яна не выйдзе замуж і да выплаты дзецьмі грошай. У трыманні Марыны былі дом у Манчыне з трыма валокамі (спадчына ад маці); там жа набытая Багдановічам Кахоўская валока; грунт, дзе засеяны шанак пшаніцы; 1,5 валокі, якія заставіў радцы мешчанін Ян Вінаградскі ў 40 коп літоўскіх грошаў [10]; палова валокі ў Грандзічах. У распараджэнне Марыны перададзена ўсё збожжа (авёс, ячмень, гарох і інш.). З гэтага яна павінна была выплаціць яго пазыкі і пазыкі маці, аплаціць працу чэлядзі. На жонку прыходзіліся хатнія рэчы (скрыня для захавання вопраткі, скрыня для воза, скрыня з шуфлядамі і інш.) і свойская жывёла. Дзеці мусілі выплаціць 100 злотых з валокі, што заставіў Вінаградскі. Акрамя таго, Марына атрымала 18 вулляў, якія Багдановіч трымаў разам з Гаўрылам Каленікам у Зарыцы. З іх ёй належала даваць воск Прачысценскай царкве. Дочкі заставаліся пры маці пакуль не выйдуць замуж. Сыны абавязваліся шанаваць Марыну і не перашкаджаць выхаду замуж за годнага чалавека.

У самым пачатку дакумента Багдановіч адзначыў, што маёмасць атрымаў ад бацькоў, затым павялічыў дзякуючы сваёй працы і спрыянню Бога. Таму важна было размеркаваць у сям'і спадчыну.

На ўсіх дзяцей Фёдара прыходзіўся пляц, забудаваны яго бацькам на вуліцы Калючынскай. Адным бокам ён межаваў з пляцам жонкі Войцеха Ліпоўскага, другім — з пляцам радцы Адама Паплаўскага, а «чолам на вуліцу». У 1617 г. Багдановіч і Агнешка Лоеўшчанка заставілі пляц у суме 244 коп літоўскіх грошаў (610 злотых) на год навагрудскаму зямяніну Паўлу. У 1623 г. ён перазаставіў яго гарадзенскаму мешчаніну Якубу Тынкоўскаму. Пасля смерці Тынкоўскага застава перайшла на Анастасію Каленкаўну і на іншых спадчыннікаў. Музыкант каралеўскай капэлы Міхаіл Хейварт і Ганна Гаўрошчанка выплацілі ёй і яе мужу Багдану Аляксеевічу 205 злотых. На гэтай падставе ў 1639 г. яны адмовіліся ад пляца. Акрамя таго, на гэтым пляцы Фёдар запісаў 100 злотых на гарадзенскі езуіцкі касцёл, якія ў 1641 г. выплаціў М. Хейварт. У 1644 г. на войтаўска-бурмістраўскім судзе Пётр адмовіўся ад сваёй часткі пляца на вуліцы Калючынскай на карысць М. Хейварта. За што атрымаў 100 злотых. Такім чынам Хейварт стаў асноўным яго трымальнікам. Падчас знаходжання пляца ў заставе будынкі на ім

[10] Валоку пазней выкупілі [11, арк. 89 адв.–90 адв.].

згарэлі. Пасля смерці музыканта згаданы ўчастак трымала Г. Гаўрошчанка, жонка М. Хейварта. Яна выплачвала з яго чынш па 20 злотых штогод. У 1673 г. Ганна стала заключаць кантракты на пляц, на што не мела права. Гэта стала повадам для скаргі Багдановічаў — Мікалая, Самуэля, Агаты і Аўдоцці. Праз год паміж імі распачалася судовая справа. Ганна Гаўрошчанка прадставіла дакументы, па якіх агульная сума запазычанасці склала 800 злотых. Яна патрабавала выплаціць грошы ці аддаць маёмасць у поўнае валоданне. Хоць Багдановічы спрабавалі зменшыць суму, суд прысудзіў выплаціць менавіта 800 злотых і трымаць у заставе да яе выплаты. Багдановічы выкупілі пляц і прадалі яго Людвіке Караліне Радзівілаўне за 1 350 злотых у 1678 г. [11] На той час ён межаваў з пляцамі радцы Войцеха Пятроўскага і мешчаніна Яна Дразда, выходзіў на вуліцы Калючынская і Залатая. У даўжыню пляц меў 44 сажані, а ў шырыню — 34 сажані [13, sygn. 306, k. 17; sygn. 307, k. 1–6, 9–10, 13–14, 17, 19, 21–23, 27–29, 31–44, 50; 9, спр. 1, арк. 124–124 адв., 357; 11, арк. 279–279 адв.].

У тастаменце падрабязна пералічваліся рухомыя рэчы, што дазваляе уявіць мяшчанскі побыт. Тастатар не меў наяўных грошай і золата. Большасць сярэбраных рэчаў (лыжкі, чарка і інш.) была застаўлена. З волава меліся вялікія міскі (13), паўміскі (10), прыстаўкі (9), талеркі, паднос для масла, жбаны з насамі (2), гарнец, біклагі (3) і інш. З медзі зроблены кацялкі (3), начынне для гатавання ежы (5), гарнец. З латуні — місы (2), кацялок, ліхтары (3) [12]. Сярод рэчаў з жалеза ў асноўным пералічваліся прылады працы — пілы, свідры, нажы, цесакі, малаток, абцугі, сякеры і інш. Акрамя гэтага, называліся такія рэчы, як ланцугі, свяцільнік для лучыны ў пякарні, крукі для вопраткі, вілы для кухні і інш.

Гэтыя рэчы добра прадстаўляюць мяшчанскую штодзённасць. Яны сустракаюцца і ў іншых гарадзенскіх тастаментах. У хатняй гаспадарцы для захавання і прыгатавання ежы мяшчане карысталіся вырабамі з волава, медзі і латуні. Срэбраныя рэчы сустракаюцца вельмі рэдка. Быў ва ўжытку і гліняны посуд, але яго не апісвалі. Рэчы, зробленыя з металу, каштавалі дорага, таму падрабязна апісваліся і перадаваліся па спадчыне [27, s. 309–310]. У шляхецкіх тастаментах такога падрабязнага апісання хатняга начыння амаль не сустракаецца.

У мяшчанскіх тастаментах часта згадвалася вопратка. Багдановіч пералічыў цёмна-блакітны фалендушовы даламан, падшыты зялёным

---

[11] Юрый Гардзееў памылкова напісаў, што пляц прадаў бурмістр Ф. Багдановіч [6, с. 153].

[12] Посуд з волава, латуні, медзі быў таксама распаўсюджаны сярод польскіх мяшчан [15, s. 83–86].

сукном; шапачкі (2); капенак [13]; блакітная дэлія, падшытая фалендушам. Вопратка размяркоўвалася паміж сынамі: Габрыэлю — капенак, Мікалаю — даламан, Пятру — каўпак, падшыты собалем. Пасцель заставалася пры жонцы Марыне, як і яе рэчы. Рэчы, якія засталіся ад першай жонкі, даўно ўжо былі зношаны. Апекунамі прызначаны ўраднікі — бурмістр Стэфан Гібула, радца Станіслаў Бельскі, радца Яраш Высоцкі і сендык Адам Цвікліч.

Акрамя рэчаў сямейнага і асабістага характару ў тастаменце сустракаецца інфармацыя, якая датычыцца гісторыі Гародні. Ён з'яўляецца адзінай крыніцай, дзе згадваецца званіца пры Прачысценскай царкве (радца быў вінен для яе 200 злотых). Яна намалявана на гравюры Адэльгаўзера-Цюндта 1567–1568 гг.

Багдановіч згадвае здарэнні, звязаныя з войскам ВКЛ, якое вярталася са Смаленскай вайны праз Гарадзеншчыну. Яго маёмасці ў Манчыне і Грандзічах была нанесена шкода на 136 злотых праз жаўнерскую харугву ротмістра Самуэля Камароўскага і паручніка харугвы Марціна Карскага [14]. У сувязі з гэтым Багдановіч прасіў магістрат улічыць яго страты.

Тастамент заканчваецца інфармацыяй аб месцы напісання і асобах, прысутных пры гэтай падзеі. Напісаны ён быў ва ўласным доме Багдановіча ў Манчыне. Прысутнічалі ўраднікі, якіх адправілі бурмістры Грыгор Варабеевіч і Стэфан Цвікліч, а менавіта радцы Ян Цвікліч і Станіслаў Цвікліч, лаўнікі Войцех Болінскі і Міхаіл Ліўчык. Дата напісання дакумента была пастаўлена на самым яго пачатку.

Тастамент паслужыў нагодай для скаргі Самуэля на брата Мікалая (12 мая 1672 г.). Па волі бацькі 4 валокі зямлі ў вёсцы Грандзічы прыходзіліся на дзяцей ад першага і другога шлюбу. Самуэль, будучы на той час маладога ўзросту, выправіўся на службу пасля смерці бацькі. Валокі засталіся пры старэйшым браце Мікалаі. Гэта дазволіла яму шмат часу імі карыстацца, а таксама заставіць частку зямлі. Акрамя таго, Мікалай трымаў пры сабе тастамент бацькі і не хацеў паказваць [9, спр. 2, арк. 298–298 адв.]. Вынік скаргі невядомы, бо звестак аб гэтай судовай справе не выяўлена ў кнігах войтаўска-лаўніцкага суда. Аднак яна сведчыць, што на гэты час жылі толькі два браты — Мікалай і Самуэль.

Лёс дзяцей Ф. Багдановіча. Паколькі дакументы захаваліся фрагментарна, то інфармацыю пра далейшы лёс дзяцей прадставіць цалкам немагчыма.

Пётр Багдановіч фігураваў на пасадзе лаўніка ў 1643, 1644, 1649 гг. [9, спр. 1, арк. 254–259, 271 і інш.; 14, k. 3] У 1644 г. на войтаўска-

---

[13] Кароткая апанча, распаўсюджана была ў XVII ст. сярод мяшчан [28, s. 93].
[14] Пра харугву гл.: [20, s. 90–91; 18, s. 334–339].

бурмістраўскім судзе Пётр адмовіўся ад сваёй часткі пляца на вуліцы Калючынскай на карысць М. Хейварта [13, sygn. 306, k. 17]. Памёр да 1672 г. Пра Габрыэля звестак не выяўлена.

Пра Мікалая захавалася больш інфармацыі. 16 ліпеня 1642 г. мяшчанамі Дзям'янам Радзівонавічам і Альбертам Іванішэвічам афіцыйна засведчана аб тым, што Мікалай Багдановіч, будучы родным братам Пятра, паходзіць з законнага шлюбу Фёдара Багдановіча і Агнешкі Лоеўшчанкі і належыць да грэка-каталіцкага веравызнання [9, спр. 1, арк. 81–81 адв.]. Як правіла, такія сведчанні мелі месца перад уступленнем у цэх ці перад заняццем пасады.

Мікалай Багдановіч фігуруе ў дакументах на пасадзе лаўніка ў 1659–1663 гг., радцы — у 1664–1676 гг. [15] У 1670 г. па справе кушнера Яхіма Івановіча супраць кравецкага цэхмайстра Яна Росчынскага аб збіцці і гвалтоўным зняцці кунтуша стары кравецкі цэхмайстр Мікалай Багдановіч сведчыў, што Іванович займаўся рамяством без упісання ў цэх. У ходзе следства высветлілася, што збіцця не было, а кунтуш Іванович пакінуў у заставе замест аплаты ўступнага [11, арк. 195–195 адв.]. У гэтым дакуменце пра Мікалая напісана, што ён стары кравецкі цэхмайстр. Гэта азначае, што ён быў краўцом і ў свой час кіраваў цэхам.

Мікалай Багдановіч быў жанаты з Зафеяй Пнеўскай. Яны прадалі ў 1670 г. бурмістру Адаму Цвіклічу за 300 злотых пляц, які атрымалі па тастаменце маці Зафеі — Кацярыны Пельчанкі, жонкі Аляксандра Карлоўскага [16]. Пусты пляц з піўніцай і агародам знаходзіўся на вуліцы Віленскай, межаваў з аднаго боку з пляцам бурмістра Адама Цвікліча, з другога боку — з пляцам канцлера ВКЛ Крыштафа Жыгмонта Паца [11, арк. 197 адв.–198 адв.].

Пра Самуэля Яна інфармацыя вядома з лістоў куплі-продажу і судовых спраў. Ён быў жанаты, але імя жонкі не называецца. Самуэль Ян набыў пляц з мураванымі склепамі і агародам на вуліцы Віленскай у гарадзенскага стольніка і пакаёвага ЯКМ дварaніна Юрыя Міхаіла Беніцкага за 480 злотых (1659). Надзел межаваў з аднаго боку з пляцам, які калісьці належаў Бурбе, а пасля перайшоў да радцы Тамаша Лагоўскага і яго нашчадкаў. З другога боку побач з ім пралягала вулачка, якая ішла ад вуліцы Віленскай да Рэзніцкай. Чолам (франтонам) забудова глядзела на Віленскую, тылам прымыкала да пляца Іваноўскай. У 1666 г. Самуэль

---

[15] Мікалай Багдановіч мог займаць на гэтых пасадах большы перыяд часу, але дакументы ў судовых кнігах заканчваюцца на 1676 г., а наступная кніга пачынаецца з 1689 г. [11, спр. 1, арк. 3–4 адв., 6–7, 8–9 адв., 86–86 адв., 206 адв.–208 і інш.; 9, спр. 1, арк. 411, 414].

[16] Тастамент быў напісаны ў 1660 г. У ім Зафея фігуруе пад прозвішчам Пальчанка [11, арк. 471–471 адв.].

Ян прадаў гэты пляц падкаморыю наваградскаму Міхаілу Абухоўскаму за 1 000 злотых [6, с. 141; 11, арк. 28–29 адв., 158–158 адв.; 22, p. 3–6].

У 1675 г. Самуэль Ян прадаў за 40 коп літоўскіх грошаў мяшчанам Юзафу Каленкевічу і Марыяне Лайкоўскай палову спадчыннай валокі ў сяле Манчына, якая межавала з аднаго боку з уладаннем Сымона Германкевіча, з другога — з уладаннем Марціна Карны [11, арк. 291–291 адв.].

Канфліктныя адносіны склаліся ў Самуэля з удавой Крыштафа Германкевіча — Кацярынай і яе сынам Сымонам Германкевічам. Яны абвінавачвалі Самуэля ў гвалтоўным забранні чвэрці валокі ў сяле Манчына 3 мая 1672 г. Ён паараў чвэрць валокі і межы вакол яе, а таксама пагражаў нанесці шкоду іх здароўю. Грунт быў дадзены Германкевічам па застаўным праве ад яго брата Мікалая ў суме 150 злотых. Багдановіч на суд не з'явіўся. Па рашэнні суда чвэрць валокі павінна заставацца ў скаржнікаў, а абвінавачаны бок быў абавязаны аплаціць шкоду за гвалтоўны напад. У гэтым жа годзе абодва бакі абвінавачвалі адзін аднаго ва ўзаемным нападзе. Са скаргі Кацярыны вынікала, што Самуэль збіў яе сына Якуба за горадам на дарозе. Ад смерці яго выратавалі два шляхцічы. У сваю чаргу Самуэль абвінавачваў Германкевічаў у ініцыяванні няслушнага судовага працэсу супраць яго аб збіцці Якуба, а таксама ў публічнай абразе Якубам на рынку. У войтаўскай кнізе зафіксаваны толькі скаргі, але адсутнічае судовы разгляд справы і адпаведнае рашэнне па ёй [9, спр. 1, арк. 296, 307, 319–319 адв.; 11, арк. 244 адв. – 245].

У войтаўска-лаўніцкім судзе ў 1664 г. разглядалася справа аб нанясенні ран Самуэлю Багдановічу гарадзенскім купцом Тамашом Чэніславам. Канчатковае рашэнне пра пакаранне ў судовай кнізе не зафіксавана [9, спр. 2, арк. 57].

У 1672 г. войтаўска-лаўніцкі суд быў вымушаны адправіць два бакі на выкананне прысягі з-за супярэчлівых паказанняў. Самуэль Ян і яго жонка праз свайго ўмацаванага (адваката) Барталамея Пастэўку патрабавалі ад Габрыэля Разумовіча і яго жонкі за збіццё выплаціць навязку ў суме 50 коп літоўскіх грошаў і 20 злотых у якасці кампенсацыі шкоды. Тамаш Адамовіч ад імя Разумовічаў сцвярджаў, што яны абараняліся ад Багдановічаў [11, арк. 237–237 адв.].

Дочкі Багдановіча Агап'я і Аўдоцця выйшлі замуж: першая за Марціна Карну, другая за Стэфана Стовейна. Яны са сваімі сужэнцамі фігуруюць у 1678 г. пры продажы спадчыннага пляца на вуліцы Калючынскай [13, sygn. 307, k. 27–29]. Акрамя таго, у 1675 г. Стэфан Стовейна і яго жонка Аўдоцця прадалі мяшчанам Аляксею Чашцы і Кацярыне Лапотнеўне за 80 злотых ¼ валокі ў Грандзічах, якая межавала з аднаго боку з уладаннем Міхаіла Грызеўскага, а з другога — з маёмасцю гарадзенскай Прачысценскай царквы [11, 290 адв.–291].

Звесткі, якія захаваліся пра дзяцей Ф. Багдановіча, дазваляюць казаць, што маёмасць была размеркавана паміж імі па волі бацькі. Дочкам не прызначалася асобных выплат на пасагі. Яны ўдзельнічалі ў падзеле разам з братамі. Гэта дазвалялася Саксонскім люстрам і Вейхбельдам.

Тастамент Ф. Багдановіча вельмі інфарматыўны. Ён мае важнае значэнне пры даследаванні гісторыі і генеалогіі гэтага мяшчанскага роду і яго ролі ў гісторыі Гародні. Дзякуючы дакументу атрымалася знайсці роднасную сувязь паміж бурмістрам Багданам Міхайлавічам і яго сынам Фёдарам. Акрамя таго, на працягу трох пакаленняў прасочваецца кар'ера прадстаўнікоў роду ў Гарадзенскім магістраце. Падобная тэндэнцыя таксама характэрна для радаводаў іншых гарадзенскіх мяшчан. Адукацыя давала магчымасць займаць пасады, але па прычыне значнага кошту была недаступна выхадцам з маламаёмасных станаў, што пазбаўляла іх шанцаў рабіць кар'еру.

Адзначым цікавую акалічнасць. Канфірмацыйным прывілеем Уладзіслава IV за 1633 г. сярод іншага ураднікам прадпісвалася пражываць у горадзе, а праваслаўным і пратэстантам забаранялася займаць пасады [5, с. 267–268]. Ф. Багдановіч быў праваслаўным або ўніятам і пражываў у Манчыне. Аднак гэта не пашкодзіла яму займаць пасады.

Варта адзначыць, што тастамент быў напісаны ў адпаведнасці з нормамі магдэбургскага права з выкананнем усіх неабходных фармальнасцей для надання яму прававой сілы.

Дакумент дае ўяўленне пра маёмасны стан сям'і. У параўнанні з іншымі гарадзенскімі мяшчанамі Багдановічаў можна аднесці да катэгорыі заможных: два дамы ў горадзе, дом і валокі ў Манчыне. Да таго ж у дакуменце праз пералік рухомых рэчаў добра прадстаўлены побыт. Для мяшчанскіх тастаментаў было звычайнай з'явай надаваць больш увагі маёмасці і яе размеркаванню. Але па сваёй структуры і зместу тастамент Багдановіча больш падобны да шляхецкіх, чым да мяшчанскіх.

У дадатку 1 прыведзены радавод сям'і гарадзенскага радцы Фёдара Багдановіча ў канцы XVI – сярэдзіне XVII ст. У дадатку 2 — тэкст тастамента, напісанага на польскай мове перыяду XVII ст. Пры транслітарацыі за аснову ўзяты прынцып палітарнай перадачы. Вынасныя літары пададзены курсівам. Прапушчаныя літары ў словах і скарачэнні раскрыты ў круглых дужках з улікам асаблівасцей тагачаснага правапісу. Нумарацыя старонак пазначана ў квадратных дужках.

Крыніцы і літаратура

1. Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею (далей — АВАК). — Т. 1. Акты Гродненского земского суда. — Вильна, 1865.
2. АВАК. — Т. 17. Акты Гродненского земского суда. — Вильна, 1890.
3. Беларускі архіў. — Т. 2. (XV–XVI стст.). — Мінск, 1928.

4. Білоус, Н. Тестаменти киян середини XVI – першої половини XVII століття / Н. Білоус. — Київ, 2011.
5. Галубовіч, В. Канфірмацыйны прывілей Гародні на магдэбургскае права 1633 г. // Гарадзенскі палімпсест. 2010. Дзяржаўныя і сацыяльныя структуры. XVI–XX стст. / В. Галубовіч; пад рэд. А. Ф. Смаленчука, Н. У. Сліж. — Мінск, 2011. — С. 255–269.
6. Гардзееў, Ю. Магдэбургская Гародня / Ю. Гардзееў. — Гародня– Вроцлаў, 2008.
7. Гродзенскі дзяржаўны гісторыка-археалагічны музей. Б/н.
8. Грыб, А. Тастамент гарадзенскага мешчаніна Барталамея Галоўчыца 1639 г. як крыніцы па гісторыі беларускага мяшчанства / А. Грыб, З. Яцкевіч // Гарадзенскі палімпсест XII–XX стст. Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі (Гародня, 7 лістапада 2008 г.) / Пад рэд. А. Ф. Смаленчука і Н. У. Сліж. — Гародня — Беласток, 2008. — С. 214–220.
9. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей НГАБ). — Ф. 1761. — Воп. 1. — Спр. 1. — Актавая кніга Гарадзенскага магістрата, 27.01.1638 — 01.11.1644 гг. — 249 арк.; Спр. 2. — Актавая кніга Гарадзенскага магістрата. 27.04.1660–25.11.1676 гг. — 433 арк.
10. НГАБ. — Ф. 1755. — Воп. 1. — Спр. 13. — Актавая кніга Гарадзенскага земскага суда, 07.01.1594–25.10.1596 гг. — 862 арк.; Спр. 14. — Актавая кніга Гарадзенскага земскага суда. 06.1596–12.1597 г. — 224 арк.
11. НГАБ. — Ф. 1800. — Воп. 1. — Спр. 1. — Актавая кніга Гарадзенскага войтаўска-лаўніцкага суда. 12.05.1659–02.10.1676 гг. — 310 арк.
12. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 77. — Прывілеі і пажалаванні, кніга пісараў Габрыэля Войны, Яраша Валовіча і Мацвея Войны. 1589–1595 гг.; Спр. 92. — Прывілеі, пажалаванні і пацверджанні. Сапраўдная кніга, змацаваная ўласным подпісам падканцлера Яўстафія Валовіча. 1615 — 1616 гг.
13. Archiwum Główne Aktów Dawnych (Галоўны архіў старажытных актаў, далей AGAD). — Archiwum Radziwiłłów. — Dz. XVIII. — Sygn. 306, 307, 313.
14. AGAD. — Zbiór Jodkowskiego. — Sygn. 7.
15. Bartkiewicz, M. Odzież i wnętrza domów mieszczańskich w Polsce w drugiej połowie XVI i w XVII wieku / M. Bartkiewicz. — Wrocław; Warszawa; Kraków; Gdańsk, 1974.
16. Bartoszewicz, A. Testament jako źródło do badań nad piśmiennością mieszczańską w późnim średniowieczu / A. Bartoszewicz // Kwartalnik Historii Kultury Materialnej. — 2011. — Nr. 3–4. — S. 293–302.
17. Biblioteka Uniwersitecka w Warszawie. — Gabinet rękopisów. — Sygn. 260.
18. Diariusz kompanii Smoleńskiej Władysława IV 1632–1634 / Oprac. M. Nagielski. — Warszawa, 2006.
19. Dubas-Urwanowicz, E. Pożegnanie z doczesnością Zygmunta Szulca, rajcy grodzieńskigo / E. Dubas-Urwanowicz // Miscellnea Historico-Archivistica. — 2000. — T. XI. — S. 243–246.
20. Kupisz, D. Smoleńsk 1632–1634 / D. Kupisz. — Warszawa, 2001.

21. Lietuvos mosklų akademijos Bibliotekas rankraščtų skyrius (Бібліятэка Акадэміі навук Літвы, аддзел рукапісаў). — F. 16. — Ap. 1. — B. 207.
22. Lietuvos Vaistybes istorijos archyvas (Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў). — F. 1282. — Ap. 1. — B. 4528.
23. Mikuła, M. Testament publiczny i prywatny w Statytach litewskich na tle praktyki prawnej / M. Mikuła // Prawo blisko człowieka. Z dziejów prawa rodzinnego i spadkowego / Pod red. M. Mikuły. — Kraków, 2008. — S. 177–193.
24. Pisanko-Borowik, A. Testamenty mieszczan grodzieńskich w XVII–XVIII wieku / A. Pisanko-Borowik // Studia Podlaskie. — T. XV. — Białystok, 2005. — S. 129–185.
25. Pisanko-Borowik, A. Dyspozycje pogrzebowe mieszczan grodzieńskich w świetle ich testamentów (XVII–XVIII w.) / A. Pisanko-Borowik // Małe Miasta. Religie / Red. M. Zemło. — Lublin-Supraśl, 2007. — S. 143–168.
26. Ptaśnik, J. Bonerowie / J. Ptaśnik // Rocznik Krakowski. — 1905. — T. VII. — S. 135–186.
27. Sliž, N. Testamenty mieszczan grodzieńskich w pierwszej połowie XVII w. / N. Sliž // Kwartalnik Historii Kultury Materialnej. — 2013. — T. 61. — Z. 2. — S. 305–316.
28. Turnau, I. Słownik ubiorów. Tkaniny, wyroby pozatkackie, skóry, broń i klejnoty oraz barwy znane w Polsce od średniowiecza do początku XIX wieku / I. Turnau. — Warszawa, 1999.
29. Vilnau Universiteto Bibliotekos Rankraščių skyrius. — Kauno magistrato aktų knyga, 1583–1591.
30. Wiszowata, K. Testament jako źródło historyczne / K. Wiszowata // Białostockie teki historycznie. — 2009. — T. 7. — S. 25–38.
31. Zielecka-Mikołajczyk, W. Prawosławni i unici w Rzeczpospolitej XVI–XVIII wieku wobec życia i śmierci w świetle testamentów / W. Zielecka-Mikołajczyk. — Warszawa, 2012.

Дадатак 1

Радавод Багдановічаў



Дадатак 2

1640.07.12. — Тастамент гарадзенскага радцы Фёдара Багдановіча

[150] Sąd Gayny wyłozony był odprawowany na Ratuszu Grodz(ienskim) przez Szlachetnych y Sławetnych PP. Marcina Grodkowskiego lantwoyta, Michała Liwczyka, Daniela Kiszmanowicza, Jana Adamowicza, Jerzego Bychnarza, Fiodora Jurewicza, Thomasza Łagowskiego ławnikow m(ia)sta JKM Grodna, roku 1640 die octima augusta.

Testament B. Bogdanowicza [17].

Przed ktorym sądem gaynym wyłozonym grodzien(skim) oblicznie stawaiąc Sławetny P. Stanisław Bielski rayca imeniem swoim y imienien takze Sławetnych PP. Stephana Gibulę burmistrza tegorocznie(g)*o* y P(an)*a* Jarosza Wysockie(g)

[17] Сказ дапісаны асобна іншым почаркам.

o rayce y P(an)*a* Adama Cwiklicza sendyka grodz(ienskiego) iako opiekunowie testamentowi pozostałey małzonki Paniey Ma(ria)nny Kiszmanowiczowny nieboszczyka Sławetnie(g)*o* P(an)*a* Fiodora Bohdanowicza raycy grodz(ienskiego) podał y przyznał ku zapisaniu do ksiąg testamentowych ławniczych grodz(ienskich) ten testament zachowuiąc w cale we wszystkich punktach clausuloch conditiach y paragrafach y pusząc aby był do act przyięty. Ktory wpisuiąc od słowa do słowa ta sie w sobie ma.

W imie Oyca y Syna y Ducha S. Amen. Jesus M(a)ria. Roku 1640 d(ie) 12 m(iesię) ca lipca. Ja Fiodor Bohdanowicz [150v] Rayca Grodz(ienski) w siele Maczynie mieszkaiący będąc od P. Boga Wszechmogące(g)*o* w Troicy S. Jedyne(g)*o* chorobą nawedzony lecz na rozsądku, baczeniu y umysle dobre zdrowy, to upaczywszy y na to sie rozmysliwszy widząc yz niemasz nic pewnego kazdemu człł(owi)ekowi na tym padole ziemie zyiącemu nad smierc y godzinę oney, widząc sie bydz bliszszy smierci, nizli zywota, upatruiąc tez to, isz mam z łaski Naywyszsze(g)*o* y z s(z)czobrobliwey łaski ie(g)*o* Przenaswiętszey maiętnosci tak ruchomey iako y nieruchomey częścią przeze mnie za staraniem moim a za łaską Naywyszsze(g)*o* nabytey, częścią po rodzicach moich miłych mnie legowaney y dziatkom mam miłym oddaney. Naprzod tedy tak zaczynam ten testament moy y wolą moią ostatnią ktorą wiecznie y nie odmienne miec chce. Dusze moią grzeszną P. Bogu wszechmogątemu w Troycy S. Jedynemu miłosierdziu ie(g)*o* nieprzebranemu w moc y ręce ie(g)*o* Przenaswiętsze poruczam. Cału moiemu grzesznemu pogrzeb przy cerkwi Soborowey S. Przeczystey Narodzienia P. Maryey w sklepie moim własnym gdzie godney pamięci rodzice moi lezą y małzonki moie. Ktory pogrzeb małzonka moia miła Maruchna Kiszmanowiczowna za daniem znac synowi moiemu starszemu na imie Piotrowi ktory służy u Je(g)*o* Msci P. Jerze(g)*o* Chreptowicza Kasztelana Smolenskie(g)*o* sprawic ma podług porządku chrzescianskiego y obrzędow cerkiewnych przy ktorym y po ktorym pogrzebie ma sie odprawowac służba Boza za dusze moią grzeszną tak ze y sorokoust iako y obiad dla kapłanow y ubogich tak y prz(yia)ciołł moich sprawiony bydz ma. Na ktory pogrzeb zło(tych) 60 u Chwedora Borsuka za puł włok ode mnie przedany nazwaney Kozierodowski w Grandziczach lezący naznaczam, a do te(g)*o* iestliby cze(g)*o* nie dostawało tedy z dobr moich ma bydz odprawowano, iako dr(o)wa ktorych iest na gumnie w gromadzie złozonych wozow 30, tak ze tarcic piłowanych ktore lezą pod swirnem [151] y przy gumnie wielkim kop 2 y tarcic 40. Te tedy tarcice w sązni 2 plus minus iako y dr(o)wa na gumnie złozone maią bydz dla prętsze(g)*o* grosza przedane y na pogrzeb obrocone. A w niedostatku iezeliby to nie wystarczyło tedy zboza kilka beczek przedac naznaczam a po odprawieniu słuszne(g)*o* ciałą moie(g)*o* grzeszne(g)*o* pogrzebu. Maiątnosc ta iest p(ie)n(ię)dzy gotowych nie mam, złota nie mam, srebra łyzek srebnych 9, z ktorych łyzek w zastawie 7, u P. Stephana Gibuły burmis(trza) 4 w kopach 6 litt, u P. Daniela Kiszmanowicza Oyca zony moiey łyzek 2 y czarka wewnątrz złocista valoris zło(tych) 10 w kopach 8 litt, u P. Michała Liwczyka łyzka 1 w kope litt od Pana Męskie(g)*o* przęcek 4 y zangiel y dziurek 2 srebnych na sznurku w szkatule. Pomienione łyszki ktore są w zastawie z dobr ruchomych wykupio-

ne bydz maią. Item cyna mis wielkich y srednich 13, pułmiskow 10, przystawek 8, dziewiąta mnieysza, talerzow cynowych pułtrzecia tuzina. Taca do masła, teyze cyny wiekich konwi 2 z nosami y trzecia koniew mnieysza takze z nosem. Item garniec cynowy gładki w garcy pultora, konew cynowa z rurą, połgarcowka 1 kwart 2 y puł quarty. Flasz 3, iedna w garcy pułtora 2ga, flasza w garniec, a 3cia w kwart 3. Miedzy, panewek [18] 5, większych 2, mnieyszych 3, kociołkow 2 ieden w wiadro, a drugi w puł wiadra, 3ci kocioł w ceber. Garniec miedziany w wiadro. Lichtarzow mosiądzowych 2, a 3ci z essem przybiany do sciany. Mozderz z kiicem. Miednic mosięznych 2, iedna większa, a druga mnieysza, a 2 złych małych, przy tym kociełek mosięzny mały nie dobry. Zelaza w sprzęcie domowy*m* to iest swidrow 2, ieden większy, a 2 małych, nozow osnych 3, ciesiel 2, pił 2 poprzecznych złamanych, do tych piłł napilnik 1, pilka 1 ręczna, piesznia 1 dobra, dynarow 2 pod kociołki, młotek 1 do zara nakowania, łancuchow [151 v] dwa, ieden wielki, 2gi mały, obcęgi 1, roznow 2, niewielkich siekier 3 dobrych w schowaniu, a 2 roboczych, sklut do ciesania drzewa 1, klamer 2, swiecilnik do łuczywa w piekarni 1, kosior 1 zelazny, hakow 2 zelaznych dla szat wieszania, wilkow para do kuchni zelaznych. Szaty, dołoman ciemnołazurowy falenduszowy, suknem zielonych podszyty nie nowy przy ktorym guzikow srebnych odlewanych czworograniastych białych 15, przy kolnierzu czaprazek 2, kopienak gozdzikowey farby dobry, suknem czerwonych podszyty przy nim guzow 6 złocistych, siodma czapraszka. Delia łazurowa baią błękiną podszyta falendyszowa, przy niey guzow 9 ze srzodku białe a na wierzchu złociste, dziesiąty kruczek alias hawtka. Ktorą delią pozywocie moim wyprowszy podszewkę y guzy odiąwszy na mie w grob włozyc maią. Synowi Gabryelowi kopienak gozdzikowy odiąwszy guzy, tak ze dołoman łazurowy synowi Mikałaiowi guziki odiawszy, a Piotrowi starszemu synowi kołpak łazurowy sobolem podzszyty, przy tym monety starey rozney w worku yrszanym mieszaney zło(tych) puł pięta y gr 7 litt. Ktore guzy od sukien 3, s tą monetą do łyzek dziewiąciu okupiwszy z chodoby moiey ruchomey maią bydz przyłączone y podług wagi słuszney zwazywszy synom czterem y corkom dwum tak pierwsze(g)*o,* wtore(g)*o* y trzecie(g)*o* małzenstwa prze ze mnie spłodzonych za rowno podzielic sie tym srebrem maią bez ukrzywdzienia zadne(g)*o*. Posciel wszytka ktora kolwiek iest y chusty białe, to małzonce moiey teraznieyszey P. Marynie Daniłownie Kiszmanowiczownie, gdzyz ona ią do mnie przyniosła. Pierwszey małzonki od lat 30 y więcey ta sie wniwecz obrociła, wtorey małzonki tę wszytką posciel y s chustami roznemi małzonce nieboszczyney oddał nic przy sobie nie zatrzymawszy. Item dom w miescie Grodnie na ulicy Kałuczynskiey oyczysty ktorym zostawiłł z nieboszczyką małzonką swą Jagnieszką Łoiewszczanską Je(g)*o* Msci P. Pawłowi Skorupie ziemianinowi krol(ewskiemu) Je(g)*o* Msci Woiewodztwa Nowogrodskie(g)*o* w summie pewney p(ie)n(ię)dzy w zło(tych) 610 [152] pol(-skich) ku pilney potrzebie swey ktore(g)*o* domu nie mogąc ia wykupic a do te(g)*o* isz po roznych osobach rozne legatia zaszły dziatkom moie spolnie spłodzonym

[18] Panew — вялікае плыткае начынне для гатаванне ежы.

troyca małzenstwa leguię y zapisuie wolni ony będzie ten dom w spomozeli onych P. Naywyszszy wykupic lubo li tesz na wiecznie puscic na ktory dom prawa wiecznosci należące przy mnie y inszych sprawach są w szkatule. Item dom z budowaniem wszelakim iako sie sam w sobie miałł y teraz ma na gruncie cerkiewnym przy cerkwi Soborowey S. Przeczystey ten małzonce moiey P. Marynie Daniłownie Kiszmanowiczownie leguie y zapisuie. O ktory dom powinna będzie prosic w Bodzie Wielebne(g)*o* Je(g)*o* Msci P. Xdza Mitropolita albo namiesnika Je(g)*o* Msci aby mogła byc ochroniona od wszelakich powinnosci y podatkow one(g)*o* y placu aby tak trzymała y one(g)*o* zazywała iako nieboszczka P. Matka moia y ja sam. Item dom moy własny we wsi Mączynie na gruncie włok 3 stoiący od nieboszczyki P. Matuchny moiey miłey P. Malaniey Parchwienowny Bordanowey Michałowiczowey burm(istrowey) grod(zienskiey) podług zapisu roku 1619 post festum visitationis B(eat)a Verginis Maria [19] proxima die quinta mensis Julii stałe(g)*o* y mnie synowie Chwedorowi Bogdanowiczu na wiecznosc z gruntem włok 3 przez P. Matuchne moią legowane(g)*o* y zapisane(g)*o* y sądownie przez urząd w intromissią podane(g)*o* y zawiedzione(g)*o*. Ktory to dom ze wszytkim na wszytko zabudowany w około ogrodzony dyłowaniem, tynowaniem opatrzony z odzynami, gumnami, stainiami, oborami, chlewami, ogrodami owocowymi, z gaiem dębowym w tyle stoiącym tak, iako sie zdawnych czasow miałł y teraz ma. Przy tym domu włok 3 pospołu we wszytkich 3 polach spolnie leżących, a mianowicie w polu sadzibnymm te pomienione włok 3 w Mączynie s konca w koniec zytem zasiane miedzy ktorym zytem ięczmienia beczki puł czwarty posiane(g)*o* iest przy tym włoka naswana Kochowska moia własna prze ze mnie Chwiedora na wiecznosc kupiona. Ta zasiana z konca w koniec zytem, a przy tym na teyze włoce w Mączynie lezacey szanek pszenice ozimey, posianey, a na zastawnych pułtoru włok [152v] tamze w Mączynie nazwane Zwierzynskie obok gruntu moie(g)*o* y od ogrodu y moie(g)*o* y tynu zagrodzone(g)*o* za stane az do granic zytem. Ktore to włok pułtory są zastawne od Jan Winogradkie(g)*o* czapnika mieszcz(anina) grodz(ienskiego) zięcia niegdy P. Zwierzykie(g)*o* w kopach 40 lidzby litt. Na ktore to włok pułtory zastawne są 2 listy pisane, a 3ci oblig tych 40 kop maią byc okupione podług zapisu. A przy tym puł włok w Grandziczach nazwany Kozierodowski zasiany zytem, na ktorym urodzay błahy, do te(g)*o* jarzyny posianey, na tym gruncie wyszmianowanym (rozney) naprzod jęczmiena beczek pułsiodmy, owsa beczek 28, jarki beczek 2, pszenice beczka 1, grochu beczka 1, gryki beczek 7, szocewice szanek, lnu szanek to wszytko zboze tak ozimne iaki y jarzynne małzonka moia P. Maryna Danielowna sprzątnąc ma y zebrac do gumna na ktore zebranie y porobienie o te(g)*o* zboża na robotniki zyta niemłocone(g)*o* w odrynie ci sie pokaze. Jęczmiena na przedaz beczek 7, owsa beczek 6 do przedania słod 1 na przedaz, a cze(g)*o* by nie mogło wystarczyc iako sam widzę za na to wiele potrzeba y ladaczem te(g)*o* nie porobic tedy to małzonce moiey poruczam. Ona sie powinna będzie starac o to wszytko iednak ma to sobie wszytko pisac na regestr aby od dzieci

[19] Пасля свята наведвання Блаславёнай Панны Марыі. Свята прыпадала на 2 ліпеня.

moich piersze(g)*o* małzenstwa nie miała żadney turbatiey za pokazaniem regestra na poty(m). Z tegoz gumna co P. Naywyszszy da taz małzonka moia powinna będzie oddac y zapłacic komu co będzie winna oddac, a ostatek te(g)*o* zboza s pola zebrane(g)*o* na obyscie domowe y roschod obrocono bydz ma, tak y czeladzi popłacic komu co będzie należało podług zasługi y myto zmowione(g)*o* do włłok pułszosty porządnie zytem zasiac ma przy tym. W tym domu sprzęt domowy iaki iest spizarni 2 slosarskiey roboty nieokowane, skrzynia biała okowana zelazem do schowania rzeczy. Item skrzynek 2 okowanych do chust chowania, skrzynia wozowa okowana, szkatuła w szuflady robiona roboty stolarskiey okowana. Sukna zielone(g)*o* lunduszu [20] do obicia sciany sztuk 2, ktore ma byc oddane do oltarza Narodzienia Panskie(g)*o* przy cerkwi Soborney. A co sie tknie sprzętu domowe(g)*o* rozne(g)*o* iako są statki drzewniane w naczyniu rozn(ego) tak rolnym [153] iako y inszym tan przy domie zostawac ma. Obora, bydła rozne(g)*o*. Naprzod wołow par 5 robotnych, krow doynych z cięlęzi 6, krow 2 bez cieląt, bydła rozne(g)*o* z padciołkami sztuk 92, owiec starych y młodych 40, konie 3 dwa roboczych, jeden szpakowaty, a 2gi wronny, klacz 2, a trzecia ze zrzebięcem, swini wielkich i małych 18, gęsi y kurow tych nie masz na co wspominac. Tę tedy maiętnosc moią ia tetator w wierzchu mianowany wszytką spisawszy oną rozporządzam. Naprzod długi ktore częscią dla częste(g)*o* przeyscia zołnierzow pod czas expedycyi roznych częscia dla nieurodzaiu przez lat wiele, częscią tez na zapłate robotnikow czasu zniwa dla te(g)*o* sie wszytkie(g)*o* nad nie rad musiałł ia dłuzyc to iest p(ie)n(ię)dzy należących cerkwi Soborney Przeczystey S. w miescie Grodnie na dzwonice zło(tych) 200, ktore są przy mnie od lat 14 od ktorych iest ia teres prze ze mnie testatora zapłacony za wszytkie lata na co y kwity są na ten tedy dług cerkiewny z tych zło(tych) 200 włokę gruntu nazwaną Kochowską puszczam zastawą gołą nie zasianą od oddania p(ie)n(ię)dzy przez dziatki moie za ktorąm sam dał zło(tych) 300. Item Oycy Czesnochreskiemu Swieszczennikowi zło(tych) 30 winen zostaie, te maią bydz oddane z gumna dobr moich. Item Szlachetney P. Andrzeiowey Smiarowskiey ray(czyney) grodz(ienskiey) winno zło(tych) 100 na oblig, na ktory dług tych zło(tych) 100 obligow 2 u P. Smiarowskiey, ieden na imie moie, a drugi z małzonka moią Maryna Danielowną dany na tosz zło(tych) 100, ktorym obligom obiema rok przypada oswiebodzenia na dzien Swięty Naswiętszey Panny Maryey Gromnic w roku da Bog przyszłym 1641 według nowe(g)*o* kalendarza. Item tey ze P. Smiarowskiey będzieli chciała przyiąc za te zło(tych) 100 winnych włoke zasiewku zytne(g)*o* s konca w koniec na włoce Kockowskiey tak nazwaney naznaczam, a nie będzieli chciała przyiąc tedy niechay czeka terminu opisu naznaczone(g)*o*. Z nowu P. Smiarowskiey winno zło(tych) 20 pol(skich) przeze mnie testatora wziętych w ktorych iest pas srebny ręka w ręka robiony, wogniwa bez rzemienia małzonki moiey Maryny Danielowny Kiszmanowiczowny, ktore małzonka tesz moia z tych ze dobr oddac ma y pas do siebie wziąc. Item P. Janowey Przyłuckiey [153v] kop 10 litt winno ktore te tedy długi przeze mnie testatora winny po-

[20] Folendusz.

płaciwszy z dobr moich ruchomych podług naylepsze(g)*o* wynalasku y rady dobrey Ich Msc PP. Prz(yia)ciołł moich nizey uproszonych y wpisanych tudziesz małzonki moiey Maryny bez uszczerbku maiętnosci y gruntu dziatkom moim z roznych małzenok spłodzonych to naprzod. Małzonce moiey miłey Marynie Danielownie Kiszmanowiczownie po ktorey ia wielkie dobroci ludzkosci usługowania pracy rozmaitey y uczciwosci małzenskiey iako na dobrą y cnotliwą przynalezało tak y w teraznieyszey chorobie moiey, w ktorey przez długi czas za nawiedzieniem P. Naywyszego cierzpie doznawszy oney to wszytko zawdzięczaiąc y zawdziaływaiąc okromia dziatek iey dwoyga za mną spłodzonych oney leguię y zapisuię zło(tych) pol(skich) 100 na włok pułtoru zastawnych obok gruntu moie(g)*o* od Jana Winogrodzkie(g)*o* czapnika y mieszcz(anina) grodz(ienskiego) nazwanych Czwierzynskie podług zastawy zapisowey ktore zło(tych) 100 maią iey bydz oddane przez dziatki moie, czasu wykupna do te(g)*o* pułwłok gruntu w siele Mączynie leżący, ktory iest przeze mnie zastawny u Konona Siemienowicza goły niezasiany w kopiach 20 litt. Ktory to pułwłok taz małzonka moia okupiwszy u pomienionego Konona z tey ze maiętnosci moiey ruchomey tey oney leguie y zapisuie na wiecznosc na ktory y prawa służące maią bydz oddane y wrocone na ten pułwłok przy tem pszczołł ulow 18 ktore są w siabrowstwie w siele Zarzycy u Hauryła Kalennika przysądu Horodnicze(g)*o* Grodz(ienskiego). Tedy te pszczoły małzonce moiey leguię. Od ktorych pszczoł wosk iako za zywota moi(g)*o* tak y po zywocie oddawac ma do cerkwie Soborowey. A przy tym teyze małzonce spokoyne uzywanie, szafowanie, dzierzenie we wszytkim iako gospodyni dobrzey do iscia zamąz naznaczam, ktorey na dobrą wołą puszczam ysc y nie isc w stan swięty małżenski oney to poruczam na uwagę, ktorey synowie moi pierwsze(g)*o* małzenstwa na imie Piotr, srzedni Gabryel y Mikolay takze y wtore(g)*o* małzenstwa Samuel zadney przeskody, krzywdy w namnieyszey rzeczy y trudnosci w rządzeniu gospodarstwa czynic nie maią, ale y owszem iako rodzicielkie szanowac, czcic powinni będą y to tesz waruie tą ostatnią wołą moią iezeliby synowie moi oney słuchac nie chciali y z nią sie nie [154] zgadzali, a trafił by sie oney czł(owi)ek dobry w stan małzenki tedy te(g)*o* tey bronic nie maią, ale y owszem pomocą oddawszy oney zło(tych) 100 legowanych, ktore są na zastawie włok pułtory, takze y pułwłok zastawy u P. Konona okupiwszy oney za nawiecznosc przeze mnie oddany y legowany puscie y oddac we wszytkich 3 polach powinne będę, za ktorym dosic uczynieniem przez syny moie ustąpic, s tey maiętnosci powinna będzie y sądzenie sie zrzec. A co sie do tycze corek 2 Ohapiey y Oudociey moiey z tą małzonką spłorzonych, ktore sobie dac rady y pomocy nie mogą, te do wzrostu lat przy małzonce moiey, a matce onych, chowac bydz maią tak ze u ruchome rzeczy iako cynę, miedz, srebro, ktore na nię s pzystoyne(g)*o* działu należą oddac w cale. Powinny będą y na wychowanue z części ich za prozuscią y uwaga PP. Opekunow testamentowych odemnie uzytych na kazdy rok pewną contentatią y szafowaniem oddawac maią z ich części od P. Matki ich ktorą w stanie panienskim iesliby P. Naywyszszy s te(g)*o* swiata powołac raczył do chwały Swey S. gdyz obiedzwie dosc nie wielkie są tedy za rowno część na mie iako na bracią tak na nich przynalezec ma takze tez y braciey

z nimi a jezeli im P. Naywyszszy doczekac dał lat dorosłych y stanu małzenskie(g)*o* wolno to będzie braci ich lub z czięsci działu rowne(g)*o* lubo za wynalaskiem ludzi onym spłacic godney pamięci P. Matuchny moiey Malaniey Parchwienowny Hrenaszkiewiczowny w ktorym maie synowi swemu zapisac raczyła y dziatkom moim ktore kolwiek za łaską Naywysze(g)*o* przeze mnie są spłodzone, ktory to zapis do dosic uczynienia przeze mnie podany przy małzonce moiey P. Marynie zostaie, a za dosic uczynieniem synom moim wrocic on powinna będzie. A co sie tycze syna Samuela wtore(g)*o* małzenstwa, ktory ieszcze niedorosły wychowania y nauki potrzebuie, one(g)*o* jako niedorosłe(g)*o* na ktoregom iuz na nauki wyzwolone przez lat 3 nakładałł, co tosz kosztem moim nie małym przychodziło tym ze PP. opekunom [154 v] testamentowym do uwagi y rozsądku poruczam ktory iezeliby sie chciał daley uczyc onemu podług moznosci y wystarszenia chudoby tak na wychowanie iako na odzieze nakładano bydz ma do rozumu wzięcia dalsze(g)*o* przy ty*m* tez Stanisławowi czeladnikowi, ktory od kilkanasciu lat domowi moiemu służy lubom onemu myto zmowione zawsze płaciłł przecie iednak pamiętaiąc na posługi one(g)*o* onemu, to mieszkanie w ktorym mieszka na włoce Kockowskiey nazwaney zenie y dzieciom ie(g)*o* z placem na pułstain przez wszytką włoke leguie y zapisuie wolne to mu będzie zienie dzieciom ie(g)*o* dac darowac zamieniac y komu inszemu puscic lubo by tez dziatkom moim podług słuszne(g)*o* targu puscic y to tez wnosze usilnie prozbę moią do Ich Msci PP. Burm(istrzow) terazneyszych y na potym będących tak ze PP. C(o)llegow moich oboiey ławice, sendykow, cechmistrzow y wszytkich obywatelow miasta KJe(g)*o* Msci Grodna takze y tuteysze(g)*o* sioła Mączyna y Grandzicz zem ponosiłł wielką szkodę w ubogiey chudobie moiey przez chorągwie zolnierską Je(g)*o* Msci P. Komorowskie(g)*o* rotmistrza usarskiego Wielmożne(g)*o* Je(g)*o* Msci P. Abramowicza Woiewodzica Smolenskie(g)*o* przez Marcina Karskie(g)*o* porucznika tey chorągwie iako prottia [21] w Grodnie uczyniena w roku 1635 opiewa tych wszytkich szkod ktorych sobie szacuie na zło(tych) 136, gdziem ia był na posługe miasta wszytkie(g)*o* iednaią kozakow zaporoskich, ktory zolnierze te(g)*o* z P. Komorowskie(g)*o* grożąc mi iakoby ia miał z woli im kozaki na miasto naprowadzic y msczą sie na mnie iedne(g)*o* przez dnie 4 stały we wszytkom siele. Za czym ia tedy unizenie proszę WM Mych Mwych Mwych PP. y łaskawych zawsze przeciwko mnie uprzeymemu słudze tę łaske pokazac raczyli aby scie tak moiey małzonce po mnie pozostałey iako y moim dziatkom łaskawe stawic raczyli y onych od wszelakich usług potocznych y podwod gdy zem to dobrze WM zasłuzyłł y szkody poniosłł niepoiednokroc uwolniły. O co y po dziesiąte prosze. Do te(g)*o* ieszcze y to małzonce moiey P. Marynie Danielownie Kiszmanowiczownie leguię y zapisuię y naznaczm ysz co kolwiek P. Naywyszszy dac raczy przypłodku z bydła rozne(g)*o* tedy iey częsc czwarta oddac powinna będzie za iey dzierzania y gospodarzstwa sprawy wszytkie tey maiętnosci służące wyiąwszy zapis P. Matuchny moiey [155] ktory do dosic uczynienia przy małzonce moiey zostawac ma. A synowi moiemu Samuelowi, gdy doro-

[21] Protectia (?).

В настоящее время я нахожусь в очень тяжелом положении, а также мое семейство. Несколько лет назад пожаром уничтожены у нас все сельскохозяйственные постройки, мертвый и живый инвентарь. Принужден устраивать все наново, не располагаю наличными средствами; существование мое в Самаре падает не выносимым бременем на мою семью, остающуюся без средств; несет убыток хозяйство; дети, воспитываемые в русском духе, отстранены от посещения школы. Все мои старания, получить должность здесь какую нибудь остались тщетными, средства мои исчерпаны.

В виду выше изложенного имею честь, покорнейше просить Ваше Превосходительство, оказать Ваше благоволение лояльному впрочем, русскому, православному семейству, не допускать разорения его и разрешить мне, вернутся обратно к моему семейству в Минскую губернию. Две гербовые марки, по 75 коп. достоинства каждая, при сем прилагаю. Вацлав Аполлинариевич Бидерман.

31. декабря 1914 года
Самара, Соловьиная ул. д[ом] № 33. Кв[артира] 2.
IV^{ой} полицейской части.

Источник: НИАБ. Ф. 295. Оп. 1. Д. 8629. Л. 93–93 об. Рукописный.

---

[1] Имеется в виду А. Ф. Гирс. *Гирс Алексей Федорович* (17.03.1871–11.02.1958, г. Париж, Франция) — из дворян г. Санкт-Петербурга, выпускник Пажеского Е. И. В. корпуса, с 05.08.1891 подпоручик лейб-гвардии Преображенского полка, с 05.08.1895 поручик (06.12.1895), с 16.05.1900 штабс-капитан (22.07.1900), с 23.02.1901 по 19.02.1903 состоял в запасе гвардейской пехоты по Санкт-Петербургскому у., с 01.03.1901 поневежский уездный предводитель дворянства и председатель Поневежского съезда мировых посредников Ковенской губ., камер-юнкер двора Е. И. В. (01.04.1901), коллежский асессор (15.06.1902), с 08.09.1902 почетный член Биржанского церковно-приходского попечительства Ковенской губ., с 01.04.1902 почетный мировой судья Поневежского округа, с 16.10.1904 по 28.10.1905 и.д. помощника одесского градоначальника, с 04.12.1904 председатель правления Одесского пожарного общества, с 14.05.1904 надворный советник (19.09.1905), с 28.10.1905 помощник одесского градоначальника, с 14.05.1905 коллежский советник (02.04.1906), с 12.08.1906 эстляндский вице-губернатор, с 28.04.1908 почетный мировой судья Ревельско-Гапсальского округа, с 14.05.1907 статский советник (30.06.1908), камергер двора Е. И. В. (06.12.1908), с 18.05.1909 и.д. киевского губернатора, с 06.12.1910 киевский губернатор, действительный статский советник (30.08.1911), с 26.11.1912 по 30.10.1915 минский губернатор, с 09.01.1913 постоянный член Высочайше учрежденной Междуведомственной комиссии по пересмотру врачебно-санитар-

ного дела в России, с 30.10.1915 по 1917 г. нижегородский губернатор, 02.03.1917 арестован большевиками, 07.03.1917 освобожден, эмигрировал в Эстонию, в 1924 г. переехал во Францию. В эмиграции занимал должности председателя Объединения бывших офицеров лейб-гвардии Преображенского полка и председателя ревизионной комиссии Союза дворян, состоял членом Комитета Общества взаимных кредитов, членом правлений Союза ревнителей памяти императора Николая II и Общества охранения русских культурных ценностей, возглавлял попечительский комитет Национальной организации витязей, в 1943 г. избран в приходской совет Свято-Александро-Невского собора в г. Париже, в 1952 г. выполнил декорации к балетам Жаннин Шара, участвовал в организации празднования 250-летия г. Санкт-Петербурга. Похоронен на кладбище Сент-Женевьев-де-Буа в г. Париже. Автор воспоминаний (переданы в архив Колумбийского университета, США). Кавалер орденов Св. Станислава 3-й ст. (09.04.1900), Св. Анны 3-й ст. (06.12.1903), Св. Владимира 3-й ст. (06.12.1913), Св. Станислава 1-й ст. (31.03.1915); французского ордена Почетного Легиона кавалерского креста и шведского ордена Вазы 2-го кл. (21.03.1909), сербского ордена Св. Саввы 1-й ст. (06.12.1912), гессенского ордена Филиппа Великодушного командорского креста 1-го кл. (15.03.1913).

[2] Имеется в виду минский № 4 пивоваренный завод «Богемия» братьев Лекерт, находившийся по Александровской ул. Основан в 1893 г. На 02.09.1914 завод имел пять паровых и электрических двигателей общей мощностью 40 лошадиных сил, 75 человек рабочих, годовая производительность составляла 350 000 руб. Склады завода находились в городах Вильне и Бобруйске. После Октябрьской революции 1917 г. завод национализирован и переименован в минский пивоваренный завод «Беларусь». С 1994 г. действует как ОАО «Пивзавод Оливария» и сегодня является одним из лидеров пивоваренной отрасли Беларуси.

[3] *Лекерт* (урожд. *Шлингензипен*) *Пауля-Аделия Юльевна* (*~1878 г.) — из ковенских мещан, жена владельца минского пивоваренного завода «Богемия» *Н. Ф. Лекерта*.

[4] *Соукуп Франц Францевич* (*~1860 г., Богемия) — чех, австрийский подданный, прав. вероисп., с 1889 по 1896 гг. работал на пивоваренном заводе «Шопен» в г. Вильне, с 1896 по 1910 гг. — на пивоваренном заводе Пупко в г. Лиде Виленской губ., с 1910 г. — на пивоваренном заводе «Богемия» братьев Лекерт в г. Минске, в 1914 г. получил разрешение остаться на проживании в г. Минске. Дальнейшая судьба неизвестна.

[5] Лекерт *Николай Францевич* (19.11.1872, г. Могилев-на-Днепре – после 05.01.1917) — бывший баварский подданный, минский купец 2-й гильдии (с 03.02.1903 по 30.05.1907 минский мещанин), рим.-кат. вероисп., проходил военную службу в германской армии старшим унтер-офицером 2-го уланского Баварского полка, с 30.06.1898 проживал в г. Минске, владел минским пивоваренным заводом «Богемия», с 1910 г. находился под подозрением в причастности к организации в России тайной военной разведки в пользу Германии, в июне 1916 г. по распоряжению командующего 10-й армией подлежал депортации во внутренние губернии России как потенциальный шпион, с 03.06.1916 вместе со своим тестем Ю. И. Шлингензипеном отбывал заключение в Минском тюремном замке,

29.06.1916 вместе с тестем депортирован в г. Иркутск в сопровождении околоточного надзирателя и двух городовых. Дальнейшая судьба неизвестна.

[6] Имеется в виду А. Ф. Гирс. *См. прим. 1 к док. № 1.*

[7] *Потоцкая* (урожд. *Бадени*) *Елена Станиславовна* (07.08.1877, д. Бранице, Глубчицкий пов., Опольское воев., Польша – 02.07.1963, г. Краков, Польша) — графиня, австрийская подданная, была замужем за графом *Домиником-Казимиром Станиславовичем Потоцким* (23.10.1877, г. Рыманув, Кросненский пов., Подкарпатское воев., Польша – 07.10.1939, г. Львов, Украинская ССР).

[8] *Европейская гостиница* (гостиница «Европа») — крупнейшая гостиница дореволюционного Минска, основана в середине 1880-х гг., в 1906–1908 гг. перестроена в стиле модерн, имела шесть этажей, принадлежала братьям Полякам. При гостинице действовали ресторан, парикмахерская, читальный зал. После 1917 г. гостиница преобразована в интернат, в 1925 г. вновь преобразована в центральную гостиницу Минского коммунального хозяйства, во время Великой Отечественной войны полностью уничтожена. В 2007 г. на месте гостиницы возведен респектабельный пятизвездочный отель «Европа».

[9] *Толлочко Юлиан-Витольд Эдвардович* (24.12.1864, Каменица – 04.05.1922, г. Варшава, Польша) — помещик Гродненской губ., был женат на графине *Эмилии Станиславовне Бадени* (07.04.1869, д. Бранице, Глубчицкий пов., Опольское воев., Польша – 11.03.1954, г. Вроцлав, Польша).

[10] Имеется в виду графиня *Цецилия Ксаверьевна Бадени*, урожд. *Скрыньская* (02.02.1848, г. Львов, Австро-Венгрия – 20.05.1932, г. Краков, Польша), была замужем за графом *Станиславом-Франциском-Павлом Михайловичем Бадени* (06.07.1834, д. Бранице, Глубчицкий пов., Опольское воев., Польша — 10.04.1910, г. Краков).

[11] *Потоцкая Цецилия-Мария-Ядвига (Целина) Доминиковна* (25.05.1900, д. Малые Бобровники Боярской вол. Волковысского у. Гродненской губ. – 17.11.1978, г. Краков, Польша) — графиня, была замужем за графом *Людвиком-Вавжинцом Станиславовичем Вершовец-Рэем* (1896 г., д. Посада Гурна, Кросненский пов., Подкарпатское воев., Польша – 24.05.1940, г. Пшецлав, Мелецкий пов., Подкарпатское воев., Польша).

[12] *Потоцкая Анна-Габриеля-Мария Доминиковна* (21.09.1909, г. Краков, Австро-Венгрия – 30.03.2009, г. Торонто, Канада) — графиня, была замужем за *Вацлавом-Антонием Иосифовичем Скарбек-Боровским* (13.06.1907, с. Минога, Краковский пов., Малопольское воев., Польша — 08.07.1984, г. Торонто, Канада).

[13] *Потоцкий Стефан Доминикович* (28.04.1911, г. Краков – 12.04.1987, г. Краков, Польша) — граф, потомства не оставил.

[14] *Бонна* (фр. bonne — няня) — воспитательница-иностранка при маленьких детях в состоятельной семье.

[15] *Ванькович Петр-Павел-Владислав Сигизмундович* (1866 – июль 1936) — дворянин Минской губ., рим.-кат. вероисп., владелец им. Великая Слепянка Минского у. (на 1914 г. — 3082 дес. земли), в котором в 1915 г. были расквартированы российские войска.

[16] *Воллович Михаил-Юзеф-Игнатий Генрихович* (*26.08.1862, двор Мстиж Борисовского у. Минской губ.) — дворянин Минской губ., рим.-кат. вероисп., владелец им. Мстиж (на 1914 г. — 4010 дес. земли).

[17] *Захарьевская ул.* находилась в пределах современных ул. Советской, площади Независимости и проспекта Независимости (до Центрального универмага).

[18] *Обронпальский (Обромпальский, Obrąpalski) Эммануил-Эразм-Юзеф Людвигович* (03.09.1859–06.01.1929, г. Варшава, Польша) — дворянин Минской губ., выпускник механического факультета Рижского политехнического университета (1885), с 1880 по 1883 гг. член академического сообщества «Arkonia», директор Минского общества взаимного кредита, владелец им. Юзефово Игуменского у. (на 1914 г. — 1124 дес. земли) и дома № 31 по ул. Захарьевской в г. Минске. Эмигрировал в Польшу, похоронен в г. Варшаве.

[19] Имеется в виду А. Ф. Гирс. *См. прим. 1 к док. № 1.*

[20] *Койдановский тракт* — сегодня ул. Чкалова.

[21] *Сергеев Левкий Сергеевич* — владелец дома по Койдановскому тракту в г. Минске.

[22] Имеется в виду А. Ф. Гирс. *См. прим. 1 к док. № 1.*

[23] *Гостиница «Одесса»* находилась в г. Минске на углу Захарьевской и Богадельной улиц, сегодня на ее месте расположен Центральный книжный магазин (просп. Независимости, 19).

[24] *Ленартович Владислав Иосифович* — уроженец Познани, поляк, германский подданный, управляющий имениями помещика М. К. Шабловского в Слуцком у. Минской губ., в августе 1914 г. арестован и заключен в Слуцкую тюрьму, в октябре 1914 г. депортирован в г. Оренбург. Дальнейшая судьба неизвестна.

[25] Имеется в виду воззвание Верховного главнокомандующего русской армией великого князя Николая Николаевича «К полякам» от 01.08.1914, согласно которому было обещано воссоединение всех польских земель под скипетром русского царя и возрождение Польши.

[26] Имеется в виду А. Ф. Гирс. *См. прим. 1 к док. № 1.*

[27] *Зенович Витольд-Давид Осипович* (*30.12.1858, двор Камёнка Игуменского у. Минской губ.) — дворянин Игуменского у., рим.-кат. вероисп., 25.02.1876 в Ярославской гимназии выдержал испытание на 1-й классный чин, с 01.10.1884 по 07.02.1886 служил по вольному найму в Минском губернском по крестьянским делам присутствии, 07.02.1886 зачислен в штат канцелярских служителей Минского губернского правления с откомандированием в Минское губернское по крестьянским делам присутствие, с 07.02.1888 коллежский регистратор (03.01.1889), с 07.02.1891 губернский секретарь (02.10.1891), с 07.02.1894 коллежский секретарь (15.11.1894), 24.10.1900 уволен от службы по болезни (с назначением пенсии в усиленном размере), на 09.09.1914 частный поверенный при Минском окружном суде и Виленской судебной палате. Дальнейшая судьба неизвестна.

[28] *Флессель* (*Flössel*, урожд. *Брежинская*) *Эрна-Шарлота-Лавра Вернеровна-Генриховна* (*Владимировна*, *27.10.1879, г. Рига Лифляндской губ.) — дочь рижского купца, ев.-лют. вероисп., вдова саксонского подданного, артистка, с 01.03.1906 проживала в г. Минске и работала воспитательницей детей у частного поверенного В. О. Зеновича, постановлением Минской казенной палаты от 07.03.1915 причислена к минским мещанам. Дальнейшая судьба неизвестна.

[29] Имеется в виду А. Ф. Гирс. *См. прим. 1 к док. № 1.*

[30] *Радзивилл Альбрехт-Антоний-Вильгельм Георгиевич* (30.10.1885, г. Берлин, Германия – 18.12.1935, г. Варшава, Польша) — князь, дворянин Минской губ. герба «Трубы», рим.-кат. вероисп., выпускник Пажеского корпуса (1906), камер-юнкер двора Е. И. В., владелец Несвижской и Клецкой ординаций, в годы Первой мировой войны основал Несвижский комитет общественной помощи христианским семействам и лицам, нуждающимся вследствие войны, и Несвижский местный комитет Российского общества Красного Креста, финансировал 1-й польский корпус генерала Ю. Довбор-Мусницкого, с февраля по октябрь 1919 г. подхорунжий 12-го полка польских уланов. Похоронен в г. Несвиже.

[31] *Досталь Генрих* (*~1865 г.) — австрийский подданный, рим.-кат. вероисп., доктор медицины, на протяжении 14 лет наблюдал за душевнобольным князем *Г. А. Радзивиллом* в г. Вене (Австро-Венгрия), на момент начала Первой мировой войны гостил в Несвижском замке, 28.07.1914 депортирован из г. Несвижа в Пермскую губ., 20.09.1914 получил разрешение вернуться в г. Несвиж, 20.01.1915 получил разрешение на переезд в Киевскую губ. по ходатайству княгини М.-Р. В. Радзивилл, урожд. графини Бранницкой (вдовы князя *Г. А. Радзивилла*). Дальнейшая судьба неизвестна.

[32] Имеется в виду душевнобольной и парализованный князь *Георгий (Ежи-Фредерик) Антонович Радзивилл* (11.01.1860, г. Берлин, Германия – 21.01.1914, г. Вена, Австро-Венгрия), который последние годы жизни провел в г. Вене под наблюдением доктора *Г. Досталя*.

[33] *Поклевский-Козелл Викентий Альфонсович* (1853 г. – август 1929 г., г. Варшава, Польша) — уральский промышленник, член Госсовета от торговли, финансист, владелец им. Талица Пермской губ. и 9000 дес. земли в г. Бобруйске Минской губ. Эмигрировал в Польшу, состоял членом правления Польско-Английского банка в г. Варшаве.

[34] Лазарет официально назывался *«Лазарет Красного Креста Марии Владиславовны, Доротеи Эдуардовны и Альбрехта Георгиевича князей Радзивиллов в Несвижском замке»* и состоял под заведыванием врача коллежского советника Ф. Л. Боровского, подчинялся непосредственно Главному управлению Российского общества Красного Креста.

[35] Имеется в виду А. Ф. Гирс. *См. прим. 1 к док. № 1.*

[36] *Фогель Николай Карлович* — коллежский советник, преподаватель немецкого языка Минского коммерческого училища.

[37] *Эргардт Вальтер* (*16.09.1895, г. Цюрих, Швейцария) — германский подданный, ев.-лют. вероисп., в 1903 г. прибыл в г. Минск вместе с отчимом и матерью,

обучался в Минском коммерческом училище, распоряжением и.д. начальника штаба Минского военного округа генерал-майора В. Н. Минута от 30.09.1914 подлежал выселению из Минской губ. Дальнейшая судьба неизвестна.

[38] *Чиханов Богдан Павлович* (*11.04.1864) — прав. вероисп., выпускник физико-математического факультета Императорского Санкт-Петербургского университета, 12.08.1888 зачислен в 147-й пехотный Самарский полк рядовым на правах вольноопределяющегося 1-го разряда, 01.09.1888 зачислен в одногодичное отделение военно-училищного курса Московского пехотного юнкерского училища, унтер-офицер (28.06.1889), подпоручик (10.08.1889), с 13.08.1890 преподаватель математики в 4–8 классах Вологодской Мариинской женской гимназии, 19.09.1890 зачислен в запас армейской пехоты, с 13.08.1890 коллежский асессор (03.12.1894), с 15.01.1895 учитель математики, физики и математической географии Люблинской мужской гимназии, с 13.08.1894 надворный советник (31.10.1897), с 13.08.1898 коллежский советник (12.03.1899), с 01.01.1903 штатный учитель математики и географии Варшавского реального училища, с 13.08.1902 статский советник (02.05.1903), с 01.08.1903 штатный преподаватель математики (с 01.11.1903 инспектор) Варшавского частного коммерческого училища Э. А. Ронталера, с 12.09.1905 по 1917 г. директор Минского коммерческого училища, 03.08.1906 уволен из запаса армейской пехоты, действительный статский советник (10.04.1911). Дальнейшая судьба неизвестна. Кавалер орденов Св. Станислава 3-й ст. (1899), Св. Станислава 2-й ст. (17.04.1905), Св. Анны 2-й ст. (1908), Св. Владимира 4-й ст. (1914). Автор работы «Элементы теории вероятностей: дополнительные статьи к курсу алгебры в восьмиклассных коммерческих училищах» (Минск: Электротипография И. Каплан, 1915. 23 с.).

[39] Имеется в виду А. Ф. Гирс. *См. прим. 1 к док. № 1.*

[40] Имеется в виду Я. А. Солтык. *Солтык Яхья Адамович* (*08.11.1867) — из дворян Волынской губ., магометанского вероисп., в 1885 г. окончил Новоградволынское 2-классное городское училище, 01.03.1888 зачислен в штат канцелярских служителей 3-го разряда Канцелярии киевского губернатора, с 16.04.1890 регистратор Канцелярии киевского губернатора, с 04.06.1892 и.д. младшего помощника (с 08.03.1898 младший помощник) правителя Канцелярии киевского губернатора, с 01.03.1898 коллежский регистратор (18.10.1898), с 27.11.1898 пристав 2-го стана Каневского у. Киевской губ., с 05.11.1899 пристав 1-го стана Васильковского у. Киевской губ., с 01.03.1901 губернский секретарь (10.08.1901), 28.09.1902 причислен к штату Киевского губернского правления, с 15.04.1903 младший (с 27.02.1904 старший) помощник правителя Канцелярии киевского губернатора, с 01.03.1904 коллежский секретарь (16.10.1904), с 24.07.1906 помощник васильковского уездного исправника, с 01.03.1907 титулярный советник (11.02.1908), с 10.12.1909 по 08.04.1913 помощник липовецкого уездного исправника, с 01.03.1910 коллежский асессор (08.11.1910), с 09.04.1913 по 31.03.1917 речицкий уездный исправник, с 01.03.1914 надворный советник (23.01.1917). Дальнейшая судьба неизвестна. Кавалер орденов Св. Станислава 3-й ст. (14.05.1896), Св. Анны 3-й ст. (06.12.1904), Св. Станислава 2-й ст. (06.12.1914) и Св. Анны 2-й ст. (30.04.1915).

[41] Германский подданный *Герман Карлович (Иоганович-Карлович) Метнер* (*1896 г.) подлежал отправлению этапным порядком в г. Елабугу Вятской губ.

[42] Имеется в виду А. Ф. Гирс. *См. прим. 1 к док. № 1.*

[43] Имеется в виду А. И. Солтан. *Солтан Амурат Иосифович* (*19.10.1862) — из дворян Минской губ., магометанского вероисп., выпускник Одесского пехотного юнкерского училища, подполковник (26.02.1905), с 12.02.1907 помощник начальника Минского губернского жандармского управления в Бобруйском, Слуцком и Новогрудском уездах, с 03.08.1914 и.о. полицмейстера м. Барановичи Новогрудского у., с 06.11.1914 помощник начальника Минского губернского жандармского управления в Минском, Борисовском и Игуменском уездах, полковник (22.03.1915), с 10.10.1916 по март 1917 г. начальник Вятского губернского жандармского управления. Дальнейшая судьба неизвестна. Кавалер орденов Св. Станислава 3-й ст. (1897), Св. Анны 2-й ст. (1905), Св. Владимира 4-й ст. (17.09.1906), Св. Владимира 3-й ст. (1915).

[44] *Разводовский Иван (Ян-Ламберт) Александрович* (1854 г., Минская губ. – 1930 г., г. Барановичи, Новогрудское воев., Польша) — граф, отставной подпоручик, в 1881 г. получил в наследство им. Барановичи Новогрудского у. Минской губ. (на 1914 г. — 222 дес. земли). Кавалер ордена Франца Иосифа (1881).

[45] *Бер Филипп Эрнестович фон* — барон, с окончанием Виленского пехотного юнкерского училища по 2-му разряду выпущен в 62-й пехотный Суздальский полк (1883), на 1896 г. поручик 63-го пехотного Уланского полка, вышел в отставку в чине штабс-капитана, надворный советник, с 1901 по 1913 гг. земский начальник 8-го уч. (м. Барановичи) Новогрудского у. Минской губ., с 1913 по 1917 гг. земский начальник 5-го уч. (м. Городыще) Новогрудского у. Дальнейшая судьба неизвестна. Автор записки «Об образовании Барановичского уезда (к вопросу об изменении границ уездов Минской губернии)» (Минск, 1913).

[46] Имеется в виду временно и.о. городского пристава поселений Барановичи и Разводово И. К. Коханов. *Коханов (Кохан) Иван Кондратьевич* (24.06.1882, с. Барщевка Гомельского у. Могилевской губ. – 10.11.1915, м. Разводово-Барановичи Новогрудского у. Минской губ.) — крестьянин д. Липки Волосевичской вол. Борисовского у. Минской губ., прав. вероисп., получил домашнее воспитание, в 1895 г. окончил Речицкое приходское училище, служил по вольному найму в Речицком уездном полицейском управлении, 13.03.1901 зачислен в штат канцелярских служителей 3-го разряда Речицкого уездного полицейского управления, с 12.02.1902 регистратор, а с 25.08.1904 столоначальник Речицкого уездного полицейского управления, с 21.01.1905 канцелярский служитель Минской губернской управы по делам земского хозяйства, с 08.11.1907 околоточный надзиратель Минского городского полицейского управления, с 31.01.1908 помощник частного пристава г. Минска, с 23.09.1914 временно и.о. пристава г. Новогрудка с откомандированием для заведования поселением Разводово-Барановичи Новогрудского у. (18.11.1914 утвержден в должности), в 1915 г. в Педагогическом совете Барановичского высшего начального училища выдержал испытание на производство в первый классный чин, 06.02.1917 посмертно произведен в коллежские регистраторы (с 20.02.1915).

[47] Имеется в виду А. Ф. Гирс. *См. прим. 1 к док. № 1.*

[48] *См. прим. 32 к док. № 6.*

[49] Имеется в виду А. Ф. Гирс. *См. прим. 1 к док. № 1.*

[50] *Лиман* — мелководный залив при впадении реки в море. В непосредственной близости от г. Одессы находилось семь лиманов (Андреевский, Хаджибейский, Клейн-Либентальский, Большой Аджалыкский, Григорьевский, Тилигульский, Днестровский), которые из-за обильного содержания на их дне лиманной грязи считались лечебными.

[51] 14.11.1914 минский губернатор в телеграмме вятскому губернатору сообщил о разрешении германскому подданному Л. И. Эверту возвратиться в Минскую губ. «как имеющему более 50 лет» (НИАБ. Ф. 295. Оп. 1. Д. 8628. Л. 65).

[52] Имеется в виду А. Ф. Гирс. *См. прим. 1 к док. № 1.*

[53] Имеется в виду А. Ф. Гирс. *См. прим. 1 к док. № 1.*

[54] Имеется в виду и.д. вятского губернатора А. Г. Чернявский. *Чернявский Андрей Гаврилович* (02.07.1867 — после 22.11.1937, г. Тбилиси?) — из потомственных дворян, окончил Новороссийский университет, с 1893 по 1900 гг. чиновник особых поручений при Черниговском управлении государственных имуществ, с 1902 по 1905 гг. правитель Канцелярии тифлисского губернатора, с 21.12.1905 по 10.05.1911 тифлисский вице-губернатор, с 10.05.1911 по 23.06.1914 тифлисский губернатор, с 23.06.1914 по 30.10.1915 и.д. вятского губернатора, действительный статский советник (1915), с 30.10.1915 по 15.08.1916 минский губернатор, с 15.08.1916 по 1917 г. екатеринославский губернатор, в 1919 г. киевский губернатор при генерале А. И. Деникине. В советское время проживал в г. Тифлисе со своей семьей, зарабатывал на жизнь написанием либретто к операм для оперного театра, в ноябре 1937 г. арестован и осужден Военной комиссией Верховного Суда СССР по Грузинской ССР, приговорен к расстрелу. Кавалер орденов Св. Владимира 4-й ст., Св. Анны 2-й ст., Св. Станислава 3-й ст.; персидского ордена Льва и Солнца 2-й ст., саксонского ордена Альбрехта Великодушного и командорского креста 1-го кл. со звездой.

[55] *Мирутко Антон Герасимович* — крестьянин Плещеницкой вол. Борисовского у. Минской губ., до начала Первой мировой войны нелегально выбыл на заработки в Пруссию, откуда в 1914 г. был депортирован российскими войсками в г. Вятку в числе военнопленных партизан. Весной 1915 г. главный начальник снабжений армий Юго-Западного фронта отказал крестьянину А. Г. Мирутко в разрешении вернуться в Борисовский у. Дальнейшая судьба неизвестна.

[56] Имеется в виду А.Ф. Гирс. *См. прим. 1 к док. № 1.*

[57] *Бидерман Вацлав Аполлинариевич* (*~1865/1868 г.) – уроженец Германии, поляк, германский подданный, рим.-кат. вероисп., с 1897 г. проживал в Минской губ., на 18.12.1902 арендовал фольв. Медведиха Витуничской вол. Борисовского у., в 1914 г. депортирован в г. Самару. Дальнейшая судьба неизвестна.

[58] Имеется в виду *Мария Александровна Бидерман* (урожд. *Чехович*), которая после смерти своего отца *А.-Л.-Д.Ф. Чеховича* определением Минской казенной

палаты от 05.08.1910 получила в наследство им. Небышино Борисовского у. (на 1914 г. – 102 дес. земли).

[59] *Чехович Александр-Леопольд-Доминик Флорианович* (~1839–11.07.1905) – дворянин Борисовского у., рим.-кат. вероисп., получил домашнее воспитание, владелец им. Небышино Борисовского у. (на 1890 г. – 738 дес. земли).

Артыкул паступіў у рэдакцыю 08.10.2014

Крыніцазнаўства

Г. Ю. Васіленка

Сведчанні гаспадарчай дзейнасці Боны Сфорцы ў пісьмовых крыніцах

Аграрная гісторыя заўсёды выклікала вялікую цікавасць у даследчыкаў. Асабліва гэта тычыцца зямельнай рэформы «Валочная памера» 1557 г., якая з'яўляецца адной з найбольш значных падзей у эканамічнай гісторыі Беларусі Новага часу. Гэта рэформа вызначыла шлях развіцця краіны амаль на тры стагоддзі наперад, заклала падмурак новых гаспадарчых адносін і павялічыла прыбытак дзяржаўнага скарбу ў некалькі разоў.

Трэба сказаць, што згаданай рэформе папярэднічаў эксперымент сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў, распачатых каралевай польскай і вялікай княгіняй літоўскай Бонай Сфорцай, жонкай караля Жыгімонта I Старога, і яе адміністрацыяй ва ўладаннях яе дамену, галоўныя маёнткі якога ў першай палове XVI ст. размяшчаліся на тэрыторыі заходняй часткі Беларускага Палесся, у Гарадзенскім павеце і інш. Дадзеная праблема, якая неаднаразова ўзнімалася ў працах У. І. Пічэты, М. В. Доўнар-Запольскага, М. Космана, В. Пацехі і іншых даследчыкаў [1; 2; 3; 4], дагэтуль не знайшла належнага асвятлення (манаграфій, прысвечаных ёй, няма).

Доўгі час мерапрыемствам па рэфармаванні велікакняжацкіх маёнткаў, праведзеным Бонай Сфорцай, не надавалася вялікае значэнне ў гістарыяграфіі дарэвалюцыйнай Расіі і Савецкага Саюза, у тым ліку і Беларусі. Правядзенне «Валочнай памеры», увядзенне фальварачнай сістэмы кіравання гаспадаркай, верыфікацыя правоў шляхты і падданых на зямлю і іншыя сельскагаспадарчыя і прававыя рэформы пачалі здзяйсняць у Кароне Польскай і Падляшскім ваяводстве ВКЛ ужо ў 1520-я–1530-я гг. Але трэба ўлічваць той факт, што каралева адной з першых пачала выкарыстоўваць гэтыя новыя эканамічныя прыёмы на тэрыторыі сучаснай Беларусі, у маёнтках свайго дамену. Галоўная заслуга Боны —

стварэнне функцыянальнай сістэмы пераводу эканомікі з натуральных на таварна-грашовыя адносіны, што паўплывала на павелічэнне даходу з рэфармуемых маёнткаў.

Гаспадарчая дзейнасць каралевы пакінула пасля сябе багатую крыніцазнаўчую базу для даследчыкаў-гісторыкаў. Панарама крыніц, якія існуюць для вывучэння гэтага боку жыцця Боны Сфорцы, прадстаўлена рознымі спецыфічнымі відамі дакументаў і матэрыялаў. Сярод іх можна вылучыць крыніцы, апублікаваныя ў наступных зборніках дакументаў і матэрыялаў: «Акты, издаваемые Виленскою комиссиею для разбора древних актов», «Акты, относящиеся к истории Западной России», «Белоруссия в эпоху феодализма», публікацыі Метрыкі ВКЛ і інш. [5; 6; 7].

Асаблівую цікавасць у папярэдняй гістарыяграфіі выклікала рэформа 1552–1555 гг., праведзеная ва ўладаннях каралевы на тэрыторыі Беларусі. Па меркаванні некаторых аўтараў, у тым ліку і У. І. Пічэты, яна з'яўлялася правобразам аграрнай палітыкі ў ВКЛ, якую праводзіў сын Жыгімонта I Старога і Боны Сфорцы Жыгімонт II Аўгуст. Лічыцца, што менавіта на яе вопыт абапіраўся кароль, калі праводзіў зямельную рэформу «Валочная памера», што была распачата ў 1557 г. [1].

Асноўнай апублікаванай крыніцай, што змяшчае апісанне рэформы 1550-х гг. ва ўладаннях Боны, з'яўляецца «Уволочное измерение Пинского и Клецкого княжеств…», якое ў айчыннай гістарыяграфіі больш вядома над назвай «Писцовая книга…» [8]. Гэты дакумент быў складзены ў выглядзе пісцовай кнігі пінскім старастам Станіславам Хвальчэўскім. Кніга ўтрымлівае багаты факталагічны матэрыял і ўяўляе сабой справаздачу аб размежаванні зямель на валокі ва ўладаннях каралевы.

Тут можна знайсці поўны пералік зямель і павіннасцей, якія з іх вызначаліся, апісанне гарадоў, вёсак, маёнткаў і мястэчак (напрыклад, Мотыль, Нобель і Сіняўка), што ўваходзілі ў пералік уласнасці каралевы. Таксама змешчаны: 1) звесткі пра склад і характар абавязкаў прадстаўнікоў адміністрацыі каралеўскіх маёнткаў — ураднікаў, войтаў, дзясятнікаў, лаўнікаў і інш.; 2) звесткі пра надзел зямлі, які даваўся за службу; 3) звесткі пра сацыяльны, нацыянальны і рэлігійны склад насельніцтва такіх гарадоў, як Пінск і Клецк.

Важная частка гэтага дакумента — «Рэестр дзялення зямлі на валокі» («Regestr pomierzania ziem na włoki»). З падачы У. І. Пічэты ў айчыннай гістарыяграфіі ён вядомы пад назвай «Устава Боны» [8, с. 3–5]. Напісаны ў выглядзе асобных палажэнняў для рэвізораў. Тэкст дакумента мае даволі абстрактны характар, таму што канкрэтныя дэталі правядзення рэформы, па задуме арганізатара, аддадзены на водкуп мясцовай улады альбо ў асобае распараджэнне каралевы як вярхоўнай уласніцы зямель. Згодна з дакументам была ўведзена новая падатковая адзінка — валока. У тэксце ўставы таксама змешчана інфармацыя па непасрэднай канкрэ-

тызацыі павіннасцей, якія спаганяліся з адной валокі ў залежнасці ад якасці глебы.

Тэкст яшчэ адной часткі дакумента, названай «Рэестр замен» («Regestr otmen»), прысвечаны апісанню дзеянняў па «заменах» адных зямельных участкаў іншымі [8]. «Замена» як гістарычны тэрмін азначае канкрэтны зямельны ўчастак, які даваўся ўласніку ў абмен на адзін альбо некалькі яго ўчасткаў з мэтай ліквідацыі цераспалосіцы і акруглення зямель каралевы падчас правядзення зямельнай рэформы ў яе ўладаннях, а таксама для больш зручнага размежавання каралеўскіх зямель з царкоўнымі і прыватнымі ўладальнікамі.

Важным мерапрыемствам рэформы было вызначэнне якасці глебы у тых ці іншых населеных пунктах. Грунт мог быць прызнаны добрым, сярэднім ці дрэнным («прэдні», «сярэдні» ці «подлы», згодна з тагачаснай тэрміналогіяй). Яго памер падчас ажыццяўлення замен, у залежнасці ад якасці, мог быць большым або меншым. Калі абмен не мог быць выкананы на раўназначных умовах з-за мясцовых асаблівасцей, то ўласнік мог атрымаць значна большую колькасць зямлі для апрацоўкі, але параўнальна горшай якасці. У адваротным выпадку зямельны надзел мог быць меншым, але з грунтам лепшай якасці.

Адным з найбольш важных відаў гістарычных крыніц са звесткамі аб гаспадарчай дзейнасці каралевы з'яўляюцца лісты і ўставы Боны, адрасаваныя насельніцтву валасцей або дзяржаўцам і старастам, выдадзеныя ў адказ на скаргі насельніцтва. Уставы Боны выступалі як дадаткі да тэкстаў (напрыклад, «Рэестр замен»), так і ў выглядзе самастойных актаў. Яны складаліся ад імя Боны і з'яўляліся дакументамі, якія вызначалі формы і памеры рэнты, рэгулявалі гаспадарчае і грамадскае жыццё ва ўладаннях. Сустракаюцца рэкамендацыі аб парадку і правілах збору павіннасцей, умовы карыстання грамадскімі землямі і інш.

Важнае значэнне для вывучэння гаспадарчай дзейнасці Боны маюць сялянскія «скаргі». Гэтыя дакументы зыходзілі непасрэдна ад імя феадальна- залежнага насельніцтва. Шляхам скаргаў сяляне гэтых уладанняў рэалізоўвалі сваё законнае права звяртацца да вярхоўнага ўласніка зямлі. Маёнткі Боны часта знаходзіліся ў поўным падпарадкаванні адміністратараў — староста, якія падчас трымання, для павелічэння даходнасці значна перавышалі ўстаноўленыя раней падаткі і павіннасці. Гэтыя скаргі з'яўляліся свайго роду формай барацьбы сялянства супраць павіннасна-падатковага ўціску. Такога права не было ў прыватнаўласніцкіх сялян. Выключэнне складаюць выпадкі іх скаргаў тым сваім землеўласнікам, якія здавалі ўладанні ў заставу ці арэнду.

Бона неаднаразова выдавала ўставы як асобным мясцовасцям, так і цэлым валасцям. Так, 5 верасня 1535 г. пасля неаднаразовых скаргаў насельніцтва Бона выдала дакумент пад назвай «Устава, данная короле-

вой Боной волостям Усвятской и Озерищской о платах и повинностях» [9, с. 32]. Гэты акт рэгуляваў адносіны паміж намеснікамі каралевы і жыхарамі асобных валасцей. Ён замацоўваў іх юрыдычнае становішча і фінансавыя адносіны з адміністрацыяй і скарбам. Для гараджан прапісваліся канкрэтныя абавязкі і павіннасці, якія існавалі здаўна (склаліся па «старыне»), з мэтай спыніць злоўжыванні аболецкага і ўсвяцкага дзяржаўцы. Але, нягледзячы на з'яўленне дакумента, злоўжыванні працягваліся. Тады каралева вымушана была выдаць «Лист королевы Боны державце оболецкому и усвятскому Кирдею Гричиновичу о старинных правах на выбор старцев волости Усвятской» [10], у якім ліквідавала права дзяржаўцы мець свайго прадстаўніка на тэрыторыі воласці. Так, было загадана адхіліць ад службы няўгоднага «старца», прызначанага раней К. Грычыновічам, а таксама згодна са старадаўнім звычаем вярнуць воласці самакіраванне, пры якім пасада старца з'яўлялася выбарнай для жыхароў названай мясцовасці [1, с. 142–143].

У Рагачоўскай воласці насельніцтва таксама скардзілася на злоўжыванні дзяржаўцы, у выніку чаго каралева выдала «Лист королевы Боны державце рогочевскому, данный по жалобе на него подданных села Лучинскаго о введенных здесь новинах» ад 1548 г. [11]. «Ліст» уяўляе сабой адказ каралевы Боны на скаргі жыхароў вёскі Лучын на рагачоўскага дзяржаўцу з-за новаўведзеных павіннасцей. Гэты дакумент вызваляў жыхароў ад некаторых павіннасцей, якія былі ўведзены дзяржаўцам без уліку «старыны». Але злоўжыванні працягваліся надалей, і тады каралева была вымушана 2 чэрвеня 1544 г. выдаць новую уставу, дзеянне якой было распаўсюджана на ўсю воласць цалкам: «Лист королевы Боны державце рогочевскому П. Пельжынскому о кривдах, причиненных им подданным с описанием волостной уставы» [12]. Гэта валасная ўстава замацоўвала павіннасці насельніцтва ў адносінах да дзяржаўцы «па старыне».

Насельніцтва абавязвалася штогод дастаўляць у замак «двенадцаць вепров» пры ўмове выкупу «по слушной цене» — прымальнай для жыхароў. Устава фіксавала памеры «…пересудов, децкования и вижевого». Было адменена палажэнне аб замене натуральнай павіннасці грашовымі выплатамі. Рагачоўская ўстава ўводзіла нават асобныя абмежаванні на паўнамоцтвы дзяржаўцы. Яму забаранялася: уводзіць прымусовыя работы асоб, «…которые на сторожу до замку приходят»; прызначаць цану за пакупку жывёлы; арганізоўваць гандаль у сёлах «…горелкой и мёдам…»; прымушаць насельніцтва даваць падводы для яго асабістых патрэб і інш. [1, с. 160–161].

Лісты і ўставы Боны, накіраваныя ў адрас пэўных сялянскіх валасцей, як правіла, мелі інфармацыйны характар, выдаваліся ад яе імя і адрасаваліся ўсім жыхарам воласці, прадугледжвалі некаторыя льготы ў

павіннасным ці падатковым абкладанні для іх членаў. У тых выпадках, калі ўставы і лісты Бона выдавала ў адказ на сялянскія скаргі, найчасцей аднаўлялася парушаная чыноўнікамі дзяржаўнай адміністрацыі «старына» і рабіліся заўвагі адміністрацыі, якая злоўжывала становішчам.

Даволі карыснай для даследавання азначанай праблематыкі з'яўляецца гістарычная крыніца «Ревизия пущ и переходов звериных…», складзеная гарадзенскім гараднічым Грыгорыем Багданавічам Валовічам у 1559 г. па выніках шматгадовай працы, распачатай яшчэ пры жыцці каралевы Боны. Яна ўтрымлівае надзвычай багаты матэрыял аб эканамічнай дзейнасці Боны Сфорцы на тэрыторыі ВКЛ. Тут прадстаўлены юрыдычныя ўзаемаадносіны Боны з канкрэтнымі прыватнымі асобамі, праваслаўным духавенствам, цэрквамі і манастырамі падчас ажыццяўлення гаспадарчага рэфармавання, а таксама кантакты ўласніцы зямель з пінскім старастам, якія аформлены ў выглядзе «наказаў каралевы» [13].

Яшчэ адзін збор дакументаў у выглядзе рэестра, складзенага да правядзення «Валочнай памеры», вядомы пад назвай «Писцовая книга бывшего Пинского староства, составленная по повелению короля Сигизмунда Августа в 1561–1566 годах пинским и кобринским старостою Лаврином Войною». Яго тэкст дае магчымасць даведацца, якія вынікі праз дзесяць гадоў мела згаданая рэформа на тэрыторыі Беларусі [14; 15]. Нельга не заўважыць і тое, што гэты рэестр у гісторыі Піншчыны меў некалі выключна важнае прыкладное значэнне. Ён выкарыстоўваўся ў тыя часы для юрыдычных мэт. На яго аснове феадальна-залежнаму насельніцтву рэгіёна выдаваліся даведкі аб граніцах фамільных зямельных уладанняў і межах панскіх маёнткаў.

Вялікая колькасць дакументаў па гісторыі ўладанняў каралевы Боны ў Вялікім Княстве Літоўскім знаходзіцца ў так званай «Літоўскай Метрыцы» (архіве Канцылярыі ВКЛ), якая захоўваецца ў Расійскім дзяржаўным архіве старажытных актаў у Маскве, а беларускім даследчыкам даступная ў выглядзе мікрафільмаў у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (фонд КМФ № 18). Частка кніг Метрыкі надрукавана, іншыя чакаюць сваёй чаргі. Акрамя асобных дакументаў вядома пяць кнігзборнікаў у складзе Метрыкі ВКЛ, дакументацыя якіх або датычыць маёнткаў Боны, або зыходзіць непасрэдна з яе Канцылярыі.

Першай кнігай у храналагічнай паслядоўнасці гэтай калекцыі з'яўляецца «Зборнік дакументаў, што маюць адносіны да ўладанняў каралевы Боны, за 1532–1534 гг.» [16]. Гэты збор гісторыка-эканамічных крыніц складаецца ў большасці з пацвярджэнняў правоў прадстаўнікоў дробнай шляхты на іх уладанні.

Наступны збор дакументальных крыніц, якія адносяцца да разглядаемай тэмы і надрукаваны, — «Кніга запісаў прывілеяў, дэкрэтаў, да-

рчых, прадажных актаў, узятых з іншых кніг Метрыкі па ўказанні каралевы польскай і вялікай княгіні літоўскай Боны ў 1541 г. (1387–1547)» [17]. У ім таксама, як і ў папярэднім, захоўваецца вялікая колькасць пацвярджэнняў правоў шляхты.

У складзе Літоўскай Метрыкі, акрамя вышэй адзначаных, змяшчаюцца тры зборы дакументаў, якія маюць назву «Метрыка Боны»: два з іх называюцца «Метрика королевы Боны: данины, декреты и листы поточные от року 1548 до року 1549» (апублікавана) [18] і з аналагічнай назвай за 1549–1553 гг. [18а], а трэці — «Метрика королевы Боны данин, потвержений и листов розных судовых и поточных. А особно спосродку пописано святост костельных и законницы. От року 1552 до року 1555 г.» [19]. Апошнія дзве яшчэ не выдадзеныя. Згаданыя зборы гістарычных крыніц уяўляюць сабой матэрыялы Канцылярыі Боны Сфорцы ў ВКЛ і змяшчаюць дакументы па кіраванні яе маёнткамі, адносінах каралевы са сваімі ўраднікамі і шляхтай. Пазней яны атрымалі агульную назву «Метрыка каралевы Боны». Вядома, што падчас жыцця каралевы Боны і пазней такі тэрмін не выкарыстоўваўся, а ўжываўся ў перыяд складання тытульных аркушаў да копій гэтых кніг у 1597 г., калі кнігі Метрыкі ВКЛ былі перапісаны па загадзе канцлера ВКЛ Льва Сапегі. У навуковы ўжытак згаданае азначэнне ўвёў С. Пташыцкі [20, с. 164]. «Метрыку каралевы Боны» можна разумець як самастойны архіў асобнай Канцылярыі Боны Сфорцы, які патрапіў на захаванне ў архіў Канцылярыі ВКЛ пасля яе ад'езду з Вялікага Княства Літоўскага і пераходу ўладанняў да Жыгімонта II Аўгуста ў 1556 г.

Асноўным зместам «Метрыкі каралевы Боны» з'яўляюцца прывілеі, граматы і запісы, якія яна атрымала на свае землі і гарады. Там таксама змяшчаюцца дакументы па кіраванні маёнткамі Боны, напрыклад, карэспандэнцыя каралевы Боны да сваёй адміністрацыі па гаспадарчых пытаннях. Перапіска дазваляе лепш зразумець сэнс некаторых рашэнняў, прынятых Бонай пры правядзенні гаспадарчых і сацыяльных мерапрыемстваў, даць рэальную ацэнку становішча ў маёнтках.

Да «Метрыкі каралевы Боны» С. Пташыцкі аднёс таксама «28-ю кнігу публічных спраў Літоўскіх (1509–1544)», якую можна лічыць самай інфарматыўнай сярод названых крыніц (цяпер захоўваецца ў Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве — AGAD ML IIIA 28). Дыпламатычная перапіска з Рымам, Неапалітанскім каралеўствам і Барскім княствам наконт маёмасці каралевы Боны ў Італіі змяшчаецца у «42-й кнізе публічных спраў Каронных (1539–1547 гг.)» (цяпер у AGAD ML IIIB 42).

Дакументы «Метрыкі каралевы Боны» да гэтага часу недастаткова выкарыстаны даследчыкамі ў сваіх працах і яшчэ чакаюць належнага ўводу ў навуковы ўжытак. У гістарычнай навуцы закраналіся толькі

асобныя аспекты дзейнасці Канцылярыі каралевы Боны, а поўнамаштабнай працы, прысвечанай «Метрыцы каралевы Боны», няма да гэтага часу.

Важнай крыніцай па гісторыі гаспадарчай дзейнасці Боны з'яўляюцца дакументы з актавых кніг гродскіх і земскіх судоў, куды пісцы ўносілі «рэляцыі» (данясенні) аб судовых працэсах [21–24]. Інфармацыя, што знаходзіцца ў актах і рашэннях судоў, вельмі карысная для вывучэння гаспадарчай дзейнасці Боны Сфорцы і дазваляе больш дэталёва разгледзець сельскагаспадарчыя адносіны ва ўладаннях каралевы. Абсалютная большасць актаў тычылася маёмасных інтарэсаў феадалаўземлеўласнікаў і складалася па іх ініцыятыве для вырашэння зямельных спрэчак.

У дакументах гродскіх і земскіх судоў можна сустрэць падлік уласнасці шляхціча, а таксама памер рэнты з залежнага насельніцтва. Інфармацыя з такога роду крыніц адрозніваецца ў залежнасці ад прычыны, па якой складаўся дакумент. Звычайна ў іх змяшчаюцца распараджэнні каралевы адміністратарам маёнткаў, ускосныя сведчанні аб гаспадарчай дзейнасці Боны Сфорцы (напрыклад, адзначаецца, што Бона выдае прывілей з пацвярджэннем) і г.д. [22, арк. 931–934].

Інструкцыі і распараджэнні Боны, распрацаваныя для адміністрацыі сваіх ўладанняў, звычайна дадаваліся да судовых актаў, хаця маглі існаваць і як асобныя дакументы. Сярод судовых пастаноў захаваліся гаспадарчыя інструкцыі як для розных уладанняў, так і для аднаго маёнтка за некалькі гадоў. Інструкцыі змяшчалі распараджэнні Боны наконт высвятлення межаў маёнткаў, праверкі дакументаў, захавання парадку адносін з падданымі па «старыне». У некаторых выпадках фіксаваліся распараджэнні ў адрас адміністрацыі. Інфармацыя ў такіх інструкцыях па аб'ёме звычайна невялікая, але вельмі змястоўная. Напрыклад, «прывілей Боны баярам Красоўскім ад 17 кастрычніка 1555 г.», у якім Бона дае распараджэнне «разыскаці рэестры па пісаванню войска 1538 г.», дзе пацвярджаецца, што Васіль Яцкавіч, Яўхім Ешкавіч і Савошын Ясевіч з'яўляюцца баярамі Красоўскімі. Пасля таго як дакументы былі знойдзены Бона выдае пацвярджэнне, якім загадвае «захаваць баяр Красоўскіх пры службе баярскай». Аналіз дакумента дазваляе высветліць характар гаспадарчых адносін у канкрэтным уладанні, у тым ліку ролю Боны і яе адміністрацыі ў жыцці маёнтка [23, арк. 863–866].

Часам у судовых дакументах сустракаецца прамая інфармацыя пра гаспадарчую дзейнасць Боны. Гэта залежыць ад розных фактараў: 1) прычыны складання судовага дакумента; 2) асобы пісара, які яго афармляў і інш. Так, у дакументах, складзеных з нагоды продажу, падзелу, арэнды маёнтка, можна знайсці інструкцыі з падрабязным апісаннем

зямель каралевы Боны або даведку пра тое, як адбывалася працэдура «замены» і інш. [23, арк. 996–998].

Пры рабоце з актавымі кнігамі земскіх і гродскіх судоў трэба ўлічваць той факт, што складаліся многія з іх у больш позні перыяд — у XVIII ст. Таму важна адзначыць ролю асабістага фактару. Напрыклад, пісар мог проста перапісваць старадаўні дакумент на права валодання, які шляхецкая сям'я трымала яшчэ з тых часоў, калі каралева Бона праводзіла праверку іх правоў. Найчасцей так і было — пісар пакідаў нязменным асноўны тэкст. Але ў некаторых выпадках ён мог уносіць невялікія змены (напрыклад, лічбавага характару ў выпадку змянення памераў надзелу зямлі шляхціча; айканімічнага або антрапанімічнага характару, калі змяняліся назвы населеных пунктаў або атрымлівалі новае гучанне прозвішчы і інш.).

Згаданымі абставінамі можна растлумачыць тое, што ў архівах нярэдка сустракаецца некалькі дакументаў, дата напісання якіх адрозніваецца некалькімі гадамі або прозвішчам некаторых удзельнікаў судовага працэсу, а змест амаль адзін і той жа. У некаторых выпадках пісар мог дэталёва апісаць уладанне, адлюстраваўшы змены, якія адбываліся ў першую чаргу ў сферы землеўладання і землекарыстання, а ў другіх дакументах гэтай інфармацыі не падаваць [24, арк. 777–778 адв.].

Інфармацыя пра парадак праходжання працэдуры замены і памеры зямель, пералік вёсак, якімі валодалі тыя ці іншыя прадстаўнікі шляхты рэгіёна, пералік прыватных уласнікаў, што трымалі землі «пад Бонай», апісанне парадку выплаты павіннасцей і збору падаткаў і некаторыя іншыя звесткі, змешчаныя ў такіх дакументах, з'яўляюцца надзвычай каштоўнымі для высвятлення сістэмы гаспадарання ў дадзеным рэгіёне [24].

Такім чынам, можна зрабіць вывад аб наяўнасці дастатковай крыніцазнаўчай базы, якая дазваляе правесці глыбокае вывучэнне гісторыі гаспадарчай дзейнасці Боны Сфорцы на беларускіх землях ў першай палове XVI ст. Для даследавання гэтага пытання надзвычай каштоўным з'яўляецца комплекс дакументаў, які захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі. Акрамя архіўных, важным прадстаўляецца і шырокае кола апублікаваных матэрыялаў, якія дазваляюць выявіць асноўныя накірункі трансфармацыі сельскагаспадарчых адносін у маёнтках Боны. Як ужо адзначалася, згаданыя пісьмовыя крыніцы даследаваны па дадзенай праблеме вельмі павярхоўна. Гэта, у сваю чаргу, дае падставы сцвярджаць, што акрэслены напрамак яшчэ чакае свайго даследчыка, які б змог комплексна, выкарыстоўваючы шырокую крыніцазнаўчую базу, а таксама працы як айчынных, так і польскіх гісторыкаў, асвятліць партрэт названай гістарычнай асобы і раскрыць сутнасць яе сацыяльна-эканамічных мерапрыемстваў. Тым больш, што яе жыццёвы

шлях і асабліва здзейсненае на тэрыторыі ВКЛ заслугоўваюць гэтага ва ўсёй паўнаце.

Крыніцы і літаратура

1. Пичета, В. И. Аграрная реформа Сигизмунта Августа в Литовско-Русском государстве. — Ч. 1. Подготовка и производство реформы / В. И Пичета. — М.: Синодальная типография, 1917. — 302 с.
2. Доўнар-Запольскі, М. В. Дзяржаўная гаспадарка Вялікага княства Літоўскага пры Ягелонах / М. В. Доўнар-Запольскі. — Мінск: Беларуская навука, 2013. — 759 с.
3. Косман, М. З гісторыі і культуры Вялікага княства Літоўскага; уклад Сагановіча / М. Косман, пераклад з пол. мовы С. Ішчанкі і інш. — Мінск: Медысонт, 2010 — 448 с.
4. Pocieha, W. Krołowa Bona. Czasy i ludzie Odrodzenia. — T.3. — Poznań, 1958. — 265 s.
5. Акты, издаваемые Виленской комиссиею для разбора древних актов: в 39 т. (АВАК). — Вильна: Тип. губ. правл., 1872. — 593 с.
6. Акты, относящиеся к истории Западной России : в 5 т. — СПб: Типографія Собственной Е. И. В. Канцеляріи, 1846 — 1848. — 440 с.
7. Белоруссия в эпоху феодализма. Сборник документов и материалов: в 3 т. — Т. 1: С древнейших времён до середины XVII в. — Минск : Изд-во АН БССР, 1959. — 516 с.
8. Писцовая книга Пинского и Клецкого княжеств, составленная пинским старостою Станиславом Хвальчевским в 1552–1555 гг. — Вильна: Типография Сыркина, 1884. — 714 с.
9. Устава, данная королевой Боной волостям Усвятской и Озерищской о платах и повинностях // Очерки по истории западно-русского крестьянства в XVI веке (прил.) / М. В. Довнар-Запольский. — Киев: Киевская 1-я артель печатного дела, 1905. — С. 32–33.
10. Лист королевы Боны державце оболецкому и усвятскому Кирдею Гричиновичу о старинных правах на выбор старцев волости Усвятской (прил.) // Очерки по истории западно-русского крестьянства в XVI веке / М. В. Довнар-Запольский. — Киев: Киевская 1-я артель печатного дела, 1905. — С. 52–53.
11. Лист королевы Боны державце рогочевскому, данный по жалобе на него подданных села Лучинскаго о введеных здесь новинах 1548 г. (прил.) // Очерки по истории западно-русского крестьянства в XVI веке / М. В. Довнар-Запольский. — Киев: Киевская 1-я артель печатного дела, 1905. — С. 56–58.
12. Лист королевы Боны державце рогочевскому П. Пельжынскому о кривдах, причиненных им подданным с описанием волостной уставы от 2 июня 1544 г. (прил.) // Очерки по истории западно-русского крестьянства в XVI веке / М. В. Довнар-Запольский. — Киев: Киевская 1-я артель печатного дела, 1905. — С. 58–61.

13. Ревизия пущ и переходов звериных в бывшем Великом княжестве Литовском с присовокуплением грамот и привилегий на выходы в пущи и на земли, составленная старостою Мстибоговским Григорием Богдановичем Воловичем в 1559 г., с прибавлением другой актовой книги, содержащей в себе привилегии, данные дворянам и священникам Пинского повета, составленной в 1554 г. — Вильна : Изд. Вилен. археогр. комис., 1867. — 382 с.
14. Писцовая книга бывшего Пинского староства, составленая по велению короля Сигизмунда-Августа в 1561–1566 годах пинским кобринским старостою Лаврином Войною. — Ч. 1. — Вильна : Тип. А. И. Зака, 1874. — 423 с.
15. Писцовая книга бывшего Пинского староства, составленая по велению короля Сигизмунда-Августа в 1561–1566 годах пинским кобринским старостою Лаврином Войною. — Ч. 2. — Вильна : Тип. А. И. Зака, 1874. — 599 с.
16. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далее НГАБ). — Фонд КМФ-18. — Воп. 1. — Спр. 18. — Зборнік дакументаў, што маюць адносіны да ўладанняў каралевы Боны. 1532–1534 гг.
17. НГАБ. — Фонд КМФ-18. — Воп.1. — Спр. 25. — Кніга запісаў прывілеяў, дэкрэтаў, дарчых, прадажных актаў, узятых з іншых кніг Метрыкі па ўказанні каралевы польскай і вялікай княгіні літоўскай Боны (1541 г.). 1387–1547 гг. *Апубл.*: Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 25 (1387–1546). Užrašymų knyga 25. Parengė D. Antanavičius ir A. Baliulis. — Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidybos institutas, 1998. — 462 p.
18. НГАБ. — Фонд КМФ-18. — Воп. 1. — Спр. 32. — Метрика королевы Боны: данины, декреты и листы поточные. 1548–1549 гг. *Апубл.*: Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 32 (1548–1549). Užrašymų knyga 32. Parengė A. Blanutsa, D. Vashchuk, D. Antanavičius, E. Deveikytė. — Vilnius: Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2012. — XX, 144 p.
18[a]. НГАБ. — Фонд КМФ-18. — Воп. 1. — Спр. 33. — Метрика королевы Боны: данины, декреты и листы поточные. 1549–1553 гг.
19. НГАБ. — Фонд КМФ-18. — Воп. 1. — Спр. 36. — Метрика королевы Боны данин, потвержений и листов розных судовых и поточных. А особно спосродку пописано святост костельных и законницы. 1552–1555 гг.
20. Пташицкий, С. Л. Описание книг и актов Литовской Метрики / С. Л. Пташицкий. — СПб., 1887. — 219 с.
21. НГАБ. — Ф. 1705. — Воп. 1. — Спр. 64. — Актавая кніга Брэсцкага гродскага суда. 1775–1776 гг.
22. НГАБ. — Ф. 1777. — Воп. 1. — Спр. 2. — Актавая кніга Пінскага земскага суда. 1661–1663 гг.
23. НГАБ. — Ф. 1777. — Воп. 1. — Спр. 18. — Актавая кніга Пінскага земскага суда. 1792–1795 гг.
24. НГАБ. — Ф. 1741. — Воп. 1. — Спр. 43. — Актавая кніга Брэсцкага земскага суда. 1785 г.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 30.06.2014

О. В. Долотова

Участие интеллигенции в городских общественных собраниях Минской, Могилевской и Витебской губерний в начале XX в.

4. Сафонов, А. А. Свобода совести и модернизация вероисповедного законодательства Российской империи в начале XX века : монография / А. А. Сафонов. — Тамбов : Изд-во Першина Р. В., 2007. — 367 с.
5. Бюллетень финансового и хозяйственного законодательства. — 1930. — № 3.
6. Распоряжение Св. Синода православных церквей в СССР // Вестник Священного синода православных церквей в СССР. — 1930. — №5–6. — С. 16.
7. Бюллетень финансового и хозяйственного законодательства. — 1931. — № 7.
8. Национальный исторический архив Беларуси (далее НИАБ). — Ф. 2786 (Белорусский православный священный синод). — Оп. 1. — Д. 418. — Переписка Минского епархиального управления с церковно-приходскими советами и священно- и церковнослужителями. 1929 г.
9. НИАБ. — Ф. 2786. — Оп. 1. — Д. 451. — Переписка Синода с Оршанским епархиальным управлением. 1929 г.
10. НИАБ. — Ф. 2786. — Оп. 1. — Д. 398. — Переписка Синода с НКВД БССР, Адм. отделом Минского окрисполкома, Минским отделом городского коммунального хозяйства и другими. 1929 г.
11. Государственный архив Витебской области. — Ф. 735 (Городокский районный Совет депутатов). — Оп. 1. — Д. 193.
12. НИАБ. — Ф. 2786. — Оп. 1. — Д. 488. — Переписка митрополита минского и белорусского Даниила со священно- и церковнослужителями. 1931 г.
13. НИАБ. — Ф. 2786. — Оп. 1. — Д. 501. — Переписка Синода с Полоцким епархиальным управлением. 1931 г.
14. Государственный архив Гомельской области. — Ф. 896 (Тереховский районный Совет депутатов трудящихся и его исполнительный комитет). — Оп. 1. — Д. 175.
15. НИАБ. — Ф. 2786. — Оп. 1. — Д. 486. — Переписка Синода со священнослужителями. 1931 г.

16. Национальный архив Республики Беларусь (далее НАРБ). — Ф. 4п (Центральный комитет КПБ). — Оп. 1. — Д. 5030.
17. НИАБ. — Ф. 2786. — Оп. 1. — Д. 489. — Переписка митрополита минского и белорусского Даниила со священно- и церковнослужителями. 1931 г.
18. НИАБ. — Ф. 2786. — Оп. 1. — Д. 452. — Переписка Синода с Оршанским епархиальным управлением. 1930 г.
19. НИАБ. — Ф. 2786. — Оп. 1. — Д. 495. — Переписка Синода с Могилевским епархиальным управлением. 1931 г.
20. НИАБ. — Ф. 2786. — Оп. 1. — Д. 512. — Переписка Синода со священно- и церковнослужителями. 1932 г.
21. Государственный архив общественных объединений Гомельской области. — Ф. 3650 (Лельчицкий районный комитет КПБ). — Оп. 2а. — Д. 127.
22. НИАБ. — Ф. 2786. — Оп. 1. — Д. 494. — Переписка Синода с Могилевским епархиальным управлением. 1931–1932 гг.
23. НИАБ. — Ф. 2786. — Оп. 1. — Д. 509. — Переписка Синода со священно- и церковнослужителями. 1932 г.
24. НИАБ. — Ф. 2786. — Оп. 1. — Д. 568. — Дело о представлении в Синод сведений о Кохановичской Петропавловской церкви Освейского р-на Витебско-Полоцкой епархии. 1934 г.
25. НИАБ. — Ф. 2786. — Оп. 1. — Д. 563. — Переписка Синода со священнослужителями. 1934 г.
26. НИАБ. — Ф. 2786. — Оп. 1. — Д. 561. — Переписка Синода со священнослужителями. 1934 г.
27. НИАБ. — Ф. 2786. — Оп. 1. — Д. 571. — Переписка Синода с Могилевским епархиальным управлением. 1934 г.
28. Белорусская православная церковь в XX столетии : спецкурс лекций для Минской духовной семинарии / священник Феодор Кривонос. — Минск : Врата, 2008. — 255 с.
29. НАРБ. — Ф. 4п (Центральный комитет КПБ). — Оп. 1. — Д. 11834.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 23.06.2014

С. П. Марозаў

Дзяржаўная традыцыя Вялікага Княства Літоўскага ў палітычнай свядомасці першых пакаленняў яго нашчадкаў: погляд з Беларусі, Расіі, Францыі (1811–1832)

Пасля таго як Вялікае Княства Літоўскае спыніла сваё існаванне, мара пра яго аднаўленне яшчэ больш за стагоддзе бударажыла палітычнае мысленне інтэлектуальнай і палітычнай эліты Беларусі і Літвы. Яе апошнія праекты дзяржаўнага ўладкавання свайго народа і зямлі ў гістарычнай форме ВКЛ датуюцца 1915–1916 гг. [1; 2]. Асабліва моцнай настальгія па ВКЛ была ў першых пакаленнях яго праваперамнікаў.

Ранейшая гістарыяграфія (дарэвалюцыйная расійская, савецкая, польская) у паказе барацьбы за адраджэнне Рэчы Паспалітай не акцэнтавала ўвагі на адметнасці інтарэсаў грамадска-палітычнага руху і на спецыфіцы палітычнай думкі Беларусі і Літвы, арыентаваных найперш на адбудову ВКЛ (як суверэннай дзяржавы або ў федэратыўнай сувязі з Польшчай). Затое дадзеная спецыфіка стала прадметам цікавасці гісторыкаў суверэннай Беларусі і Літвы [3–10].

У кантэксце гэтай цікавасці высокую навуковую каштоўнасць мае інфармацыя трох рэпрэзентатыўных гістарычных крыніц, выяўленых ужо ў XXI ст. у архівах Расіі (аўтарам дадзеных радкоў) і Францыі. Гэтыя крыніцы — пісьмо (1811 г.) і дзве аналітычныя запіскі (1812 і 1832 г.) — яскрава адлюстроўваюць настроі ў асяроддзі ліцвінскай шляхты ў першай трэці XIX ст. на адраджэнне страчанай дзяржаўнасці.

Пры рабоце з гэтымі крыніцамі даследчыку трэба ўлічваць спецыфіку іх тэрміналогіі, у першую чаргу сэнсавае напаўненне палітонімаў «Літва», «Польшча», «ліцвін», «літовец», «паляк» і этнонімаў «літовец», «паляк». За імі хаваюцца таксама Беларусь і беларусы, якія самастойна згадваюцца ў крыніцах вельмі рэдка. Неабходна мець на ўвазе, што крыніцы, як правіла, ставяць знак роўнасці паміж палітонімамі «Польшча» і «Рэч Паспалітая», «паляк» і жыхар, патрыёт (былой) Рэчы Паспалітай.

Храналагічна першай крыніцай з'яўляецца пісьмо, датаванае чэрвенем 1811 г., выяўленае ў Расійскім дзяржаўным архіве старажытных актаў у Маскве [11] і ўжо ўведзенае ў навуковы зварот [12]. Пра асобу Э. Тычынскага (Тышынскага, у крыніцы прыводзяцца два варыянты прозвішча) з самога пісьма даведваемся наступнае. Гэта ўраджэнец Вялікага княства Літоўскага («Літвы») і яго вялікі патрыёт, ліцвін беларускага паходжання, арыстакрат (прадстаўляў «першынствуючую частку народа, якая карыстаецца неабмежаванай перавагай

дваранскай годнасці»), аднадумца М. К. Агінскага. Ад імя «літоўцаў», якія насяляюць берагі Заходняй Дзвіны, Э. Тычынскі пераконвае сенатара (з 1810 г.) Агінскага, які «перасяліўся ў сталіцу судзіць аб справах імперыі», у неадкладнасці справы вяртання ліцвінам іх дзяржавы.

Як вядома, за паўтара-два месяцы да гэтага пісьма М. К. Агінскі спецыяльна прыехаў у Пецярбург, каб прапанаваць свой праект аднаўлення дзяржаўнасці ВКЛ пад апекай Аляксандра I. У трохгадзіннай размове з імператарам, якая адбылася 25 красавіка, сенатар упэўніваў яго ў неабходнасці напярэдадні вайны з Францыяй апярэдзіць Напалеона з яго планам узнаўлення Польшчы.

15 мая М. К. Агінскі прадставіў манарху свае аргументы ў пісьмовай форме, чаму трэба аднавіць ВКЛ, захаваць імя Літвы, і пералічыў правы, «якія можна надаць літоўцам». У яго запісцы гаварылася, што калі Аляксандр I зробіць такі крок, то «ліцвінам адным росчыркам пяра будзе вернута бацькаўшчына…» [13]. Так быў пакладзены пачатак распрацоўкі праекта адраджэння ВКЛ, які ўвайшоў у гісторыю і школьныя падручнікі пад назвай «План Агінскага». Ён разглядаўся ва ўрадавых колах Расіі і адлюстроўваў настроі той плыні беларуска-літоўскіх магнатаў і шляхты, якія настойліва імкнуліся да адміністрацыйнай і прававой самастойнасці свайго краю. Э. Тычынскі быў адным з прадстаўнікоў і выразнікам гэтых настрояў.

Пісьмо Э. Тычынскага паказвае ролю М. К. Агінскага ў авалодванні ідэяй адраджэння ВКЛ грамадскай думкай Беларусі і Літвы пачатку XIX ст. [14, s. 25–26]: яго словы, прамовы, напаміны запалілі душы ўсіх тых, хто не змірыўся са стратай сваёй дзяржавы. Яго ідэя «зрабіліся ўсеагульным прадметам бясед, размоў і меркаванняў ва ўсіх ніжніх прыватных і публічных сходах» [11, арк. 19–19 адв.].

Даецца яркая характарыстыка «настрояў у Літве» на мяжы 1800–1810-х гадоў: «У літоўцаў дагэтуль … агульныя правілы — біцца за айчыну і закон, агульны характар — грэбаваць дастаткам і чынамі, а падтрымаць права і незалежнасць. … У літоўцаў яшчэ айчынай — Літва, законам — Статут, заканадаўчай уладай — сейм». А тых, хто думае інакш, — «малая колькасць» [11, арк. 20 адв.–21].

«Літоўцы, — піша Э. Тычынскі, — ашалела любяць незалежнасць сваёй краіны, свае законы і звычаі, любяць углядацца ў прыклады сваіх продкаў, любяць пераймаць ім … у грамадзянскіх і вайсковых подзвігах…

Ад 15-гадовага юнака да 60-гадовага старца няма ў Літве ніводнага шляхціца, які б не палаў жаданнем … або абараняць грудзьмі свае карэнныя законы і перавагі, або радзіць аб справах айчынных і аб справах дзяржавы» [11, арк. 22–22 адв.].

Бяздзеянне, па словах Э. Тычынскага, уганяе яго суайчыннікаў у маркоту або адчай. Адчай адных прымушае да эміграцыі і службы чужым інтарэсам. Туга пераўтварае іншых у цяжар самім сабе і ўраду. «Калі б уладкаваць Літву, якая доўгі час знаходзілася ў саюзе з Польшчай, але якая заўсёды зберагала ўдзельнасць і незалежнасць сваёй нацыі, на больш выгодных, супраць Варшаўскага герцагства, правілах, — лічыць Э. Тычынскі, — гэта спыніць незадавальненне, запальчывасць і парыў тых, хто спакушаецца і спакусіўся пустымі надзеямі, але яшчэ і прывабіць на бок тутэйшага ўраду вельмі многіх з-за мяжы. Літоўцы загінуць без хуткай і рашучай пастановы аб іх долі» [11, арк. 22 адв.].

Досвед адраджэння Напалеонам польскай дзяржаўнасці, перакананы Э. Тычынскі, вельмі спакуслівы для ліцвінаў. Тры гады існуе Варшаўскае герцагства, і «варшаўцы» «штодня крадуць сэрцы [ліцвінаў. — *С. М.*], адданейшыя ўсерасійскаму скіпетру». Таму, папярэджвае аўтар пісьма, «цяперашняе становішча літоўцаў … небяспечнае для імперыі» і пагражае ёй катастрофай [11, арк. 23].

Пра моцныя адраджэнскія настроі ў пачатку XIX ст. на тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага, як і Каралеўства Польскага, таксама сведчыць аналітычная запіска («мемарыял») «Аб спосабах пазбаўлення Еўропы ад уплыву Расіі, а дзякуючы гэтаму — і ад уплыву Англіі», напісаная для імператара Напалеона напярэдадні яго ўварвання ў Расію, у лютым 1812 г., польскім генералам на французскай службе Міхаілам Сакальніцкім. Гэты ўнушальны па аб'ёме рукапіс на французскай мове быў выяўлены ў архіве Гістарычнай службы сухапутных войск Францыі прафесарам Фернанам Бакурам, дырэктарам Цэнтра напалеонаўскіх даследаванняў. Беларускім даследчыкам гэта крыніца стала вядомай дзякуючы яе выданню ў 2003 г. (у перакладзе на рускую мову і з прадмовай) прафесарам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта А. А. Яноўскім [15].

Вайсковая кар'ера неаднойчы прыводзіла інжынера-гідрографа і вучонага-тапографа М. Сакальніцкага (1760–1816) [16] у Літву і Беларусь. У 1789–1791 гг. ён разам з Якубам Ясінскім стварыў ў Вільні Літоўскае інжынернае вучылішча, стаў яго першым дырэктарам, працаваў выкладчыкам. У польска-расійскай вайне 1792 г. быў задзейнічаны ў арміі ВКЛ як адзін з вышэйшых афіцэраў, падрыхтаваў для яе фартыфікацыі і магазіны пад Гродна, быў граданачальнікам Гродна, перабудаваў праз Нёман вайсковы мост. У 1812 г. генерал ішоў побач з Напалеонам на Вільню, Смаленск, Маскву. Быў паранены ў бітве пад Барадзіно, удзельнічаў у пераправе праз Бярэзіну.

Сведка падзення Рэчы Паспалітай, М. Сакальніцкі ў 1794–1795 гг. змагаўся за яе адраджэнне разам з Т. Касцюшкай, Ю. Дамброўскім, Т. Ваўжэцкім і ахвяраваў на мэты паўстання палову свайго маёнтка. Потым выехаў у Парыж, дзе стаў адным з лідэраў прафранцузскай ары-

ентацыі для патрыятычна настроеных палякаў і ліцвінаў, што страцілі сваю радзіму.

Заангажаваны ў 1811 г. у працу напалеонаўскага штаба ў Парыжы, генерал зрабіў апісанне літоўскіх, беларускіх і рускіх зямель і распрацаваў канцэпцыю вайны з Расіяй. Запіска М. Сакальніцкага 1812 г. — гэта разгорнуты план ваеннай кампаніі супраць Расіі пры дапамозе паўстання ў Беларусі, Літве і Украіне. Галоўная мэта плана — вяртанне дзяржаўнасці Рэчы Паспалітай у «яе этнічных межах» (маюцца на ўвазе межы 1772 г.). Напісаннем гэтага плана вадзіла рука «глыбока абражанага патрыёта, у якога замігцела надзея рэваншу» [15, с. 5]. Відавочнай з'яўляецца прапольская зацікаўленасць аўтара ва ўсіх ваенных аперацыях Напалеона.

Напярэдадні вайны 1812 г. была падрыхтавана вялікая колькасць праектаў па стварэнні/адраджэнні дзяржаўных утварэнняў на беларускалітоўскіх землях. Іх творцамі з'яўляліся ўладныя структуры Расійскай і Французскай імперый, а таксама шляхта Польшчы і былых зямель ВКЛ. Праўда, мэты распрацоўшчыкаў былі розныя [17, с. 64]. Планы М. Агінскага і М. Сакальніцкага напісаны аўтарамі, якія знаходзіліся па розныя бакі лініі фронту. Сенатар рабіў стаўку на мірнае адраджэнне страчанай дзяржаўнасці, генерал — на глабальнае ваеннае сутыкненне Францыі з Расіяй.

У дадзенай крыніцы намаляваны яркі псіхалагічны партрэт патрыёта ВКЛ і Рэчы Паспалітай, носьбіта ідэі іх адраджэння. Уласцівыя патрыятычна настроеным колам Беларусі, Літвы, Украіны і ўласна Польшчы пачуцці болю і крыўды з-за страты дзяржаўнасці, настальгію і волю да барацьбы за яе аднаўленне генерал называе «польскім патрыятызмам», «польскім менталітэтам». Задушэнне вызваленчага паўстання не зламала гэту волю, але яшчэ больш распаліла духоўную ўпартасць, справакавала на фізічнае супраціўленне [15, с. 7]. Крыніцай энтузіязму з'яўляецца любоў палякаў да Радзімы, рухаючай сілай змагання — імкненне да незалежнасці. У трывозе і адчаі яны змаглі знайсці нечаканыя рэсурсы і далі ўражваючыя прыклады адданасці і самаахвярнасці. Няспынныя падрыхтоўкі і перыядычныя рэвізіі сіл і прыпасаў, назапашаных у падполлі, надавалі ім упэўненасці ў будучай барацьбе [15, с. 20, 32, 33, 38].

Са слоў М. Сакальніцкага, з усіх захопленых правінцый сцякаюцца пад пераможныя сцягі Напалеона «прадстаўнікі ўсіх саслоўяў і ўсіх узростаў», якія яму давяраюць і здольныя ў імя інтарэсаў сваёй Радзімы на ўсё. Сярод іх — лепшыя сыны Польшчы, патрыёты, вядомыя людзі Красінскія, Сапегі, Патоцкія, Пацы, Радзівілы, Сангушка, Пацей, Хадкевіч і інш., якія не вераць «лукавым пасулам» расійскага імператара, але жадаюць звязаць свой лёс з лёсам жыхароў Варшаўскага герцагства. Яны рызыкуюць страціць усю сваю маёмасць, не маюць вопыту бая-

вых дзеянняў і падвяргаюць смяротнай рызыцы сваё жыццё, але вераць «выключна ў святасць сваёй справы і вялікага Напалеона». «Іх можна разглядаць як носьбітаў тых пачуццяў, што натхняюць іх суграмадзян у Літве, — піша польскі дарадчык Напалеона. — … Розумы літоўцаў таксама былі падвержаны бражэнню». З Беларусі, Літвы і Украіны добраахвотна, рызыкуючы быць засечанымі бізуном або загінуць у Сібіры, збіраюцца пад сцягі Напалеона прэлаты, купцы, землеўладальнікі, яўрэі, грэкі, татары і сяляне [15, с. 37, 39, 40, 41].

Генерал гаворыць не пра цяперашнюю адданасць палякаў Напалеону, але будучую, пры ўмове вызвалення ім іх зямлі і адраджэння іх дзяржавы. Ён намякае французскаму імператару, што ў іх ёсць альтэрнатыўны выбар — вяшчальнікі Аляксандра I усюды разносяць яго спакуслівыя абяцанні адрадзіць Польшчу. «Палякі не будуць слухаць гэтых ілжэпрарокаў», пакуль бачаць збавіцеля ў французскім імператары. Але, урэшце рэшт, яны «вымушаны будуць схіліцца на чыйсьці бок» [15, с.113].

Арэнай, «дзе павінна пачацца і завяршыцца ўзброеная барацьба» Францыі з Расіяй, на думку імператарскага дарадчыка, павінна стаць тэрыторыя Літвы [15, с. 59]. Што для яго Літва? Гэта зямля, па якой працякаюць рэкі Нёман, Шчара, Дзвіна, Днепр, Прыпяць. Тут знаходзяцца «Самагіція і Земгалія» (заходняя і цэнтральная часткі сучаснай Літвы), а таксама балоты Палесся, стаяць гарады Вільня, Коўна, Гродна, Брэст, Мінск, Магілёў, Полацк, Нясвіж, Пінск, Мазыр і інш. Такім чынам, Літва для М. Сакальніцкага — гэта былое Вялікае Княства Літоўскае (пасля Люблінскай уніі), аснову якога складала тэрыторыя сучаснай Літвы і Беларусі.

М. Сакальніцкі скрупулёзна апісаў усе магчымыя дэталі і абставіны прасоўвання французскай арміі па заходняй частцы Беларусі, Палессі, Валыні. Для яго — гэта зямля Рэчы Паспалітай, якую Напалеон адродзіць у межах 1772 г. Генерал упэўнены ў тым, што іх насельніцтва яшчэ дакажа, «што ў душы яно не перастала быць палякамі». Нацыянальна-гістарычныя адметнасці гэтых тэрыторый, іх своеасаблівасць для яго нібыта не існуюць [15, с. 7–8].

Найбольш падрабязна генерал распрацаваў ход ваеннай кампаніі на тэрыторыі Беларусі і ў меншай ступені Літвы, Украіны, Расіі, прааналізаваў розныя варыянты развіцця падзей. Пры гэтым прадэманстраваў добрае веданне беларускіх зямель.

М. Сакальніцкі даказваў Напалеону, што той можа разлічваць на спачуванне сваёй ваеннай кампаніі ў насельніцтва былога ВКЛ, бо «ўсе класы і саслоўі ад Рыгі да берагоў Дняпра спадзяюцца толькі на вялікага Напалеона» [15, с. 20]. «Французы, — піша ён, — маюць усе падставы разлічваць на добры прыём у Белай Русі, дзе Кацярына Другая моцна паскубла мясцовую знаць і аддала вялізныя маёнткі маладым паме-

шчыкам — сваім фаварытам. Характэрна, што сваім былым гаспадарам спачувае і просты люд» [15, с. 49–50]. Мясцовыя рэсурсы, магчымыя палітычныя камбінацыі разам з патрыятызмам палякаў і ліцвінаў, па словах М. Сакальніцкага, — «гэта тыя рычагі і новыя рухаючыя сілы», якімі французскі імператар узмоцніць сваю магутнасць [15, с. 27].

Генерал упэўнены, што дзеянне армейскіх карпусоў павінна стаць сігналам для ўсеагульнага ўзброенага паўстання супраць расійскай улады ў Белай Русі, якое, аднак, успыхне не стыхійна. Яго трэба падняць («справакаваць паўстанне за Дняпром на Белай Русі») і ўзброіць. «У гэтым вялізным рэгіёне, які распрасцёрся ад Рыгі да вусця Дняпра, няма ніводнага кутка, які б не ператварыўся ў вулкан, варта толькі гэтага пажадаць Напалеону. Вывяржэнне адбудзецца па першаму яго сігналу» [15, с. 42]. Пры гэтым ён раіць больш увагі ўдзяляць рабоце з насельніцтвам старажытных гарадоў, якое «выказвае да нас больш сімпатыі, чым насельніцтва новых» [15, с. 8].

Узняць паўстанне могуць людзі найбольш уплывовыя і патрыятычна настроеныя. Гэта, на думку аўтара запіскі, «лепш за ўсё даручыць маладому князю Радзівілу, накіраваўшы яму ў дапамогу вопытнага ваяку. … Малады князь — глава знакамітага роду. У яго ўладанні знаходзіцца болей зямель, чым ва ўсіх астатніх абшарнікаў Літвы, разам узятых. Да таго ж у ваколіцах Слуцка і Нясвіжа жыве шмат залежнай ад яго знаці» [15, с. 66].

Кінуўшы заклік, Радзівіл можа сабраць апалчэнне не менш за шэсць тысяч чалавек. Яны, «згрупаваўшыся ў Валожынскіх лясах, стануць ядром, вакол якога пасля захопу Нясвіжа пры адпаведнай падтрымцы можа сабрацца вялікая армія добраахвотнікаў, што прадстаўляе сабой ўсе слаі грамадства і ўсе тэрыторыі аж да Падняпроўя». Дзеля гэтага прадпрыемства будзе выкарыстана зброя, у вялікай колькасці схаваная пасля паражэння паўстання 1794 г., асабліва ў раёне Нясвіжа. Адзін з Радзівілаў асабіста завяраў М. Сакальніцкага, што закапаў тады ў сваім маёнтку 32 гарматы, некалькі тысяч вінтовак і вялікую колькасць халоднай зброі [15, с. 66].

Па падліках генерала, масавае ўзброенае паўстанне ў Літве, дзе «пачуццё помсты ферментуецца … хутка», дасць Напалеону падчас яго прасоўвання да берагоў Дняпра корпус добраахвотнікаў і 60-тысячную армію [15, с. 67–68].

План М. Сакальніцкага адносна пасляваеннага ўладкавання Усходняй Еўропы прадугледжваў адроджаную Рэчь Паспалітую з ўсходнімі межамі па Днепр і Заходнюю Дзвіну, з заходняй і цэнтральнай Беларуссю ў яе складзе і васальнымі міні-дзяржавамі на яе ўсходніх тэрыторыях — Полацкім, Мсціслаўскім і Смаленскім герцагствамі, якім разам з герцагствамі Лівонскім, Чарнігаўскім, Палтаўскім, Напалеанідай (Запа-

рожская Сеч) і Санкт-Пецярбургскім губернатарствам адводзілася роля буфера паміж аслабленай, але не знішчанай Расіяй і «новай» Польшчай. Такім чынам, энергію нацыянальных рухаў на беларускіх і ўкраінскіх землях, пазбаўленых улады дынастыі Раманавых, меркавалася накіраваць на стварэнне марыянеткавых міні-дзяржаў [15, с. 8–9].

І, урэшце, расійскі погляд на беларуска-літоўскія ідэі аб адраджэнні ВКЛ у эпоху напалеонаўскіх войнаў (1805–1815 гг.) падтрымліваў Аляксандр І.

Негатыўныя адносіны расійскай інтэлектуальнай і палітычнай эліты адносна гэтага намеру выказаў ў сваім пісьме да цара ад 17 кастрычніка 1819 г. вядомы гісторык М. М. Карамзін. Гэта пісьмо захоўваецца ў Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі [18] і ўжо вядома гістарычнай навуцы. «Ці можаце са спакойным сумленнем адабраць у нас Беларусь, Літву, Валынію, Падолію, зацверджаную ўласнасць Расіі яшчэ да Вашага царавання? — пісаў Аляксандру І М. М. Карамзін. — Хіба гасудары не клянуцца берагчы цэласнасць сваіх дзяржаў?… Мы ўзялі Польшчу мячом — вось наша права, якому ўсе дзяржавы абавязаны сваім быццём… Калі вы аддадзіце іх, то ў Вас запатрабуюць і Кіеў, і Чарнігаў, і Смаленск: бо яны таксама доўга належалі варожай Літве. Або ўсё, або нічога. …Аднаўленне Польшчы будзе падзеннем Расіі…» [18, арк. 16–18].

Прычыны жывучасці рэчпаспалітаўскага і ВКЛ-аўскага патрыятызму ў заходніх губернях і спосабы барацьбы з ім прааналізаваў у сваёй запісцы «Літва», складзенай у 1832 г., нехта Аляксандр Васільеў — верагодна, тайны агент корпуса жандараў [19]. Аўтар запіскі, як вынікае з яе зместу, — чалавек, дасведчаны ў сітуацыі ў Беларусі і Літве, праціўнік юрыдычнай адасобленасці і адметнага статусу гэтых зямель у складзе Расійскай імперыі.

Гэта запіска захоўваецца ў Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі ў Маскве ў фондзе Трэцяга аддзялення Асабістай яго імператарскай вялікасці канцылярыі.

Створанае ў 1826 г. Трэцяе аддзяленне ўяўляла сабой палітычную паліцыю, якая не дзейнічала ад імя цара і не была звязана з існуючымі законамі. Галоўная яго ўвага была скіравана на барацьбу з нацыянальна-вызваленчым і рэвалюцыйным рухам, а ў задачу ўваходзіла назіранне за дзейнасцю рэвалюцыйных арганізацый і асобных палітычных і грамадскіх дзеячаў, за перыядычным друкам і настроямі ўсіх слаёў грамадства.

У Сакрэтным архіве Трэцяга аддзялення адклаліся вельмі своеасаблівыя дакументальныя матэрыялы. Пераважна гэта агентурныя зводкі, данясенні, лісты, выпіскі з перлюстраваных пісем, запіскі дзяржаўных дзеячаў і прыватных асоб. Крыніцы з Сакрэтнага архіва ўтрымліваюць звесткі аб нелегальных арганізацыях і іх сябрах, аб водгуках розных слаёў насельніцтва на падзеі грамадскага жыцця імперыі. Тут захава-

лася шмат цікавых дакументаў па гісторыі нацыянальна-вызваленчага руху ў заходніх губернях Расійскай імперыі.

У адзначанай запісцы А. Васільеў даў сваё бачанне сучаснага стану і будучыні гэтых зямель, вылучыў і прааналізаваў тыя фактары, якія жывілі сепаратысцкія настроі ў Беларусі і Літве.

Сама назва «Літва», — так распачыналася запіска, — шкодзіць Расійскай імперыі, бо не складае з ёй адзінага цэлага. Толькі цэласнасць — залог спакою дзяржавы. Літва да гэтага часу «лічыць сябе адасобленай правамі, верай, звычаямі, дыялектамі і марай жыхароў аб народнай самабытнасці і сваім імя». Літва не з'яўляецца звяном аднаго ланцуга, гэта — «вугал, гатовы адарвацца пры першым зручным выпадку, пры першым узрушэнні дзяржавы. 1812 год пацвердзіў гэта». Напалеон, калі ўварваўся ў Расію, абяцаў літоўцам адраджэнне Літвы, «і літоўцы, не будучы народам ваяўнічым, хоць і не цалкам спраўдзілі яго чаканні, але ахвотна забяспечвалі яго войска правіянтам, выконвалі ўсё, што толькі маглі, нават сфарміравалі некалькі палкоў для бітвы з расіянамі!» [19, арк. 6].

Але Аляксандр I велікадушна аддаў усё гэта забыццю: не пазбавіў Літву прававой адасобленасці, не разбурыў яе адміністрацыйнай аўтаноміі. Аб'яднаннем літоўцаў у Літоўскі корпус ён даў падставу для яшчэ большага адчужэння Літвы ад Расіі. У той час як размяшчэнне ў Літве расійскіх войск прывяло б да яе абрусення. Шлюбнымі саюзамі афіцэраў з шляхецкімі дочкамі літоўцы «этнічна зліліся б» з рускімі.

Мяцеж 1831 г., які аўтар запіскі прадбачыў у сваім лісце на імя імператара за 1830 г., цяпер цалкам сведчыў пра шкоду прававой адасобленасці і нават прывіду існавання Літвы. Мудры правіцель павінен здабыць карысць з гэтага зла — мяцеж даў падставу «гэта зло, якое заўсёды пагражае міжусобіцамі ў Расіі, навечна выкараніць» [19, арк. 6].

Гэтаму намеру, аднак, «перашкаджаюць зайздросныя і варожыя чужаземцы». Але Расіі, па меркаванні А. Васільева, лягчэй вытрымаць новую замежную вайну, чым пакінуць корань зла ў сярэдзіне дзяржавы, бо беларускае і літоўскае дваранства пастаянна адольваюць мары аб самабытнасці; яно не задаволена частымі зменамі некалі дадзеных ім і яшчэ не знішчаных правоў і прывілеяў.

А. Васільеў раіць царскаму ўраду зрабіць стаўку на тых нешматлікіх разважлівых беларускіх і літоўскіх дваран, якія, усведамляючы моц Расіі і няроўнасць сіл у змаганні з ёю за сваю адасобленасць, разумеюць, што ўзброенае змаганне абернецца народным бедствам. Гэта тыя дваране, што, «прызнаючы адзінакроўнае паходжанне ад Славян, гатовы зліцца з Расіяй і тым назаўсёды спыніць думкі і прычыну да міжусобіцы». Да гэтай катэгорыі аўтар лічыць вартым далучыць тую шляхту, якая служыла ў расійскім войску, удзельнічала ў падаўленні

паўстання ў Беларусі і Літве, якая звязана прысягай і звычкай і не падыме зброі на сваіх саслужыўцаў. На гэтыя групы мясцовай шляхты, паводле запіскі, урад мала звярнуў увагі. Даўшы ім узнагароды, можна ўзмацніць партыю сваіх прыхільнікаў у заходніх губернях.

Другім вялікім злом у краі называецца ўкаранёнае ў свядомасць яго жыхароў атаясамленне Літвы з Польшчай, «гістарычнымі падзеямі шматразова абвержанае». Шкоднымі з'яўляюцца і словы «забраны край Літоўскі», як называюць яго мясцовыя жыхары.

Дух адчужанасці ад Расійскай імперыі моцна падтрымліваюць і заахвочваюць да хвалявання таксама знешнія атрыбуты: польскія грошы, больш знаёмыя ў Літве і Беларусі, чым асігнацыі імперыі, злучаныя гербы Літвы і Польшчы на Вострай браме ў Вільні, якія нагадваюць пра іх «былое адзінанароддзе». Нават з набожнасцю злучылася думка пра сувязь Літвы з Польшчай.

Асабліва ўздзейнічаюць гэтыя сімвалы-знакі, паводле запіскі, на дробную шляхту, якая не мае ні ўласнасці, ні аселасці, ні сродкаў для пражывання. «Гэтыя пралетарыі, — пісаў пра дробную шляхту А. Васільеў, — па беднасці сваёй і абмежаванасці разумовых сродкаў не могуць нічога страціць хваляваннем; але спадзяюцца на ўсялякую перамену, як на выпадковасць, што можа палепшыць іх стан».

Акрамя таго, аўтар запіскі знайшоў у Літве яшчэ «пять зол» і прапанаваў спосабы іх выкаранення. Сярод іх наступныя:

1. «Рознае права з сапраўднай Расіяй — гэта аснова разрыву, … зрабіўшы, урэшце, зразумелымі і кароткімі рускія законы, даць іх усёй Імперыі!»
2. Служба ў расійскай арміі не з'яўляецца абавязкам беларускай і літоўскай шляхты, таму многія з іх не прызвычаіліся лічыць сябе вернападданымі рускага цара.
3. Дробная шляхта — «шкоднае і пустое саслоўе людзей», якое «прагна чакае першага кліку бунту ў той надзеі, што ў агульнай разладжанасці, нічога не губляючы, палепшыць сваё становішча. Гэтыя шляхецкія шайкі ў час апошняга мяцяжу рабавалі ў Белавежскай пушчы, змагаліся ў Жмудзі, узмацнялі атрады Гелгута і іншых. Сялян, якія апынуліся ў шэрагах мяцежнікаў па прымусу, гэта шляхта пужае непазбежнымі новай вайной «за Польшчу і Літву» і новым паўстаннем народа. Урад ужо звярнуў увагу на дробную шляхту — «на працягу года шляхта павінна знікнуць, даказаўшы свае правы на сапраўднае дваранства».
4. Непрадуманая фіскальная палітыка ў Літве і свабода вінакурэння, ад якой прыбыткі з пладародных Мінскай, Гродзенскай і часткова Віленскай губерняў ідуць не ў даход дзяржаве, але перацякаюць у корчмы, якія ёсць у кожнай вёсцы.

У тых настроях на адасобленасць беларускіх і літоўскіх зямель і марах аб аднаўленні Вялікага Княства Літоўскага, што пануюць у краі, аўтар запіскі вінаваціць таксама школьных настаўнікаў, якія моладзі «расказвалі пра Баторыя, Жыгімонта, Каралеву Літвы Ядвігу», а гісторыю Расіі выкладалі, «пакалечанай каментарыямі ... з варожых запісак польскіх гісторыкаў». Кніга ж М. Карамзіна «Гісторыя расійская» была ў вучылішчах толькі ў адным асобніку, да таго ж у бліскучай вокладцы, г.зн. выстаўлялася толькі з прыездам у вучылішчы высокіх наведвальнікаў.

Добра дасведчаны ў мясцовых рэаліях А. Васільеў здзіўляецца, што пакуль ніхто не звярнуў увагі на прапанаваныя ім шляхі выкаранення такіх сепаратысцкіх настрояў, бо «кожны ваенны генерал-губернатар Літвы, дзеючы з розумам, мог бы выправіць шмат чаго..., без боязі тым усхваляваць розум *(мясцовай шляхты. — С. М.)*» [19].

Такім чынам, тэма змагання за адбудову Вялікага Княства Літоўскага першых двух пакаленняў яго праваперaемнікаў, раней разгледжаная ў агульным кантэксце барацьбы за адраджэнне Рэчы Паспалітай, з ігнараваннем спецыфікі іх палітычнага мыслення, для беларускай гістарыяграфіі дастаткова новая. Справе распрацоўкі дадзенай тэмы і паказу гэтай спецыфікі могуць добра паслужыць новыя рэпрэзентатыўныя гістарычныя крыніцы, выяўленыя ў 2000-я гг.: пісьмо Э. Тычынскага (Тышынскага) да М. К. Агінскага (1811 г.), запіска М. Сакальніцкага «Аб спосабах пазбаўлення Еўропы ад ўплыву Расіі, а дзякуючы гэтаму — і ад ўплыву Англіі» (1812 г.) і запіска А. Васільева «Літва» (1832 г.).

Нягледзячы на ўласцівую таму часу тэрміналагічную асаблівасць гэтых крыніц (Беларусь і беларусы часта схаваныя за палітонімамі «Літва», «Польшча», «літовец», «паляк» і этнонімамі «літовец», «паляк», а Вялікае Княства Літоўскае і ліцвіны — за палітонімамі «Польшча», «паляк» і этнонімам «паляк»), яны даюць яркую характарыстыку настрояў тых патрыётаў ВКЛ, хто не змірыўся са стратай сваёй дзяржавы. Больш таго, на матэрыяле дадзеных крыніц мы маем погляд на вызначальнае месца ў палітычнай свядомасці нашчадкаў Вялікага Княства Літоўскага яго дзяржаўнай традыцыі з самой Беларусі-Літвы, з Расіі, а таксама з Францыі (дакладней сказаць, прафранцузскі польскі погляд).

Звяртае на сябе ўвагу наступнае:

1. Аўтары крыніц падкрэсліваюць гістарычную адметнасць інтарэсаў Княства і Кароны, у кантэксце чаго навукова больш зразумелым, апраўданым, мэтазгодным становіцца рух за адраджэнне менавіта ВКЛ. Э. Тычынскі прадстаўляў Літву, «якая доўгі час знаходзілася ў саюзе з Польшчай, але якая заўсёды зберагала ўдзельнасць і незалежнасць сваёй нацыі». А. Васільеў называе вялікім злом у літоўска-беларускім краі ўкаранёнае ў свядомасць яго жыхароў ата-

ясамленне Літвы з Польшчай, «гістарычнымі падзеямі шматразова абвержанае».

2. Крыніцы сведчаць пра шырокі размах і сілу адраджэнскіх настрояў. Ідэі вяртання ліцвінам іх дзяржавы (пад уплывам М. Агінскага) «зрабіліся ўсеагульным прадметам бясед, размоў і меркаванняў ва ўсіх ніжніх прыватных і публічных сходах» (Э. Тычынскі). У Літве «пачуццё помсты ферментуецца … хутка» (М. Сакальніцкі). Літва да гэтага часу «лічыць сябе адасобленай правамі, верай, звычаямі, дыялектамі і марай жыхароў аб народнай самабытнасці і сваім імя»; гатова «адарвацца пры першым зручным выпадку, пры першым узрушэнні дзяржавы»; лягчэй вытрымаць новую замежную вайну, чым пакінуць корань зла ў сярэдзіне дзяржавы (А. Васільеў). Канстатаваныя гэтымі аўтарытэтнымі аўтарамі размах і моц адраджэнскіх настрояў у Беларусі і Літве дазваляюць падысці да даследавання руху за аднаўленне ВКЛ з новай метадалогіяй і разглядаць яго ў кантэксце тэорыі сацыякультурнай траўмы, прапанаванай вядомым польскім даследчыкам Пятром Штомпка [20].
3. Ліцвін беларускага паходжання Э. Тычынскі, паляк на французскай службе М. Сакальніцкі і расіяне М. Карамзін і А. Васільеў узводзяць «літоўскае пытанне» ў ранг еўрапейскай значнасці — ад яго вырашэння залежыць лёс дзяржаў, зыход вайны, баланс сіл на кантыненце. З аднаго боку — «цяперашняе становішча літоўцаў … небяспечнае для імперыі» (незадавальненне, запальчывасць, эміграцыя і служба замежным інтарэсам, пранапалеонаўскія настроі і інш.) і пагражае ёй катастрофай (Э. Тычынскі пра неабходнасць адраджэння ВКЛ). З другога боку — «аднаўленне Польшчы будзе падзеннем Расіі» (М. Карамзін), шкода «прававой адасобленасці Літвы і нават прывіду існавання Літвы» (А. Васільеў). М. Сакальніцкі — Напалеону: у Літве «можна або ўсё страціць, або ўсё атрымаць».

Крыніцы і літаратура

1. Ponarski, Z. Konfederacja Wielkiego Księstwa Litewskiego 1915–1916 / Z. Ponarski // Białoruskie Zeszyty Historyczne. — 1998. — № 10. — S. 56–67.
2. Lopata, R. W kręgu projektów odrodzenia Wielkiego Księstwa Litewskiego (1915–1916) / R. Lopata // Lituano-Slavica Posnaniensia: studia historica. — 2001. — Vol. VIII. — P. 155–171.
3. Грыцкевіч, А. Памятныя запіскі Міхаіла Клеафаса Агінскага Аляксандру I у 1811 годзе / А. Грыцкевіч // Адраджэнне: Гістарычны альманах. Вып. 1 / Склад. і навук. рэд. А. П. Грыцкевіч. — Мінск: Універсітэцкае, 1995. — С. 195–199.
4. Таляронак, С. Апошняя армія ВКЛ (1812–1814 гг.) / С. Таляронак, А. Блінец // Беларускі гістарычны часопіс. — 1996. — № 2. — С. 22–34.

5. Швед, В. Вялікае княства Літоўскае ў 1812 годзе / В. Швед // Беларускі гістарычны часопіс. — 2000. — № 3. — С. 9–15.
6. Ерашэвіч, А. Палітычныя праекты адраджэння Рэчы Паспалітай і Вялікага Княства Літоўскага ў палітыцы расейскага царызму напярэдадні вайны 1812 г. / А. Ерашэвіч // Гістарычны альманах. — Гародня, 2002. — Т. 6. — С. 84–96.
7. Ляллькоў, І. Традыцыі Вялікага княства Літоўскага ў палітычным жыцьці беларускіх земляў у XIX ст. // Спадчына. — 2002. — № 2–3. — С. 56–65.
8. Сідарэвіч, А. Канфедэрацыя Вялікага княства Літоўскага / А. Сідарэвіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. — Т. 4. Мінск: БелЭн, 1997. — С. 93.
9. Багалейша, С. Канфедэрацыя Вялікага княства Літоўскага: праекты і здзяйсненні / С. Багалейша // Беларускі гістарычны часопіс. — 2005. — № 7. — С. 12–17.
10. Марозаў, С. Правал Канфедэрацыі ВКЛ 1915 года — лёс або заканамернасць? / С. Марозаў // Шлях да ўзаемнасці = Droga ku Wzajemnisci : матэрыялы XV міжнар. навук. канф. (Гродна, 13–14 лістапада 2008 г.) / рэдкал.: І. Крэнь, С. Мусіенка, І. Папоў, Я. Роўба (адк. рэдактары) [і інш.]. — Гродна: ГрДУ, 2009. — С. 265–269.
11. Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў. — Ф 12. — Воп. 1. — Спр. 258. — Арк. 19–23. — Гістарычны нарыс аб Вялікім Княстве Літоўскім і ліст Э. Тычынскага да М. К. Агінскага аб утварэнні асобнага Княства Літоўскага. 1811 г.
12. Марозаў, С. П. Ля вытокаў ідэі адраджэння Вялікага княства Літоўскага ў беларускім грамадска-палітычным руху / С. П. Марозаў // Здзяйсненне мары апантаных: матэрыялы рэсп. навук. канф., прысвеч. 50-годдзю студ. навук.-даследч. гіст.-краязн. гуртка / пад рэд. І. П. Крэня, С. В. Марозавай. — Гродна: ГрДУ, 2006. — С. 25–27.
13. Запіска графа Агінскага, пададзеная Аляксандру I 15 мая 1811 года // Адраджэнне: Гістарычны альманах. Вып. 1 / Склад. і навук. рэд. А. П. Грыцкевіч. — Мінск: Універсітэцкае, 1995. — С. 208–209.
14. Marozavas, S. Mykola Kleopas Oginskis kaip XIX a. Pradzios Baltarusiu ur Lietuviu visuomenines minties lyderis / S. Marozavas // Kunigaiksciu Oginskiu kulturine, politine, veikla: praeties atspindziai, ateities perspektyvos. VII tarptautine moksline konferencija. Vilniaus pedagoginio universiteto Istorijos fakultetas (2011 m. spalio 5 d.): Pranesimu tezes. — Vilnius, 2011. — 98 s.
15. Сокольницкий, М. «Исполнено по высочайшему повелению…»: Рапорт, поданный Наполеону начальником его контрразведки, польским генералом Михалом Сокольницким, с рекомендациями «о способах избавления Европы от влияния России…» / М. Сокольницкий; сост., предисл., примеч. О. А. Яновского; пер. с фр. В. А. Яновского. — Минск: БГУ, 2003. — 151 с.
16. Baczkowski, M. Sokolnicki Michał / M. Baczkowski // Polski słownik biograficzny. — T. XL/1. — Warszawa–Kraków, 2000. — S. 74–80.

17. На шляху станаўлення беларускай нацыі: гістарыяграфічныя здабыткі і праблемы / В. В. Яноўская [і інш.]; навук. рэд. В. В. Яноўская; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. — Мінск: Беларуская навука, 2011. — 311 с.
18. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. — Ф. 1165. — Воп. 3. — Спр. 22. — Арк. 4–6. — Письмо Карамзина Н. М. Александру I с советом не восстанавливать Польшу. 17 октября 1819 г.
19. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі. — Ф. 109. Сакрэтны архіў. — Воп. 2. — Спр. 208. — Арк. 5–41 адв. — Письма капитана Васильева Александра с просьбой назначить его полицмейстером в Варшаву с приложением своих записок о Литве и Польше. Начато 20 мая 1832 г.
20. Marozau, S. Знішчэнне Вялікага княства Літоўскага як сацыякультурная траўма / S. Marozau // Per aspera ad astra: Materiały z XVI Ogólnopolskiego Zjazdu Historyków Studentów. T. XII: Metodologia historii, historiografia i historia gender / Red. Adam Swiątek. — Kraków: Uniwersytet Jagiellonski, 2008. — S. 101–113.

Дадатак

1811, чэрвень. — Фрагмент ліста Э. Тычынскага да М. К. Агінскага аб утварэнні асобнага Княства Літоўскага.

[Л. 20 об.] У литовцев поныне общий дух — править и властвовать, общие правила — биться за отечество и закон, общий характер — пренебрегать достатки и чины, а поддерживать права и независимость.

Пятнадцать лет благотворных намерений нового правительства не могли б изменить этот характер литовцев. …

[Л. 21] У литовцев все еще отечеством — Литва, законом — Статут, верховной законодательной властью — Сейм.

Малое число противномыслящих никак нельзя уравновешивать с великим превосходством общего понятия. …

[Л. 21 об.] Почему бы ныне в царствование … Александра берега Западной Двины, населенные признательными к нему литовцами, не могли доставить собою крепчайшего оплота для Российской империи?

Неоспоримо, что образование Варшавского Герцогства имело сокровенной целию: подстрекать народное поляков самолюбие, питать их надеждою восстановления упраздненного королевства и между тем мимоходом возмущать жителей тех стран, которые недавно состоят под одним правлением с жителями вновь созданного княжества. …

Литовцы … не терпят западной системы, коею ниспровержены древнейшие и драгоценнейшие памятники отечественной их свободы и отечественного достояния, … что они до исступления любят независимость страны своей; любят свои законы и обычаи, любят всматриваться в примеры своих пред-

ков, любят подражать им в гражданских и военных подвигах; а посему они готовы пожертвовать собою и своим достатком со всею горячностию воспаленных умов в пользу обожаемого монарха, лишь бы их дух, правила и характер удостоились явно высочайшего внимания и покровительства.

От пятнадцатилетнего юноши до шестидесятилетнего старца нет ни одного в Литве [Л. 22 об.] дворянина, который бы не пылал желанием или защищать грудью коренные свои законы и преимущества или советовать о делах отечественных и делах государства. Бездействие повергает их в крайнее уныние или в крайнюю отчаянность. Отчаянность переводит одних за границу и поневольно заставляет их служить чужим прихотям. Уныние обращает других в тягость им самим и попечительному о них правительству.

Если устроить Литву, бывшую долгое время в союзе с Польшей, но всегда хранившую удельность и независимость своей нации, на выгоднейших против герцогства Варшавского правилах, то сие недовольство прекратит горячность и порыв обольщаемых и обольщенных пустыми надеждами, но и еще привлечет весьма многих надеждами из-за границы на сторону здешнего правительства.

Литовцы погибнут без скорого и решительного о участи их постановления.

Затейливые чрез три года внушения варшавцев, явное попускание на сие тамошнего правительства, неусыпная со стороны оных деятельность в возвращении посеянных надежд похищают ежедневно сердца, преданнейшие всероссийскому скипетру.

Прискорбно глядеть на заблуждения легковеров, ложными впечатлениями прельщаемых; но прискорбнее еще предусматривать крайность и последствия, от сих заблуждений родиться могущие.

[Л. 23] Настоящее положение литовцев опасно для них, опасно для империи.

Опасно для империи, если они предадутся обольщениям смежной нации; опасно для них, если смежная нация покусится силою привлекать их на свою сторону.

Я не осмелюсь дальше простирать моих рассуждений; мы на низу не столько видим, сколько могут постигать взоры людей, стоящих на верху кормила.

Мы узрели черное облако, и вдруг мечтаем о страшных бурях, волнениях и конечном сокрушении корабля. … Ваше дело, князь, судить по правде.

Я, представляя на благоуважение Вашего сиятельства сию краткую, но верную картину настоящего расположения умов в Литве, пребуду уверен, что сим средством исполняю и долг верноподданного ко доброму монарху.

Крыніца: РДАСА. — Ф. 12. — Воп. 1. — Спр. 258. — Арк. 19–23.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 14.10.2014

С. Н. Рындин

Мероприятия гражданских властей белорусских губерний по конфискации имущества иностранных подданных (1914–1917 гг.)

Во время войны практически неизбежна ситуация, когда на территории одного воюющего государства в силу различных причин пребывают граждане страны-неприятеля. Формально они становятся врагами, и их положение чрезвычайно осложняется. Однако речь идет не только об иностранцах, временно находящихся за границей и застигнутых там войной. Многие из них успевали задолго до войны обосноваться за рубежом, приобрести недвижимость, заняться предпринимательством, вступить в браки с местными жителями. С начала Первой мировой войны российское государство приступило к ограничению прав пребывавших в России подданных Германии и Австро-Венгрии, затем Турции и Болгарии. Особое внимание уделялось изъятию земли и промышленных предприятий.

Реализация ограничительных мер обеспечивалась особой правовой базой, созданной в годы войны. 11 января 1915 г. вышел указ о прекращении деятельности в России фирм, учрежденных по законам «неприятельских» государств. Дальнейшие мероприятия ужесточали репрессивную политику. С 1 июля 1915 г. закрыть могли и те фирмы, которые создавались по российским законам, но имели среди своих акционеров хотя бы одного «неприятельского» подданного или выходца. На такие предприятия государство назначало своих инспекторов с широкими полномочиями. Они имели полный доступ ко всей документации предприятия. Все платежные документы заверялись их подписью. При малейшем подозрении на «вредную деятельность» инспектор инициировал процедуру ликвидации фирмы [4, с. 80].

Необходимо отметить, что степень ужесточения мер по обеспечению государственной безопасности определялась еще и субъективным фактором. В октябре 1915 г. пост министра внутренних дел занял А. Н. Хвостов — бывший глава фракции правых в Государственной думе, активный сторонник борьбы с «германизмом» во всех сферах общественной жизни. 17 октября 1915 г. он распространил указ от 11 января этого же года на крупные предприятия [4, с. 82–83]. 7 июля 1916 г. возник государственный орган с необычным названием — Особый комитет по борьбе с немецким засильем. Впрочем, это учреждение, просуществовавшее до 31 августа 1917 г., не было карательным. Его работа свелась к тому, чтобы выявлять, учитывать и подробно характеризовать недвижимую собственность «неприятельских» подданных и выходцев из Германии и

Австро-Венгрии [6, с. 129]. Пиком «антинемецкой» политики в торгово-промышленной сфере стал указ от 8 февраля 1917 г. об изъятии у всех подданных воюющих с Россией государств ценных бумаг и передаче их другим владельцам. Акционерам полагалась компенсация, но для этого необходимо было возбудить ходатайство в двухнедельный срок. Учитывая волокиту делопроизводства, уложиться в такой отрезок времени было очень трудно [4, с. 86].

С осени 1914 г. власти Российской империи развернули масштабное наступление и на «немецкое» землевладение. 22 сентября 1914 г. царем издан указ, запрещающий подданным Германии и Австро-Венгрии на время войны приобретать в собственность или аренду землю и любую недвижимость [5, с. 10]. Очень скоро на смену этому указу пришел более жесткий закон. 2 февраля 1915 г. Совет министров утвердил положение о конфискации внегородских недвижимых имуществ в прифронтовых губерниях, принадлежащих австрийским, венгерским и германским подданным, а также российским подданным из германских, австрийских, венгерских выходцев и их потомкам по мужской линии [9, л. 486]. Осмотром и оценкой этих имуществ занимались отделения Крестьянского поземельного банка [9, л. 367]. Соответствующее право банк получил 1 мая 1915 г. [13, л. 34]. Суть нового закона заключалась в следующем: иностранцам-«врагам» не просто запрещали покупать новую недвижимость, у них хотели отобрать и их наличное имущество, которое через публичные торги переходило к другим собственникам. Причем закон распространялся и на часть российских подданных. Перечень недвижимостей, подлежащих ликвидации (ликвидационный список), регулярно публиковался в местных «Губернских ведомостях» и вывешивался в полицейских управлениях.

Закон от 2 февраля 1915 г. прописывал следующие меры:

- уволить всех «вражеских» подданных с административных постов по управлению недвижимостью (распространялось на всю империю);
- землю вне городских поселений описать и установить определенный срок (от полугода до двух лет), за который бывший владелец может самостоятельно продать ее;
- расторгнуть соглашения по аренде земли с фирмами, если среди их акционеров хоть один имел «вражеское» подданство [14, л. 4 об–5].

Действию второго и третьего положений закона от 2 февраля 1915 г. подлежали только приграничные губернии, включая все белорусские, кроме Могилевской [12, л. 266]. 13 декабря 1915 г. вышел закон, по которому за Крестьянским поземельным банком закреплялось право преимущественной покупки отчуждаемых земель [4, с. 125].

Таким образом, подданные воюющих с Россией государств и российские подданные, происходившие из этих стран, повсеместно не могли приобретать недвижимое имущество в частную собственность. Правда, при этом выделялись категории льготников. По циркуляру МВД № 8 от 15 января 1916 г от конфискации освобождались те, у кого среди родственников были российские военнослужащие с боевыми наградами [11, л. 30]. В сентябре того же года, по решению Совета министров, лица славянского, итальянского и французского происхождения, а также болгарские и турецкие подданные (за исключением мусульман) частично восстанавливались в своих имущественных правах. Им позволялось арендовать землю на срок не более 2 лет. Но в каждом отдельном случае требовалось разрешение министра внутренних дел. Кроме того, просители должны были доказать, что арендованные ими земли послужат нуждам обороны [11, л. 94].

Масштаб конфискаций во многом определялся географической удаленностью от государственной границы. Так, недвижимость «неприятельских» иностранцев в пределах 150-верстной приграничной полосы подлежала отчуждению в течение 2 лет. Недвижимость внутри 100-верстной полосы ликвидировалась за 8 месяцев. На конфискацию земельной собственности «неприятельских» выходцев, расположенной в 150-верстной полосе, выделялось 12 месяцев. Внутри же 100-верстной полосы земля данной категории российских подданных изымалась по истечении 1,5 лет после публикации ликвидационного списка. На всей остальной территории Российской империи принудительное отчуждение не вводилось. Предусматривались и некоторые послабления для российско-подданных немцев, венгров и турок. Они по-прежнему могли занимать должности поверенных и управляющих имений, председателей и членов советов правлений [14, л. 4об–5].

Минский губернатор А. Ф. Гирс приказал приступить к работам по ликвидации иностранного землевладения во вверенной ему губернии 18 февраля 1915 г. Перед начальниками полиции ставилась задача собрать сведения и составить списки имуществ. Надлежащий список был опубликован в № 27 «Минских губернских ведомостей» от 15 апреля 1915 г. Он включал 49 земельных участков общей площадью 9 167 дес. (10 015 га). Они принадлежали 56 иностранным подданным — 24 австро-венгерским и 32 германским. Наибольшее количество участков (25) находилось в Мозырском уезде. Там же располагались Дяковичи — самое крупное из иностранных имений в Минской губернии, занимавшее 8 258 дес. (9 022 га). Владельцем являлся дворянин Курт Вольдемарович Баг. Но все остальные участки в уезде были небольшими — 2–4 дес. в среднем. Их населяли так называемые чиншевики, а собственником записан некто Кеневич. В целом количество чиншевиков и собственников

распределялось равномерно — 27 и 28 соответственно [8, л. 42]. Мелкие землевладельцы и землепользователи вели крестьянский образ жизни, обладали одним-двумя деревянными жилыми домами и хозяйственными постройками (гумнами, сараями для скота). В годы Первой мировой войны российские власти высылали из этих хозяйств в заволжские губернии иностранных подданных мужчин. На прежнем месте оставались их жены. Они происходили из местных крестьян, с замужеством автоматически получив иностранное подданство. Их мужья либо родились в России, либо были привезены сюда в детском возрасте. Как следует из документов, земля, подлежавшая отчуждению, могла быть как купленной самими иностранцами, так и являться собственностью их жен еще до замужества. Земли чиншевиков принадлежали российским подданным — князьям Радзивиллам, дворянам М. В. Шварцу, Э. Г. Котлубаю, М. И. Мигаю и др. [8, л. 42] Но, несмотря на это, недвижимость вносилась в ликвидационный список. Как видно, отчуждение имущества затрагивало интересы не только «неприятельских» подданных и выходцев.

Минское отделение Крестьянского поземельного банка приступило к осмотру и оценке подлежащей отчуждению недвижимости в Минской губернии только со второй половины июня 1915 г. [9, л. 367–367об]. Но в сентябре 1916 г. Особый комитет по борьбе с «немецким засильем» отмечал отсутствие широких масштабов продаж [6, с. 78]. Большинство землевладельцев не торопились продавать свои участки, предпочитая следить за развитием событий. К тому же летом 1916 г. законы о ликвидации немецкого землевладения в Минской губернии не применялись из-за военных действий [6, с. 71].

В Гродненской губернии по положению от 2 февраля 1915 г. власти постановили конфисковать 6 владений «неприятельских» подданных (927 дес. 2 096 2/3 кв. саж. или 1 013,70 га) и 30 владений «неприятельских» выходцев (34 дес. 7 204 5/18 кв. саж. или 40,42 га) [11, л. 56об–57]. Из иностранных собственников четверо имели австро-венгерское подданство, трое — германское. Наиболее крупными землевладельцами были австро-венгры Мария Тышкевич (559 дес. или 610,71 га) и Фаддей Марачевский (360 дес. или 393,3 га). Площадь остальных земельных участков колебалась от 1 до 4 дес. «Неприятельские» выходцы, судя по списку, были колонистами Белостокского, Бельского, Кобринского, Пружанского, Гродненского уездов и местечка Городок. В список внесены также промышленные предприятия в Бельском уезде, принадлежащие колонистам: красильный завод Вильгельма Карлова Лямпрехта и по одной паровой суконной фабрике у Фридриха Густавова Зыбера и Вильгельма Иоганова Фреймарка [13, л. 6–7об].

В первоначальном варианте списка фигурировали и две крупные колонии в Брестском уезде — Нейбров (1 312 чел.) и Нейдорф (1 261 чел.)

Домачевской волости. Но 16 июня 1915 г. постановлением Гродненского губернского правления обе колонии были освобождены от конфискаций [12, л. 87]. Это объяснялось тем, что их жители происходили не из Германии, а из Голландии [14, л. 57]. Они поселились на Брестчине еще в 1524 г. Земля тогда принадлежала князю Домачеву, который взимал с голландцев арендную плату. При этом они имели право продавать участки, но только лицам из своей среды, обладали личной свободой, платили подати в казну, выставляли рекрутов в армию. Вот что они сами о себе писали 28 мая 1915 г. в прошении об исключении колоний из ликвидационного списка: «За это долгое время все мы слились с коренным населением, так что язык наш не отличается от языка, употребляемого в окрестности нашей, т.е. смешанное русско-польское наречие, а немецкого языка никто из нас не знает и не употребляет, богослужение же происходит на польском языке» [15, л. 3]. Факт богослужения на польском языке «в их кирхе» подтвердил в июне 1915 г. помощник коменданта Брест-Литовской крепости. По его мнению, это был веский аргумент в пользу того, что голландцы действительно слились с местным населением [15, л. 21].

Впрочем, ликвидация имений «вражеских» подданных в Гродненской губернии так и не состоялась. Соответствующие списки публиковались 15 и 22 мая 1915 г. По закону иностранным подданным предоставлялось полгода на то, чтобы самим продать свою недвижимость, российским подданным — 10 месяцев. По истечении срока имения подлежали аресту и продаже с молотка [13, л. 101об–102]. Однако этого не случилось. В августе–сентябре 1915 г. Гродненская и Виленская губернии были оккупированы Германией.

Сведения о количестве фабрик и заводов на Гродненщине, которыми частично или полностью владели подданные воюющих с Россией государств, ограничены. В г. Белостоке числилось 8 таких предприятий. Наиболее интернациональным был состав акционеров Товарищества белостокских мануфактур «Беккер и К°»: 6 германских, 4 французских, 1 британский и 18 российских подданных [12, л. 60об]. Вообще, «вражеских» подданных среди акционеров Гродненщины насчитывалось не более десяти.

В Витебской губернии по закону 13 декабря 1915 г. в список имуществ, подлежащих ликвидации, 15 мая 1916 г. были внесены 20 владений «неприятельских» подданных (24 дес. 865 кв. саж. или 26,61 га) и 44 владения «неприятельских» выходцев (4 559 дес. 339,85 кв. саж. или 4 980,86 га). Только один участок принадлежал юридическому лицу. На этом участке в г. Двинске располагалась электростанция — собственность берлинского Общества электрических предприятий [10, л. 67].

Но реализация на практике законов о ликвидации «немецкого засилья» сталкивалась с множеством проблем. 10 марта 1916 г. старший нотариус витебского окружного суда написал его председателю, что особый учет имуществ иностранных подданных в губернии никогда не велся. Поэтому требовалась чрезвычайно кропотливая работа по проверке крепостных реестров, хранящихся в нотариальном архиве. Все тома содержали около 60 тыс. записей, в которых далеко не всегда указывалось подданство собственников. Это требовало изучения дополнительной документации. Чиновник смог лишь сказать, что со дня объявления войны в Витебской губернии не зафиксировано ни одной сделки по продаже или передаче недвижимого имущества между германскими и австро-венгерскими подданными с одной стороны и российскими с другой. По заявлению старшего нотариуса выборка необходимых сведений началась еще осенью 1914 г. [10, л. 41–41об.]. Но первые результаты поступили в канцелярию витебского губернатора только 28 марта 1916 г. С этого времени в Витебской губернии и началось формирование ликвидационного списка, состоявшего из имений «вражеских» иностранцев и выходцев.

Самыми ранними в канцелярию губернатора пришли выписки из реестра крепостных дел на недвижимые внегородские имущества семейств Петричеков и Плятеров. Первые были потомками австро-венгерского подданного, чеха по происхождению, Карла Вячеславова Петричека. Он вместе с семьей приехал в Люцинский уезд в 1876 г. За 15 тыс. руб. 75 коп. купил у частных лиц имение в 4662 дес. Умер в 1892 г., после чего в соответствии с завещанием имение поделили на указанные доли жена и шесть сыновей. Дети Петричека, кроме умершего Вячеслава, с течением времени получили российское подданство, приписавшись к псковским мещанам. К 1914 г. они уже частично распродали свои участки [10, л. 95–99]. Имение братьев Генриха и Станислава Плятеров находилось в Двинском уезде. Оба имели графские титулы. Станислав Плятер был прусским подданным [10, л. 100–100 об.]. Как сообщал старший нотариус витебского окружного суда в марте 1916 г., другой «немецкой» внегородской недвижимости по губернии не выявлено [10, л. 94]. Однако последующие проверки расширяли ликвидационный список.

В Национальном историческом архиве Беларуси сохранились жалобы некоторых землевладельцев, считавших неправомерным распространение на них закона от 2 февраля 1915 г. Владелец паровой мукомольной мельницы в селе Жулево Невельского уезда Людвиг Бодендорф, прусский подданный, в своем прошении 6 июня 1916 г. написал: «<…> во-первых, я с семьею уроженцы России, немецкого языка не знаем, никогда за границею не были и вероисповедания римско-католического, и

во-вторых, я водворен в России с семейством уже несколько лет тому назад, и в-третьих, мною возбуждено ходатайство о принятии меня в Русское подданство» [10, л. 146].

Все жалобщики стремились обратить внимание властей на то, что они родились в России или очень давно безвыездно в ней живут, породнились с россиянами. Большинство состояло в российском подданстве. Свои жалобы иностранные подданные и выходцы писали в Витебское губернское правление, оттуда они отсылались в Правительственный сенат. С прошениями нередко препровождались в Петроград различные документы: свидетельства о славянском происхождении, о родственниках в рядах действующей армии, о расположении недвижимости в черте городов. Собранные бумаги успешно заверялись местными властями. При этом никакой информации о «политически неблагонадежном» поведении собственников зачастую не представлялось. Основанием для подозрений и репрессивных мер служили, в первую очередь, подданство или даже просто немецкая фамилия.

Социальный состав «вражеских» землевладельцев и землепользователей был представлен всеми сословиями, кроме купцов: крестьянами, колонистами, мещанами, дворянами. Из последних, например, в Витебской губернии в эту группу населения зачислили земского начальника 5-го участка Полоцкого уезда надворного советника Виктора Редера, как сына германского выходца, графов Плятеров, вдову действительного статского советника Александра Краузе, жену полковника Симанкина Марту и др. Как видно, ярлык неблагонадежного элемента навешивался как на «вражеских» иностранцев, так и на некоторых россиян только за их национальность.

Но в редких случаях из ликвидационных списков делались исключения. Сведения о них фрагментарны, но известно, что от конфискации дома в г. Двинске 6 августа 1916 г. была официально освобождена Марта Симанкина, жена российского полковника [10, л. 226]. За земского начальника Виктора Редера в предыдущем месяце лично ходатайствовал витебский губернатор в МВД [10, л. 133]. Однако исход этого дела неизвестен.

Какое же в целом место занимали земельные участки «вражеских» подданных и выходцев из белорусских губерний в совокупном фонде экспроприированных земель на территории Российской империи? Согласно данным Особого комитета по борьбе с «немецким засильем», в ликвидационные списки к 1 января 1917 г. было включено по белорусским губерниям, кроме Могилевской, 71 имение «вражеских» подданных. Это составляло 2,53 % от числа всех имений в 29 губерниях и областях, где действовали законы от 2 февраля и 13 декабря 1915 г. Общая площадь описанных в белорусских губерниях земельных участков

достигла 12 833 дес. (4,34 % от всего конфискационного земельного фонда). Наибольшее количество имений находилось в Минской губернии — 49 суммарной площадью 9 167 дес. Наименьшее — из 4 имений — в Виленской [6, с. 133–134].

Земель «неприятельских» выходцев в белорусских губерниях числилось больше, но относительно 29 губерний и областей Российской империи также незначительно. 103 таких имения (всего 0,25 % от общего количества) в 4 рассматриваемых губерниях общей площадью 27 741 дес. (0,86 %) были внесены в списки. Лидировала Витебская губерния — 50 имений (10 313 дес.). Но по площади земельных участков ее опережала Минская губерния — 21 имение (13 152 дес.). Гродненская губерния отличалась наименьшей площадью имений. Она составила 1 504 дес. и включала 24 имения [6, с. 133–134].

Всего к 1 января 1917 г. по всем прифронтовым губерниям опубликованы ликвидационные списки 44 285 земельных владений (3,5 млн. дес. земли). Из них 2 805 (295 399 дес.) принадлежали «неприятельским» подданным. Но реально конфисковать до Февральской революции удалось лишь незначительную долю земли. К 1 января 1917 г. только 1923 земельных участка (665 892 дес.), принадлежавших российским подданным, были принудительно направлены на публичные торги и проданы в целом за 123 млн. руб. По белорусским губерниям эта сумма на 1 января 1917 г. составила всего 2 346 руб. за 3 имения площадью 34 дес. в Минской губернии [6, с. 135].

Временное правительство взяло курс на свертывание борьбы с «немецким засильем». 11 марта 1917 г. законы от 2 февраля и 13 декабря 1915 г. были отменены [7, л. 43–44].

Отношение местного населения к ликвидации недвижимого имущества «вражеских» подданных и выходцев отображено в отчетах начальников губернских жандармских управлений в Министерство внутренних дел, хранящихся в Государственном архиве Российской Федерации. Начальник Витебского ГЖУ в отчете от 8 ноября 1915 г. писал: «Крестьяне, безусловно, рассчитывают на получение от правительства ликвидированных земель и лесов, принадлежащих подданным воюющих с нами стран, но в местном районе таких земель очень немного. К лицам германского происхождения, оставшимся на местах, отношение населения явно недружелюбно» [1, л. 2 об.].

Отношение местных жителей к представителям воюющих с Россией государств начальник Минского ГЖУ в октябре 1915 г. также охарактеризовал как нетерпимое [2, л. 17].

Начальник Могилевского ГЖУ в отчете № 4923 от 26 октября 1916 г. следующим образом описал восприятие местными жителями так называемого «немецкого засилья»: «Среди населения, а равно и среди

воинских чинов, живет убеждение, что немцы и лица с немецкими фамилиями, занимая, как в гражданском, так и в военном управлении, ответственные должности, являются причиной осложнений в тылу армии и частичных военных неудач. К ликвидации немецких угодий и предприятий население относится с большим одобрением, считая, что это первый шаг к избавлению России от немецкого засилья» [3, л. 28]. В предыдущем отчете № 4132 от 5 декабря 1915 г. подытоживалось: «В общем, крестьяне настроены против всех немцев, проживающих в Империи, и общее их желание, чтобы все немцы без всяких исключений и послаблений были удалены из Государства с отобранием от них всех прав и всей земли». Далее в отчете уточняется, что одну из главных причин неудач на войне крестьяне видят в немцах, как состоящих на государственной службе, так и просто проживающих в России, не делая различий между немцами русско-подданными и германскими. С начала войны поступило много анонимных доносов как на лиц немецкого происхождения, так и на евреев. Последних под влиянием рассказов военнослужащих, прибывающих из действующей армии, стали считать шпионами [3, л. 2–2об]. Впрочем, 22 августа 1916 г. начальник Могилевского ГЖУ сообщил, что ликвидации имений германских подданных в губернии не было из-за их отсутствия [3, л. 4об]. Хотя и признавал, что крестьяне, особенно малоземельные и безземельные семьи, члены которых находятся на фронте, надеются получить дополнительные наделы за счет конфискованных немецких владений [3, л. 28].

По мнению американского историка Эрика Лора, репрессивная политика в Российской империи времен Первой мировой войны имела вначале характер необходимых мер по обеспечению безопасности тыла. Но вскоре наметилось стремление к тому, чтобы навсегда изменить национально-демографические показатели в стране, то есть вычистить «вражеских» иностранцев и выходцев из экономики, сделав ее более мононациональной [4, с. 16]. Архивные источники подтверждают, что конфискация имущества стала важнейшим атрибутом борьбы с «немецким засильем». Она была призвана подорвать экономически неугодные правительству диаспоры, свести практически к нулю их влияние на российскую экономику. При этом подданные Германии и Австро-Венгрии подлежали действию закона от 2 февраля 1915 г. независимо от их социального статуса. Не принимались во внимание долгое проживание в России, отсутствие связей с зарубежьем. Ограничительные меры распространялись и на российских подданных, являвшихся выходцами из стран-противников. В белорусских губерниях германское и австро-венгерское землевладение было незначительным. Но, как показали архивные документы, реализовать в полной мере планы по его ликвидации так и не удалось. Этому препятствовали бюрократическая волокита,

военные действия Первой мировой войны, иностранная оккупация Гродненской и Виленской губерний, а также послабления в законе от 2 февраля 1915 г. Землевладельцам предоставлялся срок до 2 лет на самостоятельную продажу своей собственности. Местные жители, как констатировали жандармские органы, одобряли принудительное отчуждение имущества иностранных подданных. Они надеялись на перераспределение собственности и улучшение личных материальных условий, под влиянием слухов и правительственной патриотической агитации обвиняли российских немцев в трудностях военного времени. Германофобские настроения имели место во всех рассмотренных выше губерниях, но дальше недовольства и угроз в адрес чиновников с немецкими фамилиями дело не шло. Это объяснялось как военным положением, так и малочисленностью самих немцев в белорусских губерниях.

Источники и литература

1. Государственный архив Российской Федерации (далее ГАРФ). — Ф. 102 (Департамент полиции МВД). — Оп. 245. — Д. 167 часть. 12. –Департамент полиции. Витебская губерния.1915–1916 гг.
2. ГАРФ. — Ф. 102. — Оп. 1915. — Д. 167. — Часть 44. — Департамент полиции. Минская губерния. 1915–1916 гг.
3. ГАРФ. — Ф. 102. — Оп. 1915. — Д. 167. — Часть 45. — Департамент полиции. Могилевская губерния. 1915–1916 гг.
4. Лор, Э. Русский национализм и Российская империя: Кампания против «вражеских подданных» в годы Первой мировой войны / Эрик Лор; перевод с английского В. Макарова. — М.: Новое литературное обозрение, 2012. — 304 с.
5. Савинова, Н. В. Российский национализм и немецкие погромы в России в годы Первой мировой войны (1914–1917 гг.): дис. …канд. ист. наук: 07.00.02 / Н. В. Савинова; Санкт-Петербургский государственный университет. — СПб., 2008. — 249 с.
6. Соболев, И. Г. Борьба с «немецким засильем» в годы Первой мировой войны / И. Г. Соболев. — СПб. : Изд-во Рос. нац. б-ка, 1998. — 176 с.
7. Национальный исторический архив Беларуси (далее НИАБ). — Ф. 299 (Минское губернское правление). — Оп. 2. — Д. 16101. — Об отчуждении недвижимого имущества австрийских подданных А. и А. Богачей в деревне Фастовичи Мозырского уезда. 17.03.1915–11.04.1917 г. — 47 л.
8. НИАБ. — Ф. 299. — Оп. 2. — Д. 16102. — По жалобе австрийской подданной Ю.-Э. В. Даляк об отчуждении недвижимого имущества в им. Давидполь (Затишье) Минского уезда. 05.05.1915–16.04.1916 г.
9. НИАБ. — Ф. 300 (Минское городское полицейское управление). — Оп. 1. — Д. 65. — Обязательные постановления и объявления начальника Минского военного округа, минского губерна-

тора, циркуляры Департамента полиции и минского губернатора. 28.05.1914–05.04.1915 г. — 514 л.

10. НИАБ. — Ф. 1430 (Канцелярия витебского губернатора). — Оп. 1. — Д. 50068. — Переписка Крестьянского поземельного банка и гражданских губернаторов по вопросу о прекращении землевладения и землепользования австрийских, венгерских, германских и турецких подданных в России. 18.02.–26.12. 1916 г.
11. НИАБ в г. Гродно. — Ф. 2 (Гродненское губернское правление). — Оп. 25. — Д. 3368. — Циркуляры МВД о запрещении австрийским, германским, венгерским и турецким подданным приобретения недвижимого имущества, о продаже конфискованных имуществ и по другим вопросам. 02.02.1915–07.09. 1916 г.
12. НИАБ в г. Гродно. — Ф. 2. — Оп. 25. — Д. 3369. — О сборе сведений об имущественном положении австрийских, венгерских и германских подданных по губернии. 05.12.1914–22.12.1916 г.
13. НИАБ в г. Гродно. — Ф. 29 (Гродненское отделение Крестьянского поземельного банка). — Оп. 1. — Д. 2044. — Наряд Гродненского отделения Крестьянского поземельного банка с перепиской по вопросу о приобретении Крестьянским банком земель немецких, австрийских, венгерских и турецких подданных и выходцев из них. 28.04.– 27.08.1915 г.
14. НИАБ в г. Гродно. — Ф. 31 (Гродненское губернское управление земледелия и госимуществ). — Оп. 1. — Д. 1355. — О ликвидации имущества иностранных подданных, проживавших в Гродненской губернии, в связи с продажей другим лицам. 06.04.1915–09.05.1917 гг.
15. НИАБ в г. Гродно. — Ф. 31. — Оп. 25. — Д. 3370. — Об исключении из списка подлежащего конфискации недвижимого имущества, принадлежащего крестьянам колоний Нейбров и Нейдорф Брестского уезда. 16–26.05.1915 г.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 28.01.2014

В. В. Урублеўскі

Сялянская штодзённасць у адлюстраванні наратыўных крыніц XVIII ст.

Наратыўныя крыніцы ўяўляюць сабой асобны блок крыніцазнаўчай праблематыкі. Створаныя па жаданні асобных людзей, а не дзяржаўна-рэлігійных інстытутаў, яны адлюстроўваюць гістарычныя з'явы і падзеі ў пэўным ключы, а менавіта праз трансляцыю асаблівай сістэмы каштоўнасцей, уласнага вопыту і аўтарытэтнага меркавання іншых.

У той час, калі інвентары, візіты-апісанні, метрычныя кнігі фіксуюць аспекты штодзённасці, строга вызначаныя мэтай складання дакумента і фармулярам, матэрыялы мемуарнага характару падаюць інфармацыю больш спрошчана, але эмацыянальна насычана. Яе перадача суб'ектыўная, бо грунтуецца на значным індывідуальным падтэксце, а менавіта праяўляецца праз асобу чалавека-складальніка, праз яго інтарэсы, погляды, адчуванні, надзеі. Па сутнасці, мемуары адносяцца да шэрагу ўласна асабістых крыніц, якія «найбольш паслядоўна ўвасабляюць працэс самапазнання асобы і ўзаемаадносіны паміж асобамі» [8, с. 466].

Успаміны — гэта інфармацыя, якую аўтар перадае праз нейкі час пасля пэўных падзей. Дзённікі — штодзённыя запісы аб падзеях, людзях, пачуццях, якія вядуцца аўтарам на працягу пэўнага перыяду жыцця. Успамінам уласцівы рэтраспектыўны погляд на падзеі, што дае падставу для іх глыбейшага асэнсавання. Апавядальная плынь ачышчаецца ад усяго дробязнага, неістотнага. Адначасова губляюцца дэталі, знікаюць нюансы, крыніца становіцца менш дакладнай і аўтарытэтнай. Дзённікі дэталізуюць падзеі, глыбей раскрываюць іх стадыі, адзначаюць другарадныя з'явы. Аўтар дзённіка не ставіць перад сабой мэту абавязковай высновы, яго задача — толькі раскрыць ход дзённых падзей у іх паслядоўнасці, што дазваляе даследчыку адзначаць асабліва частыя заняткі і зацікаўленасці, якія знайшлі адбітак у дзённіку. Яны пішуцца пад пэўным эмацыянальным уздзеяннем ад падзеі, аўтар яшчэ не можа ўзняцца да асэнсавання яе ў цэлым, адлюстроўвае толькі асобныя бакі рэчаіснасці. Найбольш ідэальнымі ў мемуарнай літаратуры з'яўляюцца творы, у якіх дзённікавая дакладнасць спалучаецца з сінтэтычнасцю, уласцівай успамінам (калі аўтар пры складанні апошніх карыстаўся сваімі ранейшымі дзённікавымі нататкамі) [19, с. 130–131].

Ідэалогія эпохі Асветніцтва надала штуршок да актывізацыі жанраў мемуарыстыкі і вядзення дзённікаў. Пераломная эпоха паступовага пераходу еўрапейскай свядомасці ад феадальнага да буржуазнага грамадства непакоіла многіх прадстаўнікоў дзяржаўнай і царкоўнай эліты, якія лічылі неабходным адзначаць для сябе і нашчадкаў асноўныя моманты і з'явы са свайго жыцця.

У манаграфіі Д. В. Лісейчыкава, прысвечанай штодзённаму жыццю ўніяцкага парафіяльнага духавенства, пэўная ўвага надаецца вядзенню дзённікаў уніяцкімі святарамі, да ліку якіх адносіцца святар з в. Цярэса Браслаўскага пав. Ян Забароўскі. Фрагмент яго дзённіка, адшуканага ў візітах уніяцкіх храмаў, змяшчае запісы за 1748–1799 гг. Акрамя занатовак адносна стану царкоўнай гаспадаркі, Забароўскі робіць запісы этнаграфічнага зместу, а менавіта апісвае «рускія» звычаі, распаўсюджаныя ў парафіі сярод сялян-вернікаў (святкаванне дзён памяці святых Міколы, Юр'я, Пятра, Іллі-Прарока). Іншыя з'явы са штодзённага жыц-

ця парафіі знайшлі сваё адлюстраванне ў хроніцы мясцовых падзей: пабудове карчмы ў прылеглым маёнтку, здабыванні моху на суседніх балотах, «супрацьстаянні» мядзведзям, якія апанавалі ягаднікі і разганялі людзей, што ішлі на царкоўную літургію [9, с. 121].

У сваіх успамінах знакаміты публіцыст і журналіст Фадзей Венедыктавіч Булгарын (1789–1859) прыгадвае пэўныя эпізоды са штодзённага жыцця шляхты ў пераломную эпоху ўваходжання Беларусі ў склад Расійскай імперыі [2, с. 13–36]. Тут жа ён успамінае і пра агульныя адмоўныя адносіны да шляхты з боку сялянства, якія сталі вынікам адпаведных стасункаў з імі прадстаўнікоў названага прывілеяванага саслоўя. Па словах Ф. Булгарына, «пасяляне тады ўвогуле былі прыгнечаны, а ў Літве і Беларусі іх становішча было горш, чым неграў» [10, с. 206].

Асобны раздзел у другім томе свайго апісання штодзённага жыцця ў Рэчы Паспалітай перыяду панавання караля Аўгуста III мемуарыст Андрэй Кітовіч (1728–1804) прысвяціў «халопскім звычаям», дзе ім падрабязна апісваюцца народныя строі [22, s. 642–645].

Адной з характэрных рыс мемуараў з'яўляецца тое, што ў адлюстраванні сялянскай рэчаіснасці іх аўтары рэдка называюць прыгонных па прозвішчы. Яны ўяўляюцца шляхетным пісьменным панам бязлікай і шэрай масай, якая па праву нараджэння не можа адыгрываць ніякай значнай ролі ў грамадска-палітычным жыцці краіны. Так, Марцін Матушэвіч (1714–1773) толькі ў двух выпадках прыводзіць прозвішчы сялян — кур'ёзу і забойства [10, с. 199]. Першы раз гэта быў прыкры для яго эпізод з Ганнай Шымчыхай Гінчуковай, якая па прымусу сваіх паноў, называла сябе яго цёткай [25, s. 148]. Другі раз — выпадак забойства ў 1761 г. яго «мікшыцкага падданага Данілы Кузьмічка, што было здзейснена сялянамі высокаўскага пробашча ксяндза Бухавецкага, заклятага ворага мемуарыста» [25, s. 180]. Двое з трох нападаўшых за выкананне загаду ксяндза былі пакараны ў мястэчку Славацічы ў 1763 г.: адзін смерцю, другі — ударамі бізуна [25, s. 278].

Звычайная будзённая сялянская праца характарызуецца мемуарыстамі ў агульных даволі размытых рысах. Іншае значэнне надаецца асаблівым сітуацыям, такім, як голад і галеча. Неабходнасць трымаць вытворчыя сілы на належным узроўні прымушала паноў ажыццяўляць эканамічную падтрымку сялян падчас нястачы. Так, у 1757 г. Матушэвіч, адзначаючы недахоп на сялянскіх дворышчах жыта, наймаў сялян на работу ў сваім маёнтку за грошы, якія можна было патраціць затым на куплю жыта ў яго, «у двары ці ў Высокім рынку» [25, s. 295]. Акрамя гэтага сялян кармілі ў пана абедам, вячэрай, а ў дадатак давалі па бітым шастаку. Ініцыятыва Матушэвіча па дапамозе сялянам аказалася ўзаемавыгаднай — падданыя «расцерабілі яму сенажаць, прывялі ў парадак сад і агарод» [10, с. 208].

Антысанітарыю ў карчме роднага мястэчка Мір апісвае Саламон Майман (1753–1800). Ён адзначаў, што ў адным кутку карчмы тулілася сям'я яго бацькі, у другім — на земляной падлозе сядзелі яе наведвальнікі-сяляне [24, s. 1, 8, 9].

Мемуарная літаратура другой паловы XVIII ст. у параўнанні з ранейшымі часамі ў апісанні сялянскага ладу жыцця адзначаецца большым гуманізмам. Калі напачатку XVIII ст. падканцлер ВКЛ Крыштаф Завіша (1666–1721) шчыра здзіўляецца «смешным і дзівосным вясковым цырымоніям», якія яго рассмяшылі і ўсцешылі [10, с. 210], то ў канцы таго ж стагоддзя паэт-сентыменталіст Францішак Карпінскі (1753–1800), будучы арандатарам і ўладальнікам фальваркаў каля Пружан і Гародні, працаваў разам з сялянамі ў полі, вучыў грамаце вясковых дзяцей, паважаў нормы звычаёвага права [21, s. 121].

Галеча ў вёсцы XVIII ст. была досыць істотнай, што прымушала сялян пакідаць свой асяродак у спадзяванні на лепшую долю. Мемуарыст Залескі фіксуе, што нават цяжкі і незайздросны лёс рэкрута палохаў менш, чым жыццё ў вёсцы. Ім паказаны галодны селянін, які ў 1797 г. згадзіўся за дваццаць рублёў пайсці за іншага на вайсковую службу [10, с. 209].

Верагодным з'яўляецца тое, што многія бабылі і кутнікі або бедныя сяляне-гаспадары, па прыродзе няздатныя да добрага вядзення гаспадаркі, мелі іншыя здольнасці, для рэалізацыі якіх не было неабходных перадумоў. Нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы жыцця, якія часта хавалі пад сабой чалавечыя таленты, народны інтэлектуальны патэнцыял усё ж прадстаўлены ў мемуарах пры ўпамінанні асабліва вядомых прадстаўнікоў сялянскага асяроддзя. А. І. Мальдзіс, спасылаючыся на ўспаміны С. Рэйтана і Г. Герыч, згадвае селяніна-рахункавода, падданага князя Гераніма Радзівіла, і сялянскага хлапчука Каролека з маёнтка Беразова, які, атрымаўшы адукацыю, стаў цудоўным садоўнікам, агароднікам, лекарам, а таксама красамоўным казачнікам [10, с. 209].

Нясхільнасць нешматлікіх пісьменных сялян да напісання мемуараў як малапатрэбнага для штодзённага прагматычнага жыцця занятку не дае магчымасці зірнуць на штодзённасць сялянства праз адлюстраванне яе вачыма саміх носьбітаў традыцыйнай аграрнай культуры. Згадку аб вядзенні селянінам, народжаным у XVIII ст., мемуараў удалося адшукаць ва ўспамінах Фёдара Пятровіча Бельскага (1900–1974), краязнаўцы з вёскі Забалацце Уздзенскага раёна Мінскай вобласці. Ён сведчыў, што яго прадзед Пятрусь Бельскі, самастойна навучыўшыся чытаць і пісаць і «адбыўшы 25 гадоў у рэкрутах», вярнуўся на радзіму і пакінуў цікавыя пісьмовыя ўспаміны аб сваім жыцці. Аднак застаецца толькі здагадвацца, наколькі яны былі рэчаіснымі, паколькі да нашага часу не зберагліся

[14, с. 615–616]. У дадзеным кантэксце цікавасць таксама ўяўляюць успаміны іншага беларускага селяніна Якава Чабодзькі (1798–1901), які, будучы народжаным на рубяжы XVIII і XIX стст., заспеў, запомніў і падзяліўся звесткамі аб асаблівасцях жыцця беларускага селяніна ў першыя дзесяцігоддзі пасля далучэння зямель Рэчы Паспалітай да Расійскай імперыі [7].

Прыкладам вядзення дзённікавых запісаў у адзначаны перыяд з'яўляецца дзённік Рафала Слізня (каля 1750–1817), прадстаўніка сапраўднай дынастыі мемуарыстаў, уладальніка маёнткаў Княгінін і Дзядзілавічы, грамадскага дзеяча Рэчы Паспалітай. Крыніца зберагаецца ў фамільным фондзе роду ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў г. Гродна і ахоплівае перыяд 1774–1779, 1794–1795 гг. (усяго 121 аркуш). У адносінах да штодзённасці найбольш інфарматыўнай можна лічыць першую частку першага перыяду, а менавіта з 15 ліпеня 1774 г. па 15 жніўня 1776 г., калі аўтар не прымаў значнага ўдзелу ў грамадска-палітычным жыцці краіны [15]. Гэты раздзел насычаны апісаннем гасцяванняў, картачных гульняў, тэатральных прадстаўленняў, кліматычных змяненняў, архітэктурнага аблічча гарадоў. У сваіх падарожных нататках Рафал Слізень таксама надае немалую ўвагу сялянам, сустрэтым падчас яго вандровак. У яго нататках знаходзяць адбітак заўвагі адносна сялянскай адукацыі ў краі. 6 лістапада 1775 г. ён вяртаўся з Бярозы Картузскай праз паселішча Дзяды, дзе «пры дзвюх корчмах мураваная царква» і адзначаў, што, нягледзячы на такую перавагу негатыўнага над пазітыўным, пры панскім двары арганізавана школа для дзяцей «простага стану». Дваццаць дзяўчат пад наглядам гувернанткі навучаліся пісаць, чытаць, займацца «рознымі работамі» [6, арк. 41].

Штодзённыя стасункі пана з уласнымі падданымі рэдка знаходзяць адбітак на старонках яго дзённіка. Звычайна яны зводзіліся да дамоўных адносінаў гаспадарчага характару. Так, 22 сакавіка 1775 г. Слізень прапаноўваў сваім падданым за пэўны заробак апрацоўваць брусы на патрэбы фабрыкі ў Дзядзілавічах. Асабліва актуальным ён палічыў гэты занятак для найбольш убогіх немаёмасных сялян, якія атрымалі магчымасць зарабіць [6, арк. 30–30 адв.]. Пазней, у запісе за 13 мая, гаспадар пералічвае імёны васьмі парабкаў, якія працавалі на фабрыцы і пагадзіліся на заробак у памеры паўкварты талера ў месяц. Акрамя гэтага, у месяц для патрэб кожнага працоўнага выдаткоўвалася па чвэрці жыта, чвэрці ярыны, паўгарца солі, чатыры фунты свініны, паўгарца водкі [6, арк. 33 адв.]. У дзённіку ў дачыненні да сялянскага жыцця знайшлі праявы і цікавыя здарэнні. 28 красавіка 1775 г. селянін з вёскі Кленнікі і працоўны Дзядзілавіцкай фабрыкі Курыла Папко прынёс на панскі двор скуру ваўка, забітага, паводле ўласнага сцвярджэння, камянём [6, арк. 32].

Пад своеасаблівым ракурсам разглядае штодзённае жыццё сялянства публіцыстыка XVIII ст. Назіранні аўтараў разнастайных публіцыстычных нататак і заўваг перадавалі пазіцыю прадстаўнікоў пэўных сацыяльных колаў на праблемы палітычага ладу, сацыяльна-эканамічнага развіцця, стану культуры. Ідэалогія эпохі Асветніцтва распаўсюдзілася на тэрыторыі Рэчы Паспалітай у час асабліва цяжкага крызіснага стану, што напаткаў яе ў другой палове XVIII ст. Шматлікія публіцысты, разважаючы над праблемамі пераўладкавання грамадства, прычынай заняпаду дзяржавы лічылі процілегласць паміж шляхтай і сялянствам, «якія не знаходзіліся ў стане прамога варагавання паміж сабой толькі ў сувязі з поўнай забітасцю і некультурнасцю апошніх» [12, с. 97].

Матэрыялы публіцыстыкі, характарызуючы сялянскае пытанне, закранаюць тыя яго аспекты, якія блізка звязаны са штодзённасцю, а менавіта быт як знешняе праяўленне і пачуцці як унутранае адасабленне. Пры гэтым найбольш цікавымі з'яўляюцца не ўласныя назіранні публіцыстаў, а іх спасыланне на словы і погляды саміх прадстаўнікоў сялянскага саслоўя.

Найбольш грунтоўным даследаваннем публіцыстыкі Рэчы Паспалітай XVIII ст., прысвечанай сялянскаму пытанню, адзначыўся рускі даследчык Венядыкт Аляксандравіч Мякоцін (1867–1937). Менавіта яго дэталёвы агляд публіцыстычных брашур дазваляе назіраць асноўныя падыходы ў асвятленні сялянскага пытання з пазіцый перадавой шляхты і перадавога сялянства, якія склаліся да ажыццяўлення сур'ёзных грамадска-палітычных і сацыяльна-эканамічных крокаў [12].

Інфарматыўным дакументам, адшуканым у бібліятэцы Чартарыйскіх, а затым апублікаваным князем Любамірскім, з'яўляецца «Праект, знойдзены ў Тарчыне пасля кірмаша на Святую Троіцу ў 1767 г.». Дадзены дакумент уяўляе сабой адозву да шляхты, напісаную ад імя сялян, і хоць адносіцца да тэрыторыі этнічнай Польшчы, але таксама сведчыць пра ўсё тое, што было характэрна і для Беларусі. Гэты «праект» дазваляе зірнуць на сялянскую штодзённасць не вачамі шляхты, а з пазіцыі сялянства. Тут згадваецца аб прыгнёце, які сяляне церпяць ад «духавенства, жаўнераў пры выдачы ім фуражу, ураднікаў, якія жорстка абыходзяцца з імі». Аўтар скардзіцца на звычай аддаваць корчмы ў арэнду яўрэям, на цяжкасць доступу сялян да памешчыкаў і нават на тое, што яны прымушаюць мужыцкіх сыноў браць замуж уласных наложніц [12, с. 103–104].

Патрабаванні сялян зводзіліся да наступнага: 1) забеспячэнне права вольнага карыстання ляснымі рэсурсамі; 2) усталяванне непарушнай спадчыны на зямельныя надзелы; 3) дарожная павіннасць («дарожчына») павінна адбывацца не часцей за два разы на год на адлегласць не больш за 12 міляў; 4) вартавая павіннасць («старожчына») павінна

адбывацца толькі ў адносінах да двара; 5) сялянская сям'я павінна карыстацца асабістай свабодай з правам самавольнага пераезду на іншае месца, але пры ўмове пасялення на яе былым надзеле новых пасяленцаў; 6) прадстаўленне права карыстацца выганамі на чыншавай аснове (па два злотых з каня); 7) публічныя нарады не могуць адбывацца без удзелу як мінімум чатырох прадстаўнікоў ад сялянства. Немалаважнай тэзай адозвы з'яўляецца ўпэўненасць у тым, што пры выкананні гэтых патрабаванняў сялянства з гатоўнасцю выступіць разам са шляхтай на барацьбу з захопнікамі ці іншаверцамі. Завяршаецца дакумент пагрозай помсты, якая адбудзецца ў тым выпадку, калі «якая-небудзь вёска або селішча ўхіляцца ад гэтага акта» [12, с. 105].

Аналіз тэксту, праведзены Мякоціным і польскім даследчыкам Тадэвушам Сільвестрам Корзанам (1839–1918), прывёў абодвух да агульнай высновы, што для аўтарства шляхціча гэты дакумент вельмі паглыблены ў сялянскую спецыфіку, з якой незнаёмыя прадстаўнікі прывілеяванага саслоўя. Акрамя таго, мае месца прамая пагроза шляхце, што дадаткова пазбаўляе такі варыянт слушнасці. Верагодней за ўсё, яго аўтарам быў выхадзец з сялянскага саслоўя, які атрымаў пэўную адукацыю [12, с. 105]. Дадзены факт надае дакументу ўнікальнасць, робіць каштоўным помнікам уласна сялянскіх поглядаў на дзяржаўны і грамадскі лад у краіне.

Пэўнае святло на сялянскі светапогляд пралівае твор асветніка, публіцыста ксяндза Станіслава Ваўрынца Сташыца (1755–1826), апублікаваны ў 1785 г. у Геліясбергу (па другіх звестках — у 1787 г. у Варшаве) пад назвай «Роздумы над жыццём Яна Замойскага, вялікакняскага канцлера і гетмана, прыменены да цяперашняга стану польскай Рэчы Паспалітай». Дадзены твор змяшчае ўсяго некалькі выпадковых згадак пра Яна Замойскага, аднак сялянскае пытанне займае ў кнізе адно з найбольш значных месцаў [12, с. 110].

С. В. Сташыц, як і невядомы аўтар папярэдняга твора, у некаторых месцах сваёй працы спасылаецца на пачутыя ад сялян характарыстыкі іх бяспраўнага становішча. Так, ён перадае аповяд аднаго састарэлага селяніна аб сваім лёсе, зламаным з-за таго, што шанаванне ім уласнай працы і хрысціянскіх запаветаў натыкалася на скупасць і блюзнерства з боку яго паноў, ад якіх ён вымушаны быў уцячы, не здзейсніўшы ніякага злачынства [12, с. 112–113].

Другі выпадак, пра які згадвае С. В. Сташыц, не менш яскравы. У той час як у першым перадаюцца праявы прыватнай штодзённасці, у другім характарызуецца грамадская пазіцыя сялян па шэрагу хвалюючых іх пытанняў. Напрыклад, апісваюцца масы прыгонных, якія атачалі будынак заканадаўчага сходу, дзе ў гэты час знаходзіўся кароль Рэчы Паспалітай. Па надпісах на шыльдах, якія яны трымалі, публіцыст

зразумеў іх настойлівае жаданне звярнуць на сябе ўвагу кіраўнікоў краіны: «Нас 4 мільёны 500 тысяч карыснейшых жыхароў, і хаця па сваім стане мы, як быццам, адрозніваемся ад людзей, але рэлігія адкрывае нам, што ў нас адзін пачатак з іншымі людзьмі, навучаючы, што ўсе мы паходзім ад аднаго бацькі, што кожны другі чалавек наш бліжні; таму мы абвяшчаем любоў да бліжняга, не просячы ні аб чым, акрамя таго, каб нам мець роўную з усялякім другім чалавекам справядлівасць, каб той, хто нас можа пакрыўдзіць, не быў ва ўласнай справе ні бокам, ні суддзёй» [12, с. 113].

Акрамя гэтага, у дэкламацыях сялян згадваецца аб неабходнасці пазбавіць памешчыкаў права заключаць шлюбы паміж сялянамі, што магло прыводзіць да замыкання кроўна-роднасных сувязей у межах аднаго паселішча і адпаведна да генетычных захворванняў. Трэцім сур'ёзным патрабаваннем было наданне сялянскай моладзі права свабоднай працы ўсімі дазволенымі ў краіне спосабамі адпаведна іх здольнасцям і ахвоце, права карыстацца здабытымі сродкамі па сваім уласным разуменні, «калі не адна вёска, але ўся краіна будзе іх радзімай» [12, с. 113–114].

У даследаванні намі закранаецца толькі аспект знешняга праяўлення штодзённасці і ўнутранага светапогляднага ўспрымання рэчаіснасці, але неабходна зазначыць пра вялікую ролю, якую публіцыстычная праца С. В. Сташыца адыграла ў ажыўленні абмеркавання сялянскага пытання ў літаратуры [12, с. 118].

У брашуры невядомага аўтара «Практычныя заўвагі аб польскіх прыгонных у дачыненні да іх свабоды і няволі» [28] ад імя сялян сцвярджаецца, што неадукаванасць, забабоны і п'янства ў іх асяроддзі — гэта прамыя вынікі прыгоннага права. Адсутнасць ахвоты да працы і асветы вынікае з адсутнасці волі і прыватнай уласнасці, якія не спрыяюць паляпшэнню гаспадарчага і маральнага ладу жыцця. Чалавеку, які зведаў гвалт, не даступна і паняцце дабрачыннасці. Гаспадарчая штодзённасць праяўляецца ў адсутнасці добрых прылад працы, патрэбнай колькасці валоў і кароў, недахопе грошай у сувязі са шматлікімі выплатамі, наяўнасці цераспалосіцы [16, с. 123, 129]. Усё гэта разам робіцца прычынамі шматлікіх бунтаў. Аўтар хадайнічае аб увядзенні для сялян сістэмы «закупніцтва» (купля зямлі за вызначаную суму з далейшай выплатай чыншу за яе на карысць пана або дзяржавы) і ўсталяванні кантрактаў паміж сялянамі і шляхтай, недатыкальнасці асобы і маёмасці, ліквідацыі паншчыны і іншых павіннасцей, свабоды пераходаў і інш. [16, с. 131, 134–135].

Працягваючы тэму, публіцыст львоўскі кашталян Тадэвуш Морскі (1754–1825) у адказ на тэкст дадзенай брашуры заўважае, што бунтаваць можа толькі той, хто парушае закон, для «сялян жа Рэчы Паспалітай законы не існуюць» [26, s. 14–15]. Прычынай падобнай сітуацыі

называецца менавіта цяжкае становішча прыгонных, «дзякуючы якому яны лёгка паддаюцца разнастайным замежным унушальнасцям» [26, s. 18–19]. Морскі патрабуе асветы для народа, мяккіх чалавечных адносін і цярпімасці да сялян.

Некаторыя з тэкстаў публіцыстычнага жанру прама перадаюць адкрытыя сімпатыі сваіх аўтараў да сялян. Так, аўтар ананімнай брашуры пад назвай «Агульныя заўвагі аб земляробчым і гарадскім саслоўі», выдадзенай у Варшаве ў 1789 г., называе сялян «людзьмі, найбольш вартымі павагі ў земляробчай краіне, якія перадусім маюць права на беражлівыя адносіны з боку ўлады, але намі пагарджаюцца» [27, s. 25–26]. З абурэннем ён выказваецца аб адносінах паноў да сваіх падданых: «Мы, часовыя ўласнікі земскіх маёнткаў, прадаем іх (сялян. — *В. У.*) адзін аднаму на падставе інвентара, на вечны час або, хутчэй, на нікчэмную вечнасць нашага жыцця, што цягнецца некалькі дзясяткаў гадоў. Іх дзяцей, народжаных звычайна голымі, мы пакідаем у спадчыну сваім дзецям, якія нараджаюцца ў кляйнотах … Дваццаць адзін год таму мы мелі права забіваць іх … толькі закон трактата 1768 г. нагадаў нам, што наша галава злеплена з той жа гліны, што і сялянская» [27, s. 30–31]. Улада шляхты засноўваецца на яе абязальніцтве абараняць астатніх жыхароў, але падзелам Польшчы гэта абязальніцтва парушана. Падзел гэты не мог бы адбыцца, калі б сяляне і мяшчане не бачылі для сябе ў суседніх дзяржавах лепшай долі, чым у Польшчы [27, s. 32–37]. Няшчасці Польшчы будуць доўжыцца да тых часоў, пакуль яна не ўпэўніцца, «што пад народным дабрабытам патрэбна разумець шчасце не аднаго класа грамадзян, але ўсіх разам узятых жыхароў Рэчы Паспалітай» [27, s. 46].

Публіцыстычныя нататкі таксама асвятляюць факт адрознення асаблівасцей жыццядзейнасці сялян у прыватных і духоўных маёнтках. Фердынанд Аўгуст Грывеніц згадвае, што ў духоўных валоданнях узаемаадносіны сялян з уладальнікамі насілі на сабе адбітак мяккасці, уласцівай прадстаўнікам духавенства. У другім месцы той жа аўтар сведчыць, што ў духоўных маёнтках «менш адступалі ад законаў і абавязкаў» [20, s. 18, 32].

Свой погляд на прыватнае, грамадскае і гаспадарчае жыццё селяніна з вярхоўяў Нёмана ў сваёй брашуры для варшаўскага гаспадарча-эканамічнага таварыства выклаў грамадскі і гаспадарчы дзеяч Ігнацый Ляхніцкі (1755–1830). У прыватнасці, ім адзначаюцца перспектывы асветы і верагоднасць вызвалення сялян ад прыгоннай залежнасці, што можа адкрыць перад імі «дарогу для вольных розумаў» [23].

Каларытная постаць дзяржаўнага дзеяча Расійскай імперыі і паэта Гаўрылы Раманавіча Дзяржавіна (1743–1816) прадстаўляе кола рускіх чыноўнікаў, якія, наведваючы беларускія землі са спецыяльнымі даручэннямі, не маглі не адзначыць тое, што кідалася ім у вочы найбольш.

Сітуацыю, якую сенатар Дзяржавін назіраў на землях Беларускага генерал-губернатарства падчас сваіх візітаў у 1799–1800 гг., ён апісаў у «Запісках», што пабачылі свет у 1859 г. Вызначаны мясцовымі панамі парадак і памер выплаты падаткаў, выканання павіннасцей даводзіў сялян да сур'ёзнай галечы ў другой палове XVIII ст. і пэўным чынам характарызаваў іх штодзённасць. Г. Р. Дзяржавін заўважае вялікі недахоп у сялян хлеба, харчам называецца «параная трава, перасыпаная малой колькасцю мукі або круп». Асаблівая галеча была адзначана ў вёсках Агінскага пад Віцебскам, дзе, увайшоўшы ў хаты, ён знаходзіў «худых і бледных, быццам мёртвых» сялян. Пасля пераводу адной з вёсак пад апеку губернскага праўлення ў суседніх уладаннях актывізавалася дзейнасць па забеспячэнні сялян хлебам. Пэўнай акалічнасцю тагачаснай сялянскай штодзённасці з'яўлялася і шкодная для сялян дзейнасць яўрэяў па выманьванні ў іх хлеба для патрэб вінакурных заводаў, а таксама памешчыкаў, якія прымусова спойвалі ў корчмах сваіх падданых. Шэраг захадаў Г. Р. Дзяржавіна па паляпшэнні стану сельскага насельніцтва дазволіў на час прыпыніць голад [5, с. 201–202].

Адзначаючы гаротны стан сялян у розных частках усходняй Віцебшчыны, Г. Р. Дзяржавін згадвае вялікую колькасць страў раслiннага паходжання, якія з'яўляліся асноўным сялянскім рацыёнам і вылучаліся кожная сваім арэалам ужывання. Ён адзначаў, што ў маёнтках Заранкаў і Гуркаў сяляне «зусім не маюць хлеба, а ядуць шчаўе, сныць і лебяду і іншыя травы і карэнні, густа зварыўшы і напарыўшы ў гаршках накшталт кашы...». У маёнтку Драздоўскага «сяляне елі барду, звараную з некаторай часткаю мукі і шчаўя». У вёсцы Гарбачы пад Дуброўнай, «знаходзячыся зусім без харчу, пачалі яны жаць новае жыта і, сушачы ў печах па два, па тры снапы, вымаючы рукамі з каласоў зернейка, ядуць яго, распарваючы накшталт кашы». На падставе атрыманага данясення Дзяржавіна генерал-пракурор П. Х. Абальянінаў, дадаючы свае звесткі ў справаздачы імператару Паўлу I падсумоўваў, што нават «у самыя лепшыя хлебародныя гады ў тым краі, асабліва вясной, напярэдадні новага жніва, сяляне мелюць пятую частку жыта з чатырма часткамі мякіны, а іншыя ядуць звараное шчаўе або з вотруб'яў і жамерынаў вараную кісліцу». Дадзенае сцвярджэнне фактычна падкрэслівае, што голад з'яўляўся нязменным спадарожнікам сялянскага жыцця ў канцы XVIII ст. [5, с. 181].

Матэрыялы публіцыстыкі садзейнічаюць даследаванню быту, а таксама глыбінных матываў паводзін і настрояў сялянскага насельніцтва, прычын многіх грамадскіх з'яў, якія апанавалі Рэч Паспалітую ў другой палове XVIII ст. Тым самым разам з іншымі крыніцамі дазваляюць рэканструяваць знешні і ўнутраны бакі прыватнага, грамадскага і гаспадарчага штодзённага жыцця ў правінцыі.

Адносіны чалавека да іншага этнасу, светапогляд, узровень выхавання і адукацыі накладалі пэўны адбітак на адлюстраванне той рэчаіснасці, якая прадстаўлялася яго вачам падчас вандровак у блізкае ці далёкае замежжа.

У XVIII ст. іншаземцы наведвалі Беларусь з азнаямляльнымі, службовымі і вайсковымі мэтамі і пакідалі разнастайныя па змесце і эмацыянальныя па насычанасці запісы, якія апавядаюць пра парадак і лад мясцовага жыцця, у т.л. у сельскай правінцыі.

Англійскі падарожнік і гісторык Вільям Кокс (1747–1828), які наведваў Беларусь хутчэй з экскурсійным намерам, грунтуючыся на сваіх назіраннях за побытам сялян Швейцарыі, прыйшоў да наступных заключэнняў: «Швейцарац — чалавек адкрыты, шчыры, некалькі грубаваты, але гатовы аказаць вам паслугу; яго абурае самая нязначная грубасць і ён не дазваляе беспакарана прынізіць сябе. Польскія сяляне, наадварот, прыніжаныя, рабалепныя і ліслівыя: жадаючы выказаць нам сваю павагу, яны кланяліся да зямлі і, зняўшы капялюш ці шапку, трымалі яе ў руках да таго часу, пакуль мы не знікалі з вачэй; толькі пабачыўшы нашу карэту, яны адразу ж спынялі свае фурманкі; адным словам, усе іх паводзіны сведчылі аб самым агідлівым рабстве, пад ярмом якога яны стагналі» [4, с. 179].

Наведваючы мануфактуры ў Гародні, Кокс адзначаў нізкі ўзровень зацікаўленасці рабочых у выніках сваёй дзейнасці і ва ўдасканаленні ўласных працоўных навыкаў. Падарожнік, на падставе сведчанняў дырэктараў школ пры мануфактурах, пісаў, што паміж вучнямі «не назіраецца спаборніцтва і што хаця яны атрымліваюць лепшае адзенне і ежу, чым іншыя сяляне, аднак іх нельга прымусіць да заняцця промысламі інакш, як толькі сілай» [1, с. 272]. Адсутнасць матывацыі заключалася ў тым, што плата за працу ішла пану, а не самому працоўнаму — прыгоннаму селяніну.

Ураджэнец Саксоніі, эканаміст і батанік Андрэй Казімір Меер (1742–1807) з'яўляецца аўтарам даволі падрабязнага «Апісання Крычаўскага графства за 1786 г.», апублікаванага ў «Магілёўскай старыне» за 1901 г. Цікавасць уяўляюць яго параўнанні тэмпераменту крычаўскіх сялян з аналагічнай праявай характару сялян Цэнтральнай Расіі. Нягледзячы на сваю забітасць і неадукаванасць, яны пераўзыходзяць расейцаў ціхмянасцю і цярплівасцю. А. К. Меер характарызуе падданых Крычаўскага графства ліслівымі перад панамі, сарамлівымі і скрытнымі перад чужынцамі, а таксама негасціннымі перад вандроўнымі людзьмі, што падарожнік тлумачыць амаль паўсюднай беднасцю. Цікавая яго заўвага адносна таго, што селянін лепш абыдзецца без жытняга хлеба, чым без гарачыцельнага напою. Па гэтай прычыне для сялянскага саслоўя характэрны розныя хваробы, што ўзнікаюць на глебе п'янства [11, с. 92].

На гэтым пералік арыгінальных назіранняў, зробленых А. К. Меерам, не завяршаецца. Найбольш распаўсюджанымі хваробамі ён называе калатун і карасту, звязаныя, галоўным чынам, з неахайным стаўленнем да ўласнай гігіены. Знешне апісваюцца сяляне як людзі сярэдняга росту, бледныя ў твары, маламоцныя. Асабліва аўтарам падкрэсліваецца сялянская забабоннасць, на прыкладзе святкавання Страсной сядміцы і памінання продкаў падчас веснавых і восеньскіх Дзядоў.

Апісваючы быт Крычаўскага староства, А. К. Меер адыходзіць ад пабочнага назірання і імкнецца выказаць свае меркаванні аб паляпшэнні сялянскага дабрабыту. Паводле яго меркавання, многае залежыць ад прысутнасці ў мясцовасці такіх прыходскіх святароў, якія былі б здольныя клапаціцца аб распаўсюджванні асветы сярод сваіх сялян [11, с. 93].

Падарожнік дае падрабязную характарыстыку рамесным промыслам, харчаванню, адзенню, пабудовам, прыладам працы жыхароў. Мужчыны, акрамя земляробства, займаліся таксама грабарствам (землякопствам), плотніцтвам, смалакурэннем, маслабойствам, бондарствам, рымарствам, калесніцтвам, бортніцтвам. Жанчыны, акрамя летніх палявых і агародных прац, зімой займаліся прадзеннем пяньковай кудзелі, ткацтвам з такога матэрыялу, як лён і шэрсць. Асноўным прадуктам харчавання называюцца ляпёшкі, прыгатаваныя са змешанай аўсянай, жытняй мукі і шчаўя. Пры недахопе хлеба ў ежу ўжывалася абмалочаная ў вадзе гнілая дубовая сарцавіна, якую пяклі з мучным дамешкам. Пры характарыстыцы адзення, не валодаючы беларускай тэрміналогіяй, А. К. Меер карыстаецца сваімі назіраннямі асаблівасцей рускага народнага касцюма: суконныя кашулі называюцца ў яго пяньковымі касталанамі, лапці — каверзнямі або пяцірнікамі, летні капялюш «брыль» — каўпаком [11, с. 94–96].

Сялянскія хаты апісваюцца драўлянымі з сасновага і асінавага лесу, без сенцаў, акружаныя хлявамі і паветкамі. Сярэдняя сялянская гаспадарка трымала дзвюх кароў, трох ці чатырох коней, некалькі авечак, бараноў і свіней. Асноўным сельскагаспадарчым інвентаром з'яўляліся сохі і бароны. Сохі выраблялiся, галоўным чынам, з бярозы і ліпы. У якасці бараны магло паслужыць асобнае дрэва з некалькімі абсечанымі галінамі. Ураджай збожжа захоўвалі звычайна пад асеццю або на таку, абмалочанае жыта сыпалі ў ямы або ў свірны [11, с. 96–98, 100].

У межах шырокай характарыстыкі, якую падае генерал Сяргей Аляксеевіч Тучкоў (1767–1839), апісваючы чатыры саслоўі Рэчы Паспалітай, прысутнічае і апісанне сялян. Ён дапаўняе назіранні Дзяржавіна аб панскім і яўрэйскім прыгнёце, упамінаючы аб нярэдкай працы сялян у святочныя або нядзельныя дні і аб забароне ім мець пры хаце жорны з тым, каб карыстацца паслугамі панскага млына, аддадзенага ў арэнду яўрэю, і тым прыносіць прыбытак абодвум. Тучкоў заўважае аб існаванні коштаў на мужчын (200 руб.) і жанчын (100 руб.), якія нярэдка

прадаваліся. Тучкоў, ідучы далей за Кокса, надае селяніну толькі адмоўныя характарыстыкі, а менавіта такія, як вяласць, марудлівасць, лянота, глупства, п'янства, адсутнасць маральнасці; жанчыны называюцца ім распуснымі [18, с. 78–80].

Рускі чыноўнік і сенатар Дзмітрый Барысавіч Мяртвага (1760–1824), які падарожнічаў праз Беларусь у 1789 г., праводзіць рэзкую паралель паміж жыццём насельніцтва сельскай мясцовасці і гарадоў: «Звычай здаваць маёнткі ў арэнду знішчыў усялякае чалавекалюбства і прамысловасць… Шмат наведваў я такіх селішчаў, дзе немагчыма было знайсці кавалак хлеба, а між тым у гарадах панавалі бяспутная раскоша і свавольная бяздзейнасць» [17, с. 56–57].

Падарожныя нататкі навукоўцаў, дыпламатаў, вайскоўцаў, людзей іншага роду заняткаў пад пэўным вуглом адлюстроўваюць сялянскую штодзённасць, звяртаючы ўвагу на самыя незвычайныя з іх пункту гледжання дэталі штодзённага жыцця. Для Кокса — гэта былі мануфактуры (гаспадарчая штодзённасць), для Тучкова — маральны стан (прыватная). Найбольш аб'ектыўнай ацэнкай сітуацыі, сведкам якой яму давялося быць, адзначыўся Меер. Яго апісанне тычылася штодзённасці ўсіх трох парадкаў — прыватнай, грамадскай і гаспадарчай.

Умоўна перапіску магчыма падзяліць на ліставанне асабістага і службовага (юрыдычнага) парадку. У той час, калі першая з большага зводзіцца да агульнай перадачы ўражанняў і пачуццяў у апісанні пэўнай падзеі ці з'явы, характарызуецца шчырай цікавасцю да жыццядзейнасці адрасата, то другая накіравана на вырашэнне сутнасці канкрэтнай справы і менш схільная да сентыменталізму. Для юрыдычнага засведчання многія лісты таксама актыкаваліся ў актавых кнігах, чаго нельга сказаць пра прыватную перапіску, дзе адзначаліся падзеі з асабістага жыцця. Часцей за ўсё яны асядалі ў радавых архівах. Матэрыялы перапіскі XVIII ст. сведчаць аб з'явах грамадзянскага супрацьстаяння сялянскага насельніцтва шляхецкаму свавольству.

Асаблівасці штодзённага жыцця праваслаўных сялян Усходняй Беларусі, у прыватнасці Крычаўшчыны, магчыма прасачыць па перапіскі магілёўскага епіскапа Іераніма Ваўчанскага з літоўскім харужым, уладальнікам Крычаўскага староства, Геранімам Фларыянам Радзівілам у 1744 г. Напружаная сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Крычаўскім старостве, якая прывяла да вядомага паўстання, па звестках Радзівіла падагравалася таксама фактам прамога ўдзелу ў бунце праваслаўных святароў, якія бласлаўлялі сялян на выступленне супраць радзівілаўскай адміністрацыі, што сведчыць аб значным аўтарытэце праваслаўнага святарства сярод крычаўскіх сялян. У лісце ад 16 лютага 1744 г. Радзівіл пытае ў Ваўчанскага, што заслужылі такія святары, якія сваімі ўчынкамі асіраціліі столькі двароў і тым самым паспрыялі моцным эканамічным

стратам. У наступным лісце ад 21 лютага Радзівіл згадвае, што святары самі прымалі ўдзел у забойствах і забіралі ў забітых іх маёмасць. 24 лютага епіскап Ваўчанскі адказвае на гэта, што неабходна прадставіць пратаколы апытання сведкаў, іншыя доказы, якія маглі безапеляцыйна сведчыць пра такія выпадкі [1, с. 392–394].

Пасля падаўлення паўстання ў Крычаўскім старостве сітуацыя пачала абвастрацца ў іншых радзівілаўскіх уладаннях, аб чым сведчыць ліст паверанага Юзафа Арачэўскага да князя Гераніма Радзівіла ад 13 красавіка 1748 г., дзе той апавядае аб выступленні сялян з вёскі Дамашаны маёнтка Драчкава, якія ў колькасці болей 100 чалавек выступілі супраць гвалту атрада шляхціча Арамовіча і жорстка збілі 12 жаўнераў. Завадатары бунту, спрабуючы апраўдацца, спаслаліся на адпаведны загад свайго «міласцівага князя» Радзівіла. Напрыканцы Арачэўскі выказваў асцярогу, што падобныя сутычкі могуць прывесці да новага паўстання, а значыць, людскіх і матэрыяльных страт [1, с. 394–396].

У сваім лісце да сакратара Расійскага пасольства ў Рэч Паспалітую Рычэўскага ад 14 снежня 1755 г. мазырскі падсудак Ян Прыбора скардзіўся на тое, што яму пагражаюць забойствам два былыя войты, якія перайшлі на бок гайдамакаў і маюць уплыў на жыхароў вёсак, прыналежных Прыборы. Згаданыя падданыя абвінавачваліся ў планаванні нападу на свайго пана, а таксама ў рабаўніцтве яго маёнтка і парафіяльнай царквы. Намеры Прыборы зводзілася не столькі да выдачы беглых сялян, колькі да забеспячэння сваёй бяспекі ад іх магчымага нападу [1, с. 400–401; 13, с. 46–47].

Матэрыялы перапіскі даюць характарыстыку падзеям у вольнай форме, без юрыдычных тэрмінаў і строга акрэсленага фармуляра. Яны дазваляюць прасачыць механізм узаемаадносін роўных паміж сабой асоб (князь — епіскап), а таксама асоб, што знаходзяцца паміж сабой у няроўных пазіцыях, падпарадкаваных іерархічнай лесвіцы (пан — службовец, епіскап — святар), у вырашэнні важных пытанняў, датычных у т.л. жыццядзейнасці сялянства ва ўмовах надзвычайных унутрыпалітычных падзей і працэсаў.

Адсутнасць сялянскай мемуарыстыкі ў адзначаны перыяд кампенсуецца наяўнасцю мемуарыстыкі шляхецкай, дзе з розных пазіцый адзначаюцца пэўныя акалічнасці з жыцця селяніна, якія сведчаць пра яго безабароннасць перад моцнымі, але наяўнасць таленавітасці і схільнасці да традыцый. Успамінамі па акрэсленым прамежку часу з'яўляюцца мемуары Ф. Булгарына, І. Шыманоўскага, Г. Патоцкай, якія найбольш прысвечаны пытанням грамадскага і палітычнага жыцця. Большай паўнатой вылучаюцца мемуары гісторыка і рэлігійнага дзеяча А. Кітовіча, пісьменніка і дзяржаўнага дзеяча М. Матушэвіча, філосафа С. Маймана, паэта-сентыменталіста Ф. Карпінскага. У параўнанні з іншымі аўтарамі яны

найбольш каларытна адлюстроўваюць парадкі грамадскага і гаспадарчага жыцця сялян у другой палове XVIII ст. Пры даследаванні сялянскай штодзённасці вялікую значнасць маюць дзённікі прадстаўнікоў сярэдняй і дробнай шляхты, чыя жыццядзейнасць была заснавана на штодзённых гаспадарчых стасунках са сваімі падданымі (як у выпадку з Р. Слізнем). Публіцысты Рэчы Паспалітай XVIII ст. у сваіх творах, прысвечаных сялянскаму і аграрнаму пытанням, вызначаюць штодзённасць толькі ў якасці фону даследавання, на падставе чаго імі робяцца высновы аб становішчы сялянства і прапаноўваюцца праекты аб магчымым пераадоленні сацыяльных і эканамічных супярэчнасцей. Пад ракурсам адзначэння найбольш яскравых асаблівасцей падаюцца звесткі аб сялянскай штодзённасці ў нататках падарожнікаў. Матэрыялы прыватнай перапіскі за акрэслены прамежак часу рэдка акцэнтуюць сваю ўвагу на сялянах, аднак большая ўвага надаецца ім у ліставанні службовага характару.

Крыніцы і літаратура

1. Белоруссия в эпоху феодализма: сборник документов и материалов. — Т. 2: С середины XVII до воссоединения с Россией / сост. А. И. Азаров, А. М. Карпачев, З. Ю. Копысский и др. — Минск : Изд-во АН БССР, 1960. — 560 с.
2. Булгарын, Ф. Воспоминания / Ф. Булгарин. — М. : Захаров, 2001. — 782 с.
3. Візіты цэркваў Барысаўскай і Лепельскай пратапопій 1754 г. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — Ф. 3245. — Воп. 8. — Спр. 1.
4. Грыцкевіч, В. П. Шляхі вялі праз Беларусь / В. П. Грыцкевіч, А. І. Мальдзіс. — Мінск, 1980. — 269 с.
5. Державин, Г. Р. Записки, 1743–1812: Полн. текст / Гавриил Романович Державин. — М. : Мысль, 2000. — 334 с.
6. Дыярыуш Рафала Слізня, уладальніка маёнткаў Княгінін і Дзядзілавічы, 1770-я гг. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ у Гродна). — Ф. 1663. — Воп. 1. — Спр. 14.
7. Из воспоминаний белоруса Я. А. Чебодько / Я. А. Чебодько. — Киев: Васильченко, 1910. — 36 с.
8. Источниковедение : Теория. История. Метод. Источники российской истории: учеб. пособ. / Н. И. Данилевский, В. В. Кабанов, О. М. Медушевская, М. Ф. Румянцева. — М., 1998. — 701 с.
9. Лісейчыкаў, Д. В. Штодзённае жыццё ўніяцкага парафіяльнага святарства беларуска-літоўскіх зямель (1720–1839 гг.) : дысертацыя на суісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук : 07.00.02 : абаронена 15.04.09 : зацверджана 04.11.09 / Лісейчыкаў Дзяніс Васільевіч. — Мінск, 2008. — 283 с.
10. Мальдзіс, А. Выбранае / А. Мальдзіс. — Мінск : Беларускі кнігазбор, 2007. — 472 с.

11. Меер, А. Описание Кричевского графства 1786 г. // Могилевская старина. — Могилев, 1901. — Вып. 2. — С. 92–100.
12. Мякотин, В. А. Крестьянский вопрос в Польше в эпоху ее разделов / В. А. Мякотин. — СПб. : Тип. Комарова, 1889. — 230 с.
13. Памяць : Мазыр. Мазырскі р-н: Гіст.-дакум. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / рэдкал.: І. Д. Замулка [і інш.]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1997. — 573 с.
14. Памяць : Уздзенскі р-н: Гіст.-дакум. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БЕЛТА, 2003. — 654 с.
15. Петухов, Ю. С. Дневник Рафаила Слизеня как источник по изучению истории Беларуси конца XVIII в. / Ю. С. Петухов // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навук. канф., прысвеч. 50-годдзю знаходкі берасцяной граматы ў Віцебску і 150-годдзю з дня нараджэння А. Р. Брадоўскага, Віцебск, 22–23 кастрычніка 2009 г. — Мінск, 2010. — С. 139–142.
16. Славянский сборник : в 3 т. — Санкт-Петербург : издание Петербургского отдела Славянского комитета, 1875–1877. — Т. III. — 1876. — 371 с.
17. Турцевич, А. Русские крестьяне под владычеством Литвы и Польши. Краткий исторический очерк / А. Турцевич. — Вильна, 1911. — 73 с.
18. Тучков, С. А. Записки Сергея Алексеевича Тучкова, 1766–1808 / С. А. Тучков ; под ред. и со вступительной статьей К. А. Военского. — Санкт-Петербург, 1908. — 287 с.
19. Ходзін, С. М. Крыніцы гісторыі Беларусі (спроба гісторыка-генетычнага і кампаратыўнага вывучэння) / С. М. Ходзін. — Мінск, 1999. — 192 с.
20. Greveniz, F.A.F. Włościanin w Polsce / F.A.F. Greveniz (z niemieckiego). — Warszawa, 1818. — 110 s.
21. Karpiński, F. Pamiętniki Franciszka Karpińskiego / F. Karpinski. — Warszawa: Granowski i Sikorski, [1898?]. — 168 s.
22. Kitowicz, J. Opis obyczajów za panowania Augusta III / J. Kitowicz. — Wrocław : Ossolineum ; Warszawa : DeAgostini, 2003. — T. 2. — 301–645 s.
23. Lachnicki, I. Biografia włościanina nad brzegami Niemna powyżej Łososny mieszkaiącego / I. Lachnicki. — Warszawa: Drukarnia Wiktora Dąbrowskiego, 1815. — 217 s.
24. Majmon, S. Autobiografia / S. Majmon. — Warszawa, 1913. — T. 1. — 61 s.
25. Matuszewicz, M. Diariusz życia mego / M. Matuszewicz. — Warszawa: Państwowy Instytut Wydawniczy, 1986. — T. 2: 1758–1764. — 814 s.
26. Morski, T. Uwagi o chlopach / T. Morski // Materiały do dziejów Sejmu Czteroletniego / wyd. J. Wołyński, J. Michalski, E. Rostworowski — Wrocław, 1955. — T. 1. — 676 s.
27. Uwagi ogólne nad stanem rolniczym i mieyskim z powodu przyszłey rządu narodowego formy / J.B. de Courtenay. — Warszawa, 1789. — 156 s.
28. Uwagi praktyczne o poddanych Polskich względem ich wolnosci i niewoli / T. Czacki, P. Dufour. — Warszawa: Drukarnia P. Dufoura, 1790. — 178 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 18.06.2014

У. В. Фёдараў

Праблемы інтэрпрэтацыі актавай тэрміналогіі пры вывучэнні працэсу ўнутранай каланізацыі тэрыторыі Беларусі ў канцы XV – першай палове XVI ст.

Адным з найбольш важных і слаба даследаваных пытанняў гаспадарчай і сацыяльнай гісторыі Беларусі ў перыяд Позняга Сярэднявечча і Ранняга Новага часу з'яўляецца праблема ўнутранага гаспадарчага асваення альбо ўнутранай каланізацыі яе тэрыторыі.

Пад гэтым паняццем разумеецца працэс пашырэння арэала сельскагаспадарчых зямель за кошт асваення пустэчаў, вырубкі лясоў, засялення новых тэрыторый і ўвядзення іх у сельскагаспадарчы абарот. Азначаныя пытанні альбо некаторыя іх аспекты спарадычна закраналіся ў працах гісторыкаў, перш за ўсё М. Доўнар-Запольскага [1], М. Любаўскага [2], Г. Лаўмяньскага [21], С. Александровіча [11], Е. Ахманьскага [22], Г. Харашкевіч [8; 9; 10], М. Спірыдонава [6; 7]. Слабая даследаванасць акрэсленай праблематыкі ў дачыненні да ўсёй тэрыторыі Беларусі прымушае надаваць асаблівую ўвагу працы з крыніцамі.

Звесткі, якія праліваюць святло на працэс унутранага гаспадарчага асваення тэрыторыі ВКЛ (у тым ліку і беларускіх зямель), сканцэнтраваны пераважна ў данацыйных і пацвярджальных актах. Азначаныя дакументы ў асноўным знаходзяцца ў складзе Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага (далей па тэксце — Метрыкі ВКЛ), хаця нямала іх захавалася таксама ў розных калекцыях і фондах шляхецкіх родаў, а таксама царкоўных арганізацый. Першыя крыніцы такога тыпу сталі з'яўляцца з канца XIV ст., але з прычыны захаванасці і інфарматыўнасці фармуляра ў больш-менш поўнай меры могуць быць выкарыстаны толькі тыя з іх, якія датуюцца пачынаючы з канца XV ст., перыядам княжання Аляксандра. Хараналагічна гэты час супадае з канцом Сярэднявечча і пачаткам Ранняга Новага часу. Тэндэнцыі эканамічнага развіцця дзяржавы захаваліся і пры кіраванні пераемніка Аляксандра Жыгімонта Старога. У час княжання Жыгімонта Аўгуста адбыліся важныя змены. Яны датычыліся як сельскай гаспадаркі (т.зв. «валочная памера») і заканадаўства (прыняцце II Статута ВКЛ, адміністрацыйная рэформа), так і частковага перараз меркавання зямельнай уласнасці і змены дэмаграфічнай сітуацыі, выкліканых пачаткам Інфлянцкай вайны. Варта дадаць, што некаторыя з гэтых змен, напрыклад аграрная рэформа, адбіліся і на эвалюцыі актавага фармуляра, робячы яго больш падрабязным і інфарматыўным.

Звяртаючыся да найбольш важнага збору дакументаў за разглядаемы перыяд — Метрыкі ВКЛ, можна адзначыць, што, пачынаючы з С. Пта-

шыцкага, у дарэвалюцыйнай расійскай, а пазней савецкай і беларускай гістарыяграфіях усталяваўся погляд аб тоеснасці Метрыкі з вялікакняжацкім дзяржаўным архівам. Паводле іншага пункту гледжання, абгрунтаванага П. Кенэдзі-Грымстэд і І. Сулкоўскай-Курасёвай, Метрыка — гэта калекцыя копій дакументаў вялікакняжацкай канцылярыі і некаторых яе кіраўнікоў — канцлераў і падканцлераў [12, p. 4–10]. Гэтую думку падтрымала апошнім часам і такі значны аўтарытэт у галіне крыніцазнаўства, як Г. Харашкевіч [10, с. 207, 227]. Але незалежна ад таго, чым з'яўляецца Метрыка, яе дадзеныя, разам са звесткамі з іншых актаў, не дазваляюць рэканструяваць у поўнай меры карціну падзей. Гэта тлумачыцца тым, што ўвесь комплекс актавых крыніц, што паходзіць як з Метрыкі, так і з іншых збораў, захаваўся далёка не ў поўнай ступені. Карыстаючыся імі, можна акрэсліць асноўныя накірункі, асаблівасці і заканамернасці працэсу ўнутранай каланізацыі тэрыторый ВКЛ. Яго вывучэнне на падставе актавага матэрыялу мае свае асаблівасці і складанасці, што звязана не толькі з інтэрпрэтацыяй крыніц, але і з методыкай іх выкарыстання.

Першая складанасць заключаецца ў тагачаснай канцылярскай тэрміналогіі актавых дакументаў. Яна звязана з выкарыстаннем поўнасцю сінанімічных дэфініцый, такіх, як «пустовъщина», «земля пустовская», «земля пустая», «землица пустовская», «terra deserta», «solitudinis» і іншых у некалькіх значэннях.

Першым разглядам спецыфікі выкарыстання гэтых тэрмінаў займаўся слынны дарэвалюцыйны гісторык М. Любаўскі. На думку рускага вучонага, які прапрацаваў немалую колькасць актавага матэрыялу Метрыкі, датаванага пераважна XVI ст., «пустаўшчына» — гэта сялянскі надзел, які ў выніку пэўных акалічнасцей (адсутнасць спадчыннікаў, невыкананне службаў з зямельнага надзелу, апусташэнне ў выніку вайсковых дзеянняў) застаўся без селяніна, які ім валодаў, плаціў падаткі і выконваў павіннасці на карысць землеўласніка. Такую фармулёўку цалкам прыняў і вядомы айчынны даследчык аграрнай гісторыі Беларусі М. Ф. Спірыдонаў [7, с. 476]. А. А. Мяцельскі на падставе актавай тэрміналогіі XV–XVII стст. згадваў аб абазначэнні тэрмінам «пустаўшчына» пакінутых людзьмі паселішчаў на прыкладзе тэрыторый Мсціслаўшчыны, спустошаных пастаяннымі войнамі з Масквой [5, с. 255]. Крыху больш шырокае значэнне гэтага тэрміна прапанавалі В. Мянжынскі і А. Дзярновіч, адзначаючы, што пад паняццем «пустаўшчына — зямля пустая» маглі разумецца: 1) пустое незасеянае поле; 2) неўрадлівая зямля; 3) недагледжаная, часова пакінутая зямля [4, с. 66]. Варта адзначыць, што праблема пустых зямель была характэрна для ўсёй Еўропы ў XIII–XVIII стст. У. Рысіньскі заўважыў, што шмат зямель часова пуставалі (і адпаведна праходзілі ў дакументах як «agri deserti») па прычыне немаг-

чымасці іх далейшага выкарыстання з-за значнага зніжэння ўрадлівасці глебы. Такі стан рэчаў, паводле польскага даследчыка, абумоўлены недасканаласцю тагачасных сістэм землекарыстання, а менавіта хуткай дэгенерацыяй глебы ў выніку ўжывання трохпольнай сістэмы [23, с. 66].

Калі непасрэдна звярнуцца да актаў Метрыкі, то можна знайсці шмат прыкладаў указання, чаму той ці іншы надзел зямлі лічыўся «пустаўшчынай» ці «зямлёй пустой». Так, у вялікай колькасці актаў сапраўды сустракаюцца ўзгадкі-тлумачэнні прычын пуставання зямель, якія М. Любаўскі адносіў да крытэрыяў вызначэння «пустаўшчын».

Так, вельмі распаўсюджанай прычынай была адсутнасць спадчыннікаў, пра што напрамую магло ўказвацца ў прывілеях [13, № 3, p. 48; 15, № 201, p. 194–195] і інш. Не меншая частка зямель прымалася за «пустыя» і «пустаўшчыны» па прычыне адсутнасці выканання службаў ці платы з іх феадальнай рэнты [20, № 64, p. 125]. Часта гэтыя дзве прычыны фігуруюць разам, калі ў актах сустракаюцца формулы кшталту «што жъ тые земли пусты а служобъ и дачокъ намъ з них на тотъ час нетъ, а отчычы тых земль розышли ся прочь» [16, № 51, p. 65], «што жь тыи землицы пусты давно лежать, а службы с них никоторое нет, бо деи наследка никакого нетъ» [15, № 199, p. 193]. Радзей сустракаюцца звесткі аб апусташэнні зямель праз вайсковыя дзеянні. Акрамя гэтага, нярэдка можна знайсці звесткі аб заселеных людзьмі землях, якія фігуравалі ў дакументах як «пустыя» і «пустаўшчыны». Так, каля 1494 г. узгадваюцца «селища пустыи» ў Віцебскім павеце, на якіх сядзелі людзі [14, № 28, p. 49–50], каля 1505 г. узгадваюцца «пустаўшчыны» з людзьмі, нададзеныя Аляксандрам Яну Забярэзінскаму [19, № 224, p. 278]. Аналагічныя прыклады, калі «пустаўшчыны» і «земли пустыя» апрацоўвалі людзі, якія жылі там, вядомы ў 1513 г. [20, № 190, p. 247] і 1529 г. у Гарадзенскім павеце [20, № 153, p. 212]. У 1506 г. згадваецца пустаўшчына Матушоўшчына Ваўкавыскага павета з «дворцом», у якім жылі два чалавекі [15, № 326, p. 264].

Як відаць з разгледжаных прыкладаў, адзіным універсальным падставовым крытэрыем, паводле якога ў вачах велікакняжацкага пісара той ці іншы надзел зямлі лічыўся «пустаўшчынай» і «зямлёй пустаўскай», было невыкананне з яго феадальнай рэнты незалежна ад прычын. Гэта падводзіць да высновы, што пад дадзеным паняццем маглі разумецца і землі, якія ніколі не выкарыстоўваліся ў сельскагаспадарчым абароце.

Пацвярджэнні гэтаму можна знайсці ў некаторых іншых актах Метрыкі. Так, у прывілеі Аляксандра Мітку Фёдаравічу на валоданне людзьмі і зямлёй у Браслаўскім павеце ад 12 чэрвеня 1506 г. узгадваецца, што на нададзеных праз вялікую княгіню Алену «землях пустовских» апошні «двор собе справил и пашню вчинилъ» [14, № 563, p. 381]. У да-

куменце за 1522 г. узгадваюцца «тры земли пустовскихъ у Слонимскомъ повете не подъ пущою» [16, №134, с.195], адкуль вынікае, што пустыя землі маглі быць і пад пушчай, г.зн. увогуле не выкарыстоўвацца раней у сельскай гаспадарцы. На магчымасць разумення пад «пусткамі» такіх зямель можа ўказваць і формула «и волен он тыи земли людми осадити», якая з пачатку XVI ст. нярэдка сустракаецца ў дыспазіцыях (dispositio) данацыйных і пацвярджальных актаў на валоданне тэрыторыямі з «пустаўшчынамі» і «землямі пустаўскімі».

Варта дадаць, што ў вялікай колькасці актаў (асабліва тычыцца дакументаў канца XV – пачатку XVI ст.) гэтыя дэфініцыі ўжываюцца без апісання. Таму высветліць, што дакладна ўяўляла тая альбо іншая «пустаўшчына», можна толькі пры наяўнасці пазнейшых падрабязных звестак аб іх, што на практыцы падаецца амаль немагчымым.

Другая складанасць выкарыстання матэрыялаў Метрыкі пры даследаванні працэсу ўнутранай каланізацыі беларускіх зямель ВКЛ заключаецца ў складанасці верыфікацыі зместу некаторых актавых формул з рэальнай практыкай. На разглядзе падобнага пытання спынялася Г. Харашкевіч [8]. Яна прыйшла да высновы, што пералікі таго, з чым надаваліся землі («з ставы», «з землицы бортныя») у дыспазіцыі актаў канца XV – пачатку XVI ст. яшчэ не сталі голымі формуламі і канкрэтна адлюстроўвалі стан мясцовасці, а формулы кшталту «волен отдати и заменити» ўказвалі на пашырэнне імунітэту землеўласнікаў [8, с. 57–58, 64]. Праўда, даследчыца не засяроджвалася на суаднясенні згаданай вышэй формулы «и волен он тыи земли людми осадити» з рэальнай практыкай. Гэтая формула прысутнічае ў дыспазіцыі некаторых актаў (галоўным чынам у тых, дзе ў спісе зямельных наданняў фігуруюць «землі пустыя», «пустаўшчыны» і інш.) адразу пасля пераліку таго, што ўтрымліваюць наданні. Пры гэтым акты, дзе прысутнічае і адсутнічае ўказаная формула, датуюцца адным часам і знаходзяцца ў складзе адных і тых жа кніг Метрыкі, а таксама маюць ідэнтычную ці амаль ідэнтычную папярэднюю частку дыспазіцыі [20, № 144, p. 206; № 163, p. 227]. Таму можна паспрабаваць выказаць асцярожную гіпотэзу наконт таго, што формула «и волен он тыи земли людми осадити», ужытая ў дачыненні да пэўных зямель, магла ў шэрагу выпадкаў указваць на іх унутранае гаспадарчае асваенне. Але знайсці і вызначыць такія сітуацыі дастаткова праблематычна з прычыны недахопу звестак аб тым, ці выкарыстоўваліся нададзеныя землі ў сельскагаспадарчым абароце раней. Калі ў дакуменце прысутнічаюць прамыя ўказанні аб наданні і засяленні «пустаўшчын», якія раней апрацоўваліся, альбо тэрыторый, спустошаных вайной, то тут гутарка будзе ісці не аб унутранай каланізацыі, а аб аднаўленні і засяленні нанова, «рэкаланізацыі» гэтых тэрыторый. Дазвол на пасяленне людзей і будоўлю двароў можна сустрэць таксама і ў актах

перадачы паселішчаў ў трыманне [20, № 107, р. 165, № 144, р. 206]. З гэтага вынікае, што сяло, двор ці іх ваколіцы маглі пуставаць (поўнасцю ці часткова), альбо сведчылі аб зацікаўленасці вялікага князя ў павышэнні эканамічнай прыбытковасці названых наданняў. У такім выпадку маглі асвойвацца толькі тыя землі ў межах маёнтка, якія не былі раней уключаны ў гаспадарчы абарот. Праверыць наяўнасць там працэсаў унутранага асваення тэрыторый можна толькі пры захаванасці іншых дакументаў, якія тычацца гэтай праблемы. Апошняе ўяўляецца вельмі складанай ці нават немагчымай задачай з прычыны вельмі фрагментарнай захаванасці крыніц: інвентары маёнткаў пачалі масава з'яўляцца толькі з сярэдзіны — другой паловы XVI ст.

З большай доляй верагоднасці можна весці гаворку аб магчымасці ўнутранага гаспадарчага асваення зямель, у дыспазіцыі прывілеяў на трыманне якіх прысутнічае формула «и волен он тыи земли людми осадити», і ўказваецца, што нададзеныя тэрыторыі знаходзіліся пад лесам.

Праўда, у выпадку надання як «пустаўшчын», так і надзелаў у лясах і пушчах паўстае заканамернае пытанне: як вызначыць, ці былі тыя землі заселены людзьмі, бо некаторыя з іх маглі пуставаць і далей па прычыне нежадання трымальнікаў інвеставаць у іх сродкі. Вядома, што галоўнай мэтай вялікага князя пры раздачы «пустаўшчын» было атрыманне ці павелічэнне прыбытку з іх у дзяржаўны скарб. Таму аб'ектамі надання часта маглі стаць «праблемныя» тэрыторыі, якія заставаліся незасвоенымі. Напрыклад, вядома шмат выпадкаў, асабліва ў пазнейшыя часы раздачы тэрыторый, спустошаных падчас Інфлянцкай вайны [3, № 9, с. 73, № 17, с. 80]. Падаецца, што дастаткова надзейным «індыкатарам» гаспадарчага асваення «пустых зямель» і лясоў людзьмі можа быць наданне не па ініцыятыве манарха, а паводле прашэння прыватнай асобы аб іх атрыманні. Звесткі падобнага кшталту ўтрымліваюцца ў прэамбулах актаў.

Такім чынам, формула «и волен он тыи земли людьми осадити», якая сутракаецца ў дыспазіцыі данацыйных актаў, сама па сабе не з'яўляецца прамым паказчыкам гаспадарчай каланізацыі тэрыторый, згаданых у дакуменце. Яна можа ўказваць з больш-менш пэўнай дакладнасцю на ўнутранае асваенне тэрыторый толькі ў выпадку прысутнасці ў пераліку зямель, якія раней не выкарыстоўваліся ў сельскагаспадарчым абароце, і атрыманні іх ад вялікага князя па просьбе трымальніка. Узнікненне і пашырэнне дадзенай актавай формулы з пачатку XVI ст. сведчыла аб інтэнсіфікацыі гаспадарчага асваення зямель у ВКЛ, у тым ліку і на тэрыторыі сучаснай Беларусі.

Аналіз актавага матэрыялу Метрыкі ВКЛ дазваляе зрабіць выснову аб неабходнасці быць асцярожным пры вызначэнні ўнутранай каланізацыі тых ці іншых зямель толькі паводле актавых формул і тэрміналогіі.

Тэрміны «пустовщина», «земля пустовская», роўна як і выкарыстанне ў дачыненні да іх актавай формулы «и волен он тыи земли людми осадити», могуць указваць на гаспадарчае асваенне прыгаданых у дакуменце зямель упершыню далёка не заўсёды, а толькі ў некаторых выпадках. Найбольш надзейным індыкатарам наяўнасці працэсу ўнутранага гаспадарчага асваення зямель з'яўляецца прамое, непасрэднае ўказанне крыніцы: наданне надзелаў з указаннем размерыць іх на валокі і засяліць людзьмі [15, № 234, p. 209], прывілеі на заснаванне двароў [20, № 72, p. 130], фальваркаў [19, № 104, p. 164–165], мястэчак [18, № 14, p. 67] на тэрыторыях, якія раней не выкарыстоўваліся ў сельскай гаспадарцы, «на сырым карэнні».

Крыніцы і літаратура

1. Доўнар-Запольскі, М. Дзяржаўная гаспадарка ВКЛ пры Ягелонах / М. Доўнар-Запольскі.– 2-е выд.– Мінск : Бел.навука, 2009. — 759 с.
2. Любавский, М. К. Областное деление и местное самоуправление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского статута / М. К. Любавский. — М. : Университетская тип., 1893. — 310 с.
3. Метрыка ВКЛ. Кніга запісаў Nr. 70 (1582–1585) = Литовская Метрика. Книга записей 70 (1582–1585) / Падр. А. А. Мяцельскі. — Мінск : Бел. навука, 2008. — 354 с.
4. Мянжынскі, В. Шляхта, іншыя землеўласнікі і землеўладальнікі ды іхныя зямельныя ўладанні ў Берасцейскім, Камянецкім і Кобрынскім паветах у другой палове XV – першай палове XVI ст. (паводле кніг №12–33 Метрыкі ВКЛ) / В. Мянжынскі, А. Дзярновіч // Metriciana. Даследаванні і матэрыялы Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага. — Т. III. — Мінск: Athenaeum. — 2004. — С. 57–196.
5. Мяцельскі, А. А. Мсціслаўскае княства і ваяводства ў XII–XVIII стст. / А. А. Мяцельскі. — Мінск : Бел.навука, 2010. — 664 с.
6. Спиридонов, М. Ф. Закрепощение крестьянства Беларуси (XV–XVI вв.) / М. Ф. Спиридонов. — Мінск : Навука і тэхніка, 1993. — 223 с.
7. Спірыдонаў, М. Ф. Пустаўшчына // Вялікае Княства Літоўскае. Энцыклапедыя: У 2 т. — Т. 2: К–Я. / Рэд. кал. Г. П. Пашкоў, Ю. М. Бохан, Г. Я. Галенчанка [і інш.]. — Мінск: БелЭн., 2006. — С. 476.
8. Хорошкевич, А. Л. Жалованные грамоты Литовской метрики конца XV века и их классификация / А. Л. Хорошкевич // Источниковедческие проблемы истории народов Прибалтики. — Рига: Зинатне, 1970. — С. 47–74.
9. Хорошкевич, А. Л. Очерки социально-экономической истории Северной Белоруссии в XV в. : дис. на соис. уч. ст. докт. ист. наук: 07.00.02 / Хорошкевич Анна Леонидовна. — М. : Институт истории СССР, 1974. — 157 с.
10. Хорошкевич, А. Л. К дипломатическому анализу документов Литовской метрики (на материалах шестой книги записей) / А. Л. Хорошкевич //

Белоруссия и Украина: история и культура. Ежегодник. — 2004. — М. : Наука, 2005. — С. 207–226.

11. Alexandrowicz, S. Studia z dziejów miasteczek Wielkiego Księstwa Litewskiego / S. Aleksandrowicz. — Warszawa: Wydawnictwo Naukowe UMK, 2011. — 443 s.
12. Kennedy-Grimsted, P. The “Lithuanian Metrica” in Moscow and Warsaw: reconstructing the archives of the Grand Duchy of Lithuania : including an annotated edition of the 1887 inventory compiled by Stanisław Ptaszycki / P. Kennedy-Grimsted., I. Sulkowska-Kurasiowa. — Cambridge, Mass. : Published for the Harvard Ukrainian Research Institute, Harvard University, by Oriental Research Partners, 1984. — 278 p.
13. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. — Knyga Nr. 3: (1440–1498); Užrašymų knyga 3 / Par. L. Anužytė, A. Baliulis. — Vilnius: Žara, 1998. — 166 p.
14. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. Kn. 5: (1427–1506); Užrašymų knyga 5 / Par. A. Baliulis, A. Dubonis, D. Antanavičius. — Vilnius: Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2012. — 586 p.
15. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. Knyga Nr. 8: (1499–1514); Užrašymų knyga 8 / Par. A. Baliulis, R. Firkovičius, D. Antanavičius. — Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidykla, 1995. — 709 p.
16. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. Knyga Nr. 10: (1440–1523); Užrašymų knyga 10 / Par. E. Banionis, A. Baliulis. — Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidybos institutas, 1997. — 179 p.
17. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. Knyga Nr. 12: (1522–1529); Užrašymų knyga 12 / Par. D. Antanavičius, A. Baliulis. — Vilnius: Žara, 2001. — 856 p.
18. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Metryka Litewska. Knyga Nr. 19: (1535–1537); Užrašymų knyga 19 / Par. D.Vilimas. — Vilnius: Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2009. — 362 p.
19. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Metryka Litewska = Литовская Метрика. Knyga Nr. 20: (1536–1539); Užrašymų knyga 20 / Par. R. Ragauskienė, D. Antanavičius. — Vilnius: Lietuvos istorijos instituto leidykla, 2009. — 444 p.
20. Lietuvos Metrika = Lithuanian Metrica = Литовская Метрика. Knyga Nr. 25: (1387–1546); Užrašymų knyga 25 / Par. D. Antanavičius, A. Baliulis. — Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidybos institutas, 1998. — 461 p.
21. Łowmiański, H. Zaludnienie państwa litewskiego w wieku XVI. Zaludnienie w roku 1528. — Poznań: Wyd. UAM, 1998. — 158 s.
22. Ochmański, J. Powstanie i rozwój latyfundium Biskupstwa Wileńskiego (1387–1550). Ze studiów nad rozwojem wielkiej własności na Litwie i Białorusi w średniowieczu / J. Ochmański. — Poznań: Wyd. UAM, 1963. — 163 s.
23. Rysiński, Wł. „Pustki” — problem agrarny feudalnej Europy / Wł. Rysiński // Roczniki dziejów społecznych i gospodarczych. T. XXIII, 1963. — S. 9–47.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 07.02.2014

М. В. Яременко

Риторическое клише в документах о переселении в Российскую империю уроженцев Речи Посполитой в XVIII в.

На протяжении всего XVIII в. в Гетманскую Украину, а из нее и на другие территории Российской империи постоянно приходили уроженцы украинских, белорусских и даже польских воеводств Речи Посполитой. Часть из них не желала возвращаться обратно. И эта перманентная мобильность (а движение было и в противоположном направлении — в «Польскую область», как в документах того времени именовали земли Польско-Литовского государства), и количество пришельцев, и их дальнейшая судьба еще недостаточно привлекли внимание историков. Важно отметить, что из Речи Посполитой переходили границу представители не только простолюдинов, но и мещан, шляхты, черного и белого духовенства, а с Правобережья Днепра — и тамошних казаков. «Следы» их проживания в Гетманщине отыскиваются также в разных местах и социальных группах. Об этом свидетельствуют некоторые примеры.

В 1737 г. «по предложению генерала князя Борятинского» назначили сотником в Лубенском полку Михаила Скаржинского «з людей полской нации литовской шляхти, за службы его во время бытности армии ея императорскаго величества в полском корпуси оказанніе» [1, л. 19 об.]. В 1757 г. через Межигорский форпост на территорию казацкой Украины пришел сын умершего священника витебской церкви Св. Николая Павел Лизлов [2, л. 11 об.]. Существенную часть «иностранцев» составляли студенты учебных заведений, причем не только Киево-Могилянской академии. В Переясловской православной коллегии среди воспитанников 1760-х гг. значились 12 делегатов (почти 10% всех воспитанников) «польской нации» (термин того времени, указывающий не на этническую принадлежность, а на происхождение с территории Речи Посполитой) от разных сословий, среди них — и казацкий сын с Киевского воеводства Иван Зорницкий [3, л. 52 об.], и три студента шляхетского происхождения: Кондрат Михайловский из Могилева, Григорий Мьековский из Золочева и Самуил Костинский из Любара [4, л. 52–53].

Среди мест, в которые стремились «заграничные» представители, — православные монастыри и приходы. Интересно, что границу пересекали также иноки-василиане. Например, в 1752 г. в Киевскую Выдубицкую обитель определили монаха-униата Иоиля [5, л. 24–27], в 1756 г. в Киево-Братскую — Иоанна Дембровского из Жировиц [6, л. 1–3 об., 9]. Во второй половине 1760-х гг. среди насельников Киево-Кирилловского монастыря проживал иеродиакон Юлиан, в прошлом почаевский по-

стриженник [7, л. 6 об.–7]. Довольно обычным явлением было также присутствие в составе украинских православных иноческих братств ранее представителей светских сословий. К примеру, в 1738 г. в Киевском Пустынно-Николаевском монастыре желали принять обеты уроженец «повиту Перемишльського» Иван Гортинский и Григорий Яхимович «родом з Литви, повиту Пинского» [8, л. 3; 9, с. 442–443]. В Киевской Межигорской обители в 1746 г. из 6 постриженцев два зафиксированы мещанскими, і два — шляхетскими детьми из «Польши». В 1764 г. туда же вступил Матфей (в иночестве — Михаил) Гречихин, мещанский сын из Могилева, и попович из Киевского воеводства Александр (Алексей) Терешчевич [10, с. 189–191, прил. 6–7]. В других киевских монастырях, а также вообще обителях Левобережной Украины аналогично проживали представители «польской» или «литовской» (так значительно реже именовали в документах приходящих из белорусских земель) «наций».

«Иностранцы» встречаются также среди клиров приходских храмов. В Пирятинской протопопии Киевской митрополии, например, в одной из церквей в 1771 г. был настоятелем бывший шляхтич из «Польши» Андрей Костецкий [11, л. 11]. Тогда же в соборном храме г. Ромны служил дьяком «захожий» с Речи Посполитой Михаил Алексеев [12, л. 2 об.], а в одной из церквей местечка Келеберды — псаломщиком «зашедший» с «Польской области» попович [13, л. 29 об.].

Приведенные примеры — лишь маленькая часть фактов, иллюстрирующих движение населения из Речи Посполитой в Гетманщину. Такая мобильность может служить темой отдельного большого исследования. В этой статье остановлюсь только на одном небольшом сюжете — мотивации перехода границы, которую предлагают источники. Репертуар последних формируют разнообразные актовые документы. Часть из них создавалась в Киевской духовной консистории (а также консисториях других приграничных епархий), главным образом при рассмотрении дел о присоединении пришельцев к православию, определению в монастыри или на приходы, разрешении учиться в Академии и т.д. Много актов, касающихся переходов, возникли в Киевской губернской канцелярии, где давали официальное разрешение на преодоление границы, а также «на происканиe места» в казацкой Украине или в Российском государстве вообще и следили за тем, чтобы желающие остаться в империи проходили обязательную процедуру присяги на верность престолу. В таких источниках, как правило, указывались причины перехода, а часто и биографические данные, сообщенные прибывшим при допросе. Важно отметить одну деталь — большинство такого типа документов писались канцеляристами: и по причине неграмотности или умению писать только по-польски теми, кто приходил из-за рубежа, и, наверное, по причине неумения «иностранцев» правильно следовать формуляру.

Практически во всех (или, по крайней мере, в подавляющем большинстве) из многих десятков канцелярских документов XVIII в., которые были просмотрены, значится универсальная причина перехода в Российскую империю — побег «изъ полскихъ разныхъ мистъ отъ находящойся въ Полщи унии» [например: 14, л. 1] (как вариант — «богомерзкой унии», «польской унии»). Не удивительно, что чем больше актов просматривает исследователь, тем больше возникает впечатление про «кровавыя страдания православия», как писал, злоупотребляя художественными приемами, один из конфессионально ангажированных авторов XIX ст. [15, с. 118–124]. Впрочем, упомянутая в источниках угроза унии влияет на соответствующие выводы также современных историков [16, с. 45–48]. Оценить правомочность упомянутого оригинального объяснения перемещения населения из Речи Посполитой в Гетманщину могут те же документы, а конкретнее — приведенные в них реалии и описания (в данном случае — биографические данные о прибывших). Рассмотрим более детально несколько разновременных случаев.

«Избегая полской унии», в 1743 г. пришел в Киев с намерением принять иноческие обеты в одном из монастырей митрополии униатский поп Иоанн Садковский. Кроме указанной причины, консисторский подписок зафиксировал также следующую информацию о парохе. Он родился в «польском» местечке Ямполе в шляхетской семье, но, избрав «духовные хлеба», в 1716 г. униатским львовским епископом был хиротонирован в священника. Служа в нескольких церквах, «иерей Иоаннъ в Полской области унию содержал и по униятску всегда служил». В 1743 г. Садковский оставил приход зятю, договорился с женою и «удрал» от унии в Киев, а впоследствии стал монахом Густынской обители [17, л. 1–2, 10 об.].

Через 2 года в Киевскую кафедральную консисторию обратились с просьбой разрешить учиться в Могилянской академии два «иностранца». Один из них, Михаил Маркушевский, родился в Красном Ставе в шляхетской римско-католической семье и принадлежал к той же конфессии. Другой пришелец, Фома Братчанский, родился в Каменец-Подольском «от родителей звания шляхетского блгочестивыхъ» (следует отметить, что на время рождения Фомы в 1722 г. вряд ли в городе функционировали православные церкви, так что это сведение вызывает сомнение). Оба молодых человека уже изучали в учебных заведениях Речи Посполитой риторику и философию. В сообщении от киевского генерал-губернатора киевскому митрополиту рассказывалось, через какие форпосты попали в Киев молодые люди, а также наводилась причина прихода: прибыли, мол, убегая «от находящеися тамо унии» [18, с. 67–69].

1746 г. в консистории рассматривалось дело Казимира Лукавского, желающего обучаться в Могилянской академии. В Киев он пришел из

Кракова, где штудировал 5 лет в «латинских школах» и закончил риторику. Казимир родился в шляхетской семье римо-католиков, но по заверению документов, в которых излагалась суть дела, «болея в Полше за находящеюся тамо униею жить не похотелъ» [19, л. 1–2].

В 1752 г. в Киев пришел из-за границы иеромонах Иоиль Совинский. В консистории он рассказал, что родился 40 лет назад в Каменце в семье посполитых, но уже с 1720 г. ходил по разным местам, оставив родителей. Сначала он служил дьяком, а затем постригся в монахи в униатском монастыре (жил, между прочим, в Уневской обители) и был хиротонирован львовским униатским епископом. Затем Иоиль опять скитался по разным монастырям, пока не пришел в Киев на богомолье. Но возвращаться обратно в «Польскую область» Совинский не захотел из-за унии. Согласно показанию, в Речи Посполитой монах «точию с принуждения тамошних униатов по униятску священнодействовал» [20, л. 24–25].

В 1753 г. в канцелярии Киевской митрополии рассматривалось дело еще одного «иностранца» — священника Григория Яроцкого. Он родился в Бельске в семье иерея. Примерно 17 лет от роду Григорий оставил родительский дом и пошел в местечко Петраков, где женился. Вскоре после этого, получив презенту местного владельца, Яроцкий был рукоположен пинским епископом Георгием в диакона и священника (3 и 4 декабря 1736 г. соответственно) и определен к Михайловской церкви с. Грабовка. С самого начала священнослужения Григорий был униатским парохом. Тем не менее, спустя 17 лет иерей, если верить официальному документу, написанному канцеляристом, по совету родных и сторонних людей решил оставить «богомерзкую» унию, больше в Речи Посполитой «за находящеюся униею жить не похотел» и пришел в Киев [21, л. 1–2 об.].

В 1760 г. в Киевской губернской канцелярии допрашивали Матвея Тандзегольского, вышедшего из Речи Посполитой «от находящейся тамо унии» и желавшего обучаться в Могилянской академии. Матвей рассказал, что «родомъ онъ полского повиту Шидловского из околицы Пожебржа» (другой вариант названия, употребленный далее, «Пожабрза») Сандомирского воеводства. Его уже умерший отец-шляхтич и сам Тандзегольский были римо-католиками. Матвей обучался в Виленских и Львовских (очевидно, иезуитских) «школах», а в августе 1760 г. пришел в Киев с намерением принять православие и жить в российском подданстве. Традиционно текст писал не Матвей, он лишь заверил его собственноручной подписью [22, л. 2–5].

Приведенные выше примеры, несмотря на небольшое их количество, позволяют, тем не менее, сделать выводы о том, что от унии из Речи Посполитой «убегали» не только православные, но даже римо-

католики, что решение о «бегстве» могло прийти на склоне жизни (до этого десятилетия уния жить не мешала), что этой угрозы боялись даже униатские монахи, священники и их дети, которые никогда не были «благочестивыми». Очевидно, в этих случаях мотивация перехода границы звучит абсурдно, ведь именно униатство в XVIII в. воспринималось римо-католиками с презрением, как «хлопская» вера; не уния, а потребность передать «в наследство» приход родственнику заставляла иерея-униата «убегать»; что скорее всего возможность приискать лучшее место в жизни стимулировала переходить границу, а не абстрактная угроза унии, тем более в тех воеводствах, где униатская конфессия отсутствовала.

Доверять без дополнительной проверки заверения о преследовании от «унии», бегство от нее и, как следствие, о желании принять веру, внесенные в формуляр документов, невозможно. Например, в 1753 г. Раина «Ляховка могилянская» подала в Киевскую консисторию доношение (с помощью канцеляристов), в котором представлена следующая история: «Пред сим обреталась я, нижайшая, в городи Могилеви, а ныни пришла в Киевъ з сыном своимъ Казимиром на житло. И такъ я, нижайшая, яко и снъ мой Казимиръ и досели находилися римской вири, а теперича грекороссийскую православную виру желаемъ принять» [23, л. 1]. Но в этом случае написанный по шаблону текст расходился с действиями: через два месяца Казимир действительно стал православным, а «мать же оного не входя в виру православную, бежала безвистно» [24, л. 3].

Указания на «унию»/«богомерзкую» или «польскую» «унию», которые обычно вообще не сопровождаются конкретными примерами преследований, — это стандартные канцелярские клише. Документ, рассказывающий о приходе «иностранца» в Российскую империю, должен был сообщать такую формулу независимо от того, логично или алогично она сочеталась с биографическими фактами, приведенными рядом. Иногда архивные дела, состоящие из черновиков и беловых актов, даже показывают, как технически «цеплялось» указанное клише. Например, в 1760 г. Киевская губернская канцелярия разбирала дело шляхтича из Перемышля Михаила Урбановского. Этот уроженец Речи Посполитой, как и его отец и мать, был римо-католиком. Он служил «в саксонскомъ войске салъдатомъ драгуномъ и унъдеръ афицеромъ», а в 1759 г. пришел в Киев, был присоединен к православной церкви и женился на дочери поручика киевского гарнизона. Спустя год Урбановский хлопотал о приведении его к присяге на верность императорскому престолу и выдаче паспорта для свободного передвижения «малороссийскими» и «великороссийскими» городами. На поле прошения о разрешении проживать в империи, которое Михаил не сочинял, а только заверил подписью на польском языке, дописана вставка, объяснявшая причины перехода гра-

ницы: не хотел оставаться в «римском законе», через унию, желал жить в благочестии [25, л. 1–3 об.]. Как видим, этот текст создавался по «законам жанра», а вначале пропущенные обязательные клише дописали позже.

На то, что документы с типичной формулой о преследовании «унией» жителей воеводств Речи Посполитой (в т. ч. униатов и римо-католиков) не следует принимать на веру, указывает также более глубокое изучение отдельных случаев с привлечением разных источников. Вот только один пример. 4 ноября 1756 г. в Киевский Братский монастырь приняли с разрешением священнослужить иеродиакона Иоанна Дембровского. Он сообщил, что родился в шляхетской семье в Слуцке. В 12 лет от роду родители отправили Иосифа (светское имя) в иезуитский Полоцкий коллегиум, где он изучал философию. После этого Дембровский добровольно постригся, сменил несколько василианских монастырей и полоцким униатским епископом был рукоположен в диаконы. Последнее место проживания Иоанна перед прибытием в Киев — Жировицкий монастырь, где он состоял, «держась базилианского закону». В 1756 г. Дембровский, если верить его сведениям, решил из-за унии сбежать в Российскую империю. Первый раз беглеца поймали, жестоко наказали, так что второй раз он должен был пересекать границу без каких-либо вещей и документов. В Киевском Братском монастыре Иоанну назначили достаточно важное послушание — денежное шафарство. Менее чем через год, 30 июня, монах сбежал из Киева, прихватив с собой 66 рублей из казны обители. Несмотря на унию, которая якобы подтолкнула его прийти в Российскую империю, Дембровский направился именно в Речь Посполитую и «римлянином стал» [26, л. 1–3 об., 11, 14].

Как видим, вряд ли действительно «уния» заставила василианина Дембровского прийти в другое государство. Больше света на его биографию проливает другой документ — письмо архимандрита Слуцкого православного монастыря к князю-колятору от 17 мая 1758 г. В нем настоятель как раз рассказывает о Яне Дембровском (он же Фидельский). Оказывается, последний был евреем-выкрестом в римо-католицизм, а уже потом стал монахом-василианином Жировицкого монастыря. В этом монастыре он украл деньги и сбежал в Слуцк, но был пойман и отослан обратно. Второй раз инок сбежал в Киев, где, как видно с приведенных выше документов, в консистории сообщил другие данные о себе и вполне шаблонную причину пересечения границы (впрочем, причину могли вписать как обычное формулярное клише и без специального указания на нее Иоанном/Яном). После возвращения из Братского монастыря обратно в Речь Посполитую Дембровский был принят в Слуцкий монастырь и даже сумел зарекомендовать себя так, что был назначен проповедником архимандрии. Когда в Слуцк пришло известие

о его «подвигах», Фидельский в очередной раз сбежал, на этот раз — к иезуитам [27, s. 1–2]. Как видим, эти факты лишний раз подчеркивают, что заверения о «богомерзкой унии» — обычная формула, которая ставилась без разбора в документах о прибывших из Речи Посполитой.

Такой вывод позволяет в конце обратить внимание на два важных момента. Во-первых, изучая межконфессиональные отношения в «Польской области», нужно привлекать как можно больше разноплановых документов и обязательно анализировать их на наличие риторических клише. Во-вторых, не будет излишним еще раз исследовать причины перемещения уроженцев Речи Посполитой на постоянное жительство в Российскую империю и в Гетманщину в частности. Во всяком случае, часть «иностранцев» приходила сюда точно не из-за конфессиональных гонений.

Источники и литература

1. Центральный государственный исторический архив Украины, г. Киев (ЦГИАУК). — Ф. 51 (Генеральная Войсковая Канцелярия). — Оп. 3. — Д. 8433. — Реестр генеральной и полковой старшины Левобережной Украины. 1742 г.
2. ЦГИАУК. — Ф. 59 (Киевская губернская канцелярия). — Оп. 1. — Д. 4021. — Дело о принятии русского подданста священником г. Могилева Боровским, иеромонахом Почаевского монастыря Иринеем и др.; о принятии присяги на верность Петру Федоровичу студентами Киевской академии и ведомость о студентах Киевской академии, не принявших присяги и др. 1762 г.
3. ЦГИАУК. — Ф. 57 (Генеральная опись Левобережной Украины 1765–1767 гг.). — Оп. 1. — Д. 280. — Полк Переяславский, г. Переяслав.
4. ЦГИАУК. — Ф. 57. — Оп. 1. — Д. 280.
5. Институт Рукописи Национальной библиотеки Украины им. В. И. Вернадского (далее — ИР НБУВ). — Ф. 160. — Д. 1107.
6. ЦГИАУК. — Ф. 127 (Киевская духовная консистория). — Оп. 151. — Д. 71. — По промемории Киевской губернской канцелярии о вышедшем из Польской области иеродиаконе Иоанне Дембровском и об определении его в Киево-Братский училищный монастырь. 1756 г.
7. ЦГИАУК. — Ф. 127. — Оп. 169. — Д. 88. — Ведомость о качествах в Киево-Троицком Кирилловском монастыре монашествующих и бельцов, в монастыре находящихся. 1774 г.
8. ЦГИАУК. — Ф. 130 (Киево-Выдубицкий Михайловский Чудовский мужской монастирь). — Оп. 1. — Д. 16. — Копии указов царей, Синода и киевского архиепископа Рафаила Заборовского за 1738–1743 гг.
9. Акты и документы, относящиеся к истории Киевской академиии. Отд. II (1721–1795 гг.) / С введ. и примеч. Н. И. Петрова. — К., 1905. — Т. II (1751–1762 гг.). — XXXVIII+534 с.

10. Кузьмук, О. Межигірська старовина: нариси з історії Києво-Межигірського в ім'я Преображення Господнього чоловічого монастиря в XVI–XVIII століттях. — К.: ФОП «Видавець Олег Філонюк», 2014. — 624 с.
11. ЦГИАУК. — Ф. 127. — Оп. 1024. — Д. 2132. — Ведомости о духовенстве Пирятинской протопопии. 1772 г.
12. ЦГИАУК. — Ф. 127. — Оп. 1024. — Д. 2042. — Ведомости о духовенстве Роменской протопопии. 1771 г.
13. ЦГИАУК. — Ф. 127. — Оп. 1020. — Д. 4201. — Ведомости о духовенстве Кобеляцкой и Решетиловской протопопий. 1772–1773 гг.
14. ЦГИАУК. — Ф. 59. — Оп. 1. — Д. 2587. — Дело о приведении к присяге студентов Киевской академии. 1755 г.
15. Филарет (Гумилевский), архиеп. История Русской Церкви. — Изд. 5. — М., 1888. Период пятый, синодальное управление (1721–1826). — 234 с.
16. Яременко, М. Київське чернецтво XVIII ст. — К.: Вид. дім «Києво-Могилянська академія», 2007. — 304 с.
17. ЦГИАУК. — Ф. 127. — Оп. 138. — Д. 26. — По отношению генерал-губернатора Леонтьева о пострижении в монахи священника Садковского, бывшего прежде в унии. 1743 г.
18. Києво-Могилянська Академія кін. XVII – поч. XIX ст.: повсякденна історія. Зб. документів / Упор. О. Ф. Задорожна та ін. — К.: Вид. дім «КМ Академія», 2005. — 530 с.
19. ЦГИАУК. — Ф. 127. — Оп. 141. — Д. 51. — По отношению военного губернатора Леонтьева о принятии вышедшего с Польской области Казимира Луковского с присоединением в православную веру по принятии его в какой-либо монастырь. 1746 г.
20. ИР НБУВ. — Ф. 160. — Д. 1107.
21. ЦГИАУК. — Ф. 127. — Оп. 148. — Д. 63. — О вышедшем из Польской области священнике униатском Григории Яроцком, о принятии его в православную веру. 1753 г.
22. ЦГИАУК. — Ф. 59. — Оп. 1. — Д. 3545. — Дело о принятии русского подданства и переходе из католического в православное вероисповедание шляхтича г. Вильно Тендзегольского. 1760 г.
23. ЦГИАУК. — Ф. 127. — Оп. 148. — Д. 24. — По доношению Могилевской губернии шляхтянки Раины о выкрещении ее с сыном ее Казимиром в греко-российскую веру. 1753 г.
24. ЦГИАУК. — Ф. 127. — Оп. 148. — Д. 24.
25. ЦГИАУК. — Ф.59. — Оп. 1. — Д. 3547. — Дело о принятии русского подданства и переходе из католического в православное вероисповедание шляхтича г. Перемышля Урбановского М. 1760 г.
26. ЦГИАУК. — Ф. 127. — Оп. 151. — Д. 71.
27. Archiwum Główne Akt Dawnych w Warszawie. — AR. — Dz. V. — № 10298.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 18.11.2014

Гісторыя

З. В. Антановіч

Асабовы склад кліру і парафіяльнага духавенства Мінскай дыяцэзіі (паводле фармулярных спісаў рымска-каталіцкага святарства за 1867 г.)

У выніку грамадска-палітычных падзей другой чвэрці XIX ст. рымска-каталіцкае духавенства Мінскай дыяцэзіі апынулася ў складанай сітуацыі, якая прывяла да скасавання дыяцэзіі ў 1869 г. Гэта звязана як са стаўленнем дзяржаўных улад, якія імкнуліся абмежаваць уплыў каталіцтва ў рэгіёне, так і з падтрымкай яго прадстаўнікамі ідэй паўстання 1863–1864 гг. У выніку, калі ў 1860 г. у Мінскай губ. дзейнічалі 73 парафіяльныя касцёлы і 26 філіяльных, у 1865 г. — 72 і 23 адпаведна, то ў 1867 г. — 52 парафіяльныя і 11 філіяльных [4; 10, 1860, s. 75–83; 1865, s. 7–14]. Пры гэтым скарацілася колькасць духавенства і абнавіўся яго асабовы склад, што адлюстравана ў фармулярных спісах за 1867 г., якія захаваліся цалкам на тэрыторыі Мінскай дыяцэзіі ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі. Апрача персанальных звестак пра кожнага святара, у гэтых крыніцах пазначана яго ўтрыманне і падсуднасць, што было немалазначным у разглядаемы перыяд [1]. Паводле пададзеных звестак тут пражывалі 186 прадстаўнікоў каталіцкага духавенства, з якіх 44 адносіліся да Нясвіжскага дамініканскага кляштара [4].

Структура кіраўніцтва рымска-каталіцкай царквой у Мінскай дыяцэзіі ўключала біскупа, якому асісціравалі суфраган, візітатар, дэфенсары (абаронцы шлюбу), капітул і кансісторыя. Азначаныя асобы адносіліся да вышэйшага кліру. Біскуп ажыццяўляў агульнае кіраўніцтва царквой і духавенствам на падначаленай тэрыторыі, вызначаў напрамкі далейшага развіцця каталіцтва ў рэгіёне і прымаў канчатковыя рашэнні па судовых справах, якія разглядаліся ў кансісторыі. На жаль, фармулярны спіс біскупа А. Вайткевіча не быў далучаны да спісаў духавенства Мінскай дыяцэзіі. Вядома, што ён нарадзіўся 6 лютага 1796 г. у Віленскай губ. і з 1819 г. пачаў сваю душпастырскую дзейнасць. Да прызначэння на па-

саду біскупа ў 1852 г. з'яўляўся канонікам Магілёўскага капітула і рэктарам Мінскай семінарыі [11]. Даход біскупа ў 1866 г. складаў 4480 руб. [6, арк. 1]. У разглядаемы перыяд пасада суфрагана была вакантнай [10, 1860, s. 67; 1865, s. 3].

Сфера кампетэнцыі візітатара кляштараў ахоплівала ажыццяўленне пастырскіх і кананічных візітацый, а таксама прадстаўніцтва інтарэсаў рэвізаваных устаноў у кансісторыях і біскупа. Яго ўтрыманне складала 400 руб. у год [6, арк. 1]. З 1857 г. гэтую пасаду займаў В. Я. Вішнеўскі (нар. каля 1802 г.), які паходзіў са шляхты Жытомірскай губ. Ён навучаўся ва Уладзімірскім вучылішчы, а з 1820 г. — у Любарскім дамініканскім кляштары. Рукапакладзены ў 1827 г. і прызначаны настаўнікам гісторыі Рэчыцкага дваранскага вучылішча, адкуль пераведзены ў 1833 г. на пасаду адміністратара Бабруйскага касцёла, а з 1839 г. выкладаў Закон Божы ў мясцовым дваранскім вучылішчы. У 1855 г. быў куратам Мінскага кафедральнага касцёла, а ў 1859 г. — адміністратарам Каралішчавіцкага касцёла [4, арк. 4 адв.–6].

Дэфенсарамі, якія абаранялі шлюб падчас разгляду кансісторыяй судовых спраў аб яго скасаванні, у 1865 г. былі С. Знамяроўскі і А. С. Валентыновіч [10, 1865, s. 4]. У 1867 г. гэтыя абавязкі выконваў адзін з асэсараў кансісторыі, шляхціц Шавельскага пав. Ковенскай губ. А. С. Валентыновіч (нар. каля 1828 г.), які першапачатковую адукацыю атрымаў у Шавельскім дваранскім вучылішчы (1844–1851 гг.), а затым паступіў у Мінскую семінарыю, з якой перавёўся ў 1853 г. у Санкт-Пецярбургскую акадэмію. Апошнюю Валентыновіч скончыў са ступенню магістра багаслоўя ў 1856 г. і ў наступным годзе прызначаны аканомам у Мінскую семінарыю. З 1859 г. стаў настаўнікам Гарадзецкага бенедыкцінскага кляштара, адкуль у 1863 г. вярнуўся ў Мінск на пасаду выкладчыка св. Пісання і царкоўнай гісторыі, а з 1867 г. — гамілетыкі. У лістападзе 1867 г. заняў пасаду асэсара кансісторыі [4, арк. 33 адв.–34].

Капітул паводле статута складаўся з прэлатаў і канонікаў, якія павінны былі знаходзіцца пераважна ў Мінску. Да прэлатаў належалі прэпазіт (намеснік), архідыякан (дысцыплінарныя і адміністрацыйныя пытанні), дэкан (адміністрацыйныя пытанні), кусташ (распараджэнне маёмасцю капітула), кантар (музычнае суправаджэнне набажэнстваў) і схаластык (адукацыйныя пытанні). Канонікамі былі канцыянатар (багаслоў), віцэ-кусташ, сеньёр (дысцыплінарныя пытанні) і сакратар, які вёў пратакаліраванне пасяджэнняў, архіў і захоўваў пячатку. Акрамя таго, статутам вызначалася шэсць мансіянарыяў (вікарыяў), якія не належалі да капітула і не мелі права голасу, але былі абавязаны ўдзельнічаць у набажэнствах разам з членамі капітула. Калі члены капітула атрымлівалі аднолькавы заробак (прэпазіт — 250 руб., а іншыя прэлаты і канонікі

па 200 руб.) [6, арк. 1], то ўтрыманне мансіянарыяў складала яго палову (100 руб). [3, с. 94–106]. Да функцый Мінскага капітула належала правядзенне адным з канонікаў штодзённага набажэнства, а ў святочныя дні — адным з прэлатаў, падчас рэлігійных свят яны ўдзельнічалі ў імшы разам з біскупам. Агульны сход капітула адбываўся двойчы ў год: у дзень пасля свят Св. Стэфана і Цела Хрыстова. На ім разглядаліся пытанні аб набажэнствах, хваробе святароў, вызначэнні ўтрымання эмерытам, падрыхтоўцы справаздач біскупу і інш. [3, с. 110–121]. У 1860 г. у склад капітула ўваходзілі: прэпазіт Д. Машынскі, архідыякан Б. Ачапоўскі, дэкан Л. Лыжыкевіч, кусташ Э. Петрашкевіч, кантар Ф. Навіцкі, схаластык Б. Навіцкі. Канцыянатарам з'яўляўся А. Я. Баўблеўскі, віцэкусташам А. Машынскі, сеньёрам Ю. В. Календа, а сакратаром В. Вейтка [2; 10, 1860, s. 67–68]. У 1865 г. склад капітула цалкам аднавіўся шляхам прасоўвання па кар'ернай лесвіцы канонікаў: архідыяканам стаў А. Я. Баўблеўскі, дэканам А. Машынскі, кусташам Ю. В. Календа, кантарам А. М. Даманьскі, а канонікі, акрамя сакратара, адсутнічалі [10, 1865, s. 3–4]. Аналагічная сітуацыя назіралася ў 1866 г., калі архідыяканам стаў Л. Лыжыкевіч, дэканам Э. Петрашкевіч, кусташам Ф. Навіцкі, кантарам Б. Навіцкі, схаластыкам А. Я. Баўблеўскі. На свае пасады вярнуліся канонікі А. Машынскі, Ю. В. Календа, А. М. Даманьскі і В. Вейтка [10, 1866, s. 3–4]. Не назіралася стабільнасці ў складзе вышэйшага кліру і ў 1867 г., калі прэлатамі былі А. Я. Баўблеўскі, А. М. Даманьскі, Ю. В. Календа, а канонікамі — Ю. М. Падліпскі і Я. Ю. Каспяровіч. Члены капітула мелі шляхецкае паходжанне з Мінскай, Віленскай і Кіеўскай губ. і ўзрост ад 43 да 59 гадоў. Яны сумяшчалі свае абавязкі з выкладаннем у семінарыі або душпастырскай дзейнасцю, што дазваляла павялічыць уласныя даходы. Так, Ю. В. Календа (нар. каля 1808 г.), які паходзіў са шляхты Мінскага пав., першапачаткова атрымаў хатнюю адукацыю пад кіраўніцтвам бацькі, які ўтрымліваў мужчынскі пансіён, затым навучаўся ў Маладзечанскім павятовым вучылішчы (1822–1826 гг.) і Мінскай губернскай гімназіі (1826–1829 гг.). У 1829 г. паступіў у Мінскую рымска-каталіцкую семінарыю, аднак у 1830 г. за поспехі ў навучанні пераведзены ў Віленскі ўніверсітэт. Рукапакладзены са ступенню кандыдата багаслоўя ў 1834 г. і да 1839 г. быў сакратаром біскупа М. Ліпскага, адначасова выкладаючы рускую мову ў Мінскай семінарыі. З 1835 г. часова займаў пасаду сакратара кансіторыі і з 1836 г. стаў пробашчам Каменскага касцёла. У 1842 г. прызначаны канонікам Мінскай капітулы і спаведнікам біскупа П. Равы, а ў 1846 г. — прэлатам і мінскім дэканам. З 1865 г. стаў кантарам і кусташам капітула, а ў 1865 г. пакараны на 50 руб. за парушэнне правіл цэнзурнага статуту аб казаннях. У 1867 г. выплаціў 100 руб. за скліканне парафіян для высвятлення іх пераходу ў праваслаўе, а таксама 50 руб. за неабвяшчэнне

вікарыем Ракаўскага касцёла аб дзяржаўным свяце [4, арк. 39 адв.–42]. Магістр багаслоўя Ю. М. Падліпскі (нар. каля 1824 г. у шляхецкай сям'і) з'яўляўся канонікам Мінскага капітула з 1867 г. Першапачатковую адукацыю атрымаў у Мінскай губернскай гімназіі (1836–1842 гг.), а затым паступіў у Мінскую семінарыю, адкуль у 1844 г. пераведзены ў Санкт-Пецярбургскую акадэмію. У 1848 г. ён атрымаў ступень кандыдата багаслоўя з прызначэннем выкладаць гамілетыку, царкоўную абраднасць і спевы ў Мінскай семінарыі. У 1852 г. разам з атрыманнем ступені магістра пераведзены на пасаду адміністратара Клецкага касцёла, дзе працаваў да перамяшчэння ў Мінск у 1866 г. [4, арк. 59–64, 97 адв.–99]. У склад дадатковых членаў капітула (мансіянарыяў) таксама ўваходзілі два мансіянарыі: пробашчы Асоўскага і Лунінскага філіяльных касцёлаў А. І. Куроўскі [4, арк. 243–248, 266 адв.–267] і І. А. Вайткоўскі. Апошні (нар. каля 1802 г.) навучаўся ў Ломжынскім павятовым вучылішчы (1817–1821 гг.) і ўступіў у Гарадзішчанскі бенедыкцінскі кляштар, а ў 1833 г. здаў іспыты ў Віленскай акадэміі. З 1828 г. знаходзіўся ў Святакрыжскім бенедыкцінскім (каля Нясвіжа) і Гарадзішчанскім кляштарах, у першым з якіх з'яўляўся настаяцелем на працягу пяці гадоў. У 1864 г., у сувязі з ліквідацыяй кляштара, яго перавялі ў Лунінскую капліцу [4, арк. 239–242, 267 адв.–268].

У склад прысутнасці Мінскай кансісторыі ўваходзілі афіцыял і тры асэсары, якія з'яўляліся прадстаўнікамі вышэйшага кліру Мінскай дыяцэзіі. Імі вырашаліся пытанні адміністрацыйнага кіраўніцтва падначаленымі ўстановамі і духавенствам, для якіх рэгламентаваліся ўзаемаадносіны з прыхаджанамі. Важнейшыя дысцыплінарныя пытанні ў дачыненні духавенства і прыватных асоб, маёмасныя спрэчкі паміж духавенствам уваходзілі ў сферу судовай кампетэнцыі азначанай установы [9, арт. 64–68]. Пры гэтым кансісторыя мела права дарадчага голасу, а арцыбіскуп не меў права разглядаць судовыя справы асабіста. Утрыманне афіцыяла складала 200 руб., а асэсараў — па 150 руб. [6, арк. 1]. У кансісторыі, як і ў капітуле, у разглядаемы час не было пастаяннага асабовага складу. Так, у 1860 г. афіцыялам быў Б. Ачапоўскі, а асэсарамі — Л. Лыжыкевіч, Ф. Навіцкі, А. Я. Баўблеўскі [10, 1860, s. 68–69]. У 1865 г. пасада афіцыяла заставалася вакантнай, а асэсарамі сталі А. Я. Баўблеўскі, П. Валіцкі, А. М. Даманьскі [10, 1865, s. 4], а ў 1866 г. Ф. Навіцкі заняў месца афіцыяла. У складзе асэсараў адбылася адна змена, і Э. Петрашкевіч быў прызначаны замест А. М. Даманьскага [10, 1860, s. 4]. Прысутнасць кансісторыі ўключала асоб шляхецкага паходжання з Мінскай, Віленскай і Ковенскай губ. ва ўзросце 38–48 гадоў, з якіх сумяшчаў дзейнасць асэсара з выкладаннем у семінарыі толькі А. С. Валентыновіч. З 1865 г. прэлатам быў А. Я. Баўблеўскі (нар. каля 1819 г.), які паходзіў са шляхты Вількамірскага пав. Ковен-

скай губ. Навучаўся ў Трашкунскай гімназіі (1830–1837 гг.), Мінскай (1840–1844 гг.) і Санкт-Пецярбургскай семінарыях (1844–1847 гг.). Апошнюю ён скончыў са ступенню кандыдата багаслоўя. Пасля рукапакладання ў 1847 г. прызначаны вікарыем Мінскага кафедральнага касцёла, а з 1852 г. — дэканам г. Мінска. У 1854 г. прызначаны асэсарам кансісторыі і канонікам капітула. У 1858 г. стаў адміністратарам Ракаўскага касцёла. З 1861 г. прызначаны прэлатам капітула [4, арк. 2 адв.–4]. Другім асэсарам з'яўляўся П. П. Валіцкі (нар. каля 1829 г.), які паходзіў са шляхты Барысаўскага пав. Мінскай губ. Ён паступіў у Мінскую губернскую гімназію ў 1839 г. і пераведзены ў Віленскі шляхецкі інстытут у 1840 г. З 1848 г. навучаўся ў Мінскай семінарыі, а з 1850 г. — у Санкт-Пецярбургскай акадэміі, якую скончыў са ступенню магістра багаслоўя ў 1853 г. з прызначэннем на пасаду настаўніка Закону Божага ў Бабруйскім дваранскім вучылішчы ў 1854 г. У 1855 г. стаў аканомам Мінскай семінарыі, а з 1858 г. — куратам пры Мінскім кафедральным касцёле. З 1861 г. заняў пасаду асэсара Мінскай кансісторыі [4, арк. 3 адв.–5].

Мінская семінарыя з'яўлялася адзінай навучальнай установай па падрыхтоўцы духавенства ў губерні. У асабовы склад семінарыі ўваходзілі рэктар, інспектар, выкладчыкі як духоўнага звання, так і свецкіх асоб, аканом, які клапаціўся гаспадарчымі пытаннямі, і сакратар. Утрыманне рэктара семінарыі складала 500 руб., інспектара — 300 руб. [6, арк. 1]. Праца выкладчыкаў семінарыі аплачвалася ў адпаведнасці з іх дасведчанасцю і кваліфікацыяй, так выкладчык Св. Пісання атрымліваў — 200 руб., царкоўнай гісторыі семінарыі — 175 руб., гамілетыкі — 150 руб., царкоўнай абраднасці і спеваў — 100 руб. Утрыманне аканома складала 200 руб. [4, арк. 31 адв.–32]. У 1860 г. рэктарам быў Б. Навіцкі, інспектарам Я. К. Яўток, а выкладчыкамі з ліку духавенства — А. М. Даманьскі, Ф. Яшчолт, Г. Касоўскі, Ф. Гарбачэўскі [10, 1860, s. 69]. Да 1865 г. змяніўся рэктар, якім стаў А. М. Даманьскі, а выкладчыкамі — А. Пласкоўскі, А. С. Валентыновіч, Э. І. Дубовік [10, 1865, s. 5]. Гэты склад амаль цалкам захаваўся да 1867 г. Так, на пасадзе рэктара працягваў працаваць А. М. Даманьскі (нар. каля 1824 г., шляхціц Мінскага пав. і губ.), які навучаўся ў Бабруйскім дваранскім вучылішчы і Мінскай гімназіі (1839–1845 гг.). У 1845 г. паступіў у Мінскую семінарыю, а ў 1846 г. пераведзены ў Санкт-Пецярбург для працягу навучання. У 1850 г. рукапакладзены і прызначаны віцэ-пробашчам Нясвіжскага касцёла, а ў 1851 г. пераведзены ў Мінскі кафедральны касцёл на пасаду вікарыя. З 1852 г. выконваў абавязкі выкладчыка гамілетыкі і царкоўнай абраднасці ў Мінскай семінарыі, з 1853 г. таксама выкладаў багаслоўе, а з 1862 г. з'яўляўся рэктарам семінарыі да снежня 1867 г. у сувязі са станам здароўя. Пры гэтым у 1861 г. А. М. Даманьскі таксама стаў канонікам капітула [4, арк. 31 адв.–32]. Склад кіраўніцтва семіна-

рыі ў 1860–1867 гг. заставаўся стабільным, а змены пераважна кранулі выкладчыкаў духоўнага стану. Яны таксама сумяшчалі некалькі пасад вышэйшага кліру, таму, напрыклад, у 1866 г. А. Пласкавіцкі цалкам атрымліваў 350 руб., А. С. Валентыновіч — 375 руб., Э. І. Дубовік — 100 руб. [6, арк. 1]. Пры гэтым кіраўніцтва і выкладчыкі семінарыі значна адрозніваліся па ўзросце (ад 31 да 67 гадоў) і пераважна паходзілі са шляхты Мінскай, Кіеўскай і Ковенскай губ. Канонікам капітула з 1866 г. і інспектарам семінарыі з'яўляўся Я. К. Яўтак (нар. каля 1820 г., шляхціц Ковенскай губ.). З 1838 г. ён навучаўся ў Цяльшэўскім дваранскім вучылішчы, а з 1843 г. — у Мінскай семінарыі, з 1846 г. — у Санкт-Пецярбургскай акадэміі. Уступіў у сан у 1850 г. і прызначаны вікарыем Мінскага Траецкага касцёла, а ў 1853 г. — выкладчыкам дагматычнага багаслоўя ў семінарыі [4, арк. 32 адв.–34]. Акрамя іх, у Мінскай семінарыі выкладалі два прадстаўнікі духавенства А. С. Валентыновіч і Э. І. Дубовік. Пры гэтым апошні, 31-гадовы Э. І. Дубовік, з'яўляўся кандыдатам багаслоўя і выкладаў абраднасць і спевы. Ён нарадзіўся каля 1835 г. у шляхецкай сям'і Мінскага пав. і губ. Навучаўся ў Мінскай губернскай гімназіі з 1846 па 1854 г., а затым паступіў у семінарыю і з 1857 г. для атрымання ступені кандыдата багаслоўя быў пераведзены ў Санкт-Пецярбургскую акадэмію. Прыняў сан у 1861 г. і прызначаны вікарыем пры Мінскім кафедральным касцёле, а таксама выкладчыкам царкоўнай абраднасці і спеваў у семінарыі. З 1862 г. выконваў таксама абавязкі капелана ў Мінскім дзіцячым прытулку [4, 7 адв.–9, арк. 34 адв.–35]. У азначанай установе працаваў аканомам Л. А. Мароз [4, арк. 34 адв.–36].

Дыяцэзія ў адміністрацыйна-тэрытарыяльным дачыненні падзялялася на дэканаты на чале з дэканамі, якім адміністрацыйна падпарадкоўваліся парафіяльныя касцёлы з падначаленымі ім філіяльнымі капліцамі, дзе працавалі пробашчы і адміністратары. У іх адміністратарамі з'яўляліся прызначаныя на пасаду пробашча, але не зацверджаныя біскупам прадстаўнікі духавенства. У адрозненне ад пробашча яны не мелі права ўводзіць навацыі і падавалі асабістыя справаздачы біскупу. Дэканы звычайна з'яўляліся пробашчамі парафіяльных касцёлаў, якія мелі пашыраныя функцыі і дадаткова атрымлівалі 140 руб. Пры гэтым яны маглі адначасова займаць некалькі пасад, як дэкан Мінскага пав. Ю. В. Календа, які таксама з'яўляўся прэлатам капітула [4, арк. 39–42]. Даходы духавенства на ўтрыманне парафій былі ўніфікаваны пры раздзяленні парафій на класы ў 1844 г. [5, арк. 5–6 адв.]. Агульная сума не магла перавышаць заканадаўча ўсталяванага ўтрымання для касцёла пэўнага класа. Так, парафіі першага класа атрымлівалі 600 руб., другога — 500, трэцяга — 400, чацвёртага — 275, пятага — 230. Займанне іншых пасад дадаткова аплачвалася, напрыклад, настаўнік Закону Божага

атрымліваў 60 руб. Даход Б. М. Завусцінскага, які працаваў у мужчынскай і жаночай гімназіях г. Мінска, складаў 525 руб. [4, арк. 6 адв.–8]. Праца вікарыяў і эмерытаў, якія асісціравалі пробашчам у душпастырскай дзейнасці, магла не аплачвацца, а ў іншым выпадку яе памер таксама залежаў ад класа касцёла і мог значна адрозніваца. Так, у Каменскім касцёле вікарый атрымліваў 60 руб., Івянецкім — 42, Ракаўскім — 36, Пяршайскім — 30. Інвалід мог атрымліваць ад 75 да 90 руб. па рашэнні капітула ў адпаведнасці з яго кваліфікацыяй.

У Мінскі дэканат у 1867 г. уваходзілі 8 парафіяльных, 4 філіяльныя касцёлы і капліца пры Мінскім таварыстве дабрадзейнасці. На яго тэрыторыі працавалі 27 прадстаўнікоў духавенства, у іх ліку 6 адміністратараў, 4 пробашчы, 8 вікарыяў, з якіх трое пры Мінскім кафедральным касцёле і настаўнік Закону Божага ў жаночай і мужчынскай гімназіях г. Мінска. Сярод іх 10 з'яўляліся служачымі капітула, кансісторыі і семінарыі, у тым ліку трое сумяшчалі працу з пасадамі парафіяльнага духавенства. У Івянецкім, Каменскім, Пяршайскім і Ракаўскім касцёлах штаты духавенства былі ўкамплектаваны пробашчам або адміністратарам і вікарыем. Сярод касцёлаў Мінскага дэканата з 1865 г. ліквідаваны толькі Халяўшчынскі філіяльны касцёл. Пераважная большасць духавенства мела ўзрост ад 31 да 40 гадоў (14 чалавек), да 30 гадоў — тры святары, а старэйшых налічвалася сем. Малодшым быў 26-гадовы Б. В. Лаўрыновіч (нар. каля 1841 г.), адміністратар Анопальскага касцёла, які паходзіў са шляхты Лепельскага пав. Віцебскай губ. У 1855 г. ён скончыў Віленскае шляхецкае павятовае вучылішча і ў 1861 г. уступіў у Віленскі бернардынскі кляштар. Атрымаў пасвячэнне ў 1864 г. і прызначаны настаўнікам Закону Божага ў Віленскім Зарэчным народным вучылішчы. Пасля скасавання кляштара ў жніўні 1864 г. перамешчаны ў Мінскі бернардынскі кляштар, па ліквідацыі якога ў верасні прыпісаны да Мінскага кафедральнага касцёла. У снежні 1864 г. стаў адміністратарам Анопальскага філіяльнага касцёла [4, арк. 13 адв.–15]. Старэйшым са святароў з'яўляўся філіяліст Кальварыйскага касцёла 69-гадовы Г. І. Лаўрыновіч [4, арк. 12 адв.–14]. Пераважна ў Мінскім дэканаце душпастырскую дзейнасць выконвалі шляхціцы, якія паходзілі з Мінскай губ. Акрамя таго, па аднаму паходзілі з Віцебскай, Кіеўскай, Магілёўскай губ., па двое шляхціцаў з Віленскай і Гродзенскай, а шэсць паходзіла з Ковенскай губ. Сярод духавенства Мінскага дэканата быў мешчанін М. Ф. Аляхновіч, які нарадзіўся каля 1834 г. у г. Мінску. Будучы святар атрымаў адукацыю ў губернскай гімназіі (1846–1852 гг.) і семінарыі (1852–1856 гг.), пасля чаго прызначаны вікарыем Ігуменскага касцёла, а затым перамешчаны ў Бярэзінскі (1857 г.), Лагойскі (1858 г.), Койданаўскі (1859 г.), Крошынскі (1860 г.), Крыжскі (1861 г.), Каменскі (1862 г.) касцёлы [4, арк. 44 адв.–45]. На пасадзе мінскага дэкана

ў 1860 г. працаваў Ю. В. Календа, а ў 1865 г. — М.-Ф. М. Тамашэвіч [10, 1860, s. 75; 1865, s. 7]. Відавочна, у сувязі з вялікім аб'ёмам абавязкаў Ю. В. Календы ў 1867 г. працавалі два дэканы. Пры гэтым дэканы А. Я. Баўблеўскі і Ю. В. Календа, згодна са сваімі абавязкамі, пераважна знаходзіліся ў Мінску ў кансісторыі і капітуле, што пашырала абавязкі каменскага і ракаўскага вікарыяў адпаведна. Сфера дзейнасці першага ахоплівала тэрыторыю Мінскага пав., а М.-Ф. М. Тамашэвіч (нар. каля 1836 г., шляхціц Бабруйскага пав. Мінскай губ.) засяроджваўся на кіраўніцтве духавенствам г. Мінска. Ён навучаўся ў Бабруйскім павятовым дваранскім вучылішчы (1846–1852 гг.). Паступіў у Мінскую семінарыю ў 1856 г., але праз два гады па распараджэнні дыяцэзіяльнага кіраўніцтва быў накіраваны ў Санкт-Пецярбургскую акадэмію, дзе навучаўся да сакавіка 1862 г. Па слабасці здароўя адзін месяц не давучыўся ў акадэміі, таму атрымаў ступень студэнта багаслоўя і накіраваны ў Мінскую дыяцэзію, дзе прызначаны вікарыем Койданаўскага касцёла, а з 20 мая 1863 г. — Мінскага траецкага касцёла і 31 студзеня 1864 г. — дэканам г. Мінска і адміністратарам Траецкага касцёла [4, арк. 6 адв.–7].

Наднёманскі дэканат у 1867 г. уключаў тры парафіяльныя касцёлы, у якіх працавалі па два адміністратары і два вікарыі. Не былі зацверджаны на пасадзе, але прызначаны выконваючымі абавязкі адміністратар Уздзенскага касцёла А. В. Наркевіч [4, арк.276–281] і вікарый Койданаўскага касцёла К. Г. Гурын [4, арк. 290–291]. Гэта сведчыць аб дастатковай колькасці духавенства ў дэканаце, аднак у сувязі з тым, што з 1865 г. зачынілі тры касцёлы ў Мікалаеўшчыне, Рубяжэвічах і Стоўбцах, праца святароў была напружанай. Духавенства дэканата раўнамерна размяркоўвалася па ўзросце: ад 27 да 30 гадоў мелі двое, столькі ж ад 31 да 40 гадоў і па аднаму да 50 і 70 гадоў. Малодшым з іх лічыўся адміністратар Свержанскага касцёла К. Ю. Трацэўскі (нар. каля 1840 г.), які паходзіў з падатнага саслоўя Свянцянскага пав. Віленскай губ., а старэйшым — выконваючы абавязкі вікарыя Уздзенскага касцёла К. Г. Гурын. Цікава, што К. Ю. Трацэўскі першапачаткова атрымаў хатнюю адукацыю, а ў 1859 г. уступіў у Мінскі бернардынскі кляштар і з 1860 г. навучаўся ў семінарыі. У 1864 г. ён быў рукапакладзены і прызначаны вікарыем Свержанскага касцёла, а пасля смерці мясцовага пробашча заняў яго пасаду [4, арк. 284–285]. Акрамя згаданага прадстаўніка духавенства, іншыя належалі да шляхты Мінскай губ., а К. Ю. Тарвід — Ковенскай губ. [4, арк. 288 адв.–289]. У 1860 г. дэканат узначальваў Р. Балашэвіч, а ў 1865 г. — У. Лекает [10, 1860, s. 76; 1865, s. 8]. У 1867 г. гэтую пасаду займаў К. П. Гудвіловіч (нар. каля 1826 г.), які паходзіў са шляхты Мінскага пав. і губ. Адукацыю атрымаў у Мінскай губернскай гімназіі (1842–1850 гг.), а затым паступіў у Мінскую семінарыю, якую скончыў у 1853 г. і быў прызначаны вікарыем Барысаўскага кас-

цёла, а з 1856 г. — віцэ-пробашчам. З 1859 г. з'яўляўся адміністратарам Лагойскага і Смілавіцкага касцёлаў. У сакавіку 1867 г. стаў пробашчам Койданаўскага касцёла, а ў кастрычніку — наднёманскім дэканам [4, арк. 274 адв.–275].

У структуры Барысаўскага дэканата ў параўнанні з 1865 г. значных змен не адбылося, толькі Гайненскі касцёл стаў філіяльным. У ім налічвалася 12 парафіяльных і адзін філіяльны касцёл, а душпастырскія патрэбы выконвалі 20 святароў, у тым ліку 7 адміністратараў, 6 пробашчаў і 7 вікарыяў. Звыш паловы касцёлаў забяспечваліся пробашчам і вікарыем, у астатніх быў толькі пробашч. Сярод іх 28-гадовы А. В. Гарбатоўскі, вікарый Докшыцкага касцёла [4, арк. 342 адв.–343], і 79-гадовы А. М. Гарбацэвіч, пробашч Коранскага касцёла. Апошні нарадзіўся каля 1788 г. у шляхецкай сям'і Навагрудскага пав. Мінскай губ. Навучаўся ў Жыровіцкім павятовым вучылішчы (1800–1806 гг.), Мінскай губернскай гімназіі (1806–1808 гг.) і ў 1810 г. паступіў у Мінскую семінарыю. У 1812 г. рукапакладзены і прызначаны ў альтарыю Дзядзілавіцкага касцёла. З 1820 г. стаў пробашчам Альковіцкага, у 1824 г. — Ляхавіцкага, а ў 1830 г. — Коранскага касцёлаў [4, арк. 337 адв.–339; 354–355; 371 адв.–372].Значная частка святарства згаданага дэканата належала да сталага (ад 60 гадоў) — 8 чалавек і сярэдняга (ад 31 да 40 гадоў) узросту — 5 чалавек. Малодшыя былі двое ад 20 да 30 гадоў. Усе прадстаўнікі духавенства Барысаўскага дэканата паходзілі са шляхты. З Ковенскай губ. было 7 чалавек, Мінскай — 6, Віленскай — 3. Астатнія з Аўгустоўскай, Ковенскай і Падольскай губ., а адзін — У. В. Эйзенблетэр — з ліку шляхты нямецкіх падданых. Ён нарадзіўся каля 1824 г. і навучаўся ў Віленскай гімназіі (1835–1839 гг.). У 1839 г. уступіў у Заслаўскі бернардынскі кляштар, у 1844 г. пераведзены ў Жытомірскую дыяцэзіяльную семінарыю, адкуль у 1845 г. прызначаны прапаведнікам Віленскага бернардынскага касцёла. Рукапакладзены ў 1847 г. і заняў пасаду вікарыя ў касцёле св. Філіпа і Якава ў Вільні, а ў наступным годзе стаў прапаведнікам бернардынскага касцёла г. Мінска. У 1856 г. перамешчаны адміністратарам Воўчкавіцкага філіяльнага касцёла і капеланам Станькаўскай капліцы, а затым вікарыем Койданаўскага касцёла. Пасаду адміністратара Дукорскага касцёла У. В. Эйзенблетэр заняў у 1858 г., адкуль пераведзены на аналагічную пасаду ў Лагойск [4, арк. 336 адв.– 337; 350–351; 369 адв.–370]. У 1860 г. дэканам быў Н. Аўгустыновіч, якога да 1865 г. змяніў Ф. Д. Стржалка [10, 1860, s. 77; 1865, s. 9]. Апошні (нар. каля 1834 г.) паходзіў са шляхты Навагрудскага пав. Мінскай губ. Ён навучаўся ў Слуцкай гімназіі з 1852 г., а з 1857 г. паступіў у Мінскую семінарыю і ў 1860 г. быў рукапакладзены. У 1863 г. прызначаны віцэ-пробашчам (у 1866 г. пробашчам) Барысаўскага касцёла, з

1864 г. — дэканам, а ў 1866 г. — капеланам павятовага вучылішча [4, арк. 334 адв.–335].

Ігуменскі дэканат ахопліваў тэрыторыю 5 парафіяльных касцёлаў, дзе душпастырскія абавязкі выконвалі 4 адміністратары і 3 вікарыі, у тым ліку адміністратар Каралішчавіцкага касцёла і візітатар кляштараў В. Я. Вішнеўскі. Пры гэтым у Бярэзінскім касцёле служылі два вікарыі і адзін у Блонскім. У межах Ігуменскага дэканата ажыццяўлялі душпастырскую дзейнасць па 4 святары ва ўзросце ад 31 да 40 і 51–70 гадоў. Малодшым быў В. П. Шаблоўскі, 34-гадовы адміністратар Блонскага касцёла [4, арк. 154 адв.–155], а старэйшым — 65-гадовы дэкан Д. Ю. Лаўцэвіч. Паходжанне шляхецкага роду аднаго святара невядома, а сярод іншых з Мінскай губ. паходзілі 3 святары, Ковенскай губ. — 2 і па адным з Жытомірскай і Падольскай губ. Узначальваў дэканат у 1860 г. Л. А. Мароз, а ў 1865 г. К. Гудвіловіч [10, 1860, s. 78; 1865, s. 10]. Першы са згаданых святароў (нар. каля 1800 г., шляхціц Барысаўскага пав. Мінскай губ.) атрымаў адукацыю ў Лядаўскім павятовым вучылішчы і ў 1820 г. уступіў у кляштар Віленскіх бернардынцаў. У 1825 г. рукапакладзены і прызначаны ў Мінскі бернардынскі кляштар, дзе быў да 1838 г., калі перамешчаны ў Будслаў. У 1840 г. зноў апынуўся ў Мінску на пасадзе настаяцеля згаданага кляштара, куды вярнуўся ў 1863 г. У 1853 г. прызначаны часовым адміністратарам Смілавіцкага касцёла, а ў 1854 г. — дэканам. З 1863 г. стаў выконваючым абавязкі аканома Мінскай семінарыі [4, арк. 34 адв.–36]. Непрацяглы час дэканам працаваў А. Ф. Тышкевіч (нар. каля 1814 г.), які паходзіў са шляхецкага роду Расіенскага пав. Ковенскай губ. Першапачатковую адукацыю атрымаў у Расіенскім павятовым вучылішчы, а ў 1828 г. уступіў у Віленскі бернардынскі кляштар. Пасля рукапакладання ў 1836 г. прызначаны вікарыем Судвянскага касцёла. У 1839 г. стаў адміністратарам Шчучынскага касцёла, у 1850 г. — Кірыянаўскага, у 1859 г. — Анопальскага філіяльных касцёлаў. У 1863 г. перамешчаны на пасады адміністратара Смілавіцкага касцёла і ігуменскага дэкана, адкуль у 1865 г. пераведзены ў Халяўшчынскі філіяльны касцёл. У сувязі з абвінавачаннем па палітычнай справе быў пакараны на 100 руб. Пасля закрыцця апошняга застаўся па-за штатам [4, арк. 26 адв.–27]. З нагоды перамяшчэння А. Ф. Тышкевіча абавязкі дэкана выконваў К. П. Гудвіловіч, а затым паводле фармулярнага спіса ігуменскім дэканам стаў Д. Ю. Лаўцэвіч, які нарадзіўся каля 1802 г. у шляхецкай сям'і Шавельскага пав. Ковенскай губ. Першапачатковую адукацыю атрымаў у Паддубскім павятовым вучылішчы. Пасля заканчэння Мінскай семінарыі ў 1823 г. ён быў прызначаны вікарыем Рубяжэвіцкага касцёла, з 1826 г. перамешчаны ў Давыд-Гарадоцкі касцёл, а ў снежні — зноў у Рубяжэвіцкі. У 1833 г. стаў адміністратарам Ігуменскага касцёла, з 1838 г. выкладаў Закон

Божы ў мясцовым павятовым вучылішчы і ў 1864 г. прызначаны дэканам [4, арк. 153 адв.–154].

У Бабруйскім дэканаце дзейнічалі чатыры парафіяльныя касцёлы, дзе адміністратары, пробашч і вікарыі жылі ў Бабруйску, за выключэннем Харамцоўскага касцёла, клір якога размяшчаўся паблізу. Пераважная частка духавенства дэканата была сярэдняга ўзросту ад 40 да 60 гадоў (5 чалавек). Малодшымі з'яўляліся 30-гадовы настаўнік Закону Божага павятовай прагімназіі А. Г. Янкоўскі [4, арк. 181 адв.–183], а сярод парафіяльнага духавенства — адміністратар Харамцоўскага касцёла В. Ф. Урачэнскі [4, арк. 167 адв.–170; 186 адв.–187]. Старэйшым — 61-гадовы вікарый Глускага касцёла А.-Ю. Ф. Гедройц [4, арк. 185 адв.–187]. У 1860 г. пасаду дэкана займаў К. Шышко, а ў 1865 г. — С.-А. І. Макарэвіч [10, 1860, s. 78–79; 1865, s. 10]. Апошні, народжаны каля 1820 г. у сям'і шляхты Лідскага пав. Віленскай губ., навучаўся ў Віленскім бернардынскім кляштары, а затым у Іўеўскім. У 1842 г. ён быў перамешчаны ў Мінскі кляштар для працягу навучання. Пасля заканчэння вучобы ў 1843 г. рукапакладзены і прызначаны прапаведнікам у гэты кляштар, а затым кусташам у Нясвіжскі бернардынскі. У 1859 г. пераведзены ў стан парафіяльнага духавенства і прызначаны пробашчам Бабруйскага касцёла і дэканам [4, арк. 179 адв.–181].

Усе парафіяльныя касцёлы аб'яднанага пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг. Мазырска-Рэчыцкага дэканата працягвалі сваю дзейнасць. У іх працавалі 4 адміністратары і адзін выконваючы гэтыя абавязкі пробашч, 3 вікарыі, па адным часовым і выконваючым абавязкі вікарыя. У дэканаце таксама былі пробашч Лоеўскага філіяльнага касцёла (Ф. М. Кунцэвіч [4, арк. 218 адв.–220]) і капелан. Па 2 вікарыі налічвалася ў Астраглядавіцкім, Мазырскім і Рэчыцкім касцёлах, у тым ліку часовы і выконваючы абавязкі, 1 — у Петрыкаўскім. Паводле ўзросту 13 чалавек мелі ад 31 да 50 гадоў. Малодшым быў настаўнік Закону Божага Рэчыцкага павятовага вучылішча 27-гадовы У. І. Ісаевіч [4, арк. 218 адв.–219], а старэйшым — 52-гадовы пробашч Капаткевіцкага касцёла Ю. Пржасмыцкі [4, арк. 205–208, 215 адв.–217]. Цікава, што мясцовасць паходжання святароў не пазначана, што звязана з цэнтралізаваным зборам звестак дэканам. Сярод іх 45-гадовы адміністратар Петрыкаўскага касцёла Ю. Я. Бяртовіч, які паходзіў з сялянскай сям'і. Адукацыю будучы святар атрымаў у Цельшаўскім павятовым вучылішчы (1839–1844 гг.) і ў 1848 г. паступіў у семінарыю. Рукапакладзены ў 1852 г. і накіраваны на пасаду вікарыя ва Усялюбскі, а затым у Крошынскі і Рубяжэвіцкі касцёлы. З 1861 г. стаў адміністратарам Сваятыцкага касцёла, а затым аналагічныя пасады атрымаў у Оўруцкім і Петрыкаўскім касцёлах [4, арк. 202–203, 214 адв.–216]. У 1860 г. рэчыцкім дэканам з'яўляўся У. Лекат, а мазырскім — Ф. П. Рымша.

У сувязі з падзеямі на грамадска-палітычнай арэне краіны згаданыя адміністрацыйна-тэрытарыяльныя адзінкі царквы былі аб'яднаны, і ў 1865 г. Мазырска-Рэчыцкі дэканат узначальваў А. Макрэцкі [10, 1860, s. 79–80; 1865, s. 11]. Сярод іх цікавай з'яўляецца постаць Ф. П. Рымшы (нар. каля 1790 г. у шляхецкай сям'і), які першапачаткова навучаўся ў Свержанскім і Нясвіжскім павятовых вучылішчах, а ў 1816 г. паступіў у Мінскую семінарыю. У 1819 г. рукапакладзены і прызначаны вікарыем у Мінскі кафедральны касцёл. У 1820 г. перамешчаны на аналагічную пасаду ў Слуцкі, а пазней у Капыскі касцёл. З 1824 г. быў пробашчам Мазырскага касцёла, а ў 1826 г. таксама з'яўляўся настаўнікам Закону Божага ў мясцовым дваранскім вучылішчы. У 1828–1839 гг. служыў мазырскім дэканам, пасля чаго прызначаны візітатарам кляштараў Магілёўскай архідыяцэзіі. На гэтай пасадзе ён працаваў да 1844 г., калі вярнуўся ў вучылішча, а ў 1853 г. стаў дэканам паўторна [4, арк. 212 адв.–214]. У 1861 г. ён выдалены з парафіі па абвінавачванні ў правядзенні разам з манахамі Кімбараўскага кляштара паніхіды па загінуўшых у Варшаве 15 лютага 1860 г. Пасля заканчэння следства Ф. П. Рымша прызначаны вікарыем Галоўчыцкай капліцы, а ў хуткім часе пераведзены ў эмерыты [4, арк. 212 адв.–214; 7, арк. 82–83 адв.]. У маі 1867 г. дэканат узначаліў шляхціц А. Ф. Сянчыкоўскі (нар. каля 1837 г.). Адукацыю ён атрымаў у Слонімскім дваранскім вучылішчы, а ў 1854 г. паступіў у Мінскую семінарыю. У 1858 г. рукапакладзены і прызначаны вікарыем Койданаўскага касцёла, а ў 1860 г. — Слуцкага. З 1863 г. пераведзены на аналагічную пасаду ў Мірскі касцёл, дзе 11 чэрвеня 1864 г. быў арыштаваны па данасе аб палітычнай нядобранадзейнасці і высланы ў Вільню. Пасля вызвалення ў снежні вярнуўся ў Мінск, дзе заняў пасаду вікарыя касцёла [4, арк 209 адв.–210]. У якасці пакарання ў Мазырскі павет быў высланы былы пробашч Анопальскага філіяльнага касцёла і капелан Кімбараўскага жаночага кляштара цыстэрыянак шляхціц Ф. Я. Урбіковіч (нар. каля 1822 г.) [4, арк. 213 адв.–214].

Пасля ліквідацыі Лахвенскага і Целяханскага філіяльных касцёлаў у 1865–1867 гг. у Пінскім дэканаце засталіся 3 парафіяльныя касцёлы і 2 філіяльныя. Іх патрэбы забяспечвалі 8 святароў. Сярод духавенства дэканата таксама лічыўся настаўнік Закону Божага мясцовай гімназіі магістр багаслоўя Ф. І. Яшчалт, які з'яўляўся канонікам капітула. Пінскі касцёл узначальваў віцэ-пробашч, у іншых былі 2 адміністратары і 2 мансіянеры, а 2 вікарыі служылі ў Пінскім касцёле. Пераважна ўзрост духавенства дэканата складаў ад 32 да 57 гадоў. Малодшым быў 30-гадовы вікарый В. Л. Свідэрскі [4, арк. 249–252, 263 адв.–264], старэйшымі 65-гадовыя мансіянер Лунінскай капліцы І. А. Вайткоўскі [4, арк. 239–242, 267 адв.–268] і віцэ-пробашч К. М. Зянькевіч [4, арк. 257–260, 262 адв.–264]. Духавенства мела шляхецкае паходжанне з Ві-

ленскай, Гродзенскай, Жытомірскай і Мінскай губ., а для трох святароў мясцовасць не пазначана. У 1860 г. дэканат узначальваў А. Машынскі, а ў 1865 г. Р.-К. М. Тамашэвіч (нар. каля 1835 г.), брат мінскага дэкана М.-Ф. М. Тамашэвіча ўзначальваў Пінскі дэканат з 1865 г. Ён прыняў пасвячэнне ў 1860 г. і прызначаны вікарыем Глускага касцёла, а з 1862 г. — Пінскага. У 1862 г. перамешчаны ў Любяшоўскі касцёл [4, арк. 262 адв.–263; 10, 1860, s. 80; 1865, s. 11].

У Слуцкім дэканаце налічвалася 8 парафіяльных касцёлаў, колькасць якіх за два гады скарацілася на 4. Па колькасці духавенства Слуцкі дэканат лічыўся найбольшым, бо ў ім дзейнічаў Нясвіжскі дамініканскі кляштар, прадстаўнікі манаскага духавенства, якія пражывалі ў ім, пазначаны ў фармулярных спісах дыяцэзіі (44 чалавекі). Парафіяльнае духавенства складалася з 14 чалавек. Душпастырскай дзейнасцю займаліся 3 адміністратары, 5 пробашчаў і віцэ-пробашч кляштара, а таксама 4 вікарыі. Узрост духавенства ад 34 да 64 гадоў. Пры гэтым малодшым быў Г. І. Костка-Гадэцкі [4, арк. 49–54, 93–96], слуцкі пробашч 30 гадоў, а старэйшым — Ю. А. Вяржэйскі, ляхавіцкі пробашч 67 гадоў [4, арк. 231–234, 267 адв.–269]. Для сямі з іх мясцовасць паходжання не пазначана, астатнія паходзілі з Віленскай (трое), Мінскай (двое), Гродзенскай і Ковенскай губ. Слуцкі дэканат з 1852 г. узначальваў 50-гадовы пробашч Нясвіжскага касцёла В. А. Шымкевіч, шляхецкага паходжання, які скончыў Крожскую гімназію. Рукапакладзены пасля заканчэння Мінскай семінарыі ў 1841 г. і прызначаны вікарыем, а пазней віцэ-пробашчам Слуцкага касцёла. У 1849 г. пераведзены на аналагічную пасаду ў Барысаў, а ў 1850 г. на пасаду пробашча Цімкавіцкага касцёла. Адначасова ён выконваў абавязкі слуцкага дэкана [4, арк. 93–94; 10, 1860, s. 81; 1865, s. 12].

У Навагрудскім дэканаце ў 1860–1867 гг. спыніў дзейнасць Стараельненскі касцёл. У астатніх працавалі 2 пробашчы і 4 вікарыі, з апошніх 2 — у Навагрудку. Там жа выкладаў настаўнік Закону Божага і канонік капітула Ф. Ф. Бядржынскі [4, арк. 129–131]. Па ўзросце прадстаўнікі духавенства пераважна належалі да асоб ад 31 да 47 гадоў. Сярод іх 31-гадовым быў вікарый Усялюбскага касцёла А. Ф. Лазарэвіч [4, арк. 115–116, 140 адв.–141], а старэйшым лічыўся 75-гадовы М. С. Чапрацкі, пробашч Усялюбскай парафіі [4, арк. 113–114, 139 адв.–140]. Яны паходзілі са шляхты Мінскай (трое), Віленскай (двое) і Ковенскай губ. Паходжанне вікарыя Навагрудскага касцёла К. П. Кучэўскага невядома [4, арк. 127–128, 130 адв.–133]. Пры гэтым, калі ў 1860 г. дэканат узначальваў К. Эйсымант, у 1865 г. — Я. Пухальскі, то ў 1867 г. азначаная пасада была вакантнай [10, 1860, s. 82; 1865, s. 13].

У 1865 г. у Ствалавіцкім дэканаце налічвалася 9 парафіяльных касцёлаў, а засталося 4, якія ўзначальваліся 2 пробашчамі, 2 адміністратарамі,

якім дапамагаў 89-гадовы вікарый Паланецкага касцёла Б. Д. Хелятоўскі. Апошні (нар. каля 1778 г.) паходзіў са шляхты Трокскага пав. Віленскай губ. Адукацыю атрымаў у Мярэцкім вучылішчы (1794–1800 гг.) і ўступіў у Віленскі бернардынскі кляштар. У 1808 г. атрымаў пасвячэнне і прызначаны вікарыем у Каранеўскі касцёл, а з 1810 г. у Грычышскі. З 1816 г. ён быў адміністратарам Цярэсльскага касцёла, з 1819 г. — Гадушыцкага, з 1827 г. — Гарадзішчанскага. У 1858 г. служыў адміністратарам Задвейскага касцёла да яго ліквідацыі ў 1867 г., калі прызначаны вікарыем Паланецкага касцёла [4, арк. 119–120; 144 адв.–146]. Адначасова Крошынскі касцёл узначальваў 30-гадовы М. В. Ясевіч [4, арк. 125–126, 147 адв.–148]. Духавенства Ствалавіцкага дэканата мела ўзрост ад 35 да 53 гадоў. З вольных людзей Шавельскага пав. Ковенскай губ. паходзіў В. А. Шпакоўскі (нар. каля 1831 .). Ён навучаўся ў Шавельскім дваранскім вучылішчы (1841–1844, 1849–1850 гг.), Віленскай, Вармянскай і Мінскай семінарыях (1858–1862 гг.). Пасля навучання ў 1862 г. быў рукапакладзены і прызначаны вікарыем Дарэўскага касцёла, а ў 1867 г. — адміністратарам Крошынскага [4, арк. 123–124, 146 адв.–147]. Астатнія святары прадстаўлялі шляхту Віленскай, Гродзенскай і Ковенскай губ. Аналагічна Навагрудскаму дэканату ў 1867 г. у Ствалавіцкім адсутнічаў дэкан, аднак ёсць звесткі, што ў 1860–1865 гг. гэтую пасаду займаў Юзаф Шмігельскі [10, 1860, s. 83; 1865, s. 13].

Цікава, што фармулярныя спісы складаліся таксама на былых пробашчаў і вікарыяў, адхіленых ад выканання абавязкаў у сувязі з удзелам у паўстанні па абвінавачванні цывільнымі ўладамі. Сярод іх А. К. Міхаэліс (нар. каля 1827 г.), які з 1858 г. займаў пасаду Бярэзінскага адміністратара, а ў 1865 г. абвінавачаны ў апрананні забароненага адзення, заахвочванні прыхаджан спяваць у касцёле «абуральныя» гімны, а таксама ў хаванні паўстанцаў. За гэта ён быў перамешчаны ў іншую парафію на пасаду вікарыя пад нагляд мясцовага духавенства [4, арк. 19 адв.–20; 8, арк. 7–7 адв., 9–9 адв.]. А. К. Сцецкі (нар. каля 1827 г.) з 1867 г. узначальваў Ішкальдскі касцёл, калі быў выкліканы ў г. Мінск для следства па палітычнай справе [4, арк. 21 адв.–22]. Таксама захаваўся фармулярны спіс пробашча Замастоцкага касцёла (з 1844 г.) Я. П. Пяркоўскага (нар. каля 1802 г.), які знаходзіўся пад судом па справе аб адчыненні ў 1865 г. уваходу ў склеп касцёла [4, арк. 22 адв.–23]. За дастаўку споведных картак перад Вялікаднём у навагрудскай турме з 8 студзеня 1868 г. знаходзіўся вікарый Ствалавіцкага касцёла Ю. А. Навіцкі (нар. каля 1841 г.) [4, арк. 136 адв.–137]. Я. М. Расінскі (нар. каля 1810 г.) быў адхілены ад пасады адміністратара Целяханскага філіяльнага касцёла за пахаванне паўстанца [4, арк. 24 адв.–26].

У сувязі з ліквідацыяй касцёлаў па-за штатамі ў Мінскай дыяцэзіі засталіся 9 святароў. Улічваючы іх узрост і здольнасць да выканання

абавязкаў, яны маглі таксама знаходзіцца пад следствам па палітычных справах, аднак звесткі пра гэта маглі не падаць у фармулярныя спісы. Сярод іх адміністратары А. М. Кершанскі з Мікалаеўскага касцёла [4, арк. 22 адв.–24], Ф. Ф. Дамброўскі са Сваятыцкага касцёла [4, арк. 133 адв.–134], Ю. М. Расінскі са Стаўбцоўскага касцёла [4, арк. 24 адв.–26], Ю. А. Кулакоўскі з Капыльскага касцёла [4, арк. 23 адв.–25], Ф. Д. Баркоўскі з Нясвіжскага касцёла [4, арк. 211 адв.–213]. Падчас душпастырскай дзейнасці П. С. Гаўронскага (нар. каля 1825 г.) былі ліквідаваны тры касцёлы (Сноўскі (1865 г.), Замастоцкі (1866 г.), Навамышскі (1867 г.)) [4, арк. 137 адв.–139]. Аналагічна без працы засталіся вікарыі Я. С. Юзафовіч (Валмянскі касцёл) [4, арк. 25 адв.–26], Г. Я. Леановіч (Гарадзішчанскі касцёл) [4, арк. 134 адв.–136] і Ф. С. Грыгаровіч (Навамышскі касцёл) [4, арк. 134 адв.–135].

Такім чынам, вышэйшы клір Мінскай дыяцэзіі ў 1867 г. прадстаўляў сабой невялікую, закрытую і ўзаемазвязаную па пасадах групу духавенства. У склад капітула ўваходзілі 5 чалавек, прысутнасці кансісторыі — 3, а семінарыі — 5. Пры гэтым прэлатам капітула з'яўляўся рэктар семінарыі А. М. Даманьскі, а канонікам яе інспектар — Ю. К. Яўток. Абавязкі асэсара кансісторыі выконваў А. С. Валентыновіч, выкладчык св. Пісання, царкоўнай гісторыі і гамілетыкі семінарыі. Прадстаўнікі вышэйшага кліру дыяцэзіі мелі навуковыя ступені магістра і кандыдата навук і паходзілі са шляхты пераважна Мінскай губ. (5 чалавек), а таксама з прадстаўнікоў Віленскай, Кіеўскай і Ковенскай губ. Сярэдні ўзрост складаў ад 38 да 48 гадоў. Найбольш маладым быў 31-гадовы выкладчык царкоўных абрадаў і спеваў Э. І. Дубовік, а старэйшымі 67-гадовы аканом семінарыі Л. А. Мароз і 59-гадовы прэлат Ю. В. Календа. У асабовым складзе капітула назіралася штогадовая змена кадраў пры інтэнсіўным прасоўванні па іерархіі канонікаў. Праца кансісторыі характарызавалася большай стабільнасцю, а ў семінарыі мяняліся выкладчыкі. Члены капітула і кансісторыі атрымлівалі ўтрыманне ў залежнасці ад пасады, аднак у кансісторыі менш. Прадстаўнікі вышэйшага кліру і выкладчыкі семінарыі мелі магчымасць сумяшчаць некалькі пасад.

У параўнанні з 1860–1865 гг., калі дзейнічалі 73 парафіяльныя касцёлы, засталіся 52 (каля 71%) у 1867 г. Сярод іх найбольшыя страты панёс Наднёманскі дэканат, дзе было ліквідавана каля паловы прадстаўніцтваў каталіцтва. У выніку іх нешматлікасці аб'яднаны Мазырскі і Рэчыцкі дэканаты. У астатніх засталося 3–5 парафіяльных касцёлаў, за выключэннем Мінскага і Бабруйскага, у якіх было ад 8 да 12 адпаведна. Больш складаная сітуацыя назіралася з філіяльнымі касцёламі. Сярод іх з 26–23 забяспечаны духавенствам былі 11 (каля 41%) і два з іх знаходзіліся ў Пінскім дэканаце, а астатнія фактычна прыпынілі сваю дзейнасць. Пры гэтым асобныя прадстаўнікі духавенства працавалі выкладчыкамі

Закону Божага ў навучальных установах Мінскай губ.: Навагрудскай, Пінскай гімназіях, Бабруйскай прагімназіі, Рэчыцкім павятовым вучылішчы і інш. У Навагрудскім і Ствалавіцкім дэканатах у разглядаемы перыяд адсутнічалі дэканы. Душпастырскія абавязкі ў 31 касцёле выконваў адзін святар (49%), у 25 — два прадстаўнікі духавенства (40%), у 7 — трое (11%), што сведчыць аб укамплектаванасці штатаў у 51 % касцёлаў. З пазначаных працавалі толькі 20 пробашчаў, 36 адміністратараў касцёлаў, 42 вікарыі і тры капеланы. У сувязі са скасаваннем касцёлаў і ўдзелам у палітычных падзеях 1863–1864 гг. без працы засталіся 14 прадстаўнікоў духавенства.

Пераважная большасць духавенства мела ўзрост ад 31 да 40 гадоў — 37 %, ад 41 да 50 і ад 51 да 60 гадоў — па 15 %, ад 61 да 70 гадоў — 16 %, а ад 25 да 30 гадоў і звыш 71 года па 10 і 6 % адпаведна. Улічваючы, што ў сярэднім святарскае пасвячэнне атрымлівалі маладыя людзі не раней 26 гадоў, можна канстатаваць недастатковую кваліфікацыю парафіяльнага духавенства. Гэта пацвярджае факт прызначэння святароў пераважна адміністратарамі касцёлаў. Малодшымі сярод іх былі 26-гадовыя былы іераманах бернардынскага ордэна і адміністратар Анопальскай філіі Б. В. Лаўрыновіч, былы вікарый Ствалавіцкага касцёла Ю. А. Навіцкі, а старэйшымі — 79-гадовы пробашч Коранскага касцёла А. М. Гарбацэвіч і 89-гадовы вікарый Паланецкага касцёла Б. Д. Хелятоўскі. За выключэннем 7 прадстаўнікоў, святарства Мінскай дыяцэзіі паходзіла са шляхты. Пры гэтым з Мінскай губ. 27 % духавенства былі шляхецкага стану, Ковенскай — 22%, Віленскай — 12%, Гродзенскай — 8%. Не пазначана тэрытарыяльнае паходжанне 23 %. Астатнія паходзілі з Падольскай, Жытомірскай, Магілёўскай, Аўгустоўскай, Віцебскай, Кіеўскай губ. і адзін з ліку нямецкіх падданых. З сялян адзначаны Ю. Я. Бяртовіч і К. Ю. Трацэўскі, з вольных людзей В. А. Шпакоўскі, з мяшчан М. Ф. Аляхновіч.

Зыходзячы са звестак, прадстаўленых у фармулярных спісах духавенства за 1867 г., можна сцвярджаць, што закрытасць вышэйшага кліру і асабовы склад парафіяльнага святарства, на які ў значнай ступені паўплывалі падзеі паўстання 1863–1864 гг., сведчаць аб крызісе ў дыяцэзіі. Гэта стала адным з найбольш значных фактараў у ліквідацыі Мінскай дыяцэзіі.

Крыніцы і літаратура

1. Антановіч, З. В. Фармулярныя спісы рымска-каталіцкага духавенства // Архівы і справаводства. — 2009. — № 6. — С. 128–134.
2. Антановіч, З. В. Прыватнае жыццё і грамадская дзейнасць ксяндза Вікенція Вейткі (па матэрыялах фонду «Магілёўская рымска-каталіцкая

кансісторыя» НГАБ) // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. Вып. 11 / рэдкал.: Ю. М. Бохан [і інш.]. — Мн.: НГАБ, 2013. — С. 43–53.
3. Акты и грамоты об устройстве и управлении Римско-католической церкви в империи Российской и царстве Польском. — Санкт-Петербург: Типография второго отделения Е. И. В. канцелярии, 1849. — 240 с.
4. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). — Ф. 937. — Воп. 6. — Спр. 107. — Фармулярныя спісы духавенства Мінскай рымска-каталіцкай дыяцэзіі. 1867 г.
5. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 2. — Спр. 3261. — Справа аб размеркаванні парафій на класы. 1844 г.
6. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 24. — Спр. 15739. — Спіс устаноў і рымска-каталіцкага духавенства Мінскай дыяцэзіі. 1866 г.
7. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 32. — Спр. 132. –Звесткі аб рэпрэсіях супраць рымска-каталіцкага святарства за антыўрадавыя выступленні. 1826–1866 гг.
8. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 32. — Спр. 145 — Справаздачы дэканаў аб святарах і іншых асобах, прыцягнутых да адказнасці за ўдзел у паўстанні, захаванне перапіскі палітычнага зместу і ўкрывальніцтва паўстанцаў. 1864–1867 гг.
9. Свод учреждений и уставов управления духовных дел иностранных исповеданий христианских и иноверных. — Кн. 1. Об управлении духовных дел христиан римско-католического и армяно-католического исповеданий // Свод законов Российской империи / Сост. Н. П. Балканов, С. С. Войт, В. Э. Герценберг, под ред. И. Д. Мордухай-Болтовского. — Санкт-Петербург: печ. Графического института. Бр. Лукшевиц, 1896. — Т. XI. — Ч. 1. — С. 1–16.
10. Directorium officii divini ac missarum SS pro dioecesi Minscensi in Annum Domini MDCCCLX. — Minsci: typis A. Dworzec, 1860. — 142 s.; 1865 — 128 s.; Minsci: Typis regimis Gubernii, 1866. — 131 s.
11. Lietuvos valstybės istorijos archyvas (Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў). — F. 604. — Ap. 4. — B. 1227. — Справа аб прызначэнні рэктара Мінскай семінарыі А. Вайткевіча мінскім біскупам. 1852–1869 гг.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 08.05.2014

Т. П. Варабей

Стан архітэктурнай спадчыны І. К. Глаўбіца ў канцы XVIII – пачатку XX ст.

Іаган Крыштаф Глаўбіц (1700?–1767) лічыцца адным з вядучых прадстаўнікоў архітэктуры «віленскага барока» — разнавіднасці позняга барока, што склалася на землях Вялікага Княства Літоўскага ў

1730–1760-х гг. На сённяшні дзень няма дакладных звестак аб паходжанні і прафесійнай адукацыі архітэктара, аднак вядома, што прыкладна з 1737 г. І. К. Глаўбіц жыў у Вільні, дзе займаўся пераважна аднаўленнем храмаў розных канфесій і жылых будынкаў пасля пажараў 1737, 1748, 1749 і 1760 гг. Архітэктар перыядычна атрымліваў замовы і на перыферыі ВКЛ, дзе таксама актыўна вялося будаўніцтва пасля разбурэнняў Паўночнай вайны. У сувязі з рознымі гістарычнымі абставінамі многія пабудовы І. К. Глаўбіца часткова ці амаль цалкам страцілі сваё знешняе і ўнутранае аблічча. У гэтых адносінах асобнага разгляду патрабуюць такія аспекты, як стан помнікаў, спецыфіка іх захавання, аднаўлення і выкарыстання ў канцы XVIII – пачатку XX ст., калі тэрыторыі былога Вялікага Княства Літоўскага ўвайшлі ў склад Расійскай імперыі.

Варта адзначыць, што ў акрэслены перыяд імя І. К. Глаўбіца апынулася ў забыцці і не было вядома нават спецыялістам, пры ўмове, што вывучэнне архітэктурнай спадчыны ВКЛ доўгі час абмяжоўвалася гістарычна-краязнаўчымі публікацыямі і даведнікамі (А. Кіркор, Ю. Крашэўскі, Я. Жыскар і інш.) [12, с. 55–56], якія ў пэўнай ступені выступаюць і ў якасці літаратурных ці публіцыстычных крыніц. Важную інфармацыю аб стане пабудоў І. К. Глаўбіца змяшчаюць дакументальныя крыніцы (у т.л. апублікаваныя) з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (НГАБ), Літоўскага дзяржаўнага гістарычнага архіва (Lietuvos valstybės istorijos archyvas, LVIA) і інш.: візіты храмаў, справаздачы аб рамонтных і будаўнічых работах, каштарысная дакументацыя і г.д. Вялікую каштоўнасць маюць выяўленчыя крыніцы, якія фіксуюць тагачасны выгляд помнікаў архітэктуры (фотаздымкі, малюнкі, акварэлі, чарцяжы і г.д.).

Сур'ёзная ўвага даследчыкаў была звернута на спадчыну І. К. Глаўбіца толькі ў 1930-х гг., калі польскія гісторыкі мастацтва сфармулявалі тэрмін «віленскае барока». На працягу дзесяцігоддзяў вядучым спецыялістам па творчасці архітэктара заставаўся польскі мастацтвазнаўца С. Лоранц, аўтар манаграфіі аб яго жыцці і дзейнасці [16]. У сваю чаргу літоўскі мастацтвазнаўца В. Дрэма выявіў і апублікаваў вялікую колькасць крыніц па архітэктуры «віленскага барока» [10], надаўшы асаблівую ўвагу пабудовам І. К. Глаўбіца [11]. Дадзеныя аўтары цесна супрацоўнічалі паміж сабой, лічылі І. К. Глаўбіца найбольш значнай постаццю ў архітэктуры Вялікага Княства Літоўскага 1730–1760-х гг. і спрабавалі скласці поўны пералік яго прац. Аднак атрыбуцыя многіх пабудоў праводзілася на падставе стылістычнага аналізу, што стала прычынай шматлікіх памылак і спрэчных момантаў у наступных публікацыях. У сучаснай гістарыяграфіі назіраюцца новыя падыходы да інтэрпрэтацыі творчасці І. К. Глаўбіца, што звязана з удакладненнем аўтарства, адкрыццём звестак пра іншых архітэктараў і г.д. У прыват-

насці, польскі мастацтвазнаўца М. Карповіч аспрэчвае многія «традыцыйныя» атрыбуцыі, што дазваляе яму характарызаваць І. К. Глаўбіца толькі як «аднаго з многіх» архітэктараў «віленскага барока», прычым досыць пераацэненага і не самага таленавітага [13, с. 75].

На сённяшні дзень грунтоўны аналіз наяўных крыніц і даследаванняў [4; 11; 13; 17] дае магчымасць больш дакладна акрэсліць кола пабудоў, якія былі ўзведзены паводле праектаў І. К. Глаўбіца. У межах артыкула звернем увагу толькі на тыя аб'екты, у адносінах да якіх аўтарства архітэктара пацверджана пісьмовымі крыніцамі. Маюцца на ўвазе наступныя помнікі архітэктуры (у дужках указаны даты аднаўленчых і будаўнічых работ паводле праектаў І. К. Глаўбіца):

1. Лютэранскі (евангельска-аўгсбургскі) збор у Вільні (1737–1743);
2. Касцёл Св. Янаў ордэна езуітаў у Вільні (1737–1762) [1];
3. Касцёл Св. Кацярыны ордэна бенедыктынак у Вільні (1741–1746);
4. Касцёл Св. Яна Хрысціцеля ордэна іанітаў у Сталовічах (1743–1746);
5. Палац уніяцкага мітрапаліта Ф. Грабніцкага ў Струні (1748–1749);
6. Будынкі Езуіцкай акадэміі (аўла, капліца Св. Станіслава Косткі, брама і інш.) у Вільні (1748–1766);
7. Праваслаўная царква Св. Духа ў Вільні (1749–1756);
8. Касцёл Св. Юрыя і кляштар дамініканцаў у Забелах (1749–1766);
9. Праваслаўная Спаса-Праабражэнская царква ў Магілёве (1756–1762).

У артыкуле таксама закрануты такі спрэчны аб'ект, як уніяцкая царква (Сафійскі сабор) ордэна базыльянаў у Полацку (1738/1748(?) – 1764) [2]. У той жа час па-за ўвагай застанецца шэраг аб'ектаў, якія звычайна прыпісваюцца І. К. Глаўбіцу паводле стылістычных аналогій, аднак выклікаюць значныя сумненні (касцёлы Узнясення Гасподняга, Св. Казімі-

---

[1] У свой час В. Дрэма выявіў значную колькасць дакументаў, якія фіксуюць актыўны ўдзел І. К. Глаўбіца ў будаўнічай кампаніі езуітаў, што дазволіла даследчыку лічыць яго праектантам цэласнай перабудовы касцёла Св. Янаў (фасады, званіца, інтэр'ер) [9, с.63]. Аднак М. Карповіч мяркуе, што архітэктарам касцёла павінен быў быць нехта больш вопытны з асяроддзя езуітаў і бачыць у асобе І. К. Глаўбіца толькі кіраўніка будоўлі [13, с. 78].

льнікаў Станіслава І Ляшчынскага і падтрымаць падобныя падаткі, як раней было зроблена ў Ашмянскім павеце [18, k. 1–3; 19, с. 338]. Спецыяльна дасланы Антоніем Пацеем атрад захапіў наваградскага харужага Пятра Совіча Корсака і наваградскага земскага пісара Стэфана Гарабурду. Праўда, апошняга хутка адпусцілі дадому (магчыма з-за хваробы). Пётр Совіч Корсак меў намер прысягнуць на вернасць Станіславу І Ляшчынскаму і аддаць набраныя з Наваградскага ваяводства грошы. Больш таго, Корсак нават пачаў фарміраваць харугву для прыхільнікаў Ляшчынскага. Разам з ім дзейнічаў таксама наваградскі гродскі пісар Самуэль Совіч Корсак, які прысягнуў Станіславу І Ляшчынскаму [16, k 293; 18, k. 3; 19, с. 338].

Наваградская шляхта 8 лютага 1734 г. сабралася на грамнічны соймік. Дырэктарам сойміка быў абраны наваградскі земскі пісар Стэфан Міхал Гарабурда. На сойміку не дайшло да выбару дэпутатаў на Трыбунал ВКЛ. У наступны дзень быў праведзены гаспадарчы соймік. Дырэктарам яго стаў наваградскі харужы Пётр Совіч Корсак. Згодна з універсалам Станіслава І Ляшчынскага і стражніка ВКЛ і генеральнага рэгіментарыя ВКЛ Антонія Пацея на паспалітае рушанне наваградская шляхта стварыла канфедэрацыю ў абарону «вольнага выбару» Станіслава Ляшчынскага. Асабліва падкрэслівалася, што наваградскія шляхціцы ўзялі прыклад з аршанскай канфедэрацыі, якая праходзіла праз Наваградскае ваяводства. На гэтым сойміку наваградскі гродскі суддзя Антоні Рдултоўскі і вярбельскі староста Марцін Храптовіч былі абраны пасламі да Антонія Пацея абраны былі 4 ротмістры: наваградскі гродскі пісар Самуэль Совіч Корсак, Якуб Ермаловіч, Станіслаў Равінскі і Міхал Кжышылоўскі, якія павінны былі кіраваць новасфарміраванымі харугвамі. Для іх стварэння ўводзіўся падатак з кожнага дыму па 6 злотых і 20 грошаў. У выніку планавалася атрымаць 120 тысяч злотых, што азначала па 30 тысяч злотых на фарміраванне кожнай харугвы. Грошы меркавалася сабраць у Наваградскім гродзе за кароткі тэрмін з 14 па 28 лютага 1734 г. За гэтыя грошы ротмістры мелі намер стварыць чатыры харугвы: у кожнай па 100 таварышаў, якія павінны былі плаціць па 300 злотых. Харугвы планавалі сабраць 8 сакавіка 1734 г., калі меркаваўся іх агляд будучым кіраўніком — наваградскім харужым Пятром Совічам Корсакам. Таксама трэба было выплаціць запазычаную пасольшчыну з каралеўскіх уладанняў за паславанне на сойм наваградскаму падваяводзе Мікалаю Булгарыну і вярбельскаму старосце Марціну Храптовічу. «Па прыкладу Сандамірскага ваяводства» наваградская шляхта склала тэкст прысягі на вернасць Станіславу І Ляшчынскаму, якую павінны былі прыносіць наваградскія шляхціцы перад наваградскім чашнікам і наваградскім гродскім суддзёй Самуэлем Совічам Корсакам. Акрамя таго, вызначаны «даўнім

звычаем» ротмістры над парафіямі: наваградскі падваявода Мікалай Булгарын над клецкай; наваградскі лоўчы Станіслаў Гарабурда над наваградскай, усялюбскай і сенеўскай; наваградскі мечнік Аляксандр Вяжэвіч над гарадзішчанскай; пінскі падстолі Самуэль Пласкавіцкі над цімкавіцкай і капыльскай; Мікалай Міштальт над дараўскай, ляхавіцкай і нядзведскай; наваградскі земскі рэгент Віктар Яленскі, пасля адмовы вярбельскага старосты Марціна Храптовіча, над нясвіжскай і мірскай, нягневіцкай і сноўскай; мінскі лоўчы Ян Булгак над ішкалдзьскай, задвейскай, сталовіцкай, ліпскай, свержэнскай і крошынскай; мазырскі чашнік Казімір Яленскі над слуцкай і глускай; Багуслаў Дунін Раецкі над дварэцкай і стараеленскай, Ян Пясецкі над быскай і свяціцкай. Свае подпісы пад пастановай канфедэрацыі з мясцовых ураднікаў паставілі харужы Пётр Совіч Корсак, земскі суддзя Ян Рдултоўскі, падстолі Аляксандр Совіч Корсак, земскі пісар Стэфан Міхал Гарабурда, гродскі суддзя Антоні Рдултоўскі, чашнік Самуэль Совіч Корсак [14, k. 202–203; 20, л. 188–189 об.; 21, л. 129–130 об.; 22, арк. 359–360 адв., 361–366]. Як бачым, усе вядучыя ўраднікі падтрымалі канфедэрацыю прыхільнікаў Станіслава І Ляшчынскага.

У выніку бітвы пад Вільняй 30 студзеня 1734 г. з расійскімі войскамі Ізмайлава і атрадам Мікалая Фаўстына Радзівіла прыхільнікі Ляшчынскага пад кіраўніцтвам Антонія Пацея былі вымушаны пакінуць сталіцу ВКЛ, але размясціліся недалёка ад яе. Наваградскія паслы Рдултоўскі і Храптовіч спаткаліся з Пацеем у абозе прыхільнікаў Ляшчынскага пад Меднікамі 21 лютага 1734 г. Пацей у сваім адказе бачыў абарону краіны ў канфедэрацыі і фарміраванні харугваў паспалітага рушання. Як прыклад прыводзіў канфедэрацыю Сандамірскага ваяводства, але па магчымасці заахвочваў і да фарміравання большых атрадаў. Асабліва прасіў сабраць харугвы пяхоты. Прыгадваючы іх узбраенне, прыводзіў у прыклад Полацкае ваяводства [20, л. 190–191, 192–193; 22, арк. 500–500 адв., 514–515 адв.].

У пачатку сакавіка 1734 г. межы Наваградскага ваяводства пакінула канфедэрацыя Аршанскага павета, якая праз Нягневічы, Налібокі, Ракаў і Мінск накіравалася ў свой павет [23, k. 124; 24, s. 195–196]. У іх прысутнасці ўжо не было патрэбы, бо ў канцы лютага 1734 г. у Наваградскае ваяводства рушылі галоўныя сілы прыхільнікаў Ляшчынскага пад кіраўніцтвам генеральнага рэгіментарыя ВКЛ Антонія Пацея. Яны размясціліся лагерам пад Карэлічамі, але разглядалі магчымасць заняцця і іншых уладанняў нясвіжскіх Радзівілаў як прыхільнікаў Аўгуста III. Наваградскі каштэлян Антоні Аскерка ад імя прыхільнікаў Ляшчынскага праводзіў перамовы з радзівілаўскай адміністрацыяй Слуцка аб узяцці жаўнераў і ўзбраення з мясцовага гарнізона [23, k. 128–129, 131; 24, s. 199–200; 25, k. 101–102].

Тым часам пасля вяртання паслоў ад Пацея 26 лютага 1734 г. наваградскі харужы Пётр Совіч Корсак выдаў універсал на скліканне рэляцыйнага сойміка [26, арк. 750–751 адв.], які адбыўся 5 сакавіка 1734 г. Яго пасяджэнні пачаў наваградскі харужы Пётр Совіч Корсак. Пасля з інструкцыяй ад Пацея выступіў пяцігорскі паручнік Кміціц. Згодна з просьбамі Пацея наваградская шляхта пагадзілася акрамя чатырох выпраўных харугваў сфарміраваць яшчэ пяхоту з тысячы чалавек (па адным пехацінцы з 18 дымоў). Адразу было агаворана і ўзбраенне пехацінцаў. Пяхота павінна была сабрацца 30 сакавіка 1734 г. у Наваградку. Яе люстрацыю меў намер правесці наваградскі харужы Пётр Совіч Корсак і прызначаны яму ў дапамогу наваградскі канюшы Казімір Есман. Для забеспячэння сфарміраваных вайсковых аддзелаў уводзіўся падатак у 26 злотых з дыму, які меркавалася выплачваць на працягу 13 тыдняў. Гэтыя грошы прызначаліся ўжо не непасрэдна жаўнерам, а генеральнаму рэгіментарыю ВКЛ Антонію Пацею. Таксама для патрэб ваяводства быў ухвалены падатак з жыдоў і татараў па тынфу з чалавека. Гэтыя падаткі павінны былі збіраць парафіяльныя ротмістры пачынаючы ад 10 сакавіка 1734 г. на працягу двух тыдняў. Улічваючы вялікія памеры парафій ротмістраў Казіміра Яленскага і Яна Булгака, у дапамогу ім збіраць падаткі вызначаўся Казімір Корвін Мілеўскі. Менавіта парафіяльныя ротмістры павінны былі карыстацца сабранымі грашамі для патрэб у парафіях. Выключэннем была толькі сума ў тры грошы з кожнага тынфа, якую неабходна было перадаць наваградскаму земскаму суддзю Яну Рдултоўскаму. На тым жа сойміку прынята рашэнне на прыкладзе іншых паветаў накіраваць да караля Станіслава І Ляшчынскага паслоў: наваградскага падстолія Аляксандра Совіча Корсака і наваградскага мечніка Аляксандра Вяжэвіча. Для іх забеспячэння вызначалася сумма ў 3000 тынфаў. Таксама былі абраны паслы да генеральнага рэгіментарыя ВКЛ Антонія Пацея, якімі сталі наваградскі харужыц Марцін Совіч Корсак і брэсцкі скарбнік Францішак Верашчака. Прычым Марцін Совіч Корсак заставаўся рэзідэнтам ад Наваградскага павета пры генеральным рэгіментарыі ВКЛ [20, л. 194–195 об., 196–197; 22, арк. 501–504 адв; 24, s. 197].

Антоні Пацей даў адказ наваградскім паслам 14 сакавіка 1734 г. Яны прывезлі яго, відаць, 20 сакавіка 1734 г., калі ён быў актыкаваны ў наваградскіх гродскіх кнігах. Антоні Пацей выказаў падзяку за арганізацыю чатырох выпраўных харугваў кавалерыі і тысячы пяхоты, прасіў толькі, каб жаўнеры мелі добрае ўзбраенне і пры іх пэўную колькасць афіцэраў. Абяцаў па прыбыцці правесці агляд гэтых войск. Пацей прымаў рэкамендацыі шляхты Наваградскага ваяводства, каб афіцэры ў гэтым войску былі вендэнскі падстолій Томаш Бжазоўскі і Яна Бянеўскі [22, арк. 521–522 адв.].

Новы соймік быў прызначаны на 26 сакавіка 1734 г. На ім абраны паслы і «кансіляры» (райцы) ў Генеральную канфедэрацыю прыхільнікаў Ляшчынскага наваградскі войскі Антоні Вайніловіч, наваградскі канюшы Казімір Есман, обер-лейтэнант ЯКМ Мікалай Аўсяны і ноўгарад-северскі скарбнік Францішак Верашчака. Наваградская шляхта рэкамендавала Антонію Пацею кіраўнікоў над выстаўленай пяхотай з Наваградскага ваяводства: Мікалая Аўсянага (палкоўніка), вендэнскага падстолія Томаша Бжазоўскага, Антонія Малушынскага і Яна Бянеўскага. Таксама наваградская шляхта прасіла арганізаваць канфедэрацкія суды ВКЛ [22, арк. 340–341 адв.]. Па невядомых прычынах 5 красавіка 1734 г. пры стварэнні Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ у Вільні ад Наваградскага ваяводства былі толькі два кансыляжы і паслы: Антоні Вайніловіч і Казімір Есман [27, s. 382].

Актыўнасць наваградскай шляхты сярод прыхільнікаў Станіслава І Ляшчынскага была заўважана расійскім генералам Львом Ізмайлавым (напэўна, з падказкі наваградскага ваяводы Мікалая Фаўстына Радзівіла). У сваім лісце да расійскага ўрада ад 30 красавіка 1734 г. Ізмайлаў звяртаў увагу на тое, што Наваградскае ваяводства «ныне почитай все садится на кони». Са слоў Ізмайлава галоўная роля ў гэтым належала наваградскаму харужаму Пятру Совічу Корсаку, які раней быў сярод выбарцаў Аўгуста III і прынёс прысягу вернасці, а зараз «новогродское воеводство к противности возмутил и публиковал манифестами, что он при той элекции [Августа III. — *А. М.*] подписался якобы чрез принуждение войск Ея Императорского Величества». Па інфармацыі Ізмайлава Пётр Совіч Корсак меў намер знаходзіцца ў сваіх уладаннях у Аршанскім павеце і таму прапаноўваў, каб размешчаны там расійскі корпус Юрыя Рапніна захапіў у палон наваградскага харужага і ўсю яго сям'ю [28, л. 49]. Яго прапанова была падтрымана расійскім урадам [28, л. 48]. Аднак дасланаму Рапніным атраду не ўдалося знайсці ва ўладаннях у Аршанскім павеце Пятра Совіча Корсака і яго сям'і [29, с. 337].

Наваградская шляхта з гатоўнасцю выстаўляла пехацінцаў у поўным узбраенні. Вялікія клопаты з гэтым мелі толькі аканомы нясвіжскіх Радзівілаў, бо не было дастатковай колькасці пяхоты, узбраення і плацілі ім заробак у 5092 злотых [23, k. 129–130, 131–132; 24, s. 199–200, 202]. Пры гэтым ад пастояў войск прыхільнікаў Ляшчынскага якраз пацярпелі ўладанні нясвіжскіх Радзівілаў (асабліва Капыль і Мір) [19, с. 338, 343]. 7 красавіка 1734 г. удалося сабраць грошы для жаўнераў, але не было ўсіх належных пехацінцаў. Наваградскі харужы Пётр Совіч Корсак настойваў на прадстаўленасці ўсёй пяхоты. Радзівілаўская адміністрацыя была вымушана звярнуцца да генеральнага рэгіментарыя ВКЛ Антонія Пацея. У выніку ў пачатку мая 1734 г. прынята рашэнне, каб замест недастаючых пехацінцаў з радзівілаўскіх уладанняў выплаціць

па 14 злотых з дыму [23, k. 140, 144–145; 24, s. 206–207]. У канцы мая 1734 г. у Карэлічах з патрабаваннем выплаты належных падаткаў з'явіліся тры выпраўныя харугвы Наваградскага ваяводства ротмістраў Ермаловіча, Корсака і Равінскага. Радзівілаўскія слугі былі вымушаны пагадзіцца і «з цяжкасцю» выплаціць належныя падаткі [30, k. 33–34]. Нясвіжскія Радзівілы мелі намер дзейнічаць асцярожна з-за варожага стаўлення да іх наваградскай шляхты. На думку Ганны Радзівіл, непрыязь да нясвіжскіх Радзівілаў выклікана тым, што шляхта лічыла, што атрыманыя імі «нойбургскія ўладанні» маглі пайсці на фінансаванне войска і ваяводстваў [14, k. 181]. Гэтая праблема для нясвіжскіх Радзівілаў існавала і надалей. Радзівілаўскі слуга Станіслаў Міхал Градэцкі атрымаў інфармацыю, што пры стварэнні Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ у Вільні будуць фарміравацца пастановы аб забеспячэнні войск з «нойбургскіх уладанняў» [23, k. 134, 136–137; 24, 203–205; 31, k. 194].

Наваградскае ваяводства і далей знаходзілася пад уладай прыхільнікаў Станіслава I Ляшчынскага. Безумоўна, гэтаму садзейнічала тое, што ўвесь час пад Карэлічамі знаходзіліся іх асноўныя сілы пад кіраўніцтвам Антонія Пацея. Згодна з універсалам маршалка Віленскай генеральнай канфедэрацыі ВКЛ віцебскага ваяводы Марціна Агінскага наваградская шляхта планавала правесці 24 мая 1734 г. рэляцыйны соймік у Наваградку, дзе шляхта мела намер прынесці прысягу Віленскай генеральнай канфедэрацыі ВКЛ [22, арк. 784–785 адв]. Напэўна, гэта было зроблена з мэтай абрання пасламі да маршалка Віленскай генеральнай канфедэрацыі віцебскага ваяводы Марціна Агінскага і генеральнага рэгіментарыя ВКЛ стражніка ВКЛ Антонія Пацея. Адным з іх быў наваградскі стольнік Ян Храптовіч, які падчас свайго пасольства падзякаваў за стварэнне канфедэрацыі ў абарону Станіслава I Ляшчынскага і абяцаў, што мясцовая шляхта будзе змагацца за яго да «апошняй кроплі крыві» [32, л. 45–49].

У ліпені 1734 г. нарэшце асноўныя сілы прыхільнікаў Ляшчынскага рушылі з-пад Карэлічаў пад Слонім. Як вядома, значная частка гэтага войска была разбіта пад Сяльцом 19 жніўня 1734 г. Прыхільнікі Аўгуста III і расійскія войскі Льва Ізмайлава праследавалі разбітыя атрады прыхільнікаў Станіслава I Ляшчынскага і накіраваліся на захад ВКЛ і нават у Карону [10, с. 363–365]. Гэта садзейнічала актыўнасці прыхільнікаў Ляшчынскага ў Наваградскім ваяводстве. У канцы жніўня 1734 г. зноў у Наваградскім ваяводстве з'явіліся прыхільнікі Ляшчынскага, якія хацелі выплаты падаткаў на войска, а таксама фарміравання новых атрадаў пяхоты. Асабліва актыўна выступала канфедэрацыя Ашмянскага павета. Нясвіжскія Радзівілы імкнуліся перашкодзіць арганізацыі соймікаў ў Наваградку прыхільнікамі Ляшчынскага і прыняцця імі такіх пастаноў. Для чаго меркавалася пісаць да наваградскіх ураднікаў

[18, k. 66]. Напэўна, гэта ўдалося, бо няма ніякай інфармацыі пра правядзенне наваградскага сойміка ў гэты час прыхільнікамі Станіслава I Ляшчынскага. Прыкладна тады ж Наваградскага ваяводства дасягнуў і ўніверсал Мікалая Фаўстына Радзівіла, які быў выдадзены 21 жніўня 1734 г. у Ружане. Ён напамінаў аб тым, што сама шляхта Наваградскага ваяводства стварыла канфедэрацыю супраць парушэнняў «вольнага голасу» на канвакацыйным сойме і потым абрала на трон Рэчы Паспалітай Аўгуста III. Зараз наваградскі ваявода заклікаў да згоды ў дзяржаве і прызнання ўлады Аўгуста III. У канцы ўніверсала Радзівіл інфармаваў шляхту аб узяцці Гданьска і дзейнасці Трыбунала ВКЛ, а таксама склікаў «кастрычніцкія рочкі» (пасяджэнні земскага суда ў кастрычніку), на якіх прасіў быць мясцовых ураднікаў і сам збіраўся прысутнічаць [21, л. 123 об.–124].

Для кантролю над тэрыторыяй ВКЛ на нарадзе 1 верасня 1734 г. у Ружане Льва Ізмайлава, Міхала Вішнявецкага, Мікалая Фаўстына і Міхала Казіміра Радзівілаў было прынята рашэнне пакінуць расійскі гарнізон у Слоніме і войскі ВКЛ, прыхільныя Аўгусту III у Слуцку. 18 верасня 1734 г. у Слуцк прыбыў адзел войска ВКЛ прыхільнікаў Аўгуста III пад кіраўніцтвам палкоўніка Патана і расійскага атрада маёра Гатаўцова. Дзве слуцкія брамы (Віленскую і Астроўскую) і новы замак узяліся ахоўваць войскі ВКЛ, трэцюю (Капыльскую) закрылі, а чацвёртую ў бок Палесся (Новамейскую) узяліся ахоўваць расійскія войскі. Галоўнай праблемай было тое, што войскі ВКЛ патрабавалі выплаты сабе падаткаў, якія з радзівілаўскіх уладанняў ужо выплацілі па загаду канфедэрацыі прыхільнікаў Станіслава I Ляшчынскага. Таксама Міхал Казімір Радзівіл загадаў дадаткова выдаць 300 вазоў сена палкоўніку Патану. У сваю чаргу расійскі маёр Гатаўцоў хацеў, каб расійскім войскам выдалі муку, крупы, соль і сена. На што радзівілаўская адміністрацыя мела намер пагадзіцца. Аднак не хацела другі раз плаціць падаткі на войска ВКЛ [33, k. 22–25, 26–30].

5 кастрычніка 1734 г. наваградская шляхта сабралася на соймік на падставе выдадзеных універсалаў наваградскага ваяводы Мікалая Фаўстына Радзівіла, канцлера ВКЛ і генеральнага рэгіментарыя ВКЛ Міхала Вішнявецкага, а таксама расійскага генерала Льва Ізмайлава. Дырэктарам сойміка стаў наваградскі падстолі і наваградскі гродскі пісар Аляксандр Пётр Совіч Корсак. На сойміку былі абраны паслы да караля Аўгуста III наваградскі падваявода Мікалай Булгарын і Станіслаў Корсак. Ім прызначана пасольшчына ў 9000 злотых. Таксама былі абраны паслы да наваградскага ваяводы Мікалая Фаўстына Радзівіла, канцлера ВКЛ і генеральнага рэгіментарыя ВКЛ Міхала Вішнявецкага і расійскага генерала Льва Ізмайлава. Гэта былі наваградскі мечнік Аляксандр Вяжэвіч і наваградскі скарбнік Плацыд Вольскі. Ім была вызна-

чана пасольшчына па 200 талераў бітых. Наваградскі падстолі і наваградскі гродскі пісар Аляксандр Пётр Совіч Корсак і обер-лейтэнант Мікалай Аўсяны мелі намер перадаць Міхалу Вішнявецкаму падаткі з дзвюх выплат жыдоўскага пагалоўнага падатку. Таксама перадаваліся сабраныя грошы ротмістрамі ў парафіях, якія павінны былі быць дастаўлены да наваградскага земскага суддзі Яна Рдултоўскага, а ад яго ўжо перададзены Корсаку і Аўсянаму. Прынята таксама пастанова аб выдачы правіянту, па які звярнуўся ў сваім універсале расійскі генерал Леў Ізмайлаў. Правіянт складаўся з тысячы бочак жыта, тысячы бочак аўса, тысячы бочак сечкі, тысячы вазоў сена, пяцідзесяці бочак круп. Яго меркавалася сабраць на працягу трох тыдняў і транспарціраваць да расійскіх войск у Слонім. Прымаць яго планавалі прызначаныя ад Наваградскага ваяводства камісары Антоні Корсак і Дамінік Раецкі [20, л. 218–217 об.].

5 лістапада 1734 г. наваградская шляхта сабралася на новы соймік. Яго пасяджэнні распачаў рэчыцкі гродскі староста Альбрыхт Радзівіл. У прынятай пастанове паўтараліся ўсе прычыны стварэння ў 1733 г. канфедэрацыі Наваградскага ваяводства, якая выступіла супраць абрання на трон Рэчы Паспалітай Станіслава Ляшчынскага. Мясцовай шляхце давалася 6 тыдняў на прынясенне прысягі вернасці Аўгусту III. Выказвалася падзяка за функцыянаванне Трыбунала ВКЛ. Згодна з пастановай сойміка ахоўваць межы ваяводства мелі намер павятовыя харугвы пад кіраўніцтвам мясцовага харужага. Як і раней, фінансаваліся (па 30 тысяч злотых кожная) чатыры харугвы, па сто коней кожная. Яны павінны былі слухацца загадаў рэгіментарыя ВКЛ Міхала Вішнявецкага. Такім чынам, узброеныя сілы, якія фарміраваліся ў ваяводстве для абароны абрання Станіслава I Ляшчынскага, паступалі ў шэрагі ўзброеных сіл яго саперніка Аўгуста III. Наваградскі падстолі і наваградскі гродскі пісар Аляксандр Пётр Совіч Корсак і наваградскі мечнік Аляксандр Вяжэвіч былі абраны пасламі да расійскай царыцы Ганны Іванаўны. Для выканання гэтага пасольства вызначаўся падатак для іх (дакладная сума не агаворвалася). Успаміналася, што на папярэднім сойміку была прынята пастанова аб дастаўцы правіянту расійскаму войску ў Слонім. Прызнавалася, што не ўсе паспелі даставіць гэты правіянт, і таму прымалася рашэнне аб яго збіранні на працягу двух тыдняў у Наваградку. У далейшым абраныя камісары Антоні Корсак і Дамінік Раецкі мусілі прыняць сабранае і накіраваць да расійскіх войск у Слонім. Наваградская шляхта прыняла пастанову і аб збіранні на працягу трох тыдняў падатку на войска ВКЛ, які павінна была заплаціць яшчэ ў верасні 1733 г., але так і не заплаціла. Прызнавалася, што часткова гэтыя грошы былі заплачаны шляхтай на выпраўныя харугвы і пяхоту, а таксама ротмістрам у парафіях. Таму для разумення запазычанасці прапаноўвалася,

каб наваградскі земскі суддзя на працягу двух тыдняў прадставіў дакументы аб зробленых ротмістрамі ў парафіях разліках. У тым ліку і аб пасольшчыне наваградскаму падстолію і наваградскаму гродскаму пісару Аляксандру Пятру Корсаку і наваградскаму мечніку Аляксандру Вяжэвічу [21, л. 91–93; 22, арк. 343–343 адв., 359–360 адв.].

У гэты час Наваградскае ваяводства знаходзілася цалкам пад кантролем прыхільнікаў Аўгуста III. Уплываў на гэта атрад у некалькі соцень (можа нават больш за тысячу) расійскіх войск пад кіраўніцтвам Міхала Казіміра Радзівіла, які ахоўваў пасяджэнні Трыбунала ВКЛ, што 8 лістапада 1734 г. аднавіў сваю працу ў Наваградку [10, с. 366].

Такім чынам, магчыма зрабіць наступныя высновы. Наваградская шляхта, як і шляхта большасці паветаў ВКЛ, у лютым 1734 г. падтрымала Станіслава I Ляшчынскага. Прычым гэта зрабіла большасць шляхты, якая яшчэ 5 кастрычніка 1733 г. стала асновай Варшаўскай генеральнай канфедэрацыі і абрала на трон Рэчы Паспалітай Аўгуста III. Сярод найбольш актыўных дзеячаў руху ў падтрымку Ляшчынскага аказаліся мясцовыя ўраднікі: наваградскі харужы Пётр Совіч Корсак, наваградскі войскі Антоні Вайніловіч, наваградскі земскі суддзя Ян Рдултоўскі, наваградскі гродскі суддзя Антоні Рдултоўскі, наваградскі падваявода Павал Булгарын, наваградскі гродскі пісар Самуэль Совіч Корсак, наваградскі канюшы Казімір Есман. Прычынай гэтага была адсутнасць у Наваградскім ваяводстве лідараў прыхільнікаў Аўгуста III (наваградскага ваяводы Мікалая Фаўстына Радзівіла, прапойскага старосты Багуслава Незабытоўскага і цырынскага старосты Казіміра Несялоўскага) і наадварот прысутнасць атрадаў прыхільнікаў Станіслава I Ляшчынскага (канфедэрацыя Аршанскага павета). Наваградская шляхта абяцала арганізаваць 4 выпраўныя харугвы конніцы і тысячу пяхоты, на што былі сабраны адпаведныя падаткі. Таксама збіраліся грошы і на фарміраванне аддзелаў у парафіях, якія павінны былі забяспечыць спакой у ваяводстве. У жніўні 1734 г. да Наваградскага ваяводства наблізіліся атрады прыхільнікаў Аўгуста III і расійскія войскі. Канчаткова яны замацаваліся ў Наваградскім ваяводстве ў верасні 1734 г. У выніку наваградская шляхта прыняла бок Аўгуста III, прынесла адпаведную прысягу і прыняла пастановы аб забеспячэнні расійскіх войск і атрадаў войска ВКЛ Міхала Вішнявецкага і Мікалая Фаўстына Радзівіла. Для гэтага былі выкарыстаны і грошы, раней сабраныя для прыхільнікаў Станіслава I Ляшчынскага. Яшчэ хацелася звярнуць увагу на значную актыўнасць наваградскай шляхты ў 1734 г. Вынікам гэтага стала 7 соймікаў Наваградскага ваяводства, якія часцей за ўсё былі выкліканы знешнім уздзеяннем узброеных атрадаў Аўгуста III і Станіслава I Ляшчынскага.

Крыніцы і літаратура

1. Герье, В. Борьба за польский престол в 1733 году / В. Герье. — М.: В тип. В. Грачева, 1862. — 638 с.
2. Kantecki, K. Po zgonie Augusta II / K. Kantecki // Przewodnik naukowy i literacki. — 1877. — S. 673–688, 767–786, 865–887, 961–989, 1057–1083.
3. Kantecki, K. Stronnictwo saskie w Polsce roku 1733: kilka rysów do charakterystyki ludzi i czasu / K. Kantecki // Niwa. — 1877. — Rocznik 6. — T. 11. — S. 631–646, 697–709, 772–784, 856–866.
4. Lisek, A. Litwini na sejmie elekcyjnym w 1733 roku / A. Lisek // Z dziejów XVII i XVIII wieku. Księga jubileszowa ofiarowana Profesorowi Michałowi Komaszyńskiemu / Red. Jan Kwak. — Katowice, 1997. — S. 138–154.
5. Lisek, A. Obóz stanisławowski na Litwie w okresie wojny o tron polski do zawiązania konfederacji generalnej wileńskiej (1733–1734) / A. Lisek // Studia Historyczne. — 2007. — Z. 2. — S. 127–141.
6. Lisek, A. Postawa Radziwiłłów w okresie przedostatniego bezkrólewia i w pierwszych miesiącach wojny domowej (1733–1734) / A. Lisek // Radziwiłłowie. Obrazy literackie. Biografie. Świadectwa historyczne / Pod red. K. Stępnika. — Lublin, 2003. — S. 358–370.
7. Sliesoriūnas, F. Georgo von Lieweno misija Lietuvoje 1733 m. pavasarį. Rusijos bandymas iškelti jai priimtino „Piasto" kandidatūrą į Lenkijos ir Lietuvos valdovo sostą priešpaskutinio tarpuvaldžio metu / F. Sliesoriūnas // Istorijos Akiračiai. — Vilnius, 2004. — S. 289–306.
8. Sliesoriūnas, F. Lietuvos Didžioji Kunigaikštystė 1733–1736 metų tarpuvaldžiu / F. Sliesoriūnas // Lietuvos Valstybė XII–XVIII a. — Vilnius, 1997. — S. 365–381.
9. Macuk, A. Szlachta województwa nowogródzkiego wobec elekcji Stanisława Leszczyńskiego i Augusta III w 1733 roku / A. Macuk // Przegląd Historyczny. — 2005. — Zeszyt 1. — S. 41–60.
10. Цясельскі, Т. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага падчас вайны за польскую спадчыну ў 1733–1735 гг. / Т. Цясельскі // Arche. — 2012. — № 6. — С. 347–371.
11. Мацук, А. Значение боевых действий в ВКЛ в войне за «польское наследство» / А. Мацук // Война и оружие. Новые исследования и материалы. Тр. IV Междунар. научн.-практ. конф. Санкт-Петербург (15–17 мая 2013 г.). — Часть III. — Санкт-Петербург : ВИМАИВиС, 2013. — Часть III. — С. 198–218.
12. Мацук, А. Российские войска и шляхта восточных воеводств Великого княжества Литовского во время войны за «польское наследство» 1733–1735 годов / А. Мацук // Война и оружие. Новые исследования и материалы. Тр. IV Междунар. научн.-практ. конф. Санкт-Петербург (14–16 мая 2014 г.). — Санкт-Петербург : ВИМАИВиС, 2014. — Часть III. — С. 144–161.
13. Archiwum Główne Akt Dawnych (далей — AGAD). — Archiwum Radziwiłłów. — Dz. IV. — № 525.

14. AGAD. — Archiwum Radziwiłłów. — Dz. IV. — № 623.
15. Цясельскі, Т. Узброеныя сілы ВКЛ падчас вайны за польскую спадчыну ў 1733–1735 гг. / Т. Цясельскі // Arche. — 2011. — № 6. — С. 246–259.
16. AGAD. — Archiwum Radziwiłłów. — Dz. IV. — № 659.
17. Sliesoriūnas, F. Mūšis prie Vilniaus ir miesto nusiaubimas 1734 metais / F. Sliesoriūnas // Lietuva ir jos kaimynai: nuo Normanų iki Napoleono. Prof. Broniaus Dundulio atminimui. — Vilnius, 2001. — S. 311–329.
18. AGAD. — Archiwum Radziwiłłów. — Dz. IV. — № 660.
19. Радзівіл, Ф. У. Выбраныя творы / Ф.-У. Радзівіл. — Мінск: Беларускі кнігазбор, 2003. — 446 с.
20. Российская национальная библиотека (далей — РНБ). — Ф. 971. — АД 126.
21. РНБ.– Ф. 957. — Pol. IV. — № 257.
22. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). — Ф. 1730. — Воп. 1. — Спр. 2. — Актавая кніга Наваградскага гродскага суда, 1660–1734 гг. — 2244 арк.
23. AGAD. — Archiwum Radziwiłłów. — Dz. V. — № 4732. — Cz. 2.
24. Codzienne kłopoty, wielkie interesy i podwójna elekcja : korespondencja radziwiłłowskich urzędników z księżną Anną z Sanguszków Radziwiłłową i jej synem Michałem Kazimierzem z 1733/1734 roku / Wydał J. Dygdała. — Warszawa: Wydawnictwo DiG, 2013. — 226 s.
25. AGAD. — Archiwum Radziwiłłów. — Dz. V. — № 10998.
26. НГАБ. — Ф. 1730. — Воп. 1. — Спр. 11. — Актавая кніга Наваградскага гродскага суда, 1732–1733 гг. — 800 арк.
27. Akty zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego. — Tom I. Okresy bezkrólewi / Opracował H. Lulewicz. — Warszawa: Neriton, 2006. — 437 s.
28. Архив внешней политики Российской империи. — Ф. 79. — Оп. 1. — Д. 45а.
29. Сборник Русского исторического общества. — Т. 108: Бумаги Кабинета Министров Императрицы Анны Иоанновны. Ч. 3. (год 1734) / Собр. и изд. под ред. А. Н. Филиппова. — Санкт-Петербург, 1900. — 512 с.
30. AGAD. — Archiwum Radziwiłłów. — Dz. V. — № 12806.
31. AGAD. — Archiwum Radziwiłłów. — Dz. V. — № 17761.
32. Національна бібліотека України імені В. І. Вернадського. Інститут рукопису. — Ф.1. — № 5086. — Л. 45–49.
33. AGAD. — Archiwum Radziwiłłów. — Dz. V. — № 4732. — Cz.3.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 19.09.2014

Генеалогія

А. Л. Грывянёў

Род Рамейкаў-Гуркаў у дакументах НГАБ або сваякі героя Шыпкі

Фонды Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі маюць звесткі аб многіх вядомых ураджэнцах Беларусі. Сярод іх — прадстаўнікі роду Гуркаў (Рамейкаў-Гуркаў), жыццё і дзейнасць якіх звязаны з Магілёўскай і Віцебскай губернямі. Найбольш вядомы прадстаўнік роду — удзельнік руска-турэцкай вайны герой Шыпкі генерал Іосіф Уладзіміравіч Гурка, сваякі якога валодалі зямельнай маёмасцю ў Бабінавіцкім (пасля скасавання апошняга ў 1840 г. Аршанскім) павеце Магілёўскай губерні.

Даследаванне пабудавана на матэрыялах фондаў «Магілёўская духоўная рымска-каталіцкая кансісторыя» (Ф. 1781), «Магілёўскае губернскае праўленне» (Ф. 2003), «Канцылярыя віцебскага грамадзянскага губернатара» (Ф. 1430), «Канцылярыя генерал-губернатара віцебскага, магілёўскага і смаленскага» (Ф. 1297), «Віцебскае губернскае праўленне» (Ф. 1416), «Віцебская гарадская ўправа» (Ф. 2496) і «Мінскае губернскае праўленне» (Ф. 299).

Род Гуркаў ці Рамейкаў-Гуркаў (Ромейко-Гурко) герба Гурка, ваенных і дзяржаўных дзеячаў Вялікага Княства Літоўскага і Расіі, належаў да беларускіх дваранскіх родаў. Да 1893 г. быў унесены ў VI частку радаслоўнай кнігі дваран Магілёўскай губерні.

Родапачынальнікам іх быў Гурка (Гурый) Аляхновіч (магчыма Аляксандравіч) Рамейка, які ў 1539 г. з'яўляўся намеснікам смаленскім у Віцебскім ваяводстве. Нашчадкі яго прынялі прозвішча Гурка. Жылі яны ў тым жа ваяводстве. Праўнук Гурыя Андрэй нарадзіўся каля 1600 г. У час вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг. ён быў узяты ў палон рускімі і памёр у Маскве. Старэйшы сын Андрэя, ротмістр Даніла, застаўся ў рускім падданстве. Адзіная ўнучка Данііла выйшла замуж за князя Іллю Друцкага-Сакалінскага, які прыняў у 1723 г. про-

звішча Рамейка-Гурка. Нашчадкі іх называюцца Друцкімі-Сакалінскімі-Рамейкамі-Гуркамі. Малодшы сын Андрэя Іосіф застаўся ў Польшчы. З яго нашчадкаў найбольш вядомыя: Іосіф Аляксандравіч Гурка (1782–21.12.1857), генерал-лейтэнант, сенатар у 1845 г., і Уладзімір Іосіфавіч Гурка (1795–21.01.1852), генерал ад інфантэрыі з 1851 г. Уладзімір Гурка ўдзельнічаў у Айчыннай вайне 1812 г. і замежных паходах рускай арміі 1813 г. З 1821 г. — у Галоўным штабе, з 1825 г. — начальнік штаба 5-га корпуса. Меў намер удзельнічаць у выступленні дзекабрыстаў у Маскве ў снежні 1825 г., у сувязі з чым знаходзіўся пад следствам. У 1830-я гг. займаў камандныя і штабныя пасады. З 1845 г. — начальнік штаба Асобнага Каўказскага корпуса. Апошняя яго пасада, на якой ён быў з 1851 г., — начальнік усіх рэзервовых і запасных войск.

Іосіф Уладзіміравіч Гурка, сын Уладзіміра Іосіфавіча, нарадзіўся 16 (28) ліпеня 1828 г. у вёсцы Бурнеўка Круглянскай воласці Магілёўскага павета Магілёўскай губерні. Даведнік пачатку XX ст. адпаведна дадзенай назвы згадвае ў Круглянскай воласці толькі маёнтак Бурнеўка двараніна Баляслава Гардзялкоўскага, каталіцкага веравызнання, пры рацэ Бярозаўка, жыхары якога належалі да Талачынскага праваслаўнага прыхода (вёска Бурнеўка Круглянскага п/с Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці). З каталіцкіх прыходаў па воласці згадваюцца Старасельскі і Талачынскі [3, с. 914; 4, с. 913; 13, с. 536; 6, с. 454; 82, с. 7; 79, с. 32]. Скончыў Пажаскі корпус у 1846 г., удзельнічаў у Крымскай вайне 1853–1856 гг. Перад пачаткам руска-турэцкай вайны 1877–1878 гг. камандаваў 2-й гвардзейскай кавалерыйскай дывізіяй. Калі расійскія войскі пераправіліся праз Дунай у Сістава, вялікі князь галоўнакамандуючы вырашыў накіраваць наперад асобы атрад для хуткага захопу некаторых праходаў праз Балканы. Даручэнне гэта ўскладалася на генерала Гурку, які быў камандзіраваны да дзеючай арміі і 24 чэрвеня прыняў пад сваё начальства перадавы атрад, які складаўся з чатырох конных палкоў, стралковай брыгады і новасфарміраванага балгарскага апалчэння пры дзвюх батарэях коннай артылерыі. З гэтага часу генерал становіцца адным з вядомых дзеячаў дадзенай вайны. На чале перадавога атрада ён перайшоў Балканы і вызваліў частку паўднёвай Балгарыі, аднак быў вымушаны адысці. Утрымліваў Шыпкінскі перавал. У верасні-кастрычніку 1877 г. як начальнік кавалерыі Заходняга атрада завяршыў акружэнне Плеўны. За гэтыя два гады з яго імем звязаны наступныя ваенныя подзвігі: авалоданне горадам Тырнавам, заняцце балканскіх праходаў Хаінкіойскага (які туркі лічылі непраходным для войск) і Шыпкінскага; паражэнне турак пад вёскай Уфланы [85], гарадамі Казанлык [77], Ені-Загра [8] і вёскай Джуранлі [7]; авалоданне непрыяцельскімі ўмацаваннямі пры сяле Горны Дубняк [2] 12 кастрычніка і вёсцы Целіш [84] 16 кастрычніка; другі пераход праз Балканы, якія лічыліся неда-

ступнымі зімой, у снежні 1877 г. на чале 70-тысячнай арміі і ўступленне ў Сафію, бітва пры сяле Ташкісен (Тышкісен) [83]; трохдзённыя баі 3, 4 і 5 студзеня 1878 г. пад горадам Філіпопаль (Філіппаль) [11], і, нарэшце, энергічнае праследаванне разбітай непрыяцельскай арміі да горада Адрыянопаль [86] і заняцце апошняга.

У красавіку 1879 г. Іосіф Уладзіміравіч быў прызначаны памочнікам галоўнакамандуючага войскамі гвардыі і Санкт-Пецярбургскай ваеннай акругі, а з 7 красавіка 1879 г. па 14 лютага 1880 г. займаў пасаду часовага санкт-пецярбургскага генерал-губернатара. У студзені 1882 г. стаў часовым адэскім генерал-губернатарам і камандуючым войскамі Адэскай ваеннай акругі. З ліпеня 1883 г. па 1894 г. — генерал-губернатар Прывіслінскага краю і Варшавы і камандуючы Варшаўскай ваеннай акругай. З 1884 г. — генерал-ад'ютант (на гэтай пасадзе быў і ў 1893 г.). З 1886 г. стаў членам Дзяржаўнага Савета (як член апошняга згадваецца і ў 1893 г.). У 1893 г. — генерал ад кавалерыі. З 1894 г. — генерал-фельдмаршал. З гэтага ж года ў адстаўцы [4, с. 913; 13, с. 536]. У энцыкпедычным слоўніку Таварыства братоў Гранат і К^0 гаворыцца яшчэ і аб удзеле Іосіфа Уладзіміравіча ў задушэнні «польскага» паўстання 1863 г.

На адміністрацыйныя пасады Іосіф Уладзіміравіч, у якога ўжо на вайне склалася рэпутацыя суровага і няўмольнага чалавека, прызначаўся пры такіх абставінах, калі правячыя ўлады лічылі неабходным узмацненне рэпрэсій. Гурка ўмеў апраўдваць надзеі, якія на яго ўскладаліся. Ён вёў сваю лінію жорстка і бязлітасна і не лічыўся з нянавісцю, якая ўзрастала вакол яго ў грамадстве. У прыватнасці яго доўгае кіраванне Польшчай прынесла вялікую шкоду, таму што садзейнічала рэзкаму пагаршэнню адносін паміж палякамі і Расіяй [1, с. 200–201]. Памёр І. У. Гурка 15 (28) студзеня 1901 г. у сяле Сахарава, у савецкі час Калінінскай вобласці, а на той перыяд, верагодна, Цвярскога павета Цвярской губерні [1, с. 200–201; 6, с. 454; 12; 13, с. 536; 80].

Таксама цікавасць уяўляюць жыццяпісы трох сыноў Іосіфа Уладзіміравіча — Уладзіміра, Васіля і Дзмітрыя. Першы, Уладзімір Іосіфавіч, нарадзіўся ў 1863 г. З 1902 г. — таварыш (намеснік) міністра Міністэрства ўнутраніх спраў. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. удзельнічаў у белым руху на поўдні Расіі. Потым — у эміграцыі. Памёр у 1931 г. [13, с. 536]. Другі, Васіль Іосіфавіч, нарадзіўся 8 (19/20) мая 1864 г. У 1885 г. скончыў Пажаскі корпус. У 1892 г. закончыў вучобу ў Акадэміі Генштаба. У час англа-бурскай вайны 1899–1902 гг. Васіль Іосіфавіч служыў ваенным агентам пры арміі бураў. Удзельнічаў у руска-японскай вайне 1904–1905 гг. З кастрычніка 1906 г. — старшыня Ваенна-гістарычнай камісіі па апісанні руска-японскай вайны. З 1911 г. камандаваў 1–й каўказскай дывізіяй, з лістапада 1914 г. — 6-м армейскім корпусам. З 1916 г. быў генералам ад кавалерыі. У Першую сусветную вайну ка-

мандаваў 5-й арміяй Паўночнага фронту, а з жніўня 1916 г. — Асобнай арміяй Паўднёва-Заходняга фронту. З лістапада (па іншых крыніцах кастрычніка) 1916 г. да лютага 1917 г. выконваў абавязкі начальніка штаба Вярхоўнага галоўнакамандуючага. У сакавіку–маі 1917 г. — камандуючы Заходнім фронтам. За манархічныя погляды быў зняты з пасады Часовым урадам і высланы за мяжу. З'яўляецца аўтарам успамінаў. Па яго ініцыятыве чатыры батальённыя палкі былі перафарміраваны ў трохбатальённыя. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі камандаваў войскамі Заходняга фронту. 23 мая 1917 г. за крытыку Часовага ўрада і манархічная выказванні паніжаны ў пасадзе да начальніка дывізіі, у ліпені 1917 г. арыштаваны за перапіску з Мікалаем II, а ў жніўні 1917 г. высланы за мяжу. У 1919 г. адмовіўся ўзначаліць белагвардзейскі рух на Поўначы і Паўночным Захадзе. Памёр Васіль Іосіфавіч 11 лістапада 1937 г. у г. Рыме [5, с. 454; 13, с. 536]. Трэці сын, Дзмітрый Іосіфавіч, нарадзіўся 5 кастрычніка 1872 г. З 1915 г. — генерал-маёр. У 1900 г. скончыў Акадэмію Генштаба. У Першую сусветную вайну Дзмітрый Іосіфавіч быў камандзірам гусарскага палка, начальнікам штаба корпуса і дывізіі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. удзельнічаў у белым руху на Паўночным Захадзе. Потым — у эміграцыі. Дата смерці яго невядома [13, с. 536].

У НГАБ ёсць дакументы аб дзейнасці і маёмасці роду Рамейкаў-Гуркаў па паветах Бабінавіцкім (пасля яго скасавання ў 1840 г. па Аршанскім) Магілёўскай губерні і Суражскім (пасля скасавання ў 1866 г. землі павета адышлі да Віцебскага, Веліжскага і Гарадоцкага паветаў) Віцебскай губерні.

Бабінавіцкі і Аршанскі паветы Магілёўскай губерні. У першай чвэрці XIX ст. прадстаўнікі роду Гуркаў служылі ў Бабінавіцкіх судах: на 16 мая 1805 г. у павятовым судзе засядацелем быў Станіслаў Гурка, а на 3 сакавіка 1819 г. у павятовым земскім судзе падсудкам (земскім падсудкам) Марцін Гурка [41].

Нехта з прадстаўнікоў роду Гуркаў прыблізна ў 1820-х гг. служыў у Магілёўскім галоўным судзе 2-га дэпартамента. Да 10 сакавіка 1830 г. згадваецца сярод былых членаў суда як засядацель. Да пачатку студзеня 1831 г. пражываў у Бабінавіцкім павеце Магілёўскай губерні [39].

Правадзейны стацкі саветнік і кавалер узнагарод Гурка, які ў красавіку 1810 г. пражываў у Бабінавіцкім павеце Магілёўскай губерні, да жніўня 1809 г. з'яўляўся арандатарам казённай мызы Альт Платон (Альтплатон) Курляндскай губерні. Адносіна Курляндскага губернскага праўлення ў Віцебскае губернскае праўленне ад 18 сакавіка 1810 г. называе Гурку землеўладальнікам Віцебскай губерні [20; 21]. Жыхаром Віцебскай губерні яго называе і такі ж дакумент ад 14 ліпеня 1811 г., дзе гаворка ідзе аб неабходнасці вяртання правадзейным стац-

кім саветнікам як былым арандатарам дадзенай мызы сялянскага сына Даве, якога ён узяў з двара [Лікке] Давіс пры ўступленні ў валоданне мызай [23, арк. 1].

Аб зямельнай маёмасці і фундатарскай дзейнасці прадстаўнікоў роду Рамейкаў-Гуркаў можна даведацца з візітаў касцёлаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў за 1822 г. Візіта Паловіцкага Прэабражэнскага касцёла Бабінавіцкага павета Магілёўскай губерні (да 1973 г. у БССР існавала вёска Паловікі Крынкаўскага с/с Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці) утрымлівае звесткі, што да гэтага года ў валоданні Рамейкаў-Гуркаў былі ўсе вёскі парафіі, за выключэннем адной. Касцёл належаў да Мікулінскага дэканата Віцебскай протапрэсвітэрыі і знаходзіўся пад патранатам генерала расійскага войска Леапольда Рамейкі-Гуркі. Філіяльнымі да касцёла з'яўляліся тры капліцы: Крынкаўская Святой Анны ў двары Крынкі (вёска Крынкі Крынкаўскага с/с Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці), Ордзежанская (вёска Ордзеж Крынкаўскага с/с Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці) і Лучоская Благаславеннага Пакутніка Юзафата [57; 78, с. 210–211, 284, 292]. У пачатку XX ст. існаваў маёнтак Лучоса Серакаратнянскай воласці Аршанскага павета, што межавала з Высачанскай і Добрамыслянскай валасцямі ўказанага павета (вёска Лучоса Шапечынскага с/с Віцебскага раёна Віцебскай вобласці) [10; 78, с. 236; 82, с. 137].

Гэты старажытны драўляны касцёл гадоў за дзесяць да 1822 г. з-за старасці ўжо быў разбураны, а яго рэчы перанесены ў дваравы Кратаўшчанскі невялікі касцёл (у метрычным запісе аб пахаванні Уладзіміра Іосіфава Гуркі ў 1852 г. згадваецца фамільны склеп пры Кратаўшанскай рымска-каталіцкай царкве Аршанскага павета — гл. ніжэй). Фундуш Паловіцкі касцёл меў ад памешчыкаў Гуркаў [57, арк. 178–178 адв.; 58, арк. 216–216 адв.].

Да 1822 г. у парафіі Паловіцкага касцёла прадстаўнікам роду належалі наступныя вёскі: Леапольду Рамейку-Гурку, генералу расійскага войска: Паловікі, Мятлі, Браткава, Іванькова, Старыны [Старына], Буракі, Баранава, Чэркасы, Слабада, Шугаева, Швады [Шведы]; Кляры Гурка, жонцы суддзі: Сімашкова [Семашкова]; Уладзіміру Рамейку-Гурку, палкоўніку расійскага войска: Каралі, Шніткі, Глушні [Глушня], Мізьнікі [Міснікі]; Аляксандру Рамейку-Гурку, падкамораму: Осіпава, Філіповічы, Выдрына, Каліновічы, Бечкі [Рэчкі], Кавалі, Сцюдзяніцы [Студзеніца], Баркі, Сніцары [Сніцэронкі]; Іаахіму Рамейку-Гурку, маёру расійскага войска: Каліновічы, Макеева. Большасць паселішчаў адносілася да Высачанскай воласці Аршанскага павета. З іншых землеўладалькаў па парафіі Паловіцкага касцёла названы толькі Астроўскі і яго вёска Рыжыкі (у пачатку XX ст. знаходзілася ў суседняй Дабрамыслянскай воласці) [57, арк. 178 адв. — 179; 82, с. 109–114].

Дзве з філіяльных капліц Паловіцкага Прэабражэнскага касцёла былі пабудаваны на грошы памешчыкаў Гуркаў. Адна з іх, у імя Святой Анны, знаходзілася ў двары Крынкі, у адной вярсце ад цэнтра парафіі. Пабудавана ў «старажытныя часы» за кошт генерала Гуркі. Другая, Ордзежанская, знаходзілася ў 10 вярстах ад парафіяльнага касцёла [відавочна, у фальварку Ордзеж Высачанскай воласці Аршанскага павета — *А. Г.*]. Была пабудавана за кошт палкоўніка Уладзіміра Гуркі ў 1820 г. і ў тым жа годзе асвечана паловіцкім адміністратарам ксяндзом Александровічам [57, арк. 179–180; 82, с. 112].

Да канца кастрычніка 1822 г. у 18 вярстах ад павятовага горада Бабінавічы знаходзіўся Добрынскі Успенскі парафіяльны касцёл Бабінавіцкага павета Магілёўскай губерні Мікулінскага дэканата Віцебскай протапрэсвітэрыі патраната паручніка расійскага войска Міхала Рамейкі-Гуркі. Пабудаваны ён калежскім саветнікам Казімірам Гуркам і ад яго атрымаў фундуш. Звестак аб годзе пабудовы, асвячэння (konsekracji), прозвішча асобы, якая асвячала касцёл, годзе надання тытула парафіяльнасці і атрымання фундуша ў архіве касцёла да 1822 г. не захавалася. Але згадваюцца пачатыя метрычныя кнігі касцёла за 1776 г. [56, арк. 176 адв. — 177]. У парафіі касцёла прадстаўнікам роду Гуркаў належалі наступныя вёскі: Міхалу Гурку, паручніку расійскага войска: Баяршчына [у даведніку на пачатак XX ст. населенага пункта з такой назвай па Аршанскім павеце няма. — *А. Г.*], Загузна [Загуззе], Грыдзякі [Градзякі], Шашкі [Шашкова] (Загуззе, Градзякі і Шашкова на пачатаку XX ст. знаходзіліся ў Высачанскай воласці Аршанскага павета); Марану [Мар'яну] Гурку, падсудку Бабінавіцкага павета: Асёткі [Асеткі] (на пачатку XX ст. знаходзілася ў Мікулінскай воласці Аршанскага павета), Дайлідова [у даведніку на пачатак XX ст. населенага пункта з такой назвай па Аршанскім павеце няма. — *А. Г.*], Задня (рус. Задняя, на пачатку XX ст. знаходзілася ў Мікулінскай воласці Аршанскага павета), Бродкі, Адвіня [Вадвінка] (Бродкі і Вадвінка на пачатку XX ст. знаходзілася ў Высачанскай воласці Аршанскага павета); Леапольду Гурку, генералу расійскага войска: Крукава (на пачатку XX ст. знаходзілася ў Высачанскай воласці Аршанскага павета), Высокія (населеныя пункты з назвай Васокае ёсць у розных валасцях Аршанскага павета, у тым ліку і ў Высачанскай); Уладзіміру Гурку, палкоўніку расійскага войска: Глушні [Глушня] (на пачатку XX ст. знаходзілася ў Высачанскай воласці Аршанскага павета). Астатнія вёскі парафіі належалі землеўладальнікам: Рагінскаму Касперу, каморніку Бабінавіцкага павета, Юзафу Весялоўскаму, асэсару Бабінавіцкага павета, Яну Тржаскоўскаму, асэсару Бабінавіцкага павета, Сымону Тржаскоўскаму, падпалкоўніку расійскага войска, і Элеаноры Багамолец, жонцы саветніка [56, арк. 177; 82, с. 107–111, 113, 120, 126, 127].

З візіты Пагашчанскага парафіяльнага касцёла Св. Мікалая Бабінавіцкага павета Магілёўскай губерні Мікулінскага дэканата Віцебскай протапрэсвітэрыі патраната [былога] бабінавіцкага павятовага маршалка Яна Багамольца (вёска Пагосцішча пасля скасавання Бабінавіцкага павета ў 1840 г. належала да Высачанскай воласці Аршанскага павета) і яго філіяльных капліц Выдрэйскай Прэабражэнскай і Хоцімлянскай Пакроўскай за 28.10.1822 г. можна даведацца, што палкоўніку Уладзіміру Гурку на гэты час належала вёска Скарада. Астатнімі вёскамі парафіі валодалі іншыя землеўладальнікі: Багамольцы, Быкава, Янушкоўскія, Суйкоўскі, Сценпінскі, Памарнацкія, Дакшынскі і Качаноўская [55, арк. 174 адв. — 175; 82, с. 110, 112].

У 1822 г. у парафіі Юшкаўскага Пакроўскага касцёла Бабінавіцкага павета Магілёўскай губерні Мікулінскага дэканата Віцебскай протапрэсвітэрыі палкоўнік і кавалер ордэнаў Іосіф Гурка валодаў вёскамі Лапёшына і Іўчынкі [Іўчэнкі] (пазней Высачанская воласць Аршанскага павета) [53, арк. 156; 82, с. 111, 112].

У другой палове 1820-х – пачатку 1830-х гг. памешчыку Бабінавіцкага павета Магілёўскай губерні Аляксандру Гурку належаў маёнтак Лучоса, ці фальварак Лучас. Да красавіка 1828 г. ён быў прададзены Санкт-Пецярбургскім губернскім праўленнем памешчыцы Палтарацкай за пазыкі. На пачатак XX ст. у Магілёўскай губерні існаваў маёнтак Лучоса Серакаратнянскай воласці Аршанскага павета парафіі Бабінавіцкага касцёла дваранiна М. Жудро, каталіцкага веравызнання, пры шашы і рацэ Лучосе. Фальварак Аляксандрава таго ж Аляксандра Гуркі да 24 чэрвеня 1832 г. знаходзіўся ў апецы. На пачатак XX ст. існаваў фальварак з такой назвай у Высачанскай воласці Аршанскага павета парафіі Бабінавіцкага касцёла дваранiна М. Жудро, каталіцкага веравызнання, пры прасёлкавай дарозе і рацэ Аляксандраўка. У савецкі час была вёска Александрова Багушэўскага с/с Сенненскага раёна Віцебскай вобласці [37; 82, с. 109, 137; 78, с. 20, 236].

У 1836 г. у Бабінавіцкім павеце Магілёўскай губерні пражываў звольнены ў 1821 г. са службы генерал-маёр Лявонці Восіпавіч Гурка. 15 кастрычніка 1836 г. на яго імя з Інспектарскага дэпартамента Ваеннага міністэрства быў адасланы бронзавы медаль [49].

Адна са спраў гаворыць аб пазыцы ў памеры 300 рублёў, якія заняў у 1833 г. памешчык Бабінавіцкага павета Магілёўскай губерні Марцін Казіміраў Рамейка-Гурка ў дваранiна Невельскага павета Віцебскай губерні Івана Восіпава Журомскага (Жэромскага). Па прашэнні апошняга ад 3 красавіка 1845 г. была заведзена справа аб спагнанні на яго карысць гэтых грошаў [16]. Гаворыцца пра сына першага, але імя не называецца [17].

Уладальнік вёскі Добрына Аршанскага павета памешчык Міхайла Гурка згадваецца ў справе аб кражы ў жніўні 1845 г. пры карчме ў маёнтку суседняга памешчыка Марціна Гуркі сялянамі вёскі першага жывёлы з гурта Рубцова, злынскага купца Чарнігаўскай губерні, пры прагоне гурта праз вёску [15].

У 1846 г. памешчык Гурка [імя і імя па бацьку не адзначаны. — *А. Г.*] валодаў маёнткам Добрына Аршанскага павета (у савецкі час існавала вёска Добрына Крынкаўскага с/с Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці) [18; 78, с. 128].

У НГАБ захоўваюцца архіўныя дакументы, якія датычацца не толькі Беларусі ў яе сучасных межах, але і закранаюць іншыя мясцовасці, якія ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі. Прыклад гэтаму — метрычная кніга Санкт-Пецярбургскага рымска-каталіцкага касцёла за 1849–1854 гг. з фонду 1781 «Магілёўская духоўная рымска-каталіцкая кансісторыя», дзе маецца запіс аб смерці ў 1852 г. у Санкт-Пецярбурзе генерала Уладзіміра Іосіфавіча Гуркі, бацькі героя Шыпкі. Каталікі Санкт-Пецярбурга належалі да ведамства Магілёўскай рымска-каталіцкай духоўнай кансісторыі, сфера дзейнасці якой ахоплівала ўсю імперыю. Па прычыне інфарматыўнасці запісу ён прыводзіцца ў артыкуле цалкам: «… Января 24 дня, напутствованный Св. Тайнами умер в С Петербурге от чахотной лихорадки Владимир Иосифов Гурко … Начальник всех пехотных Резервных и Запасных войск Армии, Генерал от Инфантерии, Кавалер Орденов: Св. Равноапостольнаго Князя Владимира большаго креста 1й степени, Св. Александра Невскаго с алмазами, Белаго Орла, Св. Анны Императорскою Короною украшенной 1й ст. и 4й ст., Св. Победоносца Георгия 3й ст., имевший знак отличия за военное достоинство 2 ст., знак отличия безпорочной службы за XXX лет, Золотую шпагу с надписью за храбрость, Медали: за Французскую войну 1812 года, за Персидскую войну и за взятие штурмом города Варшавы. От роду имел 57 лет. Оставил по себе сына [Мв.] Гусарскаго полка Ротмистра Иосифа и дочь Марианну, по муже Муравьеву-Апостол … Тело его, по совершении погребательных церемоний Его Высокопреосвященством Могилевским Архиепископом, Митрополитом Римско-Католических церквей в Российской Империи и Кавалером Игнатием Головинским, 28 того же месяца, с дозволения Правительства, перевезено в Могилевскую Губернию, Оршанскаго уезда, для предания земле в фамильном склепе, Римско-Католической Кротовшенской церкви. При совершении церемонии присутствовали: Его Величество Государь Император Самодержец Всероссийский Николай Павлович, Его Императорское Высочество, Государь Наследник Цесаревич и Великий Князь Александр Николаевич и многие другие Генералы» [58, арк. 216–216 адв.].

У газеце «Магілёўскія губернскія ведамасці» ад 17 студзеня 1859 г. № 3 сярод аб'яў, у раздзеле «Тыя, хто выязджае за граніцу» («Выезжающие за границу») паказаны памешчык Аляксандр Гурка са сваёй жонкай і служанкай Ганнай Струкавай. Аб геаграфічных даных не гаворыцца [43].

Пратакол Магілёўскага губернскага праўлення ад 2 жніўня 1863 г. называе двух памешчыкаў Аршанскага павета, што мелі дачыненне да «беспарадкаў» у Магілёўскай губерні, і іх зямельную маёмасць, апісаную па зацверджаных імператарам Аляксандрам II правілах 15 сакавіка 1863 г. аб секвестры маёнткаў асоб, якія мелі дачыненне да паўстання 1863 г.: калежскага рэгістратара Ксаверыя Ігнацьева Бржазоўскага — фальварак Астрапаль (Острополь), вёскі Павукі і Скавародкі 4-га стану плошчай 757 дзесяцін 1504 сажняў і Антона Міхайлавіча Гурку — фальварак Добрын з вёскамі 3-га стану плошчай 1145 дзесяцін 2159 сажняў [72].

Маёнтак Добрына 3-га стану Аршанскага павета Магілёўскай губерні памешчыка Антона Міхайлавіча Гуркі (Рамейкі-Гуркі) быў секвестраваны на падставе ўказа Магілёўскага губернскага праўлення ад 31 мая 1863 г. і распараджэння аршанскага земскага спраўніка ад 11 чэрвеня 1863 г., а вопіс яго склалі 24 чэрвеня 1863 г. [70]. Сярод прысяжных цэнаўшчыкоў і сведкаў складання вопісу названы памешчык Марцін Казіміраў Гурка [70, арк. 4].

Прапанова камандуючага войскамі Віленскай ваеннай акругі генерала ад інфантэрыі Мараўёва магілёўскаму губернатару ад 26 студзеня 1865 г. гаворыць аб неабходнасці канфіскацыі ў казну па канфірмацыі ад 18 студзеня 1865 г. па ваенна-судовай справе аб удзеле памешчыка Аршанскага павета Антона Міхайлавіча Гуркі ў паўстанні 1863 г. яго асабістай маёмасці і маёмасці, якая можа належыць яму па спадчыне ад бацькоў. Да 8 кастрычніка 1865 г. устаноўлена, што за памешчыкам Аршанскага павета Антонам Міхайлавым Гуркам-Рамейкам па Х-ым народным перапісе пры фальварку Добрына налічвалася 125 сялян. Другой маёмасці на гэты момант за ім выяўлена не было [73; 74, арк. 31].

Планы зямельных уладанняў 1-га і 3-га станаў Аршанскага павета памешчыкаў Гуркаў і сялянскіх надзелаў за 1843 г. (дакладней межавання 1843 г.), 1862 г. і без даты (не пазней за 1863 г.) называюць пяць памешчыкаў Гуркаў, уладальнікаў лясных дач, і іх зямельную маёмасць:

Гурка Лявонці Восіпаў, генерал-маёр — сяльцо [маёнтак] Крынкі;

Гурка Уладзімір Восіпаў, генерал-лейтэнант– сяльцо [маёнтак] Ордзеж;

Гурка Міхайла Казіміраў, паручнік — сяло Добрын, вёска Добрын, лясныя дачы Салаўёва і Чэрнышэўскія Лукі;

Гурка Марцін Казіміраў — сяльцо [маёнтак] Марцінаўка (у савецкі час вёска Марцінаўка Обальскага сельсавета Сенненскага раёна Віцебскай вобласці), лясная дача Салаўёва (Соловьево);

Гурка (Гура) Антон Міхайлавіч — сяльцо [маёнтак] Добрына, сяло Добрына, лясныя дачы Салаўёва (Соловьево), Чэрнышэўскія Лукі [71; 78, с. 253].

31 мая 1863 г. прыстаў 3-га стану Аршанскага павета рапартаваў віцебскаму грамадзянскаму губернатару аб паведамленні шынкара Сухадораўскай карчмы Е. К. Баркоўскага пра нападзенне паўстанцаў на маёнтак Высокае Высачанскай воласці гэтага павета, на мяжы з Віцебскай губерняй, памешчыка Аляксандра Гуркі. Шынкар адзначаў, што бачыў да дваццаці конных «мяцежнікаў». Па загаду грамадзянскага губернатара на месца з Віцебска былі адпраўлены рота салдат і пяцьдзясят казакоў, але з паўстанцаў нікога не знайшлі. Мясцовы станавы прыстаў пісаў, што Баркоўскі даваў паказанні пра паўстанцаў у п'яным выглядзе… [50].

18 жніўня 1863 г. быў складзены вопіс маёнтка Юльюшполле (Юльянава) з вёскай Брадкі (Браткі) Аршанскага павета губернскага сакратара Юльяна Марцінава Гуркі за ўдзел яго ў паўстанні 1863 г. на тэрыторыі Магілёўскай губерні. Згадваецца саўладальнік маёнтка Марцін Гурка. Жонкай Юльяна была Сафія Станіслававa з Піораў Гурка. Да мая 1864 г. Юльян ужо год знаходзіўся ў Аршанскім астрозе. У Оршы на гэты момант пражывала і Сафія, якая ў прашэнні аб аказанні ёй дапамогі на выхаванне малалетніх дзяцей з даходаў ад дадзенага секвестраванага маёнтка адзначала, што муж яе «нявінна пакутуе» ў заключэнні [60, арк. 1; 61, арк. 5, 11 адв., 12; 62]. Да 10 чэрвеня 1864 г. у следчых органаў не было доказаў аб удзеле памешчыцы Аршанскага павета Сафіі Гуркі ў паўстанні [63]. Але да 14 ліпеня таго ж года старшыня следчай камісіі па палітычных справах, заснаванай у Магілёве, гвардыі палкоўнік Набокаў адзначаў, што па следчай справе камісіі аб удзеле ў паўстанні памешчыка Антона і дачыненні да дзеянняў паўстанцаў Юльяна Гуркаў бачна дачыненне да паўстання і жонкі апошняга Сафіі Гуркі, якая хадайнічае аб назначэнні ўтрымання з секвестраванага маёнтка яе мужа [64]. У сям'і Юльяна і Сафіі Гуркаў было пяць дзяцей: два сыны — Станіслаў (12-ці гадоў) і Казімір (10-ці) і тры дачкі — Мар'я (7-мі), Ганна (4-х) і Емілія (2-х). Як паказалі яе суседзі сяляне, у палітычных адносінах яна была «добранадзейная». Пастановай ад 28 жніўня 1864 г. Магілёўскае губернскае праўленне прызначыла ёй дапамогу з даходаў секвестраванага маёнтка Юльянава ў памеры 100 рублёў у год [65]. Указам ад 18 лютага 1865 г. праўленне па прапанове начальніка Магілёўскай губерні ад 9 лютага гэтага ж года зняла секвестр з усёй маёмаці памешчыка Аршанскага павета былога засядацеля Аршанскага павятовага суда Юльяна Гуркі

і яго жонкі Сафіі [66]. Далей ідзе гаворка пра маёнтак Жыліншчына 3-га стану Аршанскага павета гэтай памешчыцы. Вопіс яго быў складзены 16 снежня 1864 г. за дачыненне яе да паўстання [67]. У 1864 г. ёй таксама належаў маёнтак Піорамонт (вёска Піярамонт Дабрамысленскага с/с Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці) [68, арк. 55; 78, с. 306].

Ведамасць Віцебскай палаты крымінальнага і грамадзянскага суда аб нерухомай маёмасці, што перайшла з 1 студзеня па 1 жніўня 1868 г. ад асоб польскага паходжання да асоб няпольскага паходжання па Палажэнню ад 5 сакавіка 1864 г., па Віцебскай губерні за 1868 г. утрымлівае невялікія звесткі і аб памешчыках Магілёўскай губерні. Гэтыя звесткі закрэслены алоўкам, верагодна, з-за таго, што ўнесены ў ведамасць памылкова. Пад № 39 тут паказаны маёнтак Мар'янава Аршанскага павета (вёска Мар'янова Крынкаўскага с/с Лёзненскага раёна Віцебскай вобласці) плошчай 630 дзесяцін, які да пераходу належаў памешчыку Марціну Казімірову Гурку. Пераход маёнтка да адстаўнога штабс-капітана Фамы Аляксандрава Сырыцы рускага паходжання праваслаўнага веравызнання адбыўся па добраахвотнай здзелцы. Апошні набыў маёнтак па купчай крэпасці ад 11 ліпеня 1868 г. за 4 тысячы рублёў [47, арк. 484 адв. — 485; 78, с. 254]. Другая ведамасць аналагічнага плана ўтрымлівае тыя ж звесткі, маёнтак ідзе пад № 110 і інфармацыя не закрэслена [48, арк. 581 адв. — 582].

Да 25 верасня 1870 г. у горадзе Віцебску, па вуліцы Новаафіцэрскай у 1-й частцы горада, існаваў дом, які належаў Гурку, дзе пражывалі дзве дачкі памерлага святара Іосіфа Лапы Эмілія і Марыя Лапы [45, арк. 27].

У пачатку лютага 1884 г. памешчык Аршанскага павета Магілёўскай губерні Юльян Марцінаў Гурка падаваў у Віцебскую санітарную камісію прашэнне аб выдачы яму пасведчання аб з'яўленні ў 1880 г. чумы рагатай жывёлы ў горадзе Віцебску [76].

Суражскі, Віцебскі і Веліжскі паветы Віцебскай губерні. Прадстаўнікі роду Рамейкаў-Гуркаў пражывалі і валодалі маёмасцю і ў суседняй з Магілёўскай Віцебскай губерні. Вялікая частка іх уладанняў па Аршанскім павеце, аб якіх згадана вышэй, знаходзілася ў Высачанскай воласці павета. Апошняя межавала з Селюцкай і Каралеўскай валасцямі Віцебскага павета Віцебскай губерні (дадзеныя воласці належалі да Віцебскага павета і да скасавання Суражскага павета ў 1866 г.). У раёне апошніх дзвюх валасцей, а таксама далей, у паўночным напрамку, у Суражскім павеце, землі якога пасля скасавання адышлі да Віцебскага, Веліжскага і Гарадоцкага паветаў, і знаходзіліся маёнткі іншых галін роду [9; 10; 14; 24; 30; 35; 51; 81].

У верасні 1811 г. быў складзены вопіс закладзеных былым суражскім павятовым маршалкам Савеліем Восіпавым Гуркам (на момант складання вопісу нябожчык) у Дзяржаўным пазыковым банку ў 1803 г.

вёсак яго маёнтка Брыгідполь [Брыгітполь] Суражскага павета (на пачатак XX ст. дадзеныя маёнтак і вёскі знаходзіліся ў Казакоўскай воласці Веліжскага павета; аб прыналежнасці вёскі Баравая ў гэты перыяд да апошняй воласці даных у даведніку не знойдзена; у савецкі час вёска Брыгітполле Суражскага пасялковага савета Віцебскага раёна Віцебскай вобласці), дзе пражывалі 182 селяніны: Хадорына (Хадэрына), Шчэлбава (Шчэйбава, Шэйбава), Самсонава, Стоўпкі (Стаўбкі), Перна, Баравая, Стасенкі (Стасёнак, Сталенкі), Дуброўка (Буброўка), Стайкі (Станкі) і Кіселёва за невяртанне ім банку пазыкі [25; 27, арк. 25; 78, с. 58; 81, с. 54]. Апекуном вёсак прызначылі калежскага асэсара Івана Восіпава Быкоўскага [26, арк. 23]. Прашэннем ад 22 студзеня 1816 г. у Віцебскае губернскае праўленне сын Савелія Восіпава Гуркі памешчык Суражскага павета адстаўны паручнік Антоні Гурка хадайнічаў аб устрыманні праўлення ад продажу з публічнага торгу атрыманага ім у спадчыну маёнтка бацькі, апісанага за неплацёж пазыкі Дзяржаўнаму пазыковаму банку, у сувязі з падачай ім прашэння ў праўленне банка аб растэрміноўцы пазыкі на 12 гадоў. Да 23 сакавіка 1816 г. дазвол на такую растэрміноўку ад праўлення банка быў атрыманы…[28; 29]. 25 чэрвеня 1817 г. памешчык Суражскага павета Віцебскай губерні Антон Савельеў Гурка, які валодаў у гэтым павеце населенымі пунктамі [тыпы не названы. — *А. Г.*] Брыгітполле і Стырыкі, згадваецца як падкаморы [14]. Да канца верасня 1817 г. гаворка зноў ідзе аб неабходнасці продажу с таргоў маёнтка [Брыгітполь] Суражскага павета нашчадкаў суражскага павятовага маршалка Ксаверыя [вышэй Савелія. — *А. Г.*] Восіпава Гуркі за марудную ўплату па пазыцы Дзяржаўнага пазыковага банка на 12 гадоў, зробленай 4 чэрвеня 1813 г. [31]. Да 1 ліпеня 1818 г. з памешчыка Суражскага павета падкаморыя Антонія Гуркі была спагнана частка грошаў па дадзенай пазыцы яго бацькі Ксаверыя Гуркі [32, арк. 15]. Да 15 верасня 1819 г. памешчыка Антонія Гуркі ўжо не было ў жывых, а апекуном над яго малалетнімі дзецьмі стаў тытулярны саветнік Ігнаці Кудзіновіч [33]. 24 кастрычніка 1821 г. грошы ў Дзяржаўны пазыковы банк па гэтаму маёнтку праз Суражскую павятовую паштовую экспедыцыю адпраўляла ўжо памешчыца Тэрэзія (Тэрэса) Гурка [34]. Да верасня 1822 г. яна, жонка падкаморыя Суражскага павета, валодала зямельнай маёмасцю ў парафіі Суражскага Петрапаўлаўскага касцёла Суражскага павета Віцебскай губерні Веліжскага дэканата Віцебскай протапрэсвітэрыі ў наступных населеных пунктах: павятовы горад Сураж, вёскі Сталбкі, Арэхі, Смурыгі, Перна, Кеселёва [Кіселёва], Дуброўка, Фіданава, Бітая, Стасінкі [Стасенкі], Стайкі, Азаркіна, Шчалбава [Шчэлбава], Самсонава, Хадорына [52, арк. 85]. На пачатак XX ст. вёскі знаходзіліся ў Казакоўскай воласці Веліжскага павета; аб прыналежнасці вёсак

Фіданава, Бітая і Азаркіна ў гэты перыяд да апошняй воласці даных у даведніку не знойдзена [81, с. 53–54].

Да кастрычніка 1822 г. Фалкавіцкі Успенскі парафіяльны касцёл Віцебскага павета Віцебскай губерні Мікулінскага дэканата Віцебскай протапрэсвітэрыі патраната жонкі былога [віцебскага] губернскага маршалка Багамольца валодаў зямлёй, фундаванай памешчыкам Гуркам — 29 дзесяцін 20 сажняў каля самога касцёла [54, арк. 168]. Да пачатку XX ст. касцёл знаходзіўся ў Каралеўскай воласці Віцебскага павета [81, с. 21–22], якая межавала з Высачанскай воласцю Аршанскага павета, дзе ў памешчыкаў Гуркаў, як ужо адзначалася, было шмат зямельнай маёмасці [9; 10].

Ёсць у НГАБ звесткі аб прадстаўніках гэтага роду і менш шырокага плана. 31 ліпеня 1818 г. жонка салдата Мар'я Паўлава Ляонава скардзілася віцебскаму грамадзянскаму губернатару на ўтрыманне памешчыкам Антоніем Гуркам як сваёй сялянкі яе 12-гадовай дачкі Аўдоцці. Апошняя была народжана па-за шлюбам ад радавога былой Суражскай штатнай каманды праз некалькі гадоў пасля аддачы ў рэкруты з Суражскага павета памешчыкам Ляонам Гуркам мужа прасіцельніцы Васілія Ляонава ў 1794 г. Калі прасіцельніца знаходзілася ва ўслужэнні ў горадзе Суражы, а дачка, якой тады было 10 гадоў, у вёсцы Хадоліна [Хадорына] (на пачатак XX ст. Хадорына знаходзілася ў Казакоўскай воласці Веліжскага павета Віцебскай губерні) памешчыка Антонія Гуркі ў свякоў Мар'і Паўлавай, апошні памешчык забраў дачку да сябе ў двор [36; 81, с. 54].

Уладанні значнай часткі роду Рамейкаў-Гуркаў знаходзіліся ў частках Магілёўскай і Віцебскай губерняў, якія межавалі паміж сабой, і далей, па апошняй губерні, на поўнач, у прыватнаці ў той частцы Веліжскага павета, якая да скасавання Суражскага павета належала да апошняга. Вёска Бурнеўка, дзе нарадзіўся герой руска-турэцкай вайны, знаходзілася ў Круглянскай воласці Магілёўскага павета, што межавала з Аршанскім паветам, на поўдзень ад уладанняў у Высачанскай воласці апошняга (раней Бабінавіцкага, скасаванага ў 1840 г.) павета. Паміж Высачанскай і Круглянскай валасцямі даволі значная адлегласць, некалькі валасцей Аршанскага павета. Магчыма, з Круглянскай воласцю Магілёўскага павета была звязана службовая дзейнасць яго бацькі ці там таксама знаходзіліся зямельныя ўладанні гэтай галіны роду [9; 10; 51; 81; 82].

Відавочна, улічваючы, што прадстаўнікі роду Гуркаў (Рамейкаў-Гуркаў) належалі да землеўладальнікаў і ўдзельнічалі ў паўстанні 1863 г., ёсць звесткі аб дадзеным родзе і ў іншых фондах НГАБ. Дакументы архіва змяшчаюць звесткі аб ураджэнцах і жыхарах Беларусі розных поглядаў, часам супрацьлеглых. Сведчанне таму — адносіны

Рамейкаў-Гуркаў да паўстання 1863 г. Задача гісторыка — непрадузятае іх вывучэнне.

Крыніцы і літаратура

1. А. К. [об имени автора статьи только такой вариант — *А. Г.*] Гурко, Иосиф Владимирович // Энциклопедический словарь Товарищества «Бр. А. и И. Гранат и К⁰» / 7-е изд. под ред. проф. Ю. С. Гамбарова, В. Я. Железнова, М. М. Ковалевского, С. А. Муромцева и К. А. Тимирязева.– М., без даты: не ранее 1914 г. — Т. XVII (Греция-Дарвин). — 370 с. — Столбцы 400–401 [С. 200–201].
2. Горный Дубняк — Викизнание // [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.wikiznanie.ru/ru-wz/index.php/Горный_Дубняк. — Дата доступа: 11.09.2014.
3. Гурко или Ромейко-Гурко / автор не указан // Энциклопедический словарь / издатели: Брокгауз Ф. А. (Лейпциг), Ефрон И. А. (Санкт-Петербург) / под ред. К. К. Арсеньева и заслуж. проф. Ф. Ф. Петрушевского. — Санкт-Петербург: Типо-Литография И. А. Ефрона, 1893. — Полутом (книга) 18 // Т. IX^{A} (Гравилат-Давенант). — 514 с. — С. 913–914.
4. Гурко (Иосиф Владимирович) / автор не указан // Энциклопедический словарь / издатели: Брокгауз Ф. А. (Лейпциг), Ефрон И. А. (Санкт-Петербург) / под ред. К. К. Арсеньева и и заслуж. проф. Ф. Ф. Петрушевского. — Санкт-Петербург: Типо-Литография И. А. Ефрона, 1893. — Полутом (книга) 18 // Т. IX^{A} (Гравилат-Давенант). — 514 с. — С. 913.
5. Гурко, Ромейко-Гурко Василий Иосифович / автор не указан // БСЭ / изд. 3-е / Редкол.: А. М. Прохоров (глав. ред.) и др. — М.: Советская Энциклопедия, 1972. — Т. 7 (Гоголь-Дебит). — 608 с. — С. 454.
6. Гурко, Ромейко-Гурко Иосиф Владимирович / автор не указан // БСЭ / изд. 3-е / Редкол.: А. М. Прохоров (глав. ред.) и др. — М.: Советская Энциклопедия, 1972. — Т. 7 (Гоголь-Дебит). — 608 с. — С. 454.
7. Джуранли — Викизнание // [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.wikiznanie.ru/ru-wz/index.php/%D0%94%D0%B6%D1%83%D1%80%D0%B0%D0%BD%D0%BB%D0%B8. — Дата доступа: 10.09.2014.
8. Ени-Загра — Военная энциклопедия — Яндекс.Словари // [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://slovari.yandex.ru/~книги/Военная энциклопедия/Ени-Загра/. — Дата доступа: 10.09.2014.
9. Карта валасцей паветаў Віцебскай губерні (без даты [1870-е гг.] і выхадных даных; ксеракопія канца XX ст.). — 1 арк.
10. Карта валасцей паветаў Магілёўскай губерні (без даты [1870-е гг.] і выхадных даных; ксеракопія канца XX ст.). — 1 арк.
11. Карта: Л.-Гв. 2-й стрелковый батальон под Филипополем 3-го, 4-го и 5-го января 1878 года // [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.runivers.ru/doc/cartography/468642/. — Дата доступа: 11.09.2014.

12. Карта Тверской губернии (без даты, не позднее 1918 г.) / сост. Ю. М. Шокальский // Старинные карты Тверской губернии / Тверская губерния / Губернии и области Российской империи / Металлоискатели. — Информационный портал. — Форум кладоискателей // [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://metalloiskateli-info.ru/gubernii-i-oblasti-rossijskoj-imperii/tverskaya-guberniya/. — Дата доступа: 28.07.2014.
13. Нарбут, А. М. Гуркі, Рамейкі-Гуркі // Беларуская Энцыклапедыя ў 18-ці тамах / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. — Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 1997. — Т. 5 (Гальцы-Дагон). — 576 с. — С. 536.
14. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далее — НГАБ). — Ф. 299. — Воп. 2. — Спр. 365. — Адносіна Віцебскага губернскага праўлення аб накладанні забароны на маёнткі памешчыкаў Суражскага павета Кудзіновіча, Бавара і Гуркі ў заклад на падрад на будаўніцтва паштовых станцый. 25.06.1817 г. — 1 арк.
15. НГАБ. — Ф. 1297. — Воп. 1. — Спр. 15140. — Справа па адносіне міністра унутраніх спраў аб правядзенні расследавання аб кражы сялянамі ўладальніка вёскі Добрына Аршанскага павета памешчыка Гуркі М. жывёлы з гурта злынскага купца [Чарнігаўскай губерні] Рубцова пры прагоне гурта праз вёску. 05.11.1845–13.11.1848 гг. — 22 арк.
16. НГАБ. — Ф. 1297. — Воп. 1. — Спр. 15736. — Справа па прашэнню двараніна Невельскага павета Журомскага (Жэромскага) І. В. аб спагнанні з памешчыка Бабінавіцкага павета Магілёўскай губерні Рамейкі-Гуркі М. К. пазыкі на яго карысць. 04.04.1845–28.03.1846 г. — 7 арк.
17. НГАБ. — Ф. 1297. — Воп. 1. — Спр. 15736. — Арк. 1 адв. — Прашэнне двараніна Невельскага павета Журомскага (Жэромскага) І. В. аб спагнанні з памешчыка Бабінавіцкага павета Магілёўскай губерні Рамейкі-Гуркі М. К. на яго карысць пазыкі. 03.04.1845 г.
18. НГАБ. — Ф. 1297. — Воп. 1. — Спр. 15949. — Справа па скарзе елісаветградскага купецкага сына Херсонскай губерні Сініцына Л. М. на нападзенне сялян уладальніка маёнтка Добрына Аршанскага павета памешчыка Гуркі на яго рабочых і прыказчыка пры прагоне апошнімі праз маёнтак гуртаў жывёлы прасіцеля і захоп часткі жывёлы арандатарам фальварка Добрына памешчыка дваранінам Вярыгай Р. 02.09.1846–01.04.1848 гг. — 11 арк.
19. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 2. — Спр. 3673. — Справа па адносіне Курляндскага губернскага праўлення аб прымусе землеўладальніка Віцебскай губерні былога арандатара казённай мызы Альт Платон (Альтплатон) Курляндскай губерні правадзейнага стацкага саветніка і кавалера ўзнагарод Гуркі заплаціць пазыку за арэнду мызы. 28.03–09.12.1810 г. — 3 арк.
20. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 2. — Спр. 3673. — Арк. 1–1 адв. — Адносіна Курляндскага губернскага праўлення аб прымусе землеўладальніка Віцебскай губерні былога арандатара казённай мызы Альт Платон (Альтплатон) Курляндскай губерні правадзейнага стацкага саветніка і кавалера ўзнагарод Гуркі заплаціць пазыку за арэнду мызы (копія). 18.03.1810 г.
21. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 2. — Спр. 3673. — Арк. 2. — Пратакол Віцебскага губернскага праўлення аб адсылцы ў Магілёўскае губернскае

праўленне памылкова адпраўленай у першае праўленне адносіны Курляндскага губернскага праўлення з дадаткамі аб прымусе землеўладальніка Віцебскай губерні былога арандатара казённай мызы Альт Платон (Альтплатон) Курляндскай губерні правадзейнага стацкага саветніка Гуркі заплаціць пазыку за арэнду мызы. 04.04.1810 г.

22. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 2. — Спр. 4407. — Справа па адносіне Курляндскага губернскага праўлення аб прыняцці праўленнем мер да вяртання сялянскага сына Даве, узятага жыхаром Віцебскай губерні былым арандатарам казённай мызы Альт Платон (Альтплатон) Курляндскай губерні правадзейным стацкім саветнікам Гуркай з двара [Лікке] Давіс пры ўступленні ў валоданне мызай. 24.07–06.10.1811 г. — 3 арк.
23. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 2. — Спр. 4407. — Арк. 1–2. — Адносіна Курляндскага губернскага праўлення аб прыняцці праўленнем мер да вяртання сялянскага сына Даве, узятага жыхаром Віцебскай губерні былым арандатарам казённай мызы Альт Платон (Альтплатон) Курляндскай губерні правадзейным стацкім саветнікам Гуркай з двара [Лікке] Давіс пры ўступленні ў валоданне мызай. 14.07.1811 г.
24. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 2. — Спр. 4584. — Справа па адносіне Праўлення Дзяржаўнага заёмнага банка аб вопісе і перадачы ў апеку закладзенага ў банку маёнтка Брыгідполь Суражскага павета суражскага павятовага маршалка Гуркі С. В. за невяртанне банку пазыкі. 03.07.1811–06.05.1816 г. — 68 арк; Арк. 9–20. Вопіс маёнтка Брыгідполь [Брыгітполь] Суражскага павета суражскага павятовага маршалка Гуркі С. В. 1811 г.
25. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 2. — Спр. 4584. — Арк. 9–20. — Вопіс маёнтка Брыгідполь [Брыгітполь] Суражскага павета суражскага павятовага маршалка Гуркі С. В. 1811 г.
26. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 2. — Спр. 4584. — Арк. 23–24 адв. — Адносіна Праўлення дзяржаўнага пазыковага банка ў Віцебскае губернскае праўленне аб правядзенні праўленнем расследавання аб прычынах адсутнасці ў вопісе маёнтка Брыгідполь [Брыгітполь] Суражскага павета нашчадкаў памешчыка суражскага павятовага маршалка Гуркі С. В. апякунскага валодання калежскага асэсара Быкоўскага І. імён двух сялян вёсак Стаўбкі і Стайкі. 08.01.1812 г.
27. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 2. — Спр. 4584. — Арк. 25–25 адв. — Рапарт Суражскага павятовага земскага суда ў Віцебскае губернскае праўленне аб абавязальніцтве апекуна маёнтка Брыгідполь [Брыгітполь] Суражскага павета нашчадкаў памешчыка суражскага павятовага маршалка Гуркі С. В. калежскага асэсара Быкоўскага І. штогод уплачваць Дзяржаўнаму пазыковаму банку пазыкі, якія лічацца на маёнтку. 20.01.1812 г.
28. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 2. — Спр. 4584. — Арк. 46–47. — Прашэнне памешчыка Суражскага павета адстаўнога паручніка Гуркі А. у Віцебскае губернскае праўленне аб устрыманні праўлення ад продажу з публічнага торгу атрыманага ім у спачыну ад бацькі Гуркі С. В. маёнтка Брыгідполь [Брыгітполь], апісанага за неплацёж пазыкі Дзяржаўнаму

пазыковаму банку, у сувязі з падачай ім прашэння ў праўленне банка аб растэрміноўцы пазыкі 22.01.1816 г.

29. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 2. — Спр. 4584. — Арк. 48. — Адносіна Праўлення Дзяржаўнага пазыковага банка ў Віцебскае губернскае праўленне аб адмене губернскім праўленнем продажу з таргоў маёнтка Брыгідполь [Брыгітполь] Суражскага павета нашчадкаў памешчыка суражскага павятовага маршалка Гуркі С. В. апякунскага валодання калежскага асэсара Быкоўскага І. у сувязі з растэрміноўкай праўленнем банка пазыкі банку па маёнтку і вызваленні маёнтка ад вопісу і апекі. 23.03.1816 г.
30. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 2. — Спр. 5974. — Справа па адносіне Праўлення Дзяржаўнага пазыковага банка аб продажы з таргоў маёнтка Брыгідполле Суражскага павета нашчадкаў суражскага павятовага маршалка Гуркі К. В. за неўплату па пазыцы ад банка. 01.10.1817–04.11.1821 гг. — 90 арк.
31. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 2. — Спр. 5974. — Арк. 1–2. — Адносіна Праўлення Дзяржаўнага пазыковага банка ў Віцебскае губернскае праўленне аб продажы з таргоў маёнтка [Брыгітполь] Суражскага павета нашчадкаў суражскага павятовага маршалка Гуркі К. В. за неўплату па пазыцы ад банка. 24.09.1817 г.
32. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 2. — Спр. 5974. — Арк. 15–15 адв. — Рапарт Суражскага ніжняга земскага суда ў Віцебскае губернскае праўленне аб адсылцы судом у Дзяржаўны пазыковы банк грошаў, спагнаных з памешчыка Суражскага павета падкаморыя А. Гуркі па пазыцы ад банка яго бацькі К. Гуркі. 01.07.1818 г.
33. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 2. — Спр. 5974. — Арк. 72. — Квітанцыя Суражскай павятовай паштовай экспедыцыі аб прыняцці экспедыцыяй ад апекуна малалетніх дзяцей нябожчыка памешчыка Гуркі А. тытулярнага саветніка Кудзіновіча І. грошаў для адсылкі ў горад Санкт-Пецярбург у Дзяржаўны пазыковы банк (копія). 15.09.1819 г.
34. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 2. — Спр. 5974. — Арк. 84. — Квітанцыя Суражскай павятовай паштовай экспедыцыі аб прыняцці экспедыцыяй ад памешчыцы Гуркі Т. грошаў для адсылкі ў горад Санкт-Пецярбург у Дзяржаўны пазыковы банк у лік уплаты пазыкі ад банка памешчыка суражскага павятовага маршалка Гуркі К. В. (копія з копіі). 24.10.1821 г.
35. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 2. — Спр. 6082. — Справа па скарзе жонкі салдата Ляонавай М. П. на ўтрыманне памешчыкам Суражскага павета Гуркай А. у сваім двары яе дачкі Аўдоцці, народжанай па-за шлюбам, як сваёй сялянкі пасля паездкі апошняй да сваякоў у вёску памешчыка Хадоліна [Хадорына]. 07.08–27.11.1818 г. — 4 арк.
36. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 2. — Спр. 6082. — Арк. 2–3. — Скарга жонкі салдата Ляонавай М. П. на ўтрыманне памешчыкам Суражскага павета Гуркай А. у сваім двары яе дачкі Аўдоцці, народжанай па-за шлюбам, як сваёй сялянкі пасля паездкі апошняй да сваякоў у вёску памешчыка Хадоліна [Хадорына]. 31.07.1818 г.
37. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 3. — Спр. 6219. — Справа па адносіне Віцебскай казённай палаты аб пошуках па губерням маёнтка і капіталаў па-

мешчыка Бабінавіцкага павета Магілёўскай губерні былога ўладальніка маёнтка Лучэса (Лучоса, Лучас) Гурко А. для спагнання казённай пазыкі. 28.03.1831 –21.07.1832 г. — 70 арк.

38. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 3. — Спр. 6820. — Справа па адносіне Магілёўскага губернскага праўлення аб спагнанні з сына былога саветніка Магілёўскага галоўнага суда 2-га дэпартамента Папова памешчыка маёнтка Іозафінаў Дзінабургскага павета Папова В. грошаў на карысць нашчадкаў ротмістра Ведніча Міцкевічаў за вінаватасць саветніка ў страце іх асігнацый. 02.03–31.10.1831 г. — 14 арк.
39. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 3. — Спр. 6820. — Арк. 3–4, 7–8. — Адносіны Магілёўскага губернскага праўлення ў Віцебскае губернскае праўленне аб спагнанні грошаў з былых членаў Магілёўскага галоўнага суда 2-га дэпартамента на карысць нашчадкаў ротмістра Ведніча Міцкевічаў за страту іх асігнацый падчас службы ў судзе. — 10.01; 21.02.1831 г.
40. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 3. — Спр. 9785. — Справа аб спагнанні з маёнткаў былых членаў Віцебскага павятовага суда грошаў за скрыванне тэстамента іншаземца Кніспеля і допуск памешчыка Любімскага павета Яраслаўскай губерні Пашкевіча Л. В. да валодання завешчаным Кніспелем на карысць Віцебскага прыказа грамадскага апекавання маёнткам Сушчова Віцебскага павета. 21.05.1849–19.11.1862 гг. — 405 арк.
41. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 3. — Спр. 9785. — Арк. 130^{г}–130^{е} адв. — Выпіска з кніг Бабінавіцкага павятовага суда аб запісе ў іх на паседжанні ад 03.03.1819 г. прадстаўленага ўладальніцай спадчыннага маёнтка Цялашы (Тялоши) Бабінавіцкага павета Магілёўскай губерні (раней Віцебскага павета Беларускай губерні) жонкай губернскага сакратара Пачобут А. інтэцызійнага дакумента з ператварэннем яго ў вячыстую купчую крэпасць аб продажы маёнтка яго спадчынным саўладальнікам графам Клермонтонэрам (Клермонт-Тонэрам) Л. абывацелю віцебскаму Бібке Н. і Бібке Д. з Казелаў, ад 10.05.1805 г. Не раней 10.07.1855 г.
42. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 3. — Спр. 10326. — Справа аб грашовых прэтэнзіях розных асоб да памешчыкаў маёнткаў Клюкіна, Аўчына, Рожанава [Рожнава] і Русанава Невельскага павета Крупенічам. 19.09.1851–27.08.1860 гг. — 1100 арк. — Тэматычна распрацавана. Вопіс пустыні Данільцова Невельскага павета дзяцей двараніна Ангірскага Д. Е. за 1857 г., арк. 631–632, 636. Газеты «Губернскія ведамасці» за 1857 г.: Магілёўскія ад 23.03 № 12, Смаленскія ад 30.03 № 13, Мінскія ад 29.03 № 13, Пскоўскія ад 03.04 № 14, Курляндскія ад 06.04 № 28, Віленскія ад 30.03 № 13, Ліфляндскія ад 01.04 № 38, Ковенскія ад 06.04 № 14, за 1859 г.: Смаленскія ад 17.01 № 3, Пскоўскія ад 14.01 № 2, Магілёўскія ад 17.01 № 3, Мінскія ад 16.01 № 3, Віцебскія ад 03.01 № 1, Курляндскія ад 21.01 № 6, Ковенскія ад 31.01 № 5, Ліфляндскія ад 28.01 № 12, Віленскія ад 24.01 № 4, арк. 278–288, 290–326, 328–336, 348–350, 351–352а, 359–361, 739–744, 792, 794–797, 799–800, 937–947, 961–963, 964–967, 969–976, 984–986, 988–990а, 1021–1025, 1029–1030, 1044–1045а.
43. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 3. — Спр. 10326. — Арк. 966. — Газета «Магілёўскія губернскія ведамасці». 17.01.1859. № 3.

44. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 3. — Спр. 13502. — Справа аб выплаце з сумы ад продажу з таргоў маёнтка Обаль (Агурэшчына) Полацкага павета дваран Кавалеўскіх І. Р. і Э. іх пазык розным асобам. 02.06.1868–27.12.1876 гг. — 210 арк.
45. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 3. — Спр. 13502. — Арк. 26–27. — Дакладная запіска жыхарак дома Гуркі па вуліцы Новаафіцэрскай у горадзе Віцебску дачок памерлага святара Лапы І. Эмілії і Марыі віцебскаму губернатару аб спагнанні на іх карасць пазыкі з двараніна Кавалеўскага І. праз вылік з грошаў ад продажу апісанага фальварка Обаль (Агурэшчына) Полацкага павета яго жонкі Эмілії. 25.09.1870 г.
46. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 3. — Спр. 13561. — Перапіска праўлення з губернскімі, павятовымі ўстановамі і ўстановамі іншых губерняў аб пераходзе маёнткаў ад асоб польскага паходжання да асоб няпольскага паходжання, зборы звестак аб службе чыноўнікаў, пошуку нашчадкаў розных асоб, прадстаўленні праўленнем Веліжскаму павятоваму паліцэйскаму ўпраўленню Збора законаў, партрэта імператара і «зерцала» замест згарэлых у час пажара, увядзенні новага парадку агляду шнуравых кніг і грашовых сум тэлеграфных аддзяленняў і станцый, пошуку па губерні старажытных гармат, якія захоўваліся ў Тройца-Сергіевай Лаўры ў наваколлі горада Масквы і былі захоплены войскамі Рэчы Паспалітай у 1608 г., падпісцы на даведачныя выданні Міністэрства ўнутраніх спраў і «Штомесячны календар», парадку допуску купцоў імперыі да падрадаў ваеннага ведамства і іншым пытанням. 03.07.1868–23.02.1870 гг. — 1225 арк. — Тэматычна распрацавана. Ведамасці аб канфіскаваных маёнтках і казённых фермах, якія перайшлі з часу выхаду Палажэння 05.03.1864 г. па 01.08.1868 г. ад польскіх памешчыкаў да асоб няпольскага паходжання (са спісамі маёнткаў, ферм, іх былых і сучасных уладальнікаў), па губерні за 1868 г., арк. 398, 404–405, 407, 411– 414, 423– 532, 546–608, 637–643, 653–662, 718–833, 903–909, 931–933, 942–951, 1008–1054. Апісанне гарадскіх і павятовых устаноў гарадоў губерні: павятовых: Веліжа, Гарадка, Дзінабурга, Невеля і заштатнага Суража Віцебскага павета за 1868 г., арк. 977–994.
47. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 3. — Спр. 13561. — Арк. 472–487. — Ведамасць Віцебскай палаты крымінальнага і грамадзянскага суда аб нерухомай маёмасці, што перайшла з 01.01. па 01.08.1868 г. ад асоб польскага паходжання да асоб няпольскага паходжання па Палажэнню 05.03.1864 г., па Віцебскай губерні за 1868 г.
48. НГАБ. — Ф. 1416. — Воп. 3. — Спр. 13561. — Арк. 546–608. — Ведамасць Віцебскай палаты крымінальнага і грамадзянскага суда аб нерухомай маёмасці, што перайшла з 01.01. па 01.08.1868 г. ад асоб польскага паходжання да асоб няпольскага паходжання па Палажэнню па Віцебскай губерні. 1868 г.
49. НГАБ. — Ф. 1430. — Воп. 1. — Спр. 5734. — Справа па адносіне Інспектарскага дэпартамента Ваеннага міністэрства аб адсылцы жыхару Віцебскай губерні генерал-маёру ў адстаўцы Гурку Л. В. бронзавага медаля. 26–31.10.1836 г. — 3 арк.

50. НГАБ. — Ф. 1430. — Воп. 1. — Спр. 31234. — Справа па рапарце прыстава 3-га стану Аршанскага павета аб праверцы паказанняў шынкара Сухадораўскай карчмы Баркоўскага Е. К. аб нападзенні паўстанцаў на маёнтак Высокае памешчыка Гуркі А. 01–02.06.1863 г. — 2 арк.
51. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 26. — Спр. 1410. — Візіты касцёлаў Віцебскага, Веліжскага, Веляшкоўскага, Мікулінскага і Задзвінска-Бешанковіцкага дэканатаў за 1822–1823 гг. — 236 арк.
52. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 26. — Спр. 1410. — Арк. 84–85 адв. — Візіта Суражскага Петрапаўлаўскага парафіяльнага касцёла Суражскага павета Віцебскай губерні Веліжскага дэканата Віцебскай протапрэсвітэрыі. 20.09.1822 г.
53. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 26. — Спр. 1410. — Арк. 154–156 адв. — Візіта Юшкаўскага Пакроўскага касцёла Бабінавіцкага павета Магілёўскай губерні Мікулінскага дэканата Віцебскай протапрэсвітэрыі патраната памешчыкаў Лясатовічаў, камергераў, і Заранкаў і яго Цялошскай філіі (тып апошняй не ўказаны). 16.05.1822 г.
54. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 26. — Спр. 1410. — Арк. 167–169. — Візіта Фалкавіцкага Успенскага парафіяльнага касцёла Віцебскага павета Віцебскай губерні Мікулінскага дэканата Віцебскай протапрэсвітэрыі патраната былой жонкі [віцебскага] губернскага маршалка Багамольца і яго філій Рудзькоўскай Св. Анны і Лужыньскай Троіцкай. 12.10.1822 г.
55. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 26. — Спр. 1410. — Арк. 174–175 адв. — Візіта Пагашчанскага парафіяльнага касцёла Св. Мікалая Бабінавіцкага павета Магілёўскай губерні Мікулінскага дэканата Віцебскай протапрэсвітэрыі патраната Багамольца Я., [былога] старшыні Бабінавіцкага павета [бабінавіцкага павятовага маршалка], і яго філіяльных капліц Выдрэйскай Прэабражэнскай і Хоцімлянскай Пакроўскай. 28.10.1822 г.
56. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 26. — Спр. 1410. — Арк. 176–177 адв. — Візіта Добрынскага Успенскага парафіяльнага касцёла Бабінавіцкага павета Магілёўскай губерні Мікулінскага дэканата Віцебскай протапрэсвітэрыі патраната паручніка расійскага войска Рамейкі-Гуркі М. 30.10.1822 г.
57. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 26. — Спр. 1410. — Арк. 178–180. — Візіта Паловіцкага Прэабражэнскага парафіяльнага касцёла Бабінавіцкага павета Магілёўскай губерні Мікулінскага дэканата Віцебскай протапрэсвітэрыі патраната генерала расійскага войска Рамейкі-Гуркі Л. і філіяльных капліц Крынкаўскай Святой Анны, Ордзежанскай і Лучоскай Благаславеннага Мучаніка Іозефата. 1822 г.
58. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 30. — Спр. 283. — Метрычная кніга Санкт-Пецярбургскага рымска-каталіцкага касцёла аб народжаных, шлюбаваных і памерлых. 1849–1854 гг. — 431 арк.
59. НГАБ. — Ф. 2003. — Воп. 1. — Спр. 376. — Справа аб секвестры маёнтка Юльянава (Юльюшполле) Аршанскага павета памешчыка Гуркі Ю. М. за ўдзел у паўстанні 1863 г. 17.10.1863–17.12.1864 г. — 58 арк.
60. НГАБ. — Ф. 2003. — Воп. 1. — Спр. 376. — Арк. 1–2. — Рапарт Аршанскага павятовага паліцэйскага ўпраўлення аб прадстаўленні вопісу маёнтка Юльянава (Юльюшполле) памешчыка губернскага сакратара

Гуркі Ю. М., секвестраванага за ўдзел яго ў паўстанні 1863–1864 гг. 07.09.1863 г.

61. НГАБ. — Ф. 2003. — Воп. 1. — Спр. 376. — Арк. 5–18. — Вопіс маёнтка Юльянава (Юльюшполле) з вёскай Брадкі 3-га стану Аршанскага павета губернскага сакратара Гуркі Ю. М. 18.08.1863 г.
62. НГАБ. — Ф. 2003. — Воп. 1. — Спр. 376. — Арк. 30–31. — Прашэнне жыхаркі горада Оршы жонкі ўдзельніка паўстання 1863 г. памешчыка Гуркі Ю. М. Гуркі С. С. магілёўскаму грамадзянскаму губернатару аб аказанні ёй дапамогі ў выхаванні малалетніх дзяцей. 05.1864 г.
63. НГАБ. — Ф. 2003. — Воп. 1. — Спр. 376. — Арк. 32. — Адносіна Канцылярыі начальніка Магілёўскай губерні ў 2-е аддзяленне праўлення аб праверцы адносін Гуркі С. С., жонкі Гуркі Ю. М., удзельніка паўстання 1863–1864 гг., памешчыцы Аршанскага павета, да паўстання. 10.06.1864 г.
64. НГАБ. — Ф. 2003. — Воп. 1. — Спр. 376. — Арк. 35–35 адв. — Адносіна старшыні следчай камісіі па палітычных справах, заснаванай у Магілёве, гвардыі палкоўніка [Набокава] у праўленне аб пацвярджэнні дачынення да паўстання 1863 г. Гуркі С. С., жонкі ўдзельніка паўстання Гуркі Ю. М., па следчай справе камісіі аб ступені ўдзелу ў паўстанні памешчыка яе мужа і А. Гуркі. 14.07.1864 г.
65. НГАБ. — Ф. 2003. — Воп. 1. — Спр. 376. — Арк. 43–44. — Пратакол Магілёўскага губернскага праўлення аб прызначэнні памешчыцы Аршанскага павета Гурка С. С. дапамогі на выхаванне малалетніх дзяцей з даходаў секвестраванага маёнтка Юльянава яе мужа ўдзельніка паўстання 1863 г. Гуркі Ю. М. у памеры 100 рублёў у год. 28.08.1864 г.
66. НГАБ. — Ф. 2003. — Воп. 1. — Спр. 376. — Арк. 45. — Указ Магілёўскага губернскага праўлення аб знятці па прапанове начальніка Магілёўскай губерні ад 09.02.1865 г. секвестра з усёй маёмасці памешчыка Аршанскага павета былога засядацеля Аршанскага павятовага суда Гуркі Ю. і яго жонкі Сафіі. 18.02.1865 г.
67. НГАБ. — Ф. 2003. — Воп. 1. — Спр. 376. — Арк. 48–54. — Вопіс маёнтка Жыліншчына Аршанскага павета жонкі губернскага сакратара Гуркі С. С. 16.12.1864 г.
68. НГАБ. — Ф. 2003. — Воп. 1. — Спр. 376. — Арк. 55–56. — Акладны ліст грашовым зборам з маёнтка Піорамонт (Пиоромонт) Аршанскага павета памешчыцы Гуркі з Піораў С. С. 1864 г.
69. НГАБ. — Ф. 2003. — Воп. 2. — Спр. 31. — Справа аб канфіскацыі маёнтка Добрына памешчыка Аршанскага павета Гуркі за ўдзел у паўстанні 1863 г. і вопіс маёнтка. 21.07.1863 — 12.10.1865 гг. — 32 арк.
70. НГАБ. — Ф. 2003. — Воп. 2. — Спр. 31. — Арк. 4–14. — Вопіс маёнтка Добрына 3-га стану Аршанскага павета Магілёўскай губерні памешчыка Гуркі (Рамейкі-Гуркі) А. М. 24.06.1863 г.
71. НГАБ. — Ф. 2003. — Воп. 2. — Спр. 31. — Арк. 19. — Планы зямельных уладанняў 1-га і 3-га станаў Аршанскага павета памешчыкаў Гуркаў і сялянскіх надзелаў. 1862 г.

72. НГАБ. — Ф. 2003. — Воп. 2. — Спр. 31. — Арк. 20–22 адв. — Пратакол Магілёўскага губернскага праўлення аб разглядзе вопісаў маёнткаў памешчыкаў Аршанскага павета, якія мелі дачыненне да паўстання 1863 г. у Магілёўскай губерні: фальварка Вострапаль (Остроль), вёсак Павукі і Скавародкі 4-га стану калежскага рэгістратара Бржазоўскага К. І. і фальварка Добрын з вёскамі 3-га стану Гуркі А. М. 02.08.1863 г.
73. НГАБ. — Ф. 2003. — Воп. 2. — Спр. 31. — Арк. 26–26 адв. — Прапанова камандуючага войскамі Віленскай ваеннай акругі генерала ад інфантэрыі Мураўёва магілёўскаму губернатару аб неабходнасці канфіскацыі ў скарб па канфірмацыі ад 18.01.1865 г. асабістай маёмасці Гуркі А. М. і маёмасці, якая можа належаць яму па спадчыне ад бацькоў, па ваенна-судовай справе аб удзеле Гуркі А. М., памешчыка Аршанскага павета, у паўстанні 1863 г. 26.01.1865 г.
74. НГАБ. — Ф. 2003. — Воп. 2. — Спр. 31. — Арк. 31–31 адв. — Адносіна Магілёўскай казённай палаты з паведамленнем праўленню па справе аб канфіскацыі ў казну маёнтка памешчыка Гуркі-Рамейкі А. М. аб колькасці па Х-му народнаму перапісу сялян пры фальварку Добрына Аршанскага павета дадзенага памешчыка і адсутнасці ў справаводстве палаты іншых спраў аб яго маёмасці і капіталах. 08.10.1865 г.
75. НГАБ. — Ф. 2496. — Воп. 1. — Спр. 4663. — Справа аб выдачы памешчыку Аршанскага павета Гурку Ю. М. пасведчання аб часе з'яўлення чумы рагатай жывёлы ў горадзе Віцебску ў 1880–1881 гг. 07.02–16.12.1884 г. — 4 арк.
76. НГАБ. — Ф. 2496. — Воп. 1. — Спр. 4663. — Арк. 1. Прашэнне памешчыка Аршанскага павета Магілёўскай губерні Гуркі Ю. М. аб выдачы яму пасведчання аб з'яўленні ў 1880 г. чумы рагатай жывёлы ў горадзе Віцебску. 1884 г.
77. Оборона Шипки — Русский Портал // [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.opoccuu.com/100112.htm. — Дата доступа: 10.09.2014.
78. Рапановіч, Я. Н. Слоўнік назваў населеных пунктаў Віцебскай вобласці / рэд. П. П. Шуба. — Мінск: Навука і тэхніка, 1977. — 504 с.
79. Рапановіч, Я. Н. Слоўнік назваў населеных пунктаў Магілёўскай вобласці / рэд. П. П. Шуба. — Мінск: Навука і тэхніка, 1983. — 240 с.
80. Сахарово (Тверь) / Материал из Википедии — свободной энциклопедии // [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/Сахарово_(Тверь). — Дата доступа: 28.07.2014 г.
81. Список населённых мест Витебской губернии / изд. Витебского губернского статистического комитета и Губернской типо-литографии / под ред. члена-секретаря Губернского статистистического комитета А. П. Сапунова. — Витебск: Губернская типо-литография, 1906. — 450 с.
82. Список населённых мест Могилёвской губернии / изд. Могилёвского губернского статистического комитета [и Губернской типо-литографии]. — Могилёв: [Губернская типо-литография], 1909. — 250 с.
83. Ташкисен // [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://dic.academic.ru/dic.nsf/brokgauz_efron/99840/Ташкисен. — Дата доступа: 11.09.2014.

84. Телиш — Викизнание // [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.wikiznanie.ru/ru-wz/index.php/Телиш. — Дата доступа: 11.09.2014.
85. Уфланы. Международная военно-истроическая ассоциация // [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://www.imha.ru/1144535462-uflany.html. — Дата доступа: 10.09.2014.
86. Эдирне — Википедия / Материал из Википедии — свободной энциклопедии // [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki/Эдирне. — Дата доступа: 11.09.2014.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 30.07. 2014

В. К. Крэсс

Панятоўскія-Крапышы герба «Юноша»: радавод старажытнага шляхецкага роду (XVI–XVIII стст.) [1]

Аснову дзяржаўнага кіравання і ваеннай абароны краіны ў часы Вялікага Княства Літоўскага складала шляхта, што ў працэнтных паказчыках вымяраецца лічбамі ў 10–12% ад агульнай колькасці тагачаснага насельніцтва. Да старажытных беларускіх шляхецкіх радоў адносяцца каля 4 000 прозвішчаў, якія карысталіся прыватнаўласніцкімі гербамі. Польска- беларускі род Панятоўскіх стаў сусветна вядомым дзякуючы каралю польскаму і вялікаму князю літоўскаму Станіславу Аўгусту Панятоўскаму (1732–1798).

Гістарычны маштаб гэтага чалавека абумовіў неабходнасць падрабязнага даследавання генеалогіі роду Панятоўскіх, і па гэтай прычыне ён быў вельмі дэталёва апісаны шматлікімі даследчыкамі польскай гісторыі. З ліку прац нашых айчынных гісторыкаў на гэтую тэму неабходна адзначыць кнігу Леаніда Несцярчука «Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Манарх, асветнік, мецэнат», выдадзеную ў 2011 г., у якой вельмі цікава і падрабязна распавядаецца пра згаданую гістарычную асобу [46]. Натуральна, што генеалогію Станіслава Аўгуста Панятоўскага герба «Цяля» мы пакінем па-за ўвагай, але звернемся да радаводаў яго менш вядомых аднафамільцаў, уласнікаў гербаў «Юноша» і «Шранява», менш вядомых носьбітаў слаўнага прозвішча. Наша даследаванне, па сутнасці, з'яўляецца першым крокам у гэтым напрамку.

---

[1] Аўтар выказвае ўдзячнасць за дапамогу ў правядзенні даследавання гісторыкам А. Рахубе, С. А. Рыбчонку, Ф. В. Чарняўскаму.

Пачатковай мэтай даследавання было стварэнне генеалагічнага роспісу роду Панятоўскіх герба «Юноша», якія пражывалі ў XVIII–XX стст. у ваколіцы Суцін Ігуменскага павета Мінскай губерні (раней — Мінскага ваяводства). Па меры збірання і апрацоўкі архіўнага і гістарычнага матэрыялу мэта працы была пашырана і акрэслена як рэканструкцыя гісторыі і генеалогіі роду Панятоўскіх-Крапышоў герба «Юноша».

Рэканструкцыя гісторыі і генеалогіі роду. Пачатак шляхецкага роду Панятоўскіх герба «Юноша» (Junosza), згодна з гербоўнікам Севярына Урускага, вядзецца з Польшчы, з невялікай вёскі Паняты (Poniaty), якая зараз знаходзіцца ў Вінніцкай парафіі Закрачымскай зямлі Мазавецкага ваяводства [62, s. 230]. Прозвішча Панятоўскі адпаведна паходзіць ад назвы вёскі Паняты. Прадстаўнікі гэтага роду адносіліся да дробнай шляхты. Пасля Крэўскай уніі 1385 г., вынікам якой стала стварэнне дзяржаўнага саюза Вялікага Княства Літоўскага і Кароны Польскай, у дробнай мазавецкай шляхты з'явіліся новыя магчымасці ў набыцці зямельных уладанняў на абшарах Вялікага Княства Літоўскага. У пачатку XV ст. рыцары з закрачымскай вёскі Паняты на хвалі «каланізацыі» Падляшша заснавалі ў Дарагіцкім павеце паселішчы Паняты Загайне, Паняты Крапышы, Паняты Казелкі. Пра факт даўняга існавання такіх вёсак цяпер сведчыць паселішча Паняты, лакалізаванае ў гміне Пярлеева Сямяціцкага павета Падлескага ваяводства [60].

Згодна з ваенным попісам шляхты ВКЛ, які адбыўся ў 1567–1568 гг., каля Краснага Сяла (цяпер в. Краснае Маладзечанскага р-на Мінскай вобл.) па загаду вялікага князя літоўскага Жыгімонта II Аўгуста: «до Молодечна днём и ночью, яко на кгвалт поспешаючыся», сабраліся 27776 коннікаў для працягу вайны з рускім царом Іванам Грозным [5]. З сяла Крапышы Паняты ў харугве Дарагіцкага павета сталі на ваены ўлік: «Юрекъ Юревичъ кляча, кафтанъ, мечъ, рогати. Янъ Станиславовичъ кляча, кафтанъ, мечъ. Вавърынецъ Ваврынцевичъ кляча, мечъ. Станислав з ыменья женънего съ Крепишовъ и з отчизны своее конь, кафтанъ, мечъ. Якубъ, Мартиновъ сынъ, конь, мечъ. Янъ Павловичъ конь, мечъ» [48, с. 912]. На сённяшні дзень гэта першы даступны нам юрыдычны дакумент, дзе згадваюцца прадстаўнікі галіны Панятоўскіх з Панят Крапышоў.

Другі старажытны пісьмовы дакумент у справаводстве Вялікага Княства Літоўскага, з якога пачынаецца непасрэдная генеалогія роду Панятоўскіх з Панят Крапышоў герба «Юноша», гэта акт Менскага гродскага суда 1582 г. [3, с. 146–147, 212–213, 341]. У дакуменце гаворыцца, што зямянін гаспадарскі Мікалая Кішкі Цеханавецкага, ваяводы падляскага, Валенты Панятоўскі з жонкай Галенай Урбанаўнай маюць ва ўладанні ў Менскім павеце маёнткі Дзякшняны і Урбаноў-

шчына. Верагодна, што Валенты ўзяў сабе жонку з добрым пасагам, бо яе прозвішча супадае з назвай іх сумеснага ўладання.

Далей прадстаўляецца слушным называць гэту галіну роду галіной Валентыя Панятоўскага. Яго імя па бацьку — Марцінавіч — адшукана ў рэестры дакументаў, які змяшчае актавая кніга Менскага гродскага суда 1593 г. [43, № 552]. Аднак варта адзначыць, што ў гістарычных дакументах таго часу, у 1584 г. згадваецца таксама Валенты, сын Леанарда, дзедзіч вёскі Панятова-Крапіцы (Poniatowa-Krzepice). Пра гэта піша С. Урускі, адносячы Валентыя да герба «Цёлак» [62]. Адам Банецкі, абапіраючыся на дакументы Літоўскай Метрыкі, называе Мацея, дзедзіча на Панятах, у 1541 г., і Леанарда, сына Мацея Крапыша з Панят, у 1545 г. [59, s. 256]. Таму ёсць пэўная падстава меркаваць, што пратапласта роду Панятоўскіх з Панят Крапышоў герба «Юноша» зусім не Марцін, а Мацей, бацька Леанарда, ад якога пайшоў Валенты. Далейшы генеалагічны пошук, верагодна, яшчэ ўдакладніць гэтае пытанне, аднак у нашым даследаванні будзем адштурхоўвацца ад першай версіі, сфарміраванай на падставе акта 1593 г.

Пасля Люблінскай уніі 1569 г. Падляшскае ваяводства, у якім знаходзілася вёска Паняты Крапышы, адышло да Каралеўства Польскага. Па ўмовах уніі польская шляхта болей не магла набываць землі на абшарах ВКЛ. Далейшы лёс Панятоўскіх Крапышоў, якія аселі ў іншых землях ВКЛ да гэтага часу, зводзіўся да параднення са шляхецкімі літвінскімі родамі. Таму падобная гісторыя са шлюбнай партыяй Валентыя Панятоўскага адбылася і ў жыцці яго роднага брата Крыштафа. Шлюб з Марфай Якубаўнай Рыбінскай надаў яму зямельныя ўладанні ў Мсціслаўскім ваяводстве, якія заставаліся асноўнай маёмасцю беларускай галіны Панятоўскіх на працягу больш за 200 гадоў. Як сведчыў сярэдневечны польскі генеалог Барташ Папроцкі: «Панятоўскія ў закрачымскім павеце дом старадаўні і пладавіты, з якога некаторыя ў Русь за пачцівымі справамі пайшлі і там ажаніліся» (Poniatowscy w zakroczymskim powiecie dom starodawny i rosrodzony, z kotorych niektorzy w Rusi za poczciwemi sprawami do opotrzenia przyszli i tam sie zozeniali) [57, s. 323].

Бацька братоў Валентыя і Крыштафа Марцін з'яўляецца пратапластай роду Панятоўскіх герба «Юноша». Гэта імя стала вядома дзякуючы скарзе зямяніна Сцяпана Баўтрашэвіча Брушкевіча на Валянціна Марцінавіча Панятоўскага за пабоі, нанесеныя яго дачцэ [43, № 552]. Прыкладная дата нараджэння Валентыя, такім чынам, прыпадае на 1560-я гг. Улічваючы тое, што Валенты і Крыштаф з'явіліся і аселі на землях ВКЛ дзякуючы шлюбам, і землі, якія яны прыдбалі ў якасці жончыных пасагаў, былі асноўнай іх маёмасцю, дапушчальна меркаванне, што іх бацька Марцін меў нейкую маёмасць і стала жыў на Падляшшы, магчыма, і ў Панятах, нарадзіўшыся каля першай трэці XVI ст.

Браты Валенты Марцінавіч і Крыштаф Марцінавіч Панятоўскія далі пачатак двум адгалінаванням роду, якія ўмоўна назавем «літоўскай» і «беларускай мсціслаўскай» («рускай»). Як напісаў у 1738 г. іх прапраўнук Нікадэм-Тадэвуш Панятоўскі, чашнік мсціслаўскі, у лісце да ксяндза Рудніцкага, рэктара мсціслаўскай рэзідэнцыі езуітаў, «у Літве Даніэл, на Русі Марцін Панятоўскія былі дваюраднымі братамі» (ze w Litwie Daniel, na Rusi Marcin Poniatowscy byli z soba Stryiczno Rodzoni Bracia) [24, арк. 284]. Даніэл і Марцін з'яўляліся адпаведна сынамі Валентыя і Крыштафа. Гэты геаграфічны падзел на Літву і Русь зроблены зыходзячы з месцаў знаходжання ўладанняў і пражывання гэтых сем'яў на абшарах ВКЛ.

Даніэл Валентавіч Панятоўскі, суддзя гродскі і падваяводзіч віленскі, спачатку жыў у Вільні, меў ва ўласнасці сёлы Прылепы і Усяж у Менскім павеце. У 1632 г., прадаўшы іх уніяцкаму мітрапаліту Язэпу Руцкаму, ён набывае ў Віленскім ваяводстве ў Януша Кішкі, ваяводы полацкага, маёнтак Солы, куды пераязджае з Вільні, дзе жыве і памірае ў 1649 г. Магчыма, там ён і пахаваны. Марцін Крыштафавіч Панятоўскі валодаў вёскамі Вародзькаў, Забалацце, Шумячы ў Мсціслаўскім ваяводстве, каля самай усходняй мяжы ВКЛ. Таксама меў 20 валок пусташы ў Смаленскім ваяводстве, нададзеных яму каралеўскім прывілеем у 1627 г. Умоўная мяжа паміж Літвой і Руссю ў тыя часы праходзіла па рацэ Усходняя Бярэзіна. Такім чынам, падзел роду Панятоўскіх герба «Юноша» на літоўскую і беларускую мсціслаўскую (рускую) галіны мы абумовілі менавіта гэтым фактам.

Літоўская галіна. Валенты Марцінавіч Панятоўскі да 1582 г., ажаніўшыся з Геленай Урбанаўнай, атрымаў маёнтак Дзякшняны Мінскага ваяводства, які далей перадаваўся па спадчыне нашчадкам. У Валентыя Марцінавіча было тры сыны — Даніэл, Ян (?) і Адам.

Даніэл Валентавіч Панятоўскі будучы суддзёй гродскім і падваяводзічам віленскім з 1628 г., войскім вендэнскім з 1639 г. [63, s. 113], жыў у камяніцы Тышынскай, што знаходзілася каля гасціннага дома за Вострай брамай каля рынку ў Вільні [1, с. 261]. Удзельнічаў у палітычным жыцці ВКЛ, будучы правай рукой Льва Сапегі, ваяводы віленскага, падтрымліваў яго партыю ў час бескаралеўя ў 1628 г. [61, s. 234]. Як ужо згадана, напрыканцы жыцця набыў маёнтак Солы за 60 тыс. польскіх злотых, дзе ўсяляк падтрымліваў касцёл. Памёр беспатомным.

Ян (?) Валентавіч Панятоўскі — намеснік Слонімскага павета жыў да 1632 г. Меў жонку Кацярыну Сулімоўскую. Больш звестак пра яго няма [50, s. 326]. Найменш вядомы з братоў Адам пакінуў трох сыноў — Мікалая, Крыштафа Лявона, Стафана і дачок Здзіславу і Крыстыну.

Мікалай Адамавіч, чашнік мазырскі ў 1650 г., жанаты на Эльжбеце Вейс, памёр беспатомным. Крыштаф Лявон Адамавіч, чашнік менскі

і зямянін Ашмянскага павета, змагаўся з маскавітамі ў вайне 1654–1667 гг., апынуўся ў палоне і там, верагодна, памёр да 1671 г. Стафан Адамавіч — езуіт у Солах у 1649–1657 гг. Здзіслава ў першым шлюбе за Жыгімонтам Воўкам, у другім — за Аляксандрам Ракоўскім.

Казімір Вінцэнт Панятоўскі, сын Крыштафа Лявона, пабраўся шлюбам з Іааннай Завішанкай, дачкой Яна і Канстанцыі Тышкевічаў, ваяводзянкай берасцейскай [53]. У 1663 г. Іаанна Завішанка Казіміравa Панятоўская згадваецца як удава [54]. Напрыканцы жыцця Мікалай Адамавіч з Панят Крапышоў Панятоўскі прадаў Дзякшняны і Урбаноўшчыну ў Мінскім ваяводстве Адаму і Сафіі з Храпавіцкіх Валадковічам [39, арк. 510]. На гэтым у канцы XVII ст. літоўская галіна Панятоўскіх герба «Юноша» згасае і звестак аб ёй у дакументах пазнейшага перыяду болей не сустракаецца.

Беларуская мсціслаўская галіна. *2-е калена. Радзіна Крыштафа Марцінавіча Панятоўскага.* Крыштаф Марцінавіч з'яўляецца прататпластай беларускай галіны роду Панятоўскіх. Як сказана вышэй, дзякуючы шлюбу ён апынуўся на ўсходніх землях ВКЛ, у Мсціслаўскім ваяводстве. Вёскі Вародзькаў, Забалацце, Вярхоўцы, Шумячы, пляцы ў Крычаве былі нададзены цесцю Крыштафа, зямяніну Якубу Рыбінскаму, у 1560 г. каралеўскім прывілеем [9, с. 103]. Не маючы сыноў, ён пакінуў іх сваім тром дочкам: Марфе, жонцы Крыштафа Панятоўскага, Улляне, жонцы Матыса Галімскага, і Фядоры, жонцы Фларыяна Козела, гараднічага ашмянскага [29, арк. 534–538]. З цягам часу ўся гэтая нерухомасць перайшла Панятоўскім. Цэнтрам уладанняў стала вёска Вародзькаў у Крычаўскім павеце, дзе жыў Крыштаф Марцінавіч Панятоўскі.

Крыштаф Марцінавіч пакінуў двух сыноў — Міхала і Марціна. У 1627 г. яны атрымалі каралеўскі прывілей ад Жыгімонта III Вазы на 20 валок пусташы кожнаму ў Смаленскім ваяводстве з загадам бараніць замак Смаленскі падчас небяспекі, што, хутчэй за ўсё, яны і рабілі ў 1632 г., калі маскоўскія войскі на чале з ваяводам Шэіным асадзілі горад [44, арк. 333 адв. — 334 адв.].

Міхал Крыштафавіч Панятоўскі, зямянін Браслаўскага павета, меў жонку з роду Урублеўскіх, дачку гараднічага мсціслаўскага Аляксандра Яна Урублеўскага і Ганны з Заблоцкіх. Міхал пакінуў трох сыноў і дачку.

Старэйшы сын Адам Якім, магчыма, з'яўляўся добра адукаваным у юрыдычных справах, бо згадваецца ў дакументах як паўнамоцны ў вырашэнні судовых спраў. Адам паступае ў ордэн кармелітаў босых, дзе пры пострыгу ў манаства атрымлівае духоўнае імя Аляксей. Менавіта ён разам з братам Аляксандрам Казімірам і сястрой Барбарай фундуе ў першай палове XVII ст. будаўніцтва з дрэва касцёла кармелітаў у Вародзькаве (касцёл праіснаваў да 1943 г., калі быў спалены немцамі разам з вёскай) [6, с. 169]. Трэба сказаць, што ў тыя часы ў шляхецкіх сем'ях

было пажадана, каб нехта з родных прысвячаў сваё жыццё Богу і адпаведна з цэлібатам–абетам бясшлюбнасці не пакідаў пасля сябе нашчадкаў. Адам застаўся ў гісторыі ордэна кармелітаў босых дзякуючы свайму лісту да генерала ордэна, дзе апісаў становішча на ўсходніх землях ВКЛ падчас маскоўскай вайны 1654–1667 гг. У 1682 г. жыў у Перамышлі, у кляштары кармелітаў босых, дзе, хутчэй за ўсё, і памёр [7].

Сярэдні сын Міхала Аляксандр Казімір Панятоўскі таксама стаў духоўнай асобай, ён вядомы як ксёндз-канонік і схаластык вендэнскі, камендант Віленскага фарнага касцёла, дэкан і плябан віленскі [2, с. 324–325].

Малодшы сын Міхала Крыштаф Багуслаў, канюшы і мастаўнічы мсціслаўскі, жыў да 1687 г., адзін з першых Панятоўскіх, хто атрымаў ганаровыя пасады ў Мсціслаўскім ваяводстве. Удзельнічаў у вайне 1654–1667 гг. З ім ваявалі ўсе дарослыя Панятоўскія: стрыечныя браты Крыштафа Багуслава Самуэль Міхал і Ян Марцінавічы Панятоўскія, траюрадныя браты Крыштаф Лявон і Мікалай Адамавічы Панятоўскія. Жывучы на памежжы з Маскоўскім княствам, яны першымі прынялі ўдар захопнікаў, сядзелі ў вязніцах, у казанскім палоне. Але гэта тэма асобнага апавядання, да якой мы яшчэ звернемся. Што ж тычыцца Крыштафа Багуслава, то ён, вярнуўшыся з вайны, збіраў сваіх прыгонных сялян, якія разбегліся па суседніх вёсках, у свой маёнтак Беліца. Быў жанаты на Еўфрасінні Ждановіч, брат якой Ігнаці Ждановіч, архімандрыт магілёўскі, дапамагаў ім у 1654 г. падчас вайны захаваць сямейныя каштоўнасці і маёмасныя дакументы ў Магілёўскім брацкім манастыры [2, с. 324–325]. Тэрэза, дачка ад гэтага шлюбу, у 1687 г. стала жонкай Стэфана Аляксандровіча, канюшага мсціслаўскага і лоўчага аршанскага. Пазней канца XVII ст. нашчадкі Міхала Крыштафавіча Панятоўскага ў дакументах болей не згадваюцца — яго лінія згасае.

3-е калена. Радзіна Марціна Крыштафавіча Панятоўскага. Марцін Крыштафавіч Панятоўскі меў трох сыноў Самуэля Міхала Крапыша Панятоўскага, мечнага мсціслаўскага, Яна Крапыша Панятоўскага, Станіслава Панятоўскага, ротмістра каралеўскага і дачку Марыну [2].

Самуэль Міхал Крапыш Панятоўскі, паводле інфармацыі А. Рахубы, быў на пасадзе мечніка мсціслаўскага з 1673 г., з'яўляўся дэпутатам Галоўнага Трыбунала ВКЛ у 1679 г. [8, с. 584; 55, арк. 1225–1232]. Удзельнічаў і меў «заслугі свае ў войску Кароны Польскай і ВКЛ. У рэбеліі [3] казацкай, а затым у вайне маскоўскай, а таксама шведскай, венгерскай і прускай ваяваў з нямалым коштам і здароўе сваё паклаў» [18, арк. 26].

---

[2] Прыдомак Крапыш мы дадаем да асоб, якія карысталіся ім, падпісваючыся ў юрыдычных дакументах. — *В. К.*

[3] Рэбелія (rebellio) — бунт, паўстанне, мяцеж. — *Рэд.*

Гэта азначае, што абарона Айчыны была для яго, як і для большасці літвінскай шляхты ў тыя цяжкія часы, галоўнай справай і доўжылася гэтая вайна для Самуэля з 1649 па 1667 г. Быў жанаты чатыры разы. Першая жонка, з роду Дубінскіх, згарэла з дачкой у Быхаўскім замку ў 1659 г. падчас бамбардзіроўкі маскоўцамі [52, s. 639–642]. Другая — Рэгіна Ждановіч, трэцяя — Кацярына Марцінаўна Война-Ясянецкая, чацвёртая — Ганна Катоўская. Памёр каля 1714 г.

Ян Марцінавіч Крапыш Панятоўскі, зямянін Мсціслаўскага ваяводства, пакінуў успаміны, апавядаючы аб сваім жыцці ў часы вайны з маскоўцамі перад палоннай шляхтай у Казані на так званым сойміку казанскім 1662 г. Першая жонка Лукрэцыя Марцінаўна Война-Ясянецкая знаходзілася разам з Янам і дзецьмі ў цяжкай асадзе ў Быхаўскім замку ў 1659 г. Там амаль цэлы год разам з месцічамі гераічна трымала абарону супраць рускіх войскаў навакольная шляхта. Пасля чарговай бамбардзіроўкі маскоўцамі Быхаўскай фартэцыі адна з гранат разбіла пабудову, дзе жылі Панятоўскія. Старэйшы іх сын разам са швагеркай і пляменніцай загінулі, згарэўшы ў агні. Лукрэцыя, моцна напалоханая, захварэла і памерла за дзень да ўзяцця замка рускімі войскамі. Гэта было 12 снежня 1659 г. [52, s. 639–642]. У другім шлюбе Ян Марцінавіч Панятоўскі быў жанаты з Еўфрасінняй Паўлаўнай Свянціцкай. Ён гераічна ўдзельнічаў у вайне 1654–1667 гг.: абараняў замкі ў Крычаве і Быхаве, вадзіў атрады на баявыя дзеянні пад Мсціслаў і Рослаў, біў казацкія атрады пад сваім маёнткам Вародзькаў, ваяваў на Дняпры пад Шкловам у 1654 г. У наступным годзе ўзяты ў палон рускім ваяводай князем Сямёнам Андрэевічам Урусавым падчас знаходжання ў сваім Здзітаўскім старостве, у двары Сакалова, разам з жонкай і дзецьмі [52, s. 639–642]. Пасля прысягі цару каля года жыў у Вародзькаве, выплачваючы рускай адміністрацыі значныя падаткі. Потым зноў уступіў у барацьбу з маскавітамі і пасля захопу імі Быхаўскага замка ў 1659 г. другі раз патрапіў у няволю. Пасля пратэкцыі знаёмых шляхцічаў са Смаленскага ваяводства, якія перайшлі на бок цара, яму даруюць жыццё і адпраўляюць у Казань [47; 52, s. 639–642].

Станіслаў Марцінавіч Панятоўскі, ротмістр каралеўскай харугвы, удзельнічаў пад кіраўніцтвам Іерамія Вішнявецкага, ваяводы рускага, у бітве войска Рэчы Паспалітай з казацка-татарскім войскам Багдана Хмяльніцкага пад Берастэчкам у 1651 г. Там і паклаў сваё жыццё ў баі з татарскімі харугвамі на вачах усяго войска і караля польскага і вялікага князя літоўскага Яна Казіміра [2, с. 324–325]. Згадваецца ў рамане Генрыка Сянкевіча «Агнём і мячом» [49, с. 242]. Нашчадкаў не пакінуў.

Марына Марцінаўна Панятоўская праз шлюб з Яраславам Падбярэзскім атрымала вёску Прусінава ў Мсціслаўскім ваяводстве [45, арк. 662], якая надалей стала яблыкам разладу паміж Панятоўскімі і Гедрой-

цамі. Гэта адбылося з той нагоды, што ў другім шлюбе Марына выйшла замуж за Самуэля Казіміра Фабіянавіча Гедройца, войскага мсціслаўскага, прыкладна каля 1657 г., аддаўшы яму ў якасці пасагу вёску Прусінава. Паводле тастамента Самуэль Казімір Гедройц быў пахаваны на Вародзькаўскіх могілках у 1687 г. У гэтым шлюбе нарадзіліся Дамінік Міхал Гедройц, стражнік мсціслаўскі, і дачка Алена [15, арк. 420–423а].

4-е калена. Радзіна Самуэля Міхала Марцінавіча Крапыша Панятоўскага. Самуэль Міхал Марцінавіч Крапыш Панятоўскі, мечны мсціслаўскі, меў трох сыноў і дачку.

Марцыян Казімір Самуэлевіч Панятоўскі, пісар гродскі, канюшы мсціслаўскі, чашнік смаленскі, палкоўнік літоўскі, дэпутат Галоўнага Трыбунала ВКЛ у 1692 г. [8, с. 584; 15, арк. 263]. Верагодна, удзельнічаў у бітве з туркамі пад Венай у 1683 г., у бітве пад Алкенікамі 18 лістапада 1700 г., узначальваў паспалітае рушанне Мсціслаўскага ваяводства ў рангу літоўскага палкоўніка. Будучы смяротна параненым, не выпусціў са сваіх рук харугву Мсціслаўскага ваяводства з выявай Пагоні, прамовіўшы баявым сябрам словы, якія ўвайшлі ў гісторыю: «Вазьміце яе з рук маіх пасля маёй смерці, але ні пры жыцці, мужная Літва даверылы мне гэту харугву, і я буду пры ёй да апошняй хвіліны» (Wezmiecie mi ja z rąk moich po mojej smierci, ale nie za życia: dzielna Litwa powierzyła mi tę chorągiew, i będę przy niej do ostatniej chwili!) [58, s. 252–253]. Загінуў у гэтым баі. Быў двойчы жанаты: першым шлюбам з Іаанай Дубінскай, другім — з Сюзанай Коцел. Нашчадкаў не пакінуў. Тастамент датуецца 1701 г. [17, арк. 263].

Тамаш Самуэлевіч Панятоўскі, чашнік мазырскі і смаленскі ў 1738 г. Уладзіслаў Юзаф Самуэлевіч Панятоўскі, пісар гродскі, канюшы, абозны мсціслаўскі. У першым шлюбе жанаты з Іаанай Сухадольскай, пісараўнай земскай мсціслаўскай, у другім — з Петрунелай Барташэвіч, пісараўнай гродскай аршанскай.

Дачка Іаана згадваецца ў 1690 г. як жонка скарбніка мазырскага Францішка Міхала Война-Ясянецкага [16, арк. 40].

4-е калена. Радзіна Яна Марцінавіча Крапыша Панятоўскага. Ян Марцінавіч Крапыш Панятоўскі меў ад першага шлюбу з Лукрэцыяй Марцінаўнай Война-Ясянецкай двух сыноў і дачку. Старэйшы сын, імя якога засталося невядомым, загінуў разам з маці ў асадзе Быхаўскага замка рускімі войскамі ў 1659 г. Другі сын Стэфан Дамінік Панятоўскі, стражнік мсціслаўскі, упамінаецца з 1687 г. Двума гадамі раней ён ажаніўся з Крыстынай Матушэвіч, дачкой мінскага чашніка Яна Матушэвіча, а ў гэтым годзе скасаваў шлюб. Памёр у 1703 г. ва ўласным фальварку Любуж каля Магілёва, які з'яўляўся пасагам яго маці Лукрэцыі Марцінаўны Война-Ясянецкай. Пахаваны на сямейных могілках у Вародзькаве. Яго сястра Ганна Янаўна Панятоўская ў першым шлюбе

за Янам Станіславам Свянціцкім, стражнікам мсціслаўскім, памерлым у 1690 г., у другім — за Паўлам Александровічам. Ад першага мужа мела сыноў Уладзіслава, Якуба, Лукаша, Сымона і дачку Рэгіну.

Рэгіна Свянціцкая, уступіўшы ў шлюб з мечным мсціслаўскім Лявонам Лапацінскім, нарадзіла сыноў Яна Дамініка Лапацінскага, каралеўскага капелана польскага караля і вялікага князя літоўскага Станіслава Ляшчынскага падчас яго знаходжання ў Круляўцы ў 1731 г., затым біскупа жмудскага ў 1762 г., Мікалая Тадэвуша Лапацінскага, ваяводу берасцейскага ў 1777 г., вялікага пісара ВКЛ у 1764–1777 гг., мсціслаўскага старасту ў 1757–1767 гг., Ігната Блажэя Станіслава Лапацінскага, скарбовага пісара ВКЛ з 1761 г.

Ад другога шлюбу Яна Марцінавіча Крапыша Панятоўскага з Еўфрасінняй Паўлаўнай Свянціцкай нарадзіліся тры сыны і дачка. Усе тры родныя браты былі на ваеннай службе ў літоўскіх краях, адкуль вярнуліся на малую радзіму ў дзедзічны маёнтак Вародзькаў у 1694 г. [40, арк. 299].

Мяркуючы па судовых дакументах мсціслаўскага гродскага і земскага судоў, браты Панятоўскія былі баявымі і адважнымі, вельмі падобнымі на знакамітых французскіх мушкецёраў з рамана Аляксандра Дзюма са знакамітым дэвізам: «Адзін за ўсіх і ўсе за аднаго!». Пасля іх вяртання з ваеннай службы ўся суседняя з уладаннямі Панятоўскіх мсціслаўская шляхта цяжка ўздыхнула: наезды, рабаванне, межавыя спрэчкі не давалі спакою Мілкевічам, Гедройцам, Дубейкоўскім і іншай мсціслаўскай шляхце.

Тым не менш, Антон Янавіч Панятоўскі займаў пасаду крайчага мсціслаўскага. Мсціслаўскім соймікам 1707 г. абраны разам з Янам Конвідам Жукоўскім камісарам ад Мсціслаўскага ваяводства па зборы падаткаў на правіянт для рускага войска падчас Паўночнай вайны [19, арк. 98–99]. Варта прыгадаць адзін прыклад той працы.

Паводле сведчання Яна Відуна Дубейкоўскага 1 ліпеня 1707 г. камісары Антон Панятоўскі з Янам Жукоўскім у доме Дубейкоўскага пасля добрага застолля адабралі ў небаракі 2 тысячы злотых сярэбранымі капейкамі з запазухі, пры гэтым збілі і аддалі маскоўскім стражнікам гаспадара гасціннай хаты. Даведаўшыся пра здарэнне, староста жмудскі Рыгор Антон Агінскі, які на той час узначальваў войска ВКЛ у Мсціслаўскім ваяводстве, праз рускага генерала Баўэра аддаў пацярпеўшаму Дубейкоўскаму 1200 злотых і даў дазвол на арышт камісараў. Відаць, па той прычыне, што збор падаткаў праходзіў не заўсёды на законнай падставе, у Антона з'явілася шмат нядобразычліўцаў. Верагодна, у выніку гэтага ён быў забіты стрэламі з пісталета ў галаву ў сваім маёнтку Вародзькаў 8 ліпеня 1708 г. Па сведчанні яго роднага брата Паўла Панятоўскага, які аказаўся параненым падчас нападу, нападзенне ўчыніў іх

пляменнік Дамінік Міхал Гедройц, стражнік мсціслаўскі, разам з Аляксандрам Падбярэзскім і Самуэлем Тэадоравічам Кучуком [20, арк. 137–138]. У 1710 г. мсціслаўскі гродскі суд асудзіў на смерць праз меч ката Аляксандра Падбярэзскага і Самуэля Кучука, а вось Дамініку Міхалу Гедройцу ўдалося пазбегнуць пакарання, пераклаўшы ўсю адказнасць за забойства на сваіх таварышаў [21, арк. 181–186]. З гэтага часу пачалася сапраўдная вайна паміж мсціслаўскімі Панятоўскімі і Гедройцамі, аб чым будзе апісана ніжэй.

Другі сын Яна Марцінавіча Крапыша ад шлюба з Еўфрасінняй Паўлаўнай Свянціцкай Павел Панятоўскі, стражнік і ротмістр мсціслаўскі з 1710 г. [21, арк. 288], пасля смерці брата Антона заняў галоўнае месца ў сямейнай іерархіі Панятоўскіх. Гэтаму спрыяў і яго выгодны шлюб з Тэрэзай Камінскай, дачкой Міхала Яна Камінскага, кашталяна мсціслаўскага. Помсцячы за брата Антона сапраўднаму забойцу Дамініку Міхалу Гедройцу, ён у 1713 г. завабіў апошняга ў свой маёнтак Вародзькаў і пад пагрозай смерці забраў у яго аблігі (грашовыя распіскі) магілёўскага кагала на 250 талераў, аблігі Адама Дароўскага на 1500 злотых, права на вёску Дамброва як пасаг памерлай Марыны Панятоўскай Самуэлевай Гедройцавай, цёткі Паўла Панятоўскага і маткі Дамініка Гедройца, а таксама права на вёску Прусін. Усёй сумы набралася 12 000 тысяч злотых. У дадатак забрана ўсё золата і грошы, якія былі ў кішэнях Дамініка. Цікава, што ў якасці пагрозы Павел Панятоўскі абяцаў пасадзіць усю сям'ю Гедройцаву «з днеўнага набажэнства і аж да самай смерці ў вежу незвычайную пры касцёле Вародзькаўскім збудаваную, што не сумяшчальна з правам паспалітым» [22, арк. 110]. Відаць, званіца, пабудаваная побач з Вародзькаўскім касцёлам кармелітаў, выконвала ролю вязніцы для нядобразычліўцаў Панятоўскіх. Пра тое, што вера не надта стрымлівала пачуцці Панятоўскіх, сведчаць падзеі, якія адбыліся ў 1744 г., калі сын Паўла, на той час ужо нябожчыка, Францішак Панятоўскі разам з ксяндзом вародзькаўскім Пяндзевічам, узброеныя шаблямі, напалі прама ў касцёле, падчас святой імшы на Марціяна Падбярэзскага, «акрывавіўшы касцёл» [27, арк. 685–700].

Іншыя судовыя цяжбы з 1724 г. Павел Панятоўскі вёў з Ганнай з Любартаў Сангушкаў, старасцінай крычаўскай, жонкай Караля Станіслава Радзівіла, зноў-такі за грахі нябожчыка брата Антона, які ў 1708 г. у Крычаўскім старостве забраў у Радзівілаў у якасці правіянту лішніх 17 коней [23, арк. 382]. У 1738 г. адбыліся першыя судовыя сутычкі Паўла Панятоўскага з графам Ежы Флемінгам, старастам магілёўскай эканоміі, з нагоды межавых пытанняў і выкраданняў сялян [25, арк. 111]. Спрэчкі з гэтым чалавекам вельмі дорага каштавалі і ў будучым трагічна адбіліся на лёсе дзяцей Паўла. Памёр Павел Панятоўскі да 1743 г.

Трэці сын Яна Марцінавіча Крапыша Панятоўскага ад другога шлюбу — Міхал Панятоўскі.

Памёр Ян Марцінавіч Крапыш Панятоўскі да 1685 г.

5-е калена. Радзіна Паўла Янавіча Крапыша Панятоўскага стражнага мсціслаўскага. Павел Панятоўскі, стражны мсціслаўскі, у шлюбе з Тэрэзай Камінскай, кашталяніцай мсціслаўскай, меў пяць сыноў (Антона, Якуба, Францішка, Тадэвуша, Рафала) і трох дачок (Марыянну, Бенедыкту і Ганну). Старэйшы сын Антон Панятоўскі пасля смерці бацькі дадаў да свайго прозвішча радавы прыдомак Крапыш і ўзваліў на свае плечы цяжар бацькоўскіх праблем. Вялікая сям'я Паўла Панятоўскага была такая ж згуртаваная і загартаваная, крымінальная і рашучая, як і братэрскі саюз іх бацькі Паўла Панятоўскага з роднымі братамі Антонам і Міхалам. Гісторыя сям'і пад кіраўніцтвам маці Тэрэзы з Камінскіх Панятоўскай і яе старэйшага сына Антона нагадвае безупынныя ваенныя дзеянні супраць навакольнай мсціслаўскай шляхты. Дэкрэт мсціслаўскага кампрамісарскага суда 1750 г., у якім прадстаўнікі шляхецкіх сем'яў Мількевічаў, Падбярэзскіх, Глінкаў, Каспяровічаў і інш. распавядаюць пра «подзвігі» Панятоўскіх, дае ўяўленне пра тыя падзеі. Так, натоўп у некалькі дзясяткаў сялян, узброеных бердышамі, шаблямі, пісталетамі, пад кіраўніцтвам Антона, Якуба і Францішка Панятоўскіх, збівалі людзей, якія сабраліся на Вародзькаўскіх могілках падчас святкавання дня памяці Святога Юрыя. Падчас рабавання чужых сенажацяў у 1745 г. адбылося забойства Антона Германавіча Каспяровіча, судзіча гродскага мсціслаўскага. Таксама Антон і Францішак Панятоўскія знялі вялікі звон з Вародзькаўскай царквы Святой Параскевы і перацягнулі ў свой касцёл [27, арк. 685–700]. Гэта толькі няпоўны пералік усяго ўчыненага імі крыміналу.

Тым не менш, забойства шляхціча Антона Каспяровіча спісалі на падданага сям'і Панятоўскіх Ваську Маскаля, які, прыгавораны на смерць праз меч ката, збег з вародзькаўскай плябані, дзе павінен быў спавядацца перад стратай. Хутчэй за ўсё гэта стала магчымым пры дапамозе саміх Панятоўскіх, якія ўгаварылі яго ўзяць адказнасць на сябе. Кампрамісарскі суд загадаў звольніць баявога ксяндза і плябана вародзькаўскага Пяндзевіча за напады з шабляй на прыхаджан у касцёле, вымусіў Панятоўскіх аддаць захопленыя сенажаці і заплаціць 450 талераў пакрыўджаным суседзям — Дэвіцам, Мількевічам, Падбярэзскім, Суражам, Окалам. Абвінавачаным Антону, Якубу і Францішку Панятоўскім належала прасядзець шэсць тыдняў у вежы мсціслаўскага замка [27, арк. 685–732 адв.].

Але мяккасць прысуду не падзейнічала на зухаватых братоў Панятоўскіх. На пачатку 1750-х гг. падросшы і ўступіўшы ў паўналецце Рафал Панятоўскі стварае банду рабаўнікоў, у якую ўваходзяць каля дзя-

сятка падданых сялян і некалькі сяброў-шляхцічаў. Ад простых нападаў на шляхту і рабавання сена ў суседзяў яны пераходзяць да нападаў на купцоў на дарогах (купцамі ў тыя часы былі ў асноўным габрэі). У мэтах канспірацыі Рафал з паплечнікамі апраналіся ў сялянскія світкі і шапкі, пэцкалі твары сажай і, робячы засады на тарговых шляхах, рабавалі габрэйскіх негацыянтаў. Асабліва багатым на крымінальныя напады банды Рафала Панятоўскага быў 1759 г.: тут і напад з лясной засады на старазаветных дрыбінскіх габрэяў, якія ехалі з таварамі на кірмаш, і кража шасці коней у Антона Закамінскага з пагоняй і стралянінай з пісталетаў, і напад на карчму і млын габрэя- арандатара са збіццём яго і жонкі. Апошняй кропляй стаў напад уначы 26 чэрвеня 1759 г. на мсціслаўскі юбілейны дом, дзе начавалі людзі, якія прыехалі за пакупкай збожжа ў Мсціслаў. Пераапранутыя ў сярмягі і магеркі, з вымазанымі сажай тварамі рабаўнікі ўварваліся і пачалі катаваць агнём і мучыць шляхцічаў, забіраць усё, што толькі можна было згрузіць на раней падрыхтаваныя вазы. Усяго было забрана грошай і тавараў на 60 000 злотых. Пасля жаўнеры пад кіраўніцтвам паручніка каралеўскай гвардыі Аляксандра Шпілоўскага і Тадэвуша Пятроўскага арыштавалі злачынцаў.

Суд над імі атрымаў грамадскі рэзананс — у Мсціславе сабраліся ўсе пакрыўджаныя. Бок габрэяў магілёўскай эканоміі прадстаўляў намеснік магілёўскага староства той самы граф Ежы Флемінг, які ўжо доўгія гады вёў судовыя спрэчкі з сям'ёй Панятоўскіх. Флемінг выкарыстаў слушны момант напоўніцу. Суд вынес максімальны прысуд, абапіраючыся на 11-ы раздзел, 31-ы артыкул, І параграф Статута ВКЛ 1588 г. і канстытуцыю 1609 г., якія прадпісвалі за забойства шляхціча смяротнае пакаранне.

21 ліпеня 1759 г. мсціслаўскі гродскі суд пастанавіў асудзіць на смерць праз расстрэл стражніковіча мсціслаўскага Рафала Панятоўскага, Рыгора Валужыніча Гузіка, Францішка Дабжанскага і Марціна Кашко, праз чвартаванне і ўзбіццё на палі працавітых Данілку Васілёвага і Янку Маргуна Ступака. 23 ліпеня Рафал Панятоўскі быў расстраляны. Прысуд вынес інстыгатар ВКЛ, суддзя гродскі мсціслаўскі Мікалай Тадэвуш Лапацінскі. Будучы дваюрадным дзядзькам Рафала сваім прысудам ён увайшоў у гісторыю юрыспрудэнцыі ВКЛ як справядлівы і непадкупны суддзя.

Трэба дадаць, што гэтая гучная справа не абышлася без рэлігійнага дапаўнення. Саўдзельнік Панятоўскага Себасцьян Галкоўскі быў абвінавачаны ў чарадзействе. Ён у змове з вародзькаўскім млынаром Грышкам Івашкам, які навучыў Галкоўскага д'ябальскім навукам, узяўшы з хаты забалоцкага падданага абраз Найсвяцейшай Панны, насіў яго на некалькі дзён у лес на балота. Верагодна, дадзены факт з'явіўся дадатковай падставай для вынясення вельмі жорсткага прысуду па справе

Панятоўскага і яго шайкі. Дарэчы, суд спагнаў з сям'і Рафала 58 500 злотых на пакрыццё страт і 1000 злотых на мсціслаўскі гарнізон [30, арк. 135–168].

Пасля такой жыццёвай драмы Тэрэзу Панятоўскую і яе дзяцей напаткаў яшчэ адзін цяжкі ўдар — 24 сакавіка 1764 г. быў зверскі забіты другі яе сын Якуб Панятоўскі разам з Юзафам Краеўскім і слугамі Грышкам, конюхам, і Кузьмой, пахолкам. Як высветлілася пазней, гэта была помста магілёўскіх габрэяў.

Малодшы сын Тадэвуш Панятоўскі стаў ксяндзом, канонікам жмудскім.

5-е калена. Радзіна Уладзіслава Юзафа Самуэлевіча Панятоўскага. Уладзіслаў Юзаф Самуэлевіч Панятоўскі, пісар гродскі, канюшы, абозны мсціслаўскі пражываў у сваім маёнтку Злочаў у Мсціслаўскім ваяводстве, меў трох сыноў і трох дачок. Ад першага шлюбу з Іаанай Сухадольскай, дачкой Ежы Войцаха Сухадольскага, суддзі гродскага і пісара земскага мсціслаўскага, нарадзіўся Ежы Антоні Панятоўскі, падстолі старадубскі, канюшы і скарбнік мсціслаўскі, харунжы пяцігорскі. Ад другога шлюбу з Пятрунелай Барташэвіч, пісароўнай гродскай аршанскай, нарадзіліся сыны Нікадэм Тадэвуш і Казімір, дочкі Гелена (у 1727 г. упамінаецца як жонка Антона Скоркі, мечніка мазырскага), Уршула (у 1738 г. упамінаецца як жонка Сымона Яранды) і Рэгіна. Нікадэм Тадэвуш Панятоўскі вядомы як пісар гродскі, чашнік мсціслаўскі, паручнік пяцігорскі знака кашталяна кракаўскага Станіслава Цёлка Панятоўскага (бацькі будучага караля), а таксама стараста ўшпольскі, забычанскі і мурынборскі.

Бацька Уладзіслаў Юзаф Панятоўскі даў свайму старэйшаму сыну Ежы Антонію добрае выхаванне і адукацыю. Ён уладкаваў яго пры каралеўскім двары Аўгуста II, даўшы свае рэкамендацыі. Падчас ваеннай службы сына аплаціў яму пошту з трох коней, адзенне, зброю, пахолкаў. Усіх выдаткаваў на выправу, і жыццё сына пры двары бацька налічыў 25 000 польскіх злотых.

Але як відаць з бацькоўскай скаргі ў мсціслаўскі гродскі суд у 1739 г., Ежы Панятоўскі аказаўся не вельмі ўдзячным сынам, бо ажаніўся без бацькоўскага бласлаўлення з Тэкляй з Глінкаў. Акрамя гэтага, здзейсніў цяжкае злачынства супраць сваёй мачыхі Пятрунелы з Барташэвічаў. У 1723 г. з натоўпам сваіх людзей ён наляцеў на двор Вярхоўцы ў Мсціслаўскім ваяводстве, дзе жыла мачыха, цалкам яго разрабаваўшы. Пакалечаная жанчына ў хуткім часе памерла, пакінуўшы чатырох непаўналетніх дзяцей [26, арк. 1252–1255]. Адносіны з бацькоўскай сям'ёй былі на гэтым скончаны. Але знаходжанне пры каралеўскім двары дало пэўныя знаёмствы з уплывовымі людзьмі таго часу, пра што сведчыць вельмі прыязны ліст Станіслава Цёлка Панятоўскага, падскарбія і піса-

ра земскага ВКЛ, да Ежы Антонія Панятоўскага, двараніна скарбовага ВКЛ, які датуецца 1724 г. [23, арк. 612]. Забягаючы наперад, дапоўнім, што пратэкцыя каралеўскага двара адчувалася і ў лёсе яго сына Францішка Панятоўскага, скарбніка мсціслаўскага і суддзі гродскага пінскага ў 1786–1791 гг., які атрымаў тытул скарбніка дзякуючы бацькоўскім заслугам і якога асабіста наведваў кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі падчас свайго падарожжа па Палессі [46, с. 130]. Жонка Ежы Панятоўскага Тэкля з Глінкаў памерла ў 1770 г. і пахавана ў мсціслаўскім касцёле кармелітаў. У сваім тастаменце яна загадала даць 500 злотых на пахаванне і 500 злотых на імшу. Сынам Францішку, скарбніку мсціслаўскаму, Марціну, гараднічаму мсціслаўскаму, і Дзіянізію, паручніку каралеўскай гвардыі, аддала сяло Вялікі Злочаў. Для дачкі Багумілы маці вылучыла 7000 злотых на пасаг [35, арк. 73].

Сын ад другога шлюбу Уладзіслава Юзафа Самуэлевіча Панятоўскага з Пятрунелай Барташэвіч Нікадэм Тадэвуш Панятоўскі, пісар гродскі, чашнік мсціслаўскі, увайшоў у гісторыю Рэчы Паспалітай як душыцель буйнога ўзброенага выступлення сялян у сярэдзіне XVIII ст. у Мазырскім павеце, ва ўладанні віленскага капітула Каменшчына. У 1756 г. па загаду вялікага гетмана ВКЛ Міхала Казіміра Радзівіла Рыбанькі ўзброены атрад у колькасці 400 чалавек (гусары, лёгкая конніца, пяхота і артылерыя) пад кіраўніцтвам Нікадэма Тадэвуша Панятоўскага разбіў пад Славечна атрад паўстанцаў у колькасці некалькіх тысяч сялян, а пасля жорстка расправіўся з кіраўнікамі паўстання — чатырох чалавек пасадзілі на пáлі, дзесяць прывязалі да гарматаў і адправілі ў Нясвіж на суд да Радзівіла [10, с. 257–258].

За гэтую перамогу Нікадэм Тадэвуш Панятоўскі атрымаў добрыя прэферэнцыі ад князя Радзівіла. Пасля смерці ў 1759 г. яго жонка Францішка са Скоркаў Панятоўская (па першым мужы Макавецкая), памiраючы, у сваім тастаменце прызначыла Міхала Казіміра Радзівіла Рыбаньку, ваяводу віленскага, гетмана ВКЛ, разам з Міхалам Сапегай, падканцлерам ВКЛ, і Мікалаем Лапацінскім, старастай мсціслаўскім, апекуном сваіх дзяцей. Як відаць з далейшага, гэтыя пратэкцыі дапамаглі ім.

Пахаваны Нікадэм Тадэвуш Панятоўскі разам з жонкай Францішкай са Скоркаў Панятоўскай у сваім маёнтку Малятычы ў Мсціслаўскім ваяводстве, у скрыпце малятыцкага касцёла дамініканаў [31, арк. 7].

5-е калена. Радзіна Міхала Янавіча Панятоўскага. Міхал Янавіч Панятоўскі ў шлюбе з Геленай Сухадольскай, дачкой Аляксандра і Антаніны са Скірмунтаў Сухадольскіх, нарадзілі трох сыноў — Станіслава, чашніка люблінскага, дэпутата Галоўнага Трыбунала ВКЛ ад Смаленскага (у 1744 г.) і Мсціслаўскага (у 1753 г.) ваяводстваў [51, s. 201, 237], Пятра, Міхала, ксяндза ордэна Святога Францішка, і трох дачок — Тэрэзу (замужам за Аляксандрам Гурскім, стражнікам троцкім), Каця-

рыну (на момант 1722 г. замужам за Казімірам Тамковічам, чашнікам віленскім) і Феафілію (замужам за Длускім).

Міхал Панятоўскі, акрамя ўладанняў у Мсціслаўскім ваяводстве, валодаў сялом Матчын, другая назва Панятоўшчына, у Люблінскім ваяводстве. Пасля смерці ў 1740 г. яно перайшло яго сынам. Затым Пётр і ксёндз Міхал Панятоўскія аддалі свае долі брату Станіславу Панятоўскаму, чашніку люблінскаму. У 1754 г. перад смерцю (адбылася да 1756 г.) Станіслаў Панятоўскі прадаў сяло Матчын сваёй сястры і шурыну Аляксандру і Тэрэзе з Панятоўскіх Гурскім за 20 000 злотых. Да шлюбу з Кларай з Вялічкаў Станіслаў Панятоўскі жыў у Кароне Польскай і служыў у войску пад пяцігорскім знакам кашталяна кракаўскага Станіслава Панятоўскага. Пасля шлюбу яны з жонкай стала жылі ў сваім маёнтку Вержба ў Мсціслаўскім ваяводстве [28, арк. 23].

5-е калена. Радзіна Стэфана-Дамініка Янавіча Панятоўскага. Стэфан- Дамінік Панятоўскі, стражнік мсціслаўскі, з 1685 г. быў у шлюбе з Крыстынай Матушэвіч, дачкой Яна Матушэвіча, чашніка менскага. Паводле ўспамінаў Марціна Матушэвіча, пісара гродскага берасцейскага, унука Яна Матушэвіча, гэты шлюб скончыўся разводам, пасля якога Крыстына яшчэ двойчы выходзіла замуж і памерла бяздзетнай. Стэфан Дамінік, паміраючы ў сваім маёнтку Любуж пад Магілёвам у 1703 г., згасаючы літаральна за некалькі дзён, у сваім тастаменце перапісаў фальварак Любуж і 10 000 злотых магілёўскім езуітам у асобе ксяндза ордэна Паўла Радзіевіча, які знаходзіўся пры паміраючым і, відаць, спавядаў яго перад смерцю. Сенажаці над Дняпром дасталіся магілёўскім бернардзінам, чацвёртая частка вёсак Шумячы і Панятоўка ў Мсціслаўскім ваяводстве — мсціслаўскім кармелітам, яшчэ адна чацвёртая частка гэтых вёсак — братам Міхалу, Паўлу і Антону Панятоўскім, юрыдыкі ў Магілёве — пляменнікам і пляменніцам [42, арк. 411–413].

Тэрмінова прыбыўшыя з Вародзькава, браты Павел і Антон забралі цела памерлага Стэфана Дамініка і згодна з яго апошняй воляй завезлі і пахавалі на малой радзіме пры вародзькаўскім касцёле кармелітаў на сямейных могілках. Пасля яны некалькі гадоў вялі барацьбу з магілёўскімі езуітамі за фальварак Любуж, сцвярждаючы, што тастамент напісаны не паміраючым Панятоўскім, а самімі езуітамі [36, арк. 970]. У рэшце рэшт, гэты фальварак застаўся ў руках вародзькаўскіх Панятоўскіх.

Як вынікае з тастамента, Стэфан Дамінік Панятоўскі напрыканцы жыцця апынуўся без сям'і і дзяцей. Аднак праз дваццаць гадоў у гісторыі і генеалогіі мсціслаўскай галіны роду з'яўляецца Базыль Панятоўскі. Сваім бацькам ён называе Стэфана Дамініка, стражніка мсціслаўскага, які ў 1700 г. набыў маёнтак Суцін у Менскім ваяводстве і запісаў яго на Базыля [14, арк. 308–308 адв.].

Адным з галоўных аргументаў, якія прыводзяць нашчадкі Базыля Панятоўскага пры падачы дакументаў на пацвярджэнне шляхецтва ў 1825 г., з'яўляецца тое, што Базыль — хросны сын Тэафілы Чартарыйскай, жонкі князя Рыгора Антона Агінскага. Менавіта яна ў сваім тастаменце ад 15 лістапада 1718 г. перапісвае падараваную свайму хрэсніку Базылю Панятоўскаму ў пажыццёвае валоданне вёску Крывалі ў Менскім ваяводстве з дзесяццю сялянскімі дварамі яго сыну Яну Базылевічу Панятоўскаму. 12 лютага 1747 г. возны Менскага ваяводства Міхал Казарын робіць юрыдычны ўвод новага гаспадара ва ўладанне (інтрамісія. — *В. К.*). Згаданы дакумент актыкаваны ў судзе Галоўнага Трыбунала ВКЛ 23 лютага 1748 г. [13, арк. 64–64 адв.].

Чаму хросная маці Базыля Панятоўскага — менавіта Тэафіла з Чартарыйскіх Рыгоравая Агінская? Яе муж князь Рыгор Антон Агінскі (1665–17.10.1709), вялікі харужы і гетман польны, узначальваў канфедэрацыю шляхты ВКЛ ва ўзброенай барацьбе супраць Сапегаў у 1697–1702 гг. Пад яго кіраўніцтвам адбылася перамога ў бітве пад Алькенікамі 18 лістапада 1700 г. У гэтай бітве, згодна з гісторыяй князёў Агінскіх, напісанай Леанардам Ходзькам, удзельнічалі Павел і Антон Панятоўскія, іх дваюрадны брат ужо згаданы Марцыян Казімір Панятоўскі, які будучы цяжка параненым да самай смерці не выпускаў з рук харугву Мсціслаўскага ваяводства з выявай Пагоні [58, s. 250]. Хутчэй за ўсё ў паспалітае рушанне ад Мсціслаўскага ваяводства выступілі і іншыя браты Паўла і Антона Панятоўскіх, а менавіта родныя Міхал і стражнік мсціслаўскі Стэфан Дамінік, прафесійныя вайскоўцы таго часу, якія да гэтага ўжо адслужылі ў каралеўскім войску. Вынікае, што князь Рыгор Антон Агінскі як стараста мсціслаўскі добра ведаў гэтую сям'ю.

Сярод дакументаў, прадстаўленых нашчадкамі Базыля Панятоўскага ў 1825 г.: купчая на маёнтак Суцін ад 9 сакавіка 1700 г., актыкаваная ў Галоўным Трыбунале ВКЛ Менскага ваяводства 4 красавіка 1702 г. [14, арк. 307–307 адв.], тастамент Базыля з Суціна Панятоўскага [4], складзены 7 студзеня 1768 г. [14, арк. 308–308 адв.].

Першы шлюб Базыля з Суціна Панятоўскага заключаны з Еўфрасінняй Пашкоўскай, другі — з Рэгінай з Барэйшаў. Дарэчы, і Пашкоўскія, і Барэйшы жылі побач з Панятоўскімі ў Мсціслаўскім ваяводстве. Магчыма, з часам будуць адшуканы іншыя дакументы, якія змогуць дадаткова асвятліць ступень роднасці Стэфана Дамініка і Базыля Панятоўскіх, але, тым не менш, з 1700 г. у Менскім ваяводстве ВКЛ вядзе свой адлік галіна зямяніна Базыля з Суціна Панятоўскага герба «Юноша».

6-е калена. Радзіна Ежы Антонія Уладзіслаўлевіча Панятоўскага. Ежы Антоні, сын Уладзіслава, Панятоўскі, скарбнік і канюшы мсціслаў-

---

[4] Так ён падпісваўся ў дакументах. — В. К.

скі, падстолі старадубскі, харужы пяцігорскі, стараста ўшпольскі, дэпутат Галоўнага Трыбунала ВКЛ ад Мсціслаўскага ваяводства ў 1730 г. [51, s. 149], у шлюбе з Тэкляй Глінкай меў дзяцей — Францішка, Марціна, Дзіянізія і Багумілу. Старэйшы сын Францішак, дзякуючы бацькоўскаму аўтарытэту, атрымаў у 1763 г. каралеўскі прывілей ад Аўгуста III на скарбніцтва мсціслаўскае: «…зважаючы на заслугі Ежы Антонія Панятоўскага, скарбніка Мсціслаўскага ваяводства, на сына яго, Францішка Панятоўскага, перавесці скарбніцтва і каб яго за праўдзівага і актуальнага скарбніка мсціслаўскага ведалі…» [32, арк. 163].

Знаёмства Ежы Антонія Панятоўскага са Станіславам Цёлкам Панятоўскім, як ужо адзначалася, спрыяла кар'ернаму росту яго сыноў. Так, пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай і адыходу Мсціслаўскага ваяводства ў 1772 г. да Расійскай імперыі Францішак Панятоўскі, скарбнік мсціслаўскі, у 1784–1791 гг. знаходзіўся на пасадзе гродскага і земскага суддзі Пінскага павета, з'яўляўся кавалерам ордэна Святога Станіслава. Падчас падарожжа на пінскае Палессе ў верасні 1784 г. кароль польскі і вялікі князь літоўскі Станіслаў Аўгуст Панятоўскі наведаў Францішка Панятоўскага, суддзю гродскага пінскага, у яго маёнтку Альбрэхтава пад Пінскам, дзе апошні паказаў каралю рачное судна, зробленае з дубу, для перавозкі грузаў у разрэзе. Трэба адзначыць, што цікавасць караля да гэтых палескіх караблёў узнікла пасля таго, як у 1784 г. пінскі суддзя Матэвуш Бутрымовіч адправіў па толькі што збудаваным Мухавецкім канале 10 судоў з таварамі мясцовай натуральнай гаспадаркі (мёд, сала, сушаныя грыбы і рыба), якія паспяхова даплылі да самага каралеўскага замка ў Варшаве і вельмі ўразілі Станіслава Аўгуста Панятоўскага, зрабіўшыся і верагоднай прычынай візіту караля ў Пінск [46, с. 126, 130].

Другі сын Марцін Панятоўскі, гараднічы мсціслаўскі, ротмістр, дэпутат Галоўнага Трыбунала ВКЛ у 1766–1767 гг. [51, s. 290]. У 1769 г. ён сапернічае з Янам Непамуцэнам Ціханавецкім за пасаду пісара земскага Мсціслаўскага ваяводства. Галасаванне адбывалася тры разы. У выніку Ян Непамуцэн Ціханавецкі набраў 174 галасы, а Марцін Панятоўскі — 43 [41, арк. 97].

Трэці сын Дзіянізій Панятоўскі дайшоў па службовай лесвіцы ад паручніка каралеўскай гвардыі ў 1770 г. да генерал-маёра коннай гвардыі каронных войск у 1794 г. Пасля апошняга падзелу Рэчы Паспалітай у 1797 г. знаходзіўся ў свіце караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага, ганарова сасланага ў Санкт-Пецярбург. Двойчы прымаў прысягу расійскаму трону — Паўлу I і Аляксандру I. Пасля смерці Станіслава Аўгуста Панятоўскага пераехаў у Гродна, дзе і памёр, пакінуўшы пасля сябе трох малалетніх дзяцей: Крыштафа, які пазней падаваў прашэнне на пацвярджэнне шляхецтва ў 1818 г., Дзіянізія і Андрэя. Апекунамі былі

прызначаны родны брат суддзя гродскі пінскі Францішак Панятоўскі і рускі граф Ілля Безбародка. З нерухомасці меў вёску Валымеж у Мсціслаўскім ваяводстве, набытую ў 1765 г. [34, арк. 85], частку сяла Вялікі Злочаў Мсціслаўскага ваяводства, спадчыну па маці, і пляц у Гародні, дзе знаходзіліся крама і палова мураванай стайні, купленыя ў 1794 г. [11, арк. 106].

6-е калена. Радзіна Нікадэма Тадэвуша Уладзіслаўлевіча Панятоўскага. Нікадэм Тадэвуш Уладзіслаўлевіч Панятоўскі, пісар гродскі, чашнік мсціслаўскі, паручнік пяцігорскі, знака кашталяна кракаўскага, стараста ўшпольскі, забычанскі, мурынборскі, у шлюбе з Францішкай са Скоркаў меў чатырох сыноў — Аляксандра, Ігнацыя Юзафа, Яна Ксаверыя і другога Юзафа.

Аляксандр, стараста ўшпольскі, суддзя каптуровы мсціслаўскі ў 1764 г., жыў у сваёй дзедзічнай маёмасці Ушполле, у Мсціслаўскім ваяводстве. 7 лістапада 1764 г. на мсціслаўскім сеймiку разам з Антонам Ціханавецкім абраны паслом ад Мсціслаўскага ваяводства на каранацыйны сойм у Варшаве, дзе ўдзельнічаў у каранацыі караля польскага і вялікага князя літоўскага Станіслава Аўгуста Панятоўскага [33, арк. 1007–1009]. Пасля інкарпарацыі Мсціслаўскага ваяводства ў Расійскую імперыю ў 1790 г. займаў пасаду пракурора Магілёўскага земскага суда.

Ігнацы Юзаф (1707–1796?), генерал і кавалер ордэна Святога Станіслава. Знаходзячыся напачатку 1764 г. у чыне паручніка аўстрыйскіх войскаў [33, арк. 198], робіць імклівую кар'еру, ужо праз год стаўшы генерал- ад'ютантам войскаў ВКЛ. Пасля перасяляецца на Украіну, дзе хутка набывае значную колькасць вёсак і закладае вельмі заможную ўкраінскую галіну Панятоўскіх, якую С. Урускі адносіць да Панятоўскіх герба «Цёлак». У 1750 г. Ігнацы Юзаф Панятоўскі становіцца чашнікам жытомірскім, у 1787 г. харужым люблінскім. Першая жонка з Маркоўскіх была бяздзетная, другая — Ганна з Яксаў Малахоўская (1748–1836), выходзячы за Ігнацыя замуж у 1761 г., прыўнесла ў скарбонку мужа пасаг у памеры 30 000 злотых [56, s. 426].

6-е калена. Радзіна Базыля з Суціна Стэфанавіча Панятоўскага. Суцінская галіна. Базыль з Суціна Панятоўскі, сын Стэфана, зямянін Менскага ваяводства, знаходзіўся ў шлюбе двойчы. У другім шлюбе з Рэгінай Барэйшай, у першым шлюбе з Міхаловай Пашкоўскай меў трох сыноў — Дамініка, Яна і Міхала.

Дамінік узяў шлюб з Даротай Выганоўскай.

Ян, дваранін каралеўскі, па загаду караля Аўгуста III у красавіку 1753 г. павінен быў праверыць Свірскае староства па прычыне скаргаў мясцовых сялян аб завышаных падатках, усталяваных тагачасным яго ўладальнікам Антонам Сакульскім, мечнікам ВКЛ. Затым згадваецца як уладальнік часткі дзедзічнай маёмасці Суцін Менскага ваяводства, а з

1747 г. вёскі Крывалі ў Менскім ваяводстве [13, арк. 64–64 адв.]. Памі-раючы каля 1767 г., Ян з Суціна Панятоўскі пакінуў пасля сябе жонку Марыяну з Нядведскіх і пяць сыноў: 1) Гераніма (1759–1799); 2) Яку-ба (1764–1813), арандатара фальварка Астраўкі князя Дамініка Радзі-віла, жанаты на Ганне Абрамовіч; 3) Людвіка (1765–1799), стражніка філіі Скарбу ВКЛ у Талачыне; 4) Антона (1767–05.01.1830), жанатага на Петранелі Аляшкевіч; 5) Міхала (пам. 1813), жанатага на Эльжбеце Скіндзер.

Міхал Юзаф з Суціна Панятоўскі (пам. 09.06.1767) упамінаецца ў спісе «патрыётаў» (грамадзян. — *В. К.*) Менскага ваяводства ў 1765 г., запісаны ў харугву пухавіцкай парафіі [38, арк. 86 адв.], «губернатар» (упраўляючы) горвальскі, журавіцкі, балатнянскі. Пахаваны на каталіц-кіх могілках ордэна канонікаў рэгулярных у вёсцы Журавічы. У шлюбе з Канстанцыяй Грудзінскай (заключаны ў 1754 г.), меў сыноў Віктара, Бернарда, Тадэвуша і дачку Караліну [37, арк. 255–256 адв.].

Пасля смерці Базыля і Рэгіны з Барэйшаў Панятоўскіх у 1768 г. іх сыны Дамінік, Ян і Міхал, згодна з бацькоўскім тастаментам [14, арк. 308–308 адв.], падзялілі вёску Суцін на тры часткі і на працягу пэў-нага часу даравалі і прадавалі гэтую маёмасць. Так, напрыклад, Дамінік Панятоўскі ў 1769 г. падараваў сваю частку Суціна дачцэ і зяцю, Яну і Крыстыне з Панятоўскіх Гурскім [38, арк. 1191–1193 адв.]. Частку пра-даў Юзафу Слізню, смаленскаму мастаўнічаму. У 1824 г. Гіляры Ігна-тавіч Панятоўскі, унук Дамініка, прадае частку Суціна палкоўніку бы-лых польскіх войск графу Карлу Завішы [13, арк. 14].

Нашчадкі, унукі Дамініка і Яна Базылевічаў Панятоўскіх, падалі 11 верасня 1825 г. дакументы на вывад шляхецтва роду Панятоўскіх ге-рба «Юноша» ў вывадовую камісію Мінскага ДДС. Дамінуюць дакументы за 1742–1825 гг: шматлікія касцельныя метрыкі хросту і смерці; аплачаныя падымныя квіткі з аколіцы Суцін у Скарб Рэчы Паспалітай і Расійскай Імперыі з 1791 па 1799 г.; акт аб наданні правіянту для рускіх войскаў у 1789 г.; спісы шляхты, якая пражывала на ўласных зем-лях у 1811 і 1816 гг.; дзедаўскі тастамент Базыля за 07.01.1768 г.; купчая на вёску Суцін за 09.03.1700 г., увод вёскі Крывалі ў трыманне новага гаспадара Яна Панятоўскага за 1747 г. і іншыя юрыдычныя паперы [13, арк. 21–112].

11 верасня 1825 г. на дэпутацкай вывадовай сесіі Мінскай губерні пад старшынствам маршалка і камандора ордэна Святога Яна Ерусалім-скага Лявона Ашторпа прынята пастанова аб унясенні ў частку пер-шую радаслоўнай кнігі Мінскай губерні патэнта на імя Панятоўскіх з пералікам асоб: «… Гілярыя Ігнатавіча з двума сынамі Ежы Ігнацыем і Аляксандрам Вінцэнтам, што знаходзяцца ў Віцебскім сіроцкім аддзе-ле, Якуба Янавіча з сынам Томашам, Бенядыкта з сынам Пятром, Па-

трыцыюша Юзафа, Вінцэнта з сынам Рыгорам Міхалам, і Бярнарда Міхалавічаў, Людвіка Людвікавіча, вознага павета Ігуменскага, з сынам Кіпрыянам, Каэтана і Фабіяна Адама, сыноў Антона Янавіча, у радавітай шляхце польскай прызнаваем і да кнігі шляхецкай мінскай далучаем…» [12, арк. 465–471 адв.]. Пры далейшым разглядзе радаводнай справы суцінскіх Панятоўскіх герба «Юноша» ў Сенаце Расійскай імперыі ў Санкт-Пецярбургу ў 1838 г. вынесены прысуд аб незацвярджэнні роду Панятоўскіх у шляхецтве з нагоды адсутнасці ў пададзеных дакументах звестак аб прыгонных сялянах. У выніку гэтага суцінскія Панятоўскія ў сярэдзіне XIX ст. пераўтварыліся ў мінскіх мяшчан, а некаторыя з іх у звычайных сялян-землеўласнікаў.

7-е калена. Радзіна Ігнацыя Юзафа Нікадэмавіча Панятоўскага. Ігнацы Юзаф Нікадэмавіч Панятоўскі (1707–1796?), генерал, кавалер ордэна Святога Станіслава, у шлюбе з Ганнай з Яксаў Малахоўскай (1748–1836), меў сына Юзафа (1762–1845), палкоўніка польскіх войскаў, у 1789 г. ад'ютанта князя Юзафа Панятоўскага, аднаго з першых, хто атрымаў Залаты Крыж Ордэна «Virtuti Militari». У 1795 г. ён рабіў справаздачу па стане каралеўскага замка ў Гародні. Верагодна, што знаходзіўся на той час у свіце караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Пасля яго смерці вярнуўся на Украіну, дзе набыў у пляменніка караля вялікую зямельную маёмасць з цэнтрам у Таганчы, а таксама шмат зямель у ваколіцах Адэсы. Каля 1800 г. заклаў вялікія мануфактуры па вырабе сукна, дзе побач з ангельцамі працавала каля 1 000 мясцовых жыхароў. Валодаў адзінай для правабярэжнай Украіны сярэдзіны XIX ст. цукровай фабрыкай «Трошчын». У шлюбе, заключаным каля 1792 г., з Юліяй Грахольскай меў 16 дзяцей, з якіх васьмёра дажылі да паўналецця. Старэйшы сын Яўгеніюш, 1794 г.н, ажаніўся з унучкай Шчаснага Патоцкага Адэлай Касакоўскай, служыў камер'юнкерам расійскага двара і маршалкам шляхты Багуслаўскага павета. Наступныя за ім: Маўрыцы Ламберт (1796–1878), маршалак шляхты Кіеўскага павета, Аўгуст, палкоўнік расійскіх войскаў і ад'ютант князя Міхаіла Паўлавіча, Цэзарый і Дарыюш. Усе пяць сыноў Юзафа Панятоўскага памерлі бяздзетнымі, і ўкраінская галіна роду згасла разам з імі.

На сённяшні дзень у радаводзе Панятоўскіх герба «Юноша» XVI–XVIII стст. ёсць пэўныя белыя плямы, выкліканыя пытаннямі перасялення ў Панятоўскіх з Падляшша на беларускія землі ў сярэдзіне XVI ст. і з Мсціслаўскага ваяводства ў Менскае напачатку XVIII ст. Аднак далейшыя пошукі, у т.л. у архівах Літвы, Польшчы, Украіны і Расіі, верагодна, прадставяць дадатковыя звесткі да гісторыі і генеалогіі згаданага шляхецкага роду, адзначанага актыўным удзелам у грамадска-палітычным жыцці беларуска-літоўскіх зямель часоў Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

Крыніцы і літаратура

1. Акты, издаваемые Комиссией, высочайше учрежденной для разбора древних актов в Вильне (далее — АВАК). — Т. 10 : Акты Виленского магистрата и магдебургии : [1500 — 1897 гг.] / предисловие И. Я. Спрогиса. — 1879. — 594 с.
2. АВАК. — Т. 34 : Акты, относящиеся ко времени войны за Малороссию (1654 — 1667) / предисловие Ф. Н. Добрянского. — 1909. — 588 с.
3. АВАК. — Т. 36 : Акты Минского гродского суда : [1582–1590 гг.] / предисловие И. Я. Спрогиса. — 1912. — 452 с.
4. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при управлении Виленского учебного округа. — Вильна, 1867. — Т. 4. — 379 с.
5. Вяроўкін-Шэлюта, У. Попісы войска / У. Вяроўкін-Шалюта // Вялікае Княства Літоўскае : Энцыклапедыя. — Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2007. — Т. 2. — С. 460–461.
6. Каталіцкія храмы на Беларусі : Энцыклапедычны даведнік / А. М. Кулагін. — 2-е выд. — Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 2001. — 215 с.
7. Крэсс, В. Мае Панятоўскія / В. Крэсс // Сайт «Талька і наваколлі». — Рэжым доступу: http://www.talka.info/kpec.html. — Дата доступу : 28.01.2014.
8. Мяцельскі, А. А. Мсціслаўскае княства і ваяводства ў XII – XVIII стст. — 2-е выд., выпр. — Мінск : Беларуская навука, 2014. — 664 с.
9. Мяцельскі, А. А. Старадаўні Крычаў : Гіст.-археал. нарыс горада ад старажыт. часоў да канца XVIII ст. / А. А. Мяцельскі. — Мінск: Беларуская навука, 2003. — 165 с.
10. Нарысы гісторыі Беларусі : У 2 ч. Ч.1 / М. П. Касцюк, У. Ф. Ісаенка, Г. В. Штыхаў [і інш.]. — Мінск: Беларусь, 1994. — 527 с.
11. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далее НГАБ). — Ф. 319. — Воп. 1. — Спр. 86. — Пастановы Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу аб дваранскім паходжанні розных асоб. 1818 г.
12. НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 1. — Спр. 130. — Пастановы Мінскага дваранскага дэпутацкага сходу аб дваранскім паходжанні розных асоб. 1825 г.
13. НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 2. — Спр. 2610. — Вывадовая справа аб паходжанні роду Панятоўскіх Мінскай губ. 11.09.1825 г.
14. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 28. — Актавая кніга Мінскага гродскага суда. 02.01.–22.12.1789 г.
15. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 1. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 01.01.–27.12.1687 г.
16. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 2. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 05.01.–25.12.1690 г.
17. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 5. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 03.01.–31.12.1701 г.

18. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 8. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 02.01.–27.12.1706 г.
19. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 9. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 03.01.–18.12.1707 г.
20. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 10. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 01.01.–30.12.1708 г.
21. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 12. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 07.01.–30.12.1710 г.
22. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 24. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 01.01.–11.12.1722 г.
23. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 26. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 02.01.–29.12.1724 г.
24. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 42. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 02.01.–31.07.1738 г.
25. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 43. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 01.08.–30.12.1738 г.
26. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 44. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 02.01.–30.12.1739 г.
27. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 59. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 02.01.–31.12.1750 г.
28. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 65. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 10.02.–31.12.1755 г.
29. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 66. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 02.01.–31.12.1756 г.
30. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 70. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 01.07.–31.12.1759 г.
31. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 71. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 02.01.–31.12.1760 г.
32. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 74. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 03.01.–31.12.1763 г.
33. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 75. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 05.01.–29.12.1765 г.
34. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 76. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 04.01.–31.12.1765 г.
35. НГАБ. — Ф. 1729. — Воп. 1. — Спр. 80. — Актавая кніга Мсціслаўскага гродскага суда. 03.01.–24.12.1770 г.
36. НГАБ. — Ф. 1731. — Воп. 1. — Спр. 3. — Актавая кніга Аршанскага гродскага суда. 01.01.1703–28.12.1704 г.
37. НГАБ. — Ф. 1736. — Воп. 1. — Спр. 29. — Актавая кніга Рэчыцкага гродскага суда. 12.01.1767–29.12.1768 г.
38. НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 4. — Актавая кніга Мінскага земскага суда. 03.01.1765–12.04.1769 г.
39. НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 17. — Актавая кніга Мінскага земскага суда. 04.01.–29.12.1786 г.

40. НГАБ. — Ф. 1772. — Воп. 1. — Спр. 1. — Актавая кніга Мсціслаўскага земскага і гродскага судоў. 03.01.–29.12.1695 г.
41. НГАБ. — Ф. 1772. — Воп. 1. — Спр. 4. — Актавая кніга Мсціслаўскага земскага і гродскага судоў. 02.01.–30.12.1769 г.
42. НГАБ. — Ф. 1817. — Воп. 1. — Спр. 40. — Актавая кніга Магілёўскага магістрата. 03.01.–31.12.1706 г.
43. НГАБ. — Ф. 1926. — Воп. 5. — Спр. 48. — Вопіс дакументаў актавых кніг Мінскага гродскага суда за 1593 г.
44. НГАБ. — КМФ-18. — Воп. 1. — Спр. 102. — Метрыка літоўскіх і северскіх прывілеяў, данін, кантрактаў, пацвярджэнняў, выдадзеных каралём Жыгімонтам III у падканцлерства Паўла Сапегі. 1627–1631 гг.
45. НГАБ. — КМФ-18. — Воп. 1. — Спр. 119. — Прывілеі, пажалаванні і пацвярджэнні, кніга віцэ-канцлера Казіміра Лявона Сапегі. 1645–1647 гг.
46. Несцярчук, Л. М. Станіслаў Аўгуст Панятоўскі : манарх, асветнік, мецэнат / Л. Несцярчук. — Брэст : Брэсцкая друкарня, 2011. — 298 с.
47. Памятники истории Восточной Европы : Источники XV–XVII вв. / редкол. И. Граля и др. — Т. 4 : Крестоприводная книга шляхты Великого княжества Литовского, 1655 г. / Сост. М. М. Кулецкий, Е. Е. Лыкова. — Москва, Варшава, 1999. — 261 с.
48. Русская историческая библиотека, издаваемая Археографической Комиссией. — Петроград, 1915. — Т. 33. Литовская Метрика. Отдел 1-й. — Часть 3. Книги публичных дел. Переписи литовского войска. — 702 с.
49. Сенкевич, Г. Собрание сочинений / Генрик Сенкевич. — Москва, 1983. — Т. 2. Исторический роман «Огнем и мечем». — 672 с.
50. Akta zjazdów stanów Wielkiego Księstwa Litewskiego : w 2 t. T. 1 : Okresy bezkrólewi / Inst. Historii Pol. Akad. Nauk ; Oprac. H. Lulewicz. — Warszawa : Neriton, 2006. — 452 s.
51. Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1697–1794) : spis / pod red. A. Rachuby. — Warszawa, 2004. — 448 c.
52. Kwartalnik historyczny. — Lwów, 1893. — Rocznik VII. — 774 s.
53. LVIA (Lietuvos valstybes istorijos archyvas). — SA (Sapiehowie Archiwum). — № 2. — k. 115–116 v.
54. LVIA. — SA. — № 2651. — k. 841.
55. LVIA. — SA. — № 3417. — k. 1225–1232.
56. Orman, E. Poniatowski Jozef h. Ciolek (1762–1845) / Elżbieta Orman // Polski Słownik Biograficzny. — Wrocław, Warszawa, Kraków, Gdańsk, Lódź : Zakład narodowy imienia Ossolińskich. Wydawnictwo Polskiej Akademii Nauk, 1983. — Tom 27/3 : Poniatowska Helena — Popowski Józef. — s. 426–428.
57. Paprocki, B. Gniazdo cnoty : Zkąd herby rycerstwa sławnego Królewstwa Polskiego, Wielkiego Ksiestwa Litewskiego, Ruskiego, Pruskiego, Mazowskiego, Zmudzkiego, y inszych ksiżat, y panow, początek swóy maie. — Kraków, 1578. — 432 s.
58. Po ziarnie. Zbiorek Pamiątkowy / wydany przez Jana Prustowskiego i Maurycego Krupowicza. — Wilno, 1861.

59. Poczet rodów w Wielkiem Księstwie Litewskiem XIV–XVI wieku / ułożył i wydał Adam Boniecki. — Warszawa, 1887. — 425 s.
60. Poniaty / Wikipedia. — Рэжым доступу : http://en.m.wikipedia.org/wiki/Poniaty. — Дата доступу : 28.01.2014.
61. Rachuba, A. Wielkie Księstwo Litewskie w systemie parłamentarnym Rzeczypospolitej w latach 1569–1763 / Andrzej Rachuba. — Warszawa : Wydawnictwo sejmowe, 2002. — 375 s.
62. Rodzina : Herbarz szlachty polskiej / S. Uruski, A. Kosinski, A. Włodarski. — Warszawa, 1917. — T. XIV : Pika — Pryz. — Repr. wyd. — 1999. — 384 s.
63. Urzędnicy dawnej Rzeczypospolitej XII–XVIII wieku : spisy / pod red. A. Gąsiorowskiego. — T. 9 : Urzędnicy Inflanccy XVI–XVIII wieku / oprac.i K. Mikulski, A. Rachuba. — 1994. — 292 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 29.01.2014

В. У. Ханецкі, Я. А. Чарнецкі

Пакаленны роспіс Руткоўскіх з Барысаўскага павета (канец XVIII – пачатак XX ст.)

Паводле дакументаў Мінскага ДДС на тэрыторыі Мінскай губерні пражывала не менш за тры роды Руткоўскіх рознага паходжання. Усе яны карысталіся гербам «Побуг». Прадстаўнікі аднаго з іх пераехалі на Міншчыну з Берасцейскага ваяводства і аселі ў большасці ў Бабруйскім павеце. Другі род стала пражываў у Мінскім і часткова Вілейскім паветах, а трэці перабраўся з Дзісненскага павета. Усе яны мелі розныя вывады ў Мінскім ДДС: 16 і 30 снежня 1802 г., 8 лютага 1808 г.

Даволі значная колькасць малазямельнай альбо беззямельнай польскай шляхты на працягу XVIII ст. перасялілася на беларускія землі. Яе значная частка паходзіць з Плоцкага ваяводства, аднаго з найбольш шчыльна заселеных рэгіёнаў. Ніжэй апісаныя Руткоўскія таксама «прывандравалі» праз Вільню ў Барысаўскі павет Мінскай губерні менавіта адтуль. Род не зацвердзілі ў дваранстве Расійскай імперыі і перавялі ў падатныя станы. Частка роду ўжо напрыканцы XIX ст. перасялілася з Барысаўскага павета на Украіну. Дадзенае даследаванне характарызуе адзін з міграцыйных шляхоў рассялення дробнай польскай шляхты ў межах сучаснай Беларусі.

Прадстаўнікі роду Руткоўскіх, браты Марцін і Базыль, у 1796 г. зафіксаваны ў якасці беззямельных абываценяў Барысаўскага павета. Яны з сем'ямі жылі ў вёсцы Багданава на зямлі Храптовіча, не валодалі прыгоннымі, не былі на службе і не мелі ніякіх рангаў [1, арк. 127 адв.]. У 1816 г. Руткоўскія па-ранейшаму пражывалі ў Багданаве (на зямлі Храптовіча), былі запісаны па рэвізіі сярод чыншавай шляхты і прылічаны да «Спіса асоб Барысаўскага павета, якія не прадставілі дадатковых дакументаў для зацвярджэння ў дваранстве» [2, арк. 66 адв.].

Пакаленны роспіс Руткоўскіх

Умоўныя тлумачэнні:

* — нараджэнне
~ — хрышчэнне
х — шлюб
† — смерць
□ — пахаванне
вёс. — вёска
вол. — воласць
д. — дачка
засц. — засценак
касц. — касцёл
кс. — ксёндз
мяст. — мястэчка
пав. — павет
с. — сын
ур. — урочышча

1 пакаленне

1 Мацей [15, арк. 45–45 адв.]

Родам з Плоцкага ваяводства (Польшча). Разам з віленскім суперыёрам кс. Лукашам Жыквінскім пераехаў з Плоцка ў Вільню. Прыблізна з 1730 г. быў аканомам маёнткаў Багданава і Руднае Сяло, якія належалі віленскім айцам-месіянерам. Пра гэта засведчылі лістамі ад 28.08.1795 самі айцы-месіянеры і аршанскі падстолі і падстараста Ігнацій Амульскі, які быў дажывотным застаўным пасэсарам Багданава. На той момант Руткоўскія жылі ў Багданаве на арэндным кантракце.

2 пакаленне

2/1 Марцін

* Багданава (?)1746 **[1, арк. 124 адв.]**, † …

х … Анастасія **Страшавінская** (Straszawinówna), * … , † … , д. Базыля С.

3/1 Базыль

* Багданава (?)1748 **[1, арк. 124 адв.]**, † …

х … Катарына **Рабавіцкая** (Robawickywna), * … , † … , д. Яна Р.

3 пакаленне

4/2 Казімер

* Багданава (?)1771 **[1, арк. 124 адв.]** (1764 — паводле метрычнага запісу аб смерці),

† Калечаны 20.01.1839 **[8, арк. 175]**, □ Руднае Сяло

х … Юлія … , * … , † да 1839 **[8, арк. 175]**.

5/2 Малгажата

* Багданава (?) 1783 **[1, арк. 124 адв.]**, † …

6/2 Дыянізій

* Багданава (?) 1788 **[1, арк. 124 адв.]**, † …

7/2 Міхал

* Багданава (?) 1789 **[1, арк. 124 адв.]** (1777 **[4, арк. 332 адв. – 333]**, 1784 — у метрычным запісе аб смерці), † Руднае Сяло 07.12.1844 [8], □ Руднае Сяло, пры капліцы.

х … Разалія **Сідаровіч**, * … 1782, † …

У 1842 г. жыў часова з жонкай і дачкой Феліцыянай у Багданаве Барысаўскага пав. (уладальніка Храптовіча).

8/2 Катарына

* Багданава … , ~ Барысаў касц. 09.03.1791 **[11, арк. 71 адв.]**, † …

9/3 Арцемі

* Багданава (?)1783 (пры шлюбе паказаны з Багданава), † …

х Халопенічы, Барысаўскі пав. 09.11.1802 **[7, арк. 93]** Эўфразына **Рубчынская** (Rubczycska, Rybczycska, Rupczycska), * … (у шлюбным запісе ў якасці месца пражывання пазначана вёс. Ніжыбора Халопеніцкай парафіі), † …

10/3 Марыянна

* Багданава (?)1787, † …

х Халопенічы 10.11.1807 **[7, арк. 111]** шляхціч Павел **Гансеўскі** (Gąsiewski), * … (у шлюбным запісе ў якасці месца пражывання пазначаны засц. Статкоўшчына), † …

11/3 Амельян (Юльян)

* Багданава (?) 1789 **[1, арк. 124 адв.]** (1772) **[4, арк. 326 адв. – 327**], † …

х1 … … , * … , † … да 1811

х2 Халопенічы 30.01.1811 **[7, арк. 119]** Вікторыя **Мармужэўская** (Marmuïewska, Marmuziewska), (па першым мужы — Ярмазевіч), * Халопенічы (?) 1786 **[4, арк. 326]**, † …

У 1842 г. Амельян з жонкай, сынамі Стэфанам і Вінцэнтам, дачкой Петранэляй часова жылі ў вёс. Зачысце Барысаўскага пав. (уладальніка Радзівіла).

12/3 Гэлена

* Багданава … , ~ Барысаў кас. 15.05.1791 **[11, арк. 72]** (маці паказана Цэлінай), † … . На момант шлюбу жыла ў Багданаве.

х Халопенічы 1808.11.01 **[7, арк. 112 адв.]** Павел **Пятровіч**, * … , † …

У 1836–48 гг. жылі у засц. Красноўцы.

13/3 Антоні

* Багданава (?) 1896/98 **[2, арк. 66 адв.]** (1802) **[4, арк. 338 адв. – 339]**, † …

х Халопенічы 13.02.1821 **[7, арк. 138 адв.]** шляхцянка Марыянна **Калачынская** , *… 1812 (у шлюбным запісе ў якасці месца пражывання пазначана паселішча Саханаўка), † …

У 1842 г. ён з жонкай і дачкой Евай жылі ў вёс. Новае Сяло Барысаўскага пав. (уладальніка Храптовіча).

4 пакаленне

14/4 Ян

* Багданава (?) 1796 **[2, арк. 66 адв.]**, † да 1839

15/4 Ігнаці

* Багданава (?) 1798 [**3, арк. 49 адв.**], † да 1839

16/4 Леанора

* … 1814 (паводле шлюбнай метрыкі), † … Пры шлюбе паказана аднадворкай.

х Халопенічы 14.05.1839 **[8, арк. 127]** аднадворац Базыль **Генсееўскі** (Гансеўскі?) (Gęsiejewski),* … 1819 (паводле шлюбнай метрыкі), † … , с. Юзафа Г. і Тэадоры Яцкевіч. Жылі ў 1840 г.у вёс. Кругліца.

17/7 Канстанцыя

* … (у шлюбнай метрыцы паказана з Багданава), † …

х Халопенічы 1836.11.08 **[8, арк. 123 адв.]** Аляксандар **Галькевіч** (Halkiewicz), * … 1816 (у шлюбным запісе ў якасці месца пражывання пазначана Багданава), † … , с. Андрэя Г. і Марыянны Вайцяхоўскай. У 1837–1840 гг. абодва жылі ў паселішчы Амосаўка Барысаўскага пав.

18/7 Фэліцыяна

* … 1825 **[4, арк. 332 адв. – 333]** (паводле шлюбнай метрыкі — 1822 г., у якасці месца пражывання пазначана Амосаўка), † … У 1842 г. часова жыла ў Багданаве з бацькамі.

х Халопенічы 23.11.1847 **[8, арк. 142 адв.]** аднадворац Антоні **Калачынскі** (Kołoczynski) герба «Яніна», *… 1826 (у шлюбнай метрыцы ў якасці месца пражывання пазначана Лукомская парафія), с. Тадэвуша К. і Хрысціны Чайкоўскай.

19/9 Эліяш (Ілля)

* … 1812 **[5, арк. 78 адв. – 79]**, † да 1881

х Халопенічы 22.11.1836 **[8]** Марыянна **Хруцкая** герба «Ляліва» (у некаторых метрыках аб хросце яе дзяцей названа Марцыянай), * … 1812 **[4, арк. 344 адв.-345]** (паводле запісу аб смерці — 1813, у шлюбнай метрыцы ў якасці месца пражывання пазначана Халопеніцкая парафія), † г. Барысаў 03.12.1881 (ад запалення лёгкіх) **[13, арк. 255]**, □ Барысаў, Кальварыя.

У 1842 г.паказаны аднадворцам Барысаўскага пав., часова жыў у вёс. Краснаселле (Красналукі ?), уладальніка Прыборы, з жонкай і дочкамі Марыяннай і Канстанцыяй.

20/9 Агата

* засц. Уцеха Барысаўскага пав. … , ~ Халопенічы, кас. 16.02.1817 **[7, арк. 57]**, † …

21/9 Ян

* засц. Уцеха … , ~ Халопенічы, кас. 05.07.1819 **[7, арк. 64 адв.]**,

† Кузлы, Барысаўскі пав. 29.06.1879 (ад пухліны) **[13, арк. 220]**, □ Кальварыя.

У 1842 г.паказаны аднадворцам Барысаўскага пав., жыў часова ў вёс. Краснаселле (Красналукі ?), уладальніка Прыборы, разам з братам Эліяшам і яго сям'ёй. У 1853 г. у метрыках дзяцей згадваецца шляхцічам, у 1860 і 1862 гг. аднадворцам, у 1874 г. селянінам, у 1879 г. мешчанінам.

х … Ева **Бабіцкая** герба … , * … , † …

22/9 Міхал

* засц.Уцеха … , ~ Халопенічы 30.07.1821 **[7, арк. 72]**, † …

23/10 Апалонія (пазашлюбная)

* … 1803 (у шлюбнай метрыцы ў якасці месца пражывання пазначана Халопеніцкая парафія), † …, х Халопенічы 08.09.1828 **[8, арк. 102]** селянін Раман **Гарбачонак**, * … 1789 (у шлюбнай метрыцы ў якасці месца пражывання пазначана Халопеніцкая парафія), † … , с. Габрыэля Г. і Анастасіі з Гарбачонкаў.

24/11/2 Вінцэнт

* Багданаў … , ~ Халопенічы, кас. 19.02.1812 **[7, арк. 44]**, † …

У 1842 г. быў на казённым выхаванні ў Казанскай вучэльні, з гэтай нагоды выключаны з акладу аднадворцаў Барысаўскага пав. **[4, арк. 326 адв.-327].**

25/11/2 Анастазія

* … , † … х Халопенічы 21.02.1837 **[8, арк. 124]** шляхціч Пётр **Рэвут** (Reutt) герба «Газдава», * … 1815, † … , с. Сымона Р. і Багумілы Сяліцкай. Жылі ў 1839 г. у вёс. Зацішша [**8, арк. 63 адв.]**

26/11/2 Стэфан

* засц. Уцеха … , ~ Халопенічы, кас. 11.03.1817 **[7, арк. 59]**, † …

У 1842 г. згадваецца як арэнбургскі павятовы настаўнік, па прычыне чаго выбыў з ліку аднадворцаў Барысаўскага пав. **[4, арк. 326 адв. – 327]**

27/11/2 Юзаф

* Халопенічы … , ~ Халопенічы, кас. 29.02.1819 **[7, арк. 67 адв.],** † …

28/11/2 Юзэфата

* … 1820 (паводле метрычнага запісу аб смерці), † вёс. Галькі Барысаўскага пав. 14.07.1827 **[8, арк. 145 адв.]**, □ Халопенічы

29/11/2 Паўліна

* Халопенічы … , ~ Халопенічы, кас. 25.06.1822 **[7, арк. 74]**, † …

30/11/2 Петранэля (з блізнятаў)

* вёс. Галькі 08.10.1827 (увечары) **[8, арк. 5 адв.]**, ~ Халопенічы, касц. 30.07.1821, † …

31/11/2 Міхаліна (з блізнятаў)

* вёс. Галькі 09.10.1827 (ранкам) **[8, арк. 5 адв.]**, ~ Халопенічы, касц. 30.07.1821, † … (магчыма, у дзіцячым узросце)

32/11/2 Ян-Вінцэнт

* вёс. Галькі 12.03.1830 **[8, арк. 20 адв.]**, ~ Халопенічы, касц. 15.03.1830, † … (магчыма, у дзіцячым узросце)

33/13 Ева [4, арк. 338 адв.-339]

* вёс. Новае Сяло Барысаўскага пав. 24.12.1833 **[8, арк. 41 адв.]**, ~ Халопенічы, касц. 26.12.1833, † …

34/13 Ганна

* вёс. Новае Сяло 10.08.1837 **[8, арк. 61]**, ~ Халопенічы, касц. 15.08.1837, † … (магчыма, у дзіцячым узросце, у 1842 г.)

35/13 Ян

* вёс. Новае Сяло (?) 29.08.1842 **[8, арк. 78]**, ~ Халопенічы, касц. 30.08.1842, † … (магчыма, у немаўлячым узросце, у 1842 г.)

5 ПАКАЛЕННЕ

36/17 Рафал (пазашлюбны)

* Багданава 16.11.1843 **[8, арк. 83]**, ~ Халопенічы, касц. 29.11.1843, † …

37/19 Марыянна

* Красналукі, Барысаўскі пав. 20.06.1838 **[8, арк. 65]**, ~ Халопенічы, касц. 25.06.1838, † …

х … да 1866 грамадзянін Ігнацій **Ясінскі [12, арк. 305]**, * … , † …

Абодва жылі ў вёс. Замужаны Барысаўскага пав. (?)

38/19 Канстанцыя

* … 1840/43 **[5, арк. 78 адв.-79]**, † …

У 1881 г. пазначана ўдавой па мужу ў метрычным запісе аб смерці маці.

39/19 Міхал

* Красналукі 12.07.1843 **[8, арк. 82]**, ~ Халопенічы, касц. 23.07.1843, † …

Пералічаны ў 1866 (76?) г. у аднадворцы Корсакавіцкай вол. Барысаўскага пав. **[6, арк. 63 адв.-64].**

У 1865 г. мешчанін, у 1884 і 1892 гг. у метрыках дзяцей пазначаны мешчанінам, у 1893 г. — шляхцічам.

х1 … Разалія **Гертман** (Гартман), * … , † …

(х2)? … Разалія **Быкоўская**, * … , † …

40/19 Тамаш

* … 17.09.1845 **[8, арк. 89]**, ~ Халопенічы, касц. 23.09.1845, † да 1881

41/19 Фэліцыян (Фэлікс)

* Красноўка, Барысаўскі пав. 01.05.1848 **[8, арк. 96]**, ~ Халопенічы, касц. 08.05.1848, † Барысаў 12.12.1889 (ад чахоткі)

[13, арк. 350].

У 1879 г. згадваецца пабілетным жаўнерам, а ў 1889 г. адстаўным жаўнерам. У 1881 і 1890 г. паказаны барысаўскім мешчанінам.

х … Караліна (Кляра) **Закрэўская** (Закржэўская), * … , † …

42/19 Пётр

* … 1851 **[5, арк. 78 адв.-79]**, † … да 1881

43/19 Вінцэнт

* Зачысце 20.07.1853 **[12, арк. 47]**, ~ Барысаў, касц. 28.07.1853, † …

44/21 Ігнаці

* … 1849 **[5, арк. 78 адв.-79]**, † …

У 1878 г. у метрыках дзяцей згадваўся як селянін Зачысцкай вол. Барысаўскага пав., у 1883 г. — мешчанін. У 1895/96 г. з усёй сям'ёй пераехаў на сталае жыхарства на Украіну ў Ржышчаўскую манастырскую слабодку (ніжэй — Ржышчаў або Манастырка).

х Барысаў (?) каля 1877 г. Канстанцыя **Гіра-Сырынская** герба «Гутар», *Калпяніца, Барысаўскі пав. 02.03.1859 **[12, арк. 124 адв.]**, ~ Барысаў, касц. 04.03.1859, † … , д. Уладзіслава Г. і Францішкі Эйсмант.

45/21 Тадэвуш

* Зачысце Барысаўскага пав. 28.08.1853 **[12, арк. 48]**, ~ Барысаў, касц. 30.08.1853, † …

х … Стэфанія **Коўзан**, * … , † …

46/21 Міхаліна

* Зачысце 07.11.1856 **[12, арк. 102 адв.]**, ~ Барысаў, касц. 08.11.1856, † … да 1879

47/21 Юлія

* Зачысце 16.02.1860 **[12, арк. 145]**, ~ Барысаў, касц. 20.02.1860, † … да 1879

48/21 Марыя

* Зачысце 13.12.1862 **[12, арк. 202]**, ~ Барысаў, касц. 17.12.1862.

† Кузлы 11.01.1874 (ад шкарлятыны) **[13, арк. 171]**, □ Кальварыя.

49/21 Рыгор

* Кузлы 18.03.1866 **[12, арк. 302]**, ~ Барысаў, касц. 07.03.1866, † Кузлы 22.06.1885 (ад гарачкі) **[13, арк. 304]**, □ Кальварыя.

50/23 Станіслава (пазашлюбная)

* вёс. Красноўка 31.05.1828 **[8, арк. 10 адв.]**, ~ Халопенічы, кас. 01.06.1828, † …

6 ПАКАЛЕННЕ

51/39/1 Марыя

*вёс. Паляны Зембінскага прыхода Барысаўскага пав., 28.09.1872 **[12, арк. 394 адв. – 395]**, ~ Барысаў, касц. 10.01.1872, † …

х Барысаў 23.05.1893 **[9, арк. 196]** Стэфан **Бабіцкі**, * Барысаў, 12.06.1867 **[12, арк. 318]**, ~ Барысаў 13.06.1867, † … , с. Мацвея Б. і Разаліі Крачкоўскай.

У шлюбнай метрыцы ў якасці месца пражывання пазначаны засц. Купейкі, дзе сям'я пражывала і ў 1894 г.

52/39/1 Фларыян

* … 1880 (паводле метрыкі аб шлюбе), † …

х Барысаў, касц. 06.08.1912 **[9, арк. 469 адв.]** Марыя **Бабіцкая**, * засц. Купейкі 15.07.1891 **[10, арк. 54 адв.]**, ~ Барысаў, касц. 21.07.1891, † … , д. Францішка Б. і Евы Рэвут. У 1933 г. ёй выдадзена пасведчанне аб нараджэнні для атрымання пашпарта. У шлюбнай метрыцы абодва паказаны мяшчанамі з Барысаўскага прыхода.

53/39/1 Іван

*Будка Маскоўска-Берасцейскай чыгуначнай дарогі 23.07.1884 **[14, арк. 395 адв. – 396.]**, ~ Барысаў, касц. 29.07.1884, † …

54/39/1 Фэліцыя

*Будка Маскоўска-Берасцейскай чыгуначнай дарогі 26.09.1886 **[14, арк. 507 адв. – 508]**, ~ Барысаў, касц. 20.10.1886, † …

55/39/2 Стэфан

* засц. Баяры Барысаўскага пав.21.02.1892 **[10, арк. 77 адв. – 78]**, ~ Барысаў, касц. 25.02.1892, † … 21.07.1938 яму выдадзена пасведчанне аб нараджэнні для атрымання пашпарта.

56/41 Караль

* Барысаў 11.01.1879 **[14, арк. 181 адв. – 182]**, ~ Барысаў, касц. 18.11.1879, † Барысаў 12.01.1891 (ад тыфознай гарачкі) **[13, арк. 364 адв.]**, □ Кальварыя.

57/41 Марыя

* Барысаў 18.07.1881, ~ Барысаў, касц. 20.07.1881 **[14, арк. 271 адв. – 272]**, † … (прыкладна ў 1889)?

58/41 Іосіф

* Барысаў 13.09.1882 **[14, арк. 218 адв.]**, ~ Барысаў, касц. 26.09.1882, † …

59/41 Пётр

* … , † да 1889

60/41 Эмілія

* Барысаў 14.09.1887 **[14, арк. 558 адв. – 559]**, ~ Барысаў, касц. 28.09.1887 (у метрычным запісе дзявочае прозвішча маці пазначана як Зарэўская), † …

61/41 Марыя

* Барысаў 23.01.1890 **[10, арк. 7 адв. – 8]**, ~ Барысаў, касц. 28.01.1890, † …

62/44 Іосіф

* Кузлы 22.03.1878, ~ Барысаў, касц. 26.03.1878 **[14, арк. 112 адв. – 113]**, † …

02.02.1917 яму выдадзена пасведчанне аб нараджэнні для атрымання пашпарта.

х … Наталля **Верхачуб**, * Украіна …, † … , д. Якава В.

63/44 Петранэля

* Барысаў 02.02.1880 **[14, арк. 199 адв. – 200]**, ~ Барысаў, касц. 02.02.1880, † Барысаў 27.02.1880 (ад крупа) **[13, арк. 231 адв.]**, □ Кальварыя.

64/44 Фэліцыяна

* Кузлы 01.09.1881 **[14, арк. 277 адв. – 278]**, ~ Барысаў, касц. 13.09.1881, † …

х … селянін Іван **Коба**, * … з мяст. Ржышчаў (Украіна), † … , с. Уладзіміра К.

65/44 Іван

*Барысаў 28.03.1883 **[14, арк. 343 адв. – 344]**, ~ Барысаў, касц. 29.03.1883, † Ржышчаў або Манастырка (Украіна) 25.01.1901.

66/44 Анэля

* Кузлы 24.05.1885 **[14, арк. 438 адв. – 439]**, ~ Барысаў, касц. 16.06.1885, † …

67/44 Юльян (Ілля)

* Кузлы 18.02.1887 **[14, арк. 539 адв. – 540]**, ~ Барысаў, касц. 22.03.1887, † Ржышчаў (Украіна) 1932.

х Ржышчаў (Украіна) 02.07.1917 Ганна **Зубаха**, * Ржышчаў 27.01.1890, † … , д. Антона З.

68/44 Петранэля-Тэрэза

* Кузлы 03.01.1889 **[14, арк. 617 адв. – 618]**, ~ Барысаў, касц. 08.01.1889, † …

х Ржышчаў (Украіна) 22.10.1912 селянін Павел **Гарашкоў**, * … 1887 (з Магілёўскай губерні), † … , с. Аляксея Г.

69/44 Тэрэза

* … 1891, † Ржышчаў 22.02.1901.

70/44 Міхаіл

* засц. Струпнае Барысаўскага пав. 01.09.1892 **[10, арк. 91 адв. – 92]**, ~ Барысаў, касц. 06.09.1892, † …

х … (Украіна)? да 1919 Лукія … , * … , † … , д. Сільвестра

71/44 Анэля

* засц. Струпнае 11.01.1894 **[10, арк. 91 адв. – 92]**, ~ Барысаў, касц. 13.11.1894, † …

72/44 Пётр

* Ржышчаў (Украіна) 28.01.1897, † Ржышчаў 08.04.1898.

73/44 Павел

* Ржышчаў 18.09.1899, † …

х Ржышчаў 28.02.1919 Параскева **Асаўленка** (арыгінальная форма напісання — «Осауленко»), * Украіна … 1899, † … , д. Якіма А.

74/44 Ганна

* Ржышчаў 01.07.1901, † …

х Ржышчаў 27.05.1919 Рыгор **Майданюк** (Украіна) … 1896, † … , с. Максіма М.

75/45 Стэфан

* … 1885 (паводле метрычнага запісу аб шлюбе), † …

х Барысаў 05.10.1907 **[9, арк. 423]** Аліна З**акрэўская** (Закржэўская), * … 1887 (паводле метрычнага запісу аб шлюбе), † … , д. Міхала З. і Тэафілі Аскерка. У шлюбнай метрыцы пазначана мяшчанкай.

76/45 Стэфанія

* Кузлы 02.09.1886 **[14, арк. 503 адв. – 504]**, ~ Барысаў, касц. 28.09.1886, † …

31.03.1923 ёй выдадзена пасведчанне аб нараджэнні для атрымання пашпарта.

77/45 Станіслаў

* засц.Струпнае Барысаўскага пав. 05.12.1892. **[10, арк. 106 адв. – 107]**, ~ Барысаў, касц. 03.01. 1893, † …, х Барысаў 06.08.1912 **[9, арк. 469 адв.]** Ядвіга **Закрэўская** (Закржэўская), * … , † … , д. Міхала З. і Тэафілі Аскерка.

78/45 Іосіф ??

* Дразы, Барысаўскі пав.03.04.1889 **[14, арк. 630 адв. – 631]**, ~ Барысаў, касц. 23.04.1889, † …

79/45 Аліна

* ур. Кальварыя 27.04.1896 **[10, арк. 216 адв. – 217]**, ~ Барысаў, касц. (01)?.05.1896, † …

80/45 Віктар

* ур. Кальварыя 18.12.1897 **[10, арк. 274 адв. – 275]**, ~ Барысаў, касц. 28.12.1897, † …

81/45 Пій-Пётр

* ур. Кальварыя 05.05.1902 **[10, арк. 450 адв. – 451]**, ~ Барысаў, касц.19.05.1902, † …

У 1914 г. яму было выдадзена пасведчанне аб нараджэнні.

7 пакаленне

82/62 Іван

* Ржышчаў (Украіна) 11.06.1905, † Ржышчаў 26.06.1905.

83/62 Вольга

* Ржышчаў (Украіна) 01.07.1906, † …

84/62 Ганна

* Ржышчаў (Украіна) 09.06.1908, † …

85/62 Георгі

* Ржышчаў (Украіна) 24.04.1910, † …

86/62 Кацярына

* Ржышчаў 23.03.1913, † …

87/62 Іван

* Ржышчаў 06.01.1915, † …

88/62 Марыя (з блізнятаў)

* Ржышчаў 14.04.1918, † …

89/62 Аляксандра (з блізнятаў)

* Ржышчаў 14.04.1918, † …

90/67 Мікалай

* Ржышчаў 05.12.1919, † Ржышчаў 1912.

91/67 Аляксандр

* Ржышчаў 1918?

х … Ганна **Малярэнка**, * Ржышчаў 1925, д. Дзмітрыя М.

92/70 Ганна

* Ржышчаў 25.01.1919, † Ржышчаў 23.03.1919.

93/73 Кацярына

* Ржышчаў 25.03.1920, † …

8 пакаленне

94/91 Дзмітрый

* Украіна …

95/91 Меланія

* Украіна …

96/91 Марыя

* Украіна …

Крыніцы і літаратура

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей — НГАБ). — Ф. 319. — Воп. 1. — Спр. 7. — Спісы шляхты Барысаўскага пав. 1796 г.
2. НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 1. — Спр. 77. — Спісы ваколічнай, чыншавай, беспамеснай і іншай шляхты Барысаўскага пав., не зацверджанай у дваранскім званні. 1816 г.
3. НГАБ. — Ф. 319. — Воп. 1. — Спр. 1136. — Пасямейныя спісы шляхты Барысаўскага пав. 1917 г.
4. НГАБ. — Ф. 333. — Воп. 9. — Спр. 406. — Рэвізская сказка аднадворцаў Барысаўскага пав. 1842 г.
5. НГАБ. — Ф. 333. — Воп. 9. — Спр. 425. — Рэвізская сказка аднадворцаў Барысаўскага пав. 1842 г.
6. НГАБ. — Ф. 333. — Воп. 9. — Спр. 849. — Рэвізская сказка грамадзян Барысаўскага пав. 1865 г.
7. НГАБ. — Ф. 937. — Воп. 4. — Спр. 56. — Метрычная кніга Халопеніцкага касцёла. 1800–1827 гг.
8. НГАБ. — Ф. 937. — Воп. 4. — Спр. 57. — Метрычная кніга Халопеніцкага касцёла. 1827–1849 гг.
9. НГАБ. — Ф. 937. — Воп. 8. — Спр. 1. — Метрычная кніга Барысаўскага касцёла. 1886–1915 гг.
10. НГАБ. — Ф. 937. — Воп. 8. — Спр. 2. — Метрычная кніга Барысаўскага касцёла. 1890–1904 гг.
11. НГАБ. — Ф. 751. — Воп. 1. — Спр. 1. — Метрычная кніга Барысаўскага касцёла. 1761–1792 гг.
12. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 43. — Спр. 1. — Метрычная кніга Барысаўскага касцёла. 1851–1875 гг.
13. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 43. — Спр. 2. — Метрычная кніга Барысаўскага касцёла. 1851–1894 гг.
14. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 43. — Спр. 5. — Метрычная кніга Барысаўскага касцёла. 1876–1889 гг.
15. НГАБ. — Ф. 2117. — Воп. 1. — Спр. 20. — Паточны пратакол Аршанскага павятовага суда аб дваранскім паходжанні розных асоб. 1795 г.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 19.09.2014

Ф. В. Чарняўскі

Некалькі згадак пра Казіміра Караля Уніхоўскага, пісара земскага менскага

За час, які мінуў з моманту атрымання краінай незалежнасці, многае змянілася ў гістарычнай навуцы Беларусі. Гісторыкі нарэшце прыступілі да распрацоўкі гісторыі ВКЛ і за чвэрць века дасягнулі значных поспехаў. Асабліва вялікі прарыў яны здзейснілі ў распрацоўцы генеалогіі шляхецкіх родаў. На нашу думку, найбольшыя вынікі дасягнуты ў распрацоўцы генеалогіі тых фамілій, чые прадстаўнікі на працягу некалькіх пакаленняў займалі высокія пасады ў сістэме кіравання княствам. На даследаванне генеалогіі шляхты, якая займала дамінуючыя пазіцыі ў паветах Вялікага Княства Літоўскага, увага амаль не звярталася. Да гэтага часу такая праца ў асноўным праводзіцца аматарамі і выконваецца з хібамі, характэрнымі для людзей без грунтоўнай універсітэцкай адукацыі. У той жа час іх даследаванне мае выключнае значэнне для стварэння інфармацыйнай базы, што несумненна будзе выкарыстана спецыялістамі ў сферы генеалогіі шляхты ВКЛ.

Можна прывесці некалькі прыкладаў паспяховай пошукавай і аналітычнай працы аматараў-даследчыкаў. Так, Анатоль Чабаганаў-Стэцкевіч ажыццявіў грунтоўную распрацоўку генеалогіі Стэцкевічаў і параднёнай з імі шляхты. Яго кнігі не толькі папаўняюць нашы веды па гісторыі ВКЛ, але ў стане служыць важкім падмуркам для правядзення далейшых генеалагічных росшукаў у дачыненні да іншых літоўскіх і русінскіх шляхецкіх родаў. Віктар Крэсс даследуе генеалогію шляхецкага роду Панятоўскіх з Панят на Падляшшы і параднёнай з ім шляхты. Валянцін Калечыц праводзіць даследаванне роду Сасіных Калечыцкіх. Аб'ектам увагі Мікалая Мурашкі з'яўляюцца абставіны жыцця каралеўскага палкоўніка Дыянісія Мурашкі. Грунтоўна даследуе генеалогію роду віленскага войта Тамаша Більдзюкевіча яго нашчадак Леанід Бенядыктовіч. Гурток аматараў пад кіраўніцтвам Зміцера Юркевіча даследуе абставіны жыцця і трагічнай смерці Тадэвуша Рэйтана, нацыянальнага героя Беларусі і Польшчы, а таксама яго радавод. Гэтыя даследчыкі сабралі вялікі факталагічны матэрыял і пры завяршэнні сваёй працы змогуць праліць святло на многія важныя падзеі мінулага.

Нашу ўвагу прыцягнулі прадстаўнікі роду Уніхоўскіх, якія з пачатку XVII ст. і да канца XVIII ст. уваходзілі ў склад эліты Менскага павета і на працягу двух стагоддзяў адыгрывалі важную ролю ў кіраванні ім. Уніхоўскія трымалі ўрады харужых, стольнікаў, суддзяў і пісараў земскага суда Менскага павета. Чытачам прапануецца праца, прысвечаная жыццю і дзейнасці Казіміра Караля Уніхоўскага, які на працягу амаль

чвэрці стагоддзя, з 1704 г. і да сакавіка 1731 г., займаў вельмі важную ў жыцці Менскага павета пасаду пісара Менскага земскага суда. Спадзяемся, што прадстаўленыя ўвазе чытачоў матэрыялы будуць выкарыстаны для працягу даследаванняў гісторыі роду Уніхоўскіх.

Згодна з даследаваннямі гісторыкаў, продкі Уніхоўскіх перасяліліся на захад ВКЛ пасля захопу Вялікім Княствам Маскоўскім літоўскіх зямель на Севершчыне. На нашу думку, гэта адбылося яшчэ ў канцы XV ст. або ў самым пачатку XVI ст.

Першым з гэтага роду перасяліўся з Наваградчыны ў межы Менскага павета Януш Уніхоўскі, дзед Аляксандра, суддзі, і Казіміра, пісара, земскіх менскіх. У 1601–1603 гг. Януш Уніхоўскі набывае ў Мікалая Глябовіча, старасты анікшцянскага, маёмасць Вяпраты. Землі гэтага сяла межаваліся з калачоўскай дзяржавай. У 1621 г. Януш Уніхоўскі атрымаў прывілей Жыгімонта III на ўрад харужага менскага. Сын харужага менскага Казімір Уніхоўскі пасля смерці Тамаша Касакоўскага, кашталяна віцебскага, каля 1662 г. узяў шлюб з яго ўдавой Канстанцыяй Корсакаўнай, маршалкоўнай мазырскай. Да 1679 г. Казімір Уніхоўскі здолеў атрымаць каралеўскі прывілей на стольнікаўства менскае, але не ўтрымаўся на гэтым уладзе. Меў некалькі судовых працэсаў з Ежы Рудаміна Дусяцкім, які таксама атрымаў каралеўскі прывілей на пасаду стольніка менскага, але на некалькі дзён раней, чым гэта ўдалося зрабіць Уніхоўскаму. Прызнаў сваё паражэнне толькі пасля атрымання каля 1685 г. прывілея на харужаства менскае.

У другой палове 80-х гадоў XVII ст. Казімір і Канстанцыя Уніхоўскія правялі некалькі судовых працэсаў з нашчадкамі памерлага маршалка мазырскага, незадаволеных падзелам маёмасці, якая засталася пасля смерці бацькоў. 17 ліпеня 1688 г. у каралеўскім задворным судзе сустрэліся Сымон Корсак, князь Казімір Агінскі, ваявода мсціслаўскі, Тэадора Корсакаўна, маршалкоўна мазырская, Геронім Корсак, маршалковіч і войскі мазырскі, і Казімір Уніхоўскі, харужы менскі [25, арк. 665].

Памёр Казімір Уніхоўскі, харужы менскі, у пачатку 90-х гадоў XVII ст.

У шлюбе Казіміра і Канстанцыі Корсакаўны Уніхоўскіх, харужых менскіх, акрамя Аляксандра Юзафа і Казіміра Караля Уніхоўскіх, аб якіх гаворка пойдзе ніжэй, нарадзілася і некалькі дачок. На дадзены момант вядома аб Фларэнцыі і Дароце. Першы шлюб Фларэнцыя ўзяла з Дамінікам Пашкоўскім, сынам Уладзіслава Пашкоўскага і Дароты з Кастравіцкіх. Стольнік менскі вызначыў пасаг Фларэнцыі ў памеры 8000 злотых, якія былі забяспечаны коштам сяла Шчытамержыцы. Уладзіслаў Пашкоўскі ў сваім тастаменце запісаў сыну 18000 злотых, якія забяспечваліся коштам частак сёл Пашковічы і Дукора. Аднак паміж сваякамі ўзніклі маёмасныя непаразуменні. Толькі 8 студзеня

1681 г. Дарота з Кастравіцкіх разам са сваім другім мужам Станіславам Заблоцкім, стольнікам закрачымскім, прыйшла да пагаднення з Каралем Уніхоўскім, харужыцам і стольнікам менскім, аб памерах пасагу і адмове ад прэтэнзій на грошы, каштоўнасці, землі, быдла рагатае і нерагатае, што знаходзіліся ў карыстанні стольніка менскага [15, арк. 451].

Фларэнцыя з Уніхоўскіх, харужанка менская, склала тастамент 6 кастрычніка 1724 г., ужо будучы замужам за Сымонам Хмарам, падчашым мсціслаўскім [8, арк. 769]. У шлюбе дзяцей не было і Фларэнцыя Хмарыная свае грошы і рухомую маёмасць пакінула ўнуку Якубу Рэпніцкаму, а таксама Петранэле Адзінцоўне і Фрузыне Варанцоўне [5, арк. 1074]. Частку сваіх зямель пакінула дзецям Яна Рафала Кастравіцкага, пісара земскага менскага, і Дароты Уладзіслававай Пашкоўскай, а ў другім шлюбе Станіслававай Заблоцкай, стольнікавай закрачымскай [9, арк. 838]. Нейкія сумы грошай былі запісаны пані Хмарынай сваім пляменніцам, дочкам Казіміра Караля Уніхоўскага, пісара земскага менскага.

Аб жыцці Дароты Уніхоўскай звестак захавалася вельмі мала. 27 лютага 1733 г. незадоўга да смерці яна запісала сваёй пляменніцы Брыгідзе Уніхоўскай некаторыя грашовыя сумы [16, арк. 365–367].

За перыяд з 1566 г. і да 1793 г. на пасадзе пісара земскага змянілася восем асоб. Харужыц менскі Казімір Караль Уніхоўскі ў гэтым спісе аказаўся перадапошнім. Апошнім мы лічым Антонія Свентарэцкага, які абраны на пасаду ў 1764 г., пасля аднаўлення дзейнасці ў Менскім павеце земскага суда.

На нашу думку, у Казіміра Уніхоўскага шансы на заняцце пасады пісара былі вельмі мізэрныя. Пасля смерці ў пачатку 30-х гадоў XVII ст. Мікалая Вяжэвіча гэта пасада на доўгі час апынулася ў трыманні прадстаўнікоў роду Валадковічаў: Крыштофа, пасля 1658 г. ваяводы навагрудскага і войта менскага, яго зводнага брата Тэадора і, нарэшце, з 1689 г. іх пляменніка Марціна Казіміра Валадковіча. Пасля смерці Марціна Казіміра Валадковіча каля 1703 г. пачалася зацятая барацьба сярод менскай павятовай шляхты за атрыманне гэтай пасады. Нам невядомы імёны і прозвішчы ўсіх кандыдатаў (электаў) на яе, але з'яўляецца несумненным, што сярод іх быў і сын былога земскага пісара, менавіта Францыск, гараднічы менскі. Ён неаднаразова замяняў свайго бацьку на пасадзе падчас яго адсутнасці і меў некаторы вопыт у выкананні абавязкаў пісара земскага суда. У канцы XVII ст. многія абывацелі Менскага павета лічылі яго сапраўдным пісарам земскім менскім. Валадковічы спадзяваліся на падтрымку ў справе заняцця гэтай пасады з боку сваіх родзічаў — Радзівілаў і Сапегаў. Акрамя таго, яны знаходзіліся ў вельмі добрых адносінах з прадстаўнікамі роду Завішаў, якія з сярэдзіны пер-

шай паловы XVII ст. і да верасня 1738 г., займалі пасаду старасты судовага менскага.

Да пачатку грамадзянскай вайны ў ВКЛ вялікім уплывам у Менскім павеце карыстаўся Крыштоф Станіслаў Завіша, староста судовы менскі. У ліку яго дарадчыкаў згадваюцца Марцін Казімір Валадковіч і яго сын Дамінік. Аднак падчас вайны Крыштоф Завіша апынуўся ў лагеры прыхільнікаў Казіміра Яна Паўла Сапегі, былога гетмана ВКЛ і ваяводы віленскага. Рэспубліканцы, якія падтрымлівалі новаабранага караля Аўгуста II Моцнага, з дапамогай расійскіх войскаў нанеслі сапежынцам некалькі паражэнняў. Не дапамагло ім і ўступленне ў саюз са шведскім каралём Карлам XII. Улічваючы знаходжанне Крыштофа Станіслава Завішы ў лагеры Сапегі, шляхта, якая падтрымлівала Аўгуста II, на Люблінскім сойме і Генеральная канфедэрацыя пад Сандамірам аб'явілі Завішу банітам. Аўгуст II пазбаўляе Крыштофа Завішу пасады і 23 лістапада 1704 г. падпісвае прывілей Аляксандру Уніхоўскаму, суддзі земскаму менскаму, на староства менскае [22, арк. 1323].

На грамнічным павятовым сойміку 1704 г., які адбыўся ў пачатку лютага, менская шляхта абрала чатырох кандыдатаў, і асаблівым лістом накіравала просьбу да караля Аўгуста II Моцнага аб выбары з іх ліку найбольш годнага і заслужанага перад каралём і краінай для заняцца пасады пісара земскага. Для ўдзелу ў выбарах дапускаліся толькі асобы, якія мелі зямельную ўласнасць у межах павета і былі дасведчанымі ў выкананні пісарскіх абавязкаў. Не дапускаліся да ўдзелу ў выбарах і прыхільнікі Сапегі. 20 сакавіка 1704 г. Казімір Караль Уніхоўскі, харужыц менскі, атрымаў прывілей на пісарства земскае менскае [22, арк. 1242]. Несумненна, што рашаючую ролю ў забеспячэнні Казіміра Караля Уніхоўскага высокай пасадай пісара земскага менскага адыграў вышэйзгаданы старэйшы брат Аляксандр Юзаф Уніхоўскі, які з 1695 г. знаходзіўся на пасадзе суддзі земскага менскага. Аляксандр Уніхоўскі з'яўляўся адным з найбольш верных прыхільнікаў Аўгуста II у Менскім павеце.

Праз некаторы час былы староста судовы менскі ўсвядоміў, што праўда ўсё-такі на баку рэспубліканцаў, прызнаў свае былыя памылкі і прынёс прысягу на вернасць Аўгусту II. Пасаду старасты судовага менскага Крыштофу Завішу вярнулі, аднак пасада пісара земскага засталася пажыццёва за Казімірам Уніхоўскім. Верагодна Валадковічы не прадпрымалі выразных крокаў да яе вяртання ў свае рукі.

Зразумела, што кароль польскі і вялікі князь літоўскі пасля вяртання пасады старасты судовага менскага Крыштофу Завішу пастараўся не пакрыўдзіць Аляксандра Уніхоўскага. 31 кастрычніка 1709 г. Аўгуст II пасля смерці Гротуша падпісвае яму прывілей на заняцце высокай сенатарскай пасады кашталяна жмудзьскага [27, s. 142]. На нашу думку,

мясцовая шляхта не выказала падтрымкі такому рашэнню караля. Прызнанне гэтай пасады за Уніхоўскім адбылося толькі ў 1718 г.

Неабходна адзначыць, што атрыманне пасады кашталяна не прывяло да адмовы Аляксандра Уніхоўскага ад выканання абавязкаў суддзі земскага менскага. Ён засядаў у Менскім земскім судзе да самай смерці ў 1722 г. Такім чынам, з 1704 г. і па 1722 г. самыя важныя пасады ў Менскім земскім судзе, менавіта суддзі і пісара, адначасова займалі родныя браты Уніхоўскія.

Як для Менскага павета, так і для ўсяго Вялікага Княства Літоўскага адначасовае заняцце пасад у гродскіх і земскіх судах асобамі, якія знаходзіліся ў кроўным сваяцтве, было звычайнай справай. У канцы 80-х гадоў XVII ст. у Менскім земскім судзе на пасадзе падсудка знаходзіўся Міхал Станіслаў Валадковіч, а на пасадзе пісара яго стрый (дзядзька па бацьку) Тэадор Валадковіч. Пасля смерці апошняга пасаду пісара земскага менскага заняў яго другі пляменнік Марцін Казімір Валадковіч. Праз некаторы час Міхал Станіслаў заняў пасаду суддзі і выконваў свае абавязкі да 1695 г.

Звесткі пра маладыя гады Казіміра Уніхоўскага, харужыца менскага, адсутнічаюць. На нашу думку, гэта звязана з вялікім пажарам, які ў пачатку 60-х гадоў XVIII ст. знішчыў амаль усе архівы судоў Менскага павета. Улічваючы, што яго бацькі ўзялі шлюб каля 1662 г., то паўналецця ён мог дасягнуць каля 1690 г. Першая згадка пра гэту асобу, якая трапіла ў рукі, датуецца 1692 г. У гэтым годзе ён атрымлівае запіс ад свайго кроўнага, ваяводы трокскага Багуслава Аляксандра Уніхоўскага, на маёнтак Бардуковічы ў Наваградскім павеце з 16 службаў [27, s. 113].

Казімір Уніхоўскі, яшчэ да свайго абрання на пасаду ў Менскім земскім судзе, актыўна ўдзельнічаў у палітычным жыцці Менскага павета. У канцы 1700 г. кароль, для вырашэння спрэчнага пытання па валоданні добрамі ў ваколіцах Менска, прызначае камісарамі Казіміра Уніхоўскага, харужыца менскага, Адама Янішэўскага, пісара гродскага менскага, і Яна Грыгаровіча [22, арк. 827]. На нашу думку, гэта не першы выпадак яго ўдзелу ў грамадскім справах павета. Кіраўніцтва Княства палічыла мэтазгодным выкарыстанне здольнасцей Уніхоўскага для прымірэння жыхароў каралеўскага места Менска з менскім войтам. На некаторыя землі, якімі з даўніх часоў карысталіся менскія месцічы, прад'явіў прэтэнзіі і новапрызначаны менскі войт, менавіта Антоні Кастравіцкі, падсудковіч земскі менскі.

У пачатку 1702 г. Казіміра Уніхоўскага разам з Антоніем Кастравіцкім, менскім войтам, на грамнічным сойміку той часткі менскай павятовай шляхты, якая падтрымлівала Аўгуста II, абіраюць дэпутатам Галоўнага Трыбунала ВКЛ [26, s. 49]. Грамадзянская вайна ў ВКЛ прывяла да падзелу Галоўнага Трыбунала на дзве часткі. У Вільні пад маршалкоў-

ствам Крыштофа Станіслава Завішы засядалі прыхільнікі Казіміра Яна Паўла Сапегі. У Менску пад старшынствам Міхала Казіміра Катла, кашталяна трокскага, — антысапежынцы. У пачатку дзейнасці той часткі Галоўнага Трыбунала, якая засядала ў Менску, Казіміра Уніхоўскага, дэпутата ад Менскага павета, абіраюць пісарам для працы на менскай кадэнцыі гэтай вышэйшай судовай установы княства [14, арк. 466–467]. Згодна з правам, якое дзейнічала ў ВКЛ, такую пасаду павінен займаць земскі пісар таго павета, у якім праводзіліся пасяджэнні Галоўнага Трыбунала ВКЛ, але Марціна Казіміра Валадковіча, западозранага ў сувязях з сапежынцамі, адхілілі ад удзелу ў працы гэтай установы.

9 лютага 1707 г., у час самых цяжкіх для краіны выпрабаванняў, адбыўся чарговы соймік менскай шляхты. Улічваючы ваенныя дзеянні расійскіх і шведскіх войскаў і іх саюзнікаў з ліку мясцовай шляхты, на тэрыторыі княства не ўся шляхта змагла прыняць удзел ў яго працы. На сойміку Казіміра Уніхоўскага абіраюць дырэктарам, і ён праводзіць выбары дэпутатаў у Галоўны Трыбунал ВКЛ [3, арк. 421]. Паколькі большасць паветаў не праводзіла выбараў дэпутатаў Галоўнага Трыбунала ВКЛ, а там дзе яны і былі праведзены з прычыны злоўжыванняў іх вынікі скасаваны, то ў гэтым годзе вышэйшая судовая ўстанова Княства не працавала [26, s. 64].

Як і ў кожнага судовага ўрадніка Вялікага Княства Літоўскага, у Казіміра Уніхоўскага меліся вялікія грашовыя сумы, якія ён з ахвотай даваў у пазыку. У 1717 г. ён пазычае Абунданцыі Тэафілавай Жыжэмскай, пісаравай гродскай менскай, дачцэ Яна Рафала Кастравіцкага, падсудка земскага менскага, вялікую суму грошай і атрымлівае ў сваё распараджэнне на адзін год, да вяртання пазыкі, фальварак Шукелеўшчына [6, арк. 5]. Аднак потым справы ў гаспадыні Шукелеўшчыны пайшлі не так, як меркавалася ў самым пачатку, і тэрмін заставы прыйшлося прадоўжыць амаль на дзесяць гадоў. Толькі 30 верасня 1726 г. усе разлікі па пазыцы былі скончаны, і фальварак вярнуўся ў валоданне пані Абунданцыі. 6 мая 1724 г. пісар земскі менскі за вялікую пазыку атрымлівае ад Бенядыкта Багушэвіча Мінькоўскага, скарбніка менскага, у сваё карыстанне, да часу вяртання пазычаных грошай, вёску Міхалавічы, аддзеленую ад Шацка [5, арк. 991]. 12 красавіка 1730 г. Вайдзевіч, стольнік драгіцкі, пазычае ва Уніхоўскага 500 бітых талераў, вялікую па тых часах суму, і перадае яму ў часовае карыстанне свой фальварак [6, арк. 845]. Спіс асоб, якія пазычалі ў пісара земскага менскага грошы, можна яшчэ доўжыць.

Казімір Уніхоўскі не толькі даваў грошы ў пазыку, але і пры неабходнасці пазычаў. Не з усімі пазыкамі ён разлічыўся пры жыцці, таму і ў сваім тастаменце запісаў дзецям аб неабходнасці грашовых выплат розным асобам. У Лявона Паўла Валадковіча для сваіх асабістых па-

трэб пазычана 3000 бітых талераў, Маеўскаму і Вольскаму неабходна было вярнуць 2000 талераў, а Тамашу Жыдовічу — 2500 бітых талераў. Ён трымаў у заставе Данілавічы і Хатляны ад Ежы Гезгайлы Завішы, харужага менскага, і частку Лукаўца ад Казіміра Шумскага, суддзі земскага віленскага. У той жа час частка маёнтка Русаковічы знаходзілася ў часовым карыстанні Каспара Васілеўскага, а ў Антонія Кастравіцкага, былога войта, а затым падстолія менскага, меліся ў трыманні фальваркі Жданы і Пласкаўшчына, якія былі застаўлены за 3000 злотых [6, арк. 1171]. Другая частка маёнтка з вёскамі Цеплень, Русаковічы і Асака знаходзілася ў заставе ў нашчадкаў Тэафіла Жыжэмскага, пісара гродскага менскага.

Першы свой шлюб Казімір Уніхоўскі, яшчэ да 1703 г., узяў з Кацярынай з Багушэвічаў, якая пасля вяселля неўзабаве памерла [2, арк. 80]. На нашу думку, яна была дачкой Стэфана Багушэвіча Мінькоўскага, падчашага аршанскага, і сястрой Бенядыкта, скарбніка менскага. Дзяцей у шлюбе не было, і ўсю сваю спадчыну і пасагавыя сумы Кацярына з Багушэвічаў Казіміравая Уніхоўская пакінула сваім сястражэнніцам (пляменніцам, дочкам сясцёр). Казімір Караль Уніхоўскі і пасля смерці жонкі працягваў падтрымліваць вельмі прыязныя адносіны з сям'ёй Бенядыкта Багушэвіча Мінькоўскага, скарбніка менскага. Да 3 жніўня 1725 г. памірае сын апошняга Стэфан, і ў спісе апекуноў дзяцей і жонкі памерлага мы сустракаем імя Казіміра Уніхоўскага [5, арк. 1247].

Другі шлюб каля 1710 г. Казімір Уніхоўскі ўзяў з Ганнай з Францкевічаў Радзімінскіх, чашнікаўнай ашмянскай. У канцы 20-х гадоў XVIII ст. Ганна з Францкевічаў Радзімінская Казіміравая Уніхоўская, пісаравая земская менская, аказалася ўцягнутай у барацьбу са сваімі роднымі братамі і сёстрамі за спадчыну памерлых бацькоў. Яе бацька Браніслаў Францкевіч Радзімінскі, чашнік ашмянскі, стараста кушліцкі, памёр да 1717 г., а маці Канстанцыя Хамінская ўзяла другі шлюб з Міхалам Козелам Паклеўскім, старастам кармялоўскім [28, № 1287, s. 219], і хутчэй за ўсё пакінула гэты свет каля 1725 г. Спрэчкі па падзелу спадчыны былі скончаны да 4 чэрвеня 1728 г. У гэты дзень Галоўны Трыбунал ВКЛ зацвердзіў дзельчы запіс, складзены паміж дзецьмі ашмянскага чашніка. Браты і сёстры Канстанты, Юзаф і Тэадор, Людвіка Качынская (судзічовая вількамірская), Ганна Уніхоўская (пісаравая земская менская), нарэшце, прыйшлі да пагаднення адносна падзелу маёмасці, якая засталася пасля смерці іх бацькі [13, арк. 321]. У запісе ўпамінаецца і іх родны брат, Тэадор Францкевіч Радзімінскі, лоўчы ашмянскі, які памёр каля 1709 г., не пакінуўшы нашчадкаў. Верагодна, і на яго выдзялялася пэўная доля бацькоўскай спадчыны. Яшчэ адзін брат Ганны Уніхоўскай Андрэй Казімір Францкевіч Радзімінскі, стараста суражскі, па нейкіх

прычынах не ўпамінаецца сярод асоб, якія ўдзельнічалі ў складанні дзельчага запісу [28, № 1083, s. 190; № 1428, s. 234].

6 жніўня 1722 г. Казімір і Ганна з Францкевічаў Радзімінскіх Уніхоўскія набылі пляц у Менску па вуліцы Койданаўскай у бурмістра менскага Базыля Мазуркевіча [18, арк. 167]. Размяшчаўся пляц з усімі забудовамі ў самым цэнтры тагачаснага Менска.

У сям'і Казіміра і Ганны з Францкевічаў Радзімінскіх Уніхоўскіх нарадзілася некалькі сыноў і дачок. Вядомы імёны яго сыноў Януша, Феліцыяна, Аляксандра і Францыска, які пачынаючы з 1765 г., займаў пасаду суддзі земскага Менскага павета.

У нашым распараджэнні аказалася згадка аб нараджэнні ў гэтай сям'і Януша, якая тычыцца 1688 г. [24, арк. 707]. Верагодна, што ён памёр у маладым узросце, не пакінуўшы значных слядоў у дакументах судоў Менскага павета. Вельмі мала пражыў на гэтым свеце і Феліцыян Уніхоўскі, харужыц менскі. Яго не стала ў 1708 г. У Пухавічах на яго напалі людзі ворага Уніхоўскіх, ксяндза Мікалая Прэрадоўскага. Падчас бойкі Феліцыяна Уніхоўскага пасеклі на смерць [4, арк. 213].

29 верасня 1730 г. Казімір Уніхоўскі складае тастамент, які 7 сакавіка 1731 г. Ганна Радзімінская, ужо пасля смерці мужа, уносіць у актавыя кнігі Менскага гродскага суда для актыкацыі [6, арк. 1171].

Сваё «грэшнае цела» Уніхоўскі прасіў пахаваць на могілках езуіцкага касцёла. Атрымаць дазвол на пахаванне на гэтых могілках мог не кожны жыхар горада Менска. На працягу жыцця пісар земскі менскі аказваў пратэкцыю менскім езуітам. Падчас працы ў Галоўным Трыбунале ВКЛ неаднаразова абараняў інтарэсы Менскага калегіума і нават дабіўся прадстаўлення палёгкі па аплаце розных паборaў у скарб княства. Але, нягледзячы на свае заслугі перад кляштарам, яму прыйшлося выдаткаваць вялікія сумы грошай на атрыманне месца ля яго сцен. За месца для пахавання ён заплаціў кляштару 300 польскіх злотых. Яшчэ столькі ж унёс на кангрэгацыю. За імшу пасля пахавання цела памерлага пісара патрабавалася выплаціць 1000 злотых. Прычым імша павінна была адбывацца яшчэ на працягу наступных трох месяцаў. За яе правядзенне езуіты запрасілі яшчэ 500 злотых.

Не былі забыты і іншыя кляштары і касцёлы ў Менску і яго ваколіцах. Менскія касцёлы францысканцаў, дамініканцаў, бенядыктынцаў, кармелітаў і баніфратраў атрымалі запісы ад пісара земскага менскага на 300 злотых кожнаму. На царкву Святога Духа ў Менску было выдзелена таксама 300 злотых.

Складаючы апошнюю сваю волю, пісар земскі менскі пастараўся прадугледзець усе магчымыя абставіны. Не жадаючы ўзнікнення пасля яго смерці нязгод паміж жонкай і дзецьмі, старанна распісаў усе свае набыткі. Асноўная частка яго спадчыны павінна была перайсці ў вало-

данне сыноў Францыска і Аляксандра. Паміраючы, Казімір Уніхоўскі прасіў дзяцей выкупіць у спадчыннікаў менскага гродскага пісара Тэафіла Жыжэмскага землі сяла Русаковічы з усімі прылеглымі вёскамі. Русаковічы павінны былі перайсці ў валоданне Францыска, якому ён пакідаў таксама сваю зброю — шаблю і два палашы.

Ёсць звесткі, што Францыск Уніхоўскі да 1747 г. знаходзіўся ў шлюбе з Розай з Прашынскіх [19, арк. 251]. Ніякай інфармацыі пра гэту жанчыну нам не ўдалося знайсці. Да 1752 г. Францыск Уніхоўскі, пісарэвіч земскі менскі, узяў шлюб з Тэрэзай Булгарынаўнай. Да сярэдзіны 1750 г. яна знаходзілася ў шлюбе з Янам Валадковічам, падсудковічам менскім. У іх сям'і нарадзілася дачка Канстанцыя, якая ўзяла шлюб з Аляксандрам Гарайнам, войскім віленскім.

Пасля смерці Казіміра Караля Уніхоўскага, якая адбылася каля 1731 г., па нейкіх прычынах, у Менскім павеце не адбыліся выбары электаў на вакантную пасаду пісара земскага. Пасада суддзі земскага пасля смерці ў 1722 г. Аляксандра Уніхоўскага таксама заставалася вакантнай. З 1725 г. пасля смерці Стэфана Валадковіча не быў абраны падсудак Менскага ваяводства. 25 сакавіка 1731 г. Аўгуст II падпісвае прывілей Тэафілу Жыжэмскаму, былому пісару гродскаму менскаму, на сурагаторыю менскую [23, арк. 385]. На пасадзе сурагатара Менскага ваяводства пасля Тэафіла Жыжэмскага па чарзе засядалі: Андрэй Бенядыкт Карніцкі, лоўчы і падстараста судовы гродскі менскі, Міхал Жыжэмскі, у канцы жыцця войскі, а потым і падкаморы менскі, Ігнацы Цэлестын Свянціцкі, старасціч данілавіцкі, і нарэшце, Ігнацы Свентарэцкі. Менскія сурагатары займаліся толькі актыкацыяй дакументаў аб продажы і набыцці зямель, аб адмове ад правоў на валоданне землямі і маёмасцю, аб памерах пасагу і выправы. Менавіта ў гэты час у многіх паветах ВКЛ земскія суды былі адменены і ўведзена сурагаторыя. У 1735 г. земскі суд адсутнічаў у Наваградскім ваяводстве, на 28 жніўня 1739 г. дзейнічала сурагаторыя ў Берасцейскім і Слонімскім паветах, у 1741 г. адзначана яе існаванне ў княстве Жмудзьскім, а ў 1744 г. і ў Інфлянтах.

У 1764 г. пасля каранацыі Станіслава Аўгуста ў Менскім павеце ўзнаўляецца дзейнасць земскага суда. На павятовым сойміку менская шляхта выбірае 4 суддзяў і пісара. Ліст з вынікамі галасавання шляхты дасылаецца Станіславу Аўгусту, і кароль 27 сакавіка 1765 г. зацвярджае Францыска Уніхоўскага другім суддзёй земскім Менскага павета [12, арк. 9]. Апошні займаў пасаду кіраўніка Менскага земскага суда і ў 1795 г.

У канцы першай паловы XVIII ст. Уніхоўскія пачынаюць карыстацца прыдомкам з Радагошча. Яшчэ ў канцы XV ст. валоданні Якава і Андрэя Радагашчанінаў, продкаў Уніхоўскіх, на ўсходзе ВКЛ былі захоплены Масквой, і яны атрымалі ад каралёў польскіх і вялікіх князёў

літоўскіх валоданні каля Навагрудка ў маёнтку Уніхова. Найбольш часта карыстаўся прыдомкам Аляксандр Уніхоўскі. Да 19 сакавіка 1748 г. Аляксандр Радагошч Уніхоўскі ўзяў шлюб з зямянкай Менскага павета Марыянай Свентарэцкай, дачкой Ежы Свентарэцкага, скарбніка вількамірскага, і Іааны са Станкевічаў, чашнікаўны менскай [7, арк. 576]. Праз пяць гадоў Марыяны не стала. Дзяцей у шлюбе не было, і 10 лістапада 1753 г. Юзаф Свентарэцкі, брат Марыяны, і іх маці Іаана са Станкевічаў выклікалі ў суд пісарэвічаў земскіх менскіх, патрабуючы вяртання пасагу і выправы. 23 красавіка 1754 г. Францыск Уніхоўскі цалкам разлічыўся з кроўнымі памерлай братавай: вярнуў выправу і адлічыў 6000 чырвоных злотых пасагу [21, арк. 584].

У сям'і пісара земскага менскага нарадзілася і некалькі дачок. На сённяшні дзень нам вядомы імёны чатырох: Брыгіды, Ганны, Канстанцыі і Кацярыны. Бацька запісаў ім па 15000 польскіх злотых. Такі пасаг лічыўся на той час вельмі вялікім [16, арк. 365–367]. У выпадку рашэння дачок прысвяціць сваё жыццё служэнню Богу ў адным з менскіх жаночых кляштараў, памеры грашовай сумы змяншаліся і не павінны былі перавышаць 5000 злотых. На час смерці бацькі Кацярына і Канстанцыя яшчэ не былі ў шлюбе і абавязак выдання замуж сясцёр і выплаты пасагу дзеля забеспячэння іх сямейнага жыцця лёг на Францыска і Аляксандра.

Да 29 верасня 1730 г., яшчэ пры жыцці бацькі, Брыгіда ўзяла шлюб з Паўлам Бучынскім, лоўчым смаленскім. 10 мая 1747 г. Брыгіда з Уніхоўскіх Бучынская скардзілася, што яе маці з дазволу сыноў і яе самой да 17 ліпеня 1737 г. узяла шлюб з Уладзіславам Міхалам Ельскім, старастам пінскім і палкоўнікам пяцігорскім, і яму запісала ўсе грошы, а на сваю дачку не выдзеліла ні аднаго злотага [10, арк. 330; 19, арк. 74]. Пры гэтым мужу яна запісала 10000 злотых [1, арк. 134]. Да 1756 г. у сям'і Бучынскіх нарадзіліся дзве дачкі (Людвіка і Гелена) і два сыны (Тамаш і Міхал) [11, арк. 1684]. Да 20 красавіка 1759 г. Павел Бучынскі памірае і Брыгіда з Уніхоўскіх бярэ шлюб з Гервазіем Залескім, будаўнічым мазырскім [17, арк. 315]. Гервазі Залескі, зямянін Аршанскага павета, у якасці патрона (адваката) прымаў удзел у вырашэнні спраў, якія разглядаліся ў судах павета. Гервазі і Брыгіда Залескія згадваюцца ў судовых дакументах яшчэ і ў 1774 г. [16, арк. 365].

Кацярына двойчы брала шлюб. Спачатку з Ежы Белазорам, а пасля яго заўчаснай смерці з Раманам з Яксаў Быкоўскім, стольнікавічам менскім і старастам раваніцкім, сынам Стэфана, былога скарбніка мсціслаўскага і суддзі гродскага менскага. Ужо пасля смерці маці Ганны з Радзімінскіх Францкевічаў, 16 лютага 1747 г. яны выклікалі ў Менскі гродскі суд Аляксандра і Францыска Уніхоўскіх, пісарэвічаў земскіх менскіх, з патрабаваннем перадаць у іх валоданне не толькі спадчыну па

маці, але і некаторыя бацькоўскія землі і грошы, якія засталіся ў карыстанні братоў [11, арк. 595]. Верагодна перамовы скончыліся ўзаемнымі саступкамі. 8 лютага 1748 г. Раман і Кацярына з Уніхоўскіх Быкоўскія, старасты раваніцкія, складаюць «зрэчны», квітацыйны запіс Францыску і Аляксандру Уніхоўскім, пісарэвічам земскім менскім, аб адмове ад прэтэнзій на маёмасць, грошы і землі, якія павінны былі заставацца ў братоў пасля разлікаў з Быкоўскімі па пасагу пані Кацярыны [15, арк. 458]. Асобным радком у дакуменце пазначана аб неабходнасці выплаты Кацярыне 2000 злотых, якія пакінула ёй яе бабуля Белазоравая з князёў Агінскіх, старасціна каўранская.

Канстанцыя Уніхоўская, пісараўна земская менская, узяла шлюб з Антоніем Байкоўскім, старастам жыцінскім. У большасці адшуканых намі дакументаў Антоні Рэйводскі Байкоўскі, сын Міхала і Рахелі з Глінкаў, стражнікаў смаленскіх, пазначаўся ў якасці старасты тутліцкага. Апошняя згадка пра Канстанцыю Уніхоўскую Антоніевую Байкоўскую сустрэлася нам у дакуменце, складзеным 20 сакавіка 1756 г. [20, арк. 298]. За пазыку ў 1000 польскіх злотых Байкоўскія атрымалі ад Яна і Фрузыны Трасніцкіх фальварак Пенязёўшчына, які знаходзіўся ў межах Кораньскай парафіі Менскага павета. Неўзабаве Канстанцыя Уніхоўская памірае і ўдавец бярэ новы шлюб з Тэрэзай з Крукоўскіх. Да 19 кастрычніка 1765 г. зыходзіць са свету і пані Тэрэза з Крукоўскіх [17, арк. 362].

Мала звестак захавалася пра Ганну, якая памерла да 8 жніўня 1741 г., яшчэ будучы зусім маладой [16, арк. 1171].

Верагодна не ўсё было зроблена братамі ў адпаведнасці з апошняй воляй бацькі. На працягу многіх гадоў шурыны і сёстры, а потым і іх дзеці дакучалі Францыску Уніхоўскаму адносна выплаты належнага. Толькі 10 мая 1747 г. нашчадкі памерлага земскага пісара правялі актыкацыю вячыстага квітацыйнага запісу аб завяршэнні падзелу маёмасці бацькі [19, арк. 74–75 адв.]. Аднак, пэўна, разбіральніцтвы доўжыліся, бо сам тастамент Казіміра Караля Уніхоўскага, а таксама большая частка квітацыйных лістоў зяцёў і сясцёр былі актыкаваны Францыскам Уніхоўскім, які ўжо займаў пасаду прэзідэнта судоў земскіх Менскага ваяводства, у актавых кнігах Менскага земскага суда толькі ў 1786 г. [15, арк. 454, 458].

Жыццяпіс Казіміра Караля Уніхоўскага дазваляе вызначыць асноўнае кола жыццёвых дылем і пытанняў, што паўсталі перад шляхцічам-грамадзянінам у небяспечны, імклівы і клапатлівы час грамадзянскай і Паўночнай войнаў, вызначыць жыццёвыя прыярытэты заможнага ўрадоўцы ВКЛ і яго родзічаў, назіраць праявы шматграннага чалавечага лёсу.

Крыніцы і літаратура

1. Анішчанка, Я. Ураднікі беларускіх земляў ВКЛ у першай палове XVIII ст. Спісы на рускай мове / Збор твораў у шасці тамах. — Мінск : В. Хурсік, 2010. — Т. 6. — 392 с.
2. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей НГАБ). — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 4. — Актавая кніга Менскага гродскага суда. 02.01.1703–31.12.1706. — 1247 арк.
3. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 5. — Актавая кніга Менскага гродскага суда. 02.01.1705–18.12.1709. — 1086 арк.
4. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 6. — Актавая кніга Менскага гродскага суда. 05.02.1707–20.12.1711. — 892 арк.
5. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 8. — Актавая кніга Менскага гродскага суда. 03.01.1720–09.12.1726. — 1544 арк.
6. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 9. — Актавая кніга Менскага гродскага суда. 07.01.1727–30.12.1732. — 1785 арк.
7. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 11. — Актавая кніга Менскага гродскага суда. 28.01.1746–29.12.1751. — 1346 арк.
8. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 39. — Дэкрэтавая кніга Менскага гродскага суда. 05.04.1718–11.12.1722. — 1389 арк.
9. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 41. — Дэкрэтавая кніга Менскага гродскага суда. 08.01.1728–21.05.1738. — 1864 арк.
10. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 59. — Паточная кніга Менскага гродскага суда. 07.01.1737–17.08.1738. — 1138 арк.
11. НГАБ. — Ф. 1727. — Воп. 1. — Спр. 107. — Паточныя пратаколы Менскага гродскага суда. 03.01.1736–31.12.1760. — 2129 арк.
12. НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 4. — Актавая кніга Менскага земскага суда. 03.01.1765–12.04.1769. — 1232 арк.
13. НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 8. — Актавая кніга Менскага земскага суда. 02.01.1776–17.07.1777. — 1193 арк.
14. НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 16. — Актавая кніга Менскага земскага суда. 03.01.1785–27.12.1785. — 563 арк.
15. НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 17. — Актавая кніга Менскага земскага суда. 04.01.1786–29.12.1786. — 695 арк.
16. НГАБ. — Ф. 1769. — Воп. 1. — Спр. 29. — Дэкрэтавая кніга Менскага земскага суда. 01.07.1767–16.02.1775. — 637 арк.
17. НГАБ. — Ф. 1775. — Воп. 1. — Спр. 2. — Актавая кніга Аршанскага земскага суда. 03.06.1765–19.06.1766. — 1433 арк.
18. НГАБ. — Ф. 1816. — Воп. 1. — Спр. 2. — Актавая кніга Мінскага магістрата. 16.12.1702–21.05.1732. — 375 арк.
19. НГАБ. — Ф. 1816. — Воп. 1. — Спр. 7. — Актавая кніга Мінскага магістрата. 18.01.1747–12.11.1748. — 549 арк.
20. НГАБ. — Ф. 1816. — Воп. 1. — Спр. 10. — Актавая кніга Мінскага магістрата. 17.01.1755–31.12.1757. — 679 арк.

21. НГАБ. — Ф. 1816. — Воп. 1. — Спр. 14. — Актавая кніга Мінскага магістрата. 02.01.1772–18.07.1774. — 687 арк.
22. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 148. — Кніга вялікай канцылярыі ВКЛ, складзеная пры канцлерстве Караля Станіслава Радзівіла. 1697–1709 гг.
23. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 162. — Кніга вялікай канцылярыі ВКЛ, складзеная пры канцлерстве Міхала Карыбута Вішнявецкага пісарам Войцахам Францам Даманскім. 1724–1733 гг.
24. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 369. — Дэкрэты задворнага асэсарскага суда па справах земскіх і гродскіх, складзеная пры канцлерстве Крыштафа Паца. 1677–1690 гг.
25. НГАБ. — КМФ 18. — Воп. 1. — Спр. 380. — Дэкрэты задворных асэсарскіх судоў па справах земскіх і гродскіх. 1688 г.
26. Deputaci Trybunału Głównego Wielkiego Księstwa Litewskiego (1697–1794). Spis / Pod red. A. Rachuby. Opracowali : A. Rachuba, P. Romaniuk. Przy współpracy : A. Macuka, Jew. Aniszczenki. — Warszawa : Wydawnictwo DiG, 2004. — 448 s.
27. Metryka Litewska. Rejestry podymnego Wielkiego Księstwa Litewskiego. Województwo Nowogródzkie 1690 r. / Pod red. A.Rachuby. Oprac. H. Lulewicz, A. Rachuba. — Warszawa : Wydawnictwo Neriton, 2002. — 290 s.
28. Urzędnicy Wielkiego Księstwa Litewskiego. Spisy. T. I. Wojewodztwo Wileńskie. XIV–XVIII wiek / Pod red. A. Rachuby : Opr. H. Lulewicz, A. Rachuba, P. Romaniuk, pry współpracy U. Jamiljanczyka i A. Macuka. — Warszawa : Wydawnictwo DiG, 2004. — 764 s.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 07.07.2014

Постаці архівістаў

Г. Н. Кутукова

Памяти Тамары Евдокимовны Леонтьевой

16 января 1924 года исполнилось 90 лет со дня рождения Тамары Евдокимовны Леонтьевой. Профессионал, опытный историк-архивист, один из лучших специалистов в области сохранности документов в архивной отрасли. «Сохранить документы — главная задача каждого архивиста», — любила повторять Тамара Евдокимовна. Все мы, кто работал под ее непосредственным руководством, строго следуем этому наказу. Своим трудом в послевоенные годы, победами и успехами в сохранении документального наследия в наше время она вписала яркую страницу в историю архивного дела СССР и Республики Беларусь.

Т. Е. Леонтьева родилась 16 января 1924 года в городе Южа Ивановской области РСФСР, в семье бухгалтера Южской ткацкой фабрики. Отец, Тихонов Евдоким Никитич, в конце 20-х годов уехал по вербовке в Нижний Новгород, где начиналось строительство автомобильного завода. Мать, Леонтьева Дороя Евстратьевна, не поехала вместе с ним, т.к. у нее на руках было еще трое детей от первого брака (муж погиб в гражданскую войну). Отец семье не помогал, жить было очень трудно. Несмотря на трудности, мать постаралась дать всем детям хорошее образование. Благодаря маме Тамара Евдокимовна закончила десятилетку, хотя многие советовали отправить ее на работу после окончания неполной средней школы.

В 1942 году Т. Е. Леонтьева закончила с отличием школу и пыталась поступить в вуз. Но все институты, в которые она подавала заявление, были либо в эвакуации в Сибири или на Урале, либо не принимали иногородних, куда в условиях войны и в связи с отсутствием железных дорог, добраться было невозможно. И только через год, в 1943 году, Тамара Евдокимовна поступила в Московский историко-архивный институт, который с отличием закончила в 1947 году.

По окончании института она получила направление в город Владивосток в Приморский краевой государственный архив, где проработала три года начальником отдела фондов Октябрьской революции, а с апреля 1949 года по декабрь 1950 года начальником архива. В декабре 1950 года Тамара Евдокимовна была переведена на работу в Беларусь и назначена на должность старшего научного сотрудника организационно-методического управления МВД БССР, а в 1953 году — заместителем директора Центрального государственного архива Октябрьской революции в Минске.

В 1955 году Т. Е. Леонтьева из Минска переезжает в город Ижевск на работу в Центральный государственный архив Удмуртской АССР старшим научным сотрудником. В том же году Тамара Евдокимовна вышла замуж и снова приехала в Минск, по месту жительства мужа, Жигалова Виктора Николаевича. В 1956 году Т. Е. Леонтьева была назначена на должность заместителя начальника Государственного архива Минской области. В 1959 году в связи со строительством нового здания архива и по производственной необходимости Тамара Евдокимовна была переведена на должность заведующей отделом дореволюционных фондов того же учреждения.

В архивном здании после завершения строительства разместились Государственный архив Минской области и Центральный исторический архив БССР из города Могилева. Документальные материалы дореволюционного отдела Государственного архива Минской области были переданы в Центральный государственный исторический архив БССР в Минске, куда 31 декабря 1963 года Тамара Евдокимовна и была переведена на работу, а с 1 января 1964 года стала начальником отдела фондов Минской губернии ЦГИА БССР в Минске. С ноября 1979 года до ухода на пенсию 1 июля 1986 года — заведующая отделом обеспечения сохранности документов и фондов. В 1997 году Тамара Евдокимовна вернулась на работу в архив и до 2003 года работала по контракту главным архивистом в отделе информационно-поисковых систем.

За время 40-летней работы в архивах Т. Е. Леонтьева занималась различными видами работ с документами: 1) разборкой и описанием документов, находящихся в россыпи; 2) созданием описей на фонды, научно-справочный аппарат которых был утрачен в годы Великой Отечественной войны 1941–1945гг.; 3) усовершенствованием описей на наиболее ценные фонды; 4) экспертизой ценности документов; 5) организацией работы по дезинфекции, реставрации, переплету и созданию страхового фонда и фонда пользования на наиболее ценные документы.

Т. Е. Леонтьева активно участвовала в подготовке справочников и сборников документов: «Революционный подъем в Литве и Беларуси в 1861–1862 гг.» (1964), «Восстание в Литве и Беларуси в 1863–1864 гг.»

(1965), справочников по Государственному архиву Минской области и Центральному государственному историческому архиву БССР в Минске. Она подготовила множество справочников и рабочих инструкций по созданию и усовершенствованию научно-справочного аппарата к документам фонда, проверке наличия и состояния документов, выявлению и учету особо ценных дел, учету и подготовке на реставрацию поврежденных дел. Т. Е. Леонтьева — автор многих публикаций в архивной периодике. Являлась членом Методической комиссии Главного архивного управления БССР, принимала участие во многих научно-практических конференциях ГАУ СССР и ГАУ БССР, была делегатом Международного съезда архивистов в Москве (1972).

За многолетний и добросовестный труд, высокий профессионализм, большой вклад в сохранение документального наследия Республики Беларусь Т. Е. Леонтьева награждена двумя Почетными грамотами Верховного Совета БССР (1968, 1978), а также 10 грамотами ГАУ СССР и ГАУ БССР.

Тамара Евдокимовна была очень хорошим собеседником. Эрудит и интеллектуал — она могла поддержать любой разговор. Также увлечениями Т. Е. Леонтьевой являлись чтение «Литературной газеты» и вязание спицами и крючком. Очень любила театр. Ежегодно, уезжая в отпуск к брату в Москву, стремилась посетить Большой театр, театр Ермоловой и Малый театр. Могла подолгу делиться впечатлениями об игре актеров «старой гвардии».

Нам выпала честь работать под руководством Тамары Евдокимовны в отделе обеспечения сохранности документов и фондов Центрального государственного исторического архива БССР, а ныне Национального исторического архива Беларуси. Мы научились у нее бережному отношению к архивным документам и умению грамотно проводить работу по сохранению документального наследия.

Через месяц с небольшим после своего юбилея, 23 февраля 2014 года, Тамары Евдокимовны не стало. Она ушла из жизни спокойно, как и жила.

Светлая память о Тамаре Евдокимовне Леонтьевой останется в сердцах архивистов и всех, кто ее знал.

Артыкул паступіў у рэдакцыю 24.06.2014

Рэцэнзіі

Фірыновіч, А. Э. *Паўстанне 1863–1864 гг.: вядомыя і невядомыя крыніцы беларускіх архіваў / А. Э. Фірыновіч. — Мінск : Беларуская навука, 2013. — 315 с.*

Для беларускай (і не толькі) гістарыяграфіі характэрная актывізацыя ўвагі даследчыкаў да той ці іншай падзеі з нагоды яе юбілею. Так, у 2012 г. назіралася хваля навуковай і папулярнай літаратуры ў сувязі з 200-годдзем вайны 1812 г. у Беларусі. У 2014 г. з'явіўся адразу шэраг выданняў, прысвечаных пачатку Першай сусветнай вайны. 2013-ы год таксама не быў выключэннем. Будучы датай адзначэння 150-годдзя паўстання 1863–1864 гг., ён вызначыўся ўсплёскам цікавасці да яго ў навуковых і калянавуковых колах і як вынік — цэлым шэрагам выданняў, прысвечаных розным бакам гэтай неадназначнай падзеі. У адным толькі г. Мінску былі праведзены чатыры канферэнцыі па праблемах паўстання і яшчэ некалькі ў рэгіёнах. У 2013 г. выйшлі ў свет навукова-папулярныя і краязнаўчыя нарысы Івана Будніка [1], Зміцера Хаценчыка і Дзяніса Канецкага [9], Дзмітрыя Матвейчыка [4]. Колькасць артыкулаў вымяраецца некалькімі дзясяткамі. Аднак уласна навуковым манаграфічным выданнем з'яўляецца толькі адно — праца Алены Фірыновіч.

Неабходна адзначыць, што комплексных манаграфій пра паўстанне 1863–1864 гг. у Беларусі адносна няшмат. І хаця адна з першых — аўтарства Усевалада Ігнатоўскага — выйшла ў свет яшчэ ў 1930 г., да гэтага часу беларускімі і польскімі навукоўцамі (Анатоль Смірноў, Давід Файнгаўз, Станіслаў Ланец і інш.) усяго некалькі разоў рабіліся спробы аб'ёмнага даследавання падзей паўстання ў Беларусі і Літве. Пры

гэтым адным са слабых бакоў папярэдніх даследаванняў з'яўляўся крыніцазнаўчы. Напрыклад, у манаграфіі А. Смірнова [8] матэрыялы з Цэнтральнага дзяржаўнага архіва БССР (г. Магілёў, затым — г. Мінск) не выкарыстаны, а Д. Файнгаўз [11] увогуле не ўжывае матэрыялы з архіваў Беларусі (БССР) і Літвы (ЛітССР); працы ж С. Ланца маюць хутчэй навукова-папулярны, чым навуковы характар, таму не вылучаюцца шырынёй кола ўжытых крыніц у цэлым. У сувязі з гэтым пытанне выяўлення і ўвядзення ў навуковы ўжытак беларускай дакументальнай спадчыны, у першую чаргу з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (далей — НГАБ) і Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродна (далей — НГАБ у Гродна), у даследаваннях па гісторыі паўстання застаецца актуальным. На вырашэнне менавіта гэтага пытання і накіравана праца А. Фірыновіч, дзе ўказаная праблема акрэсліваецца як «фрагментарнае засваенне дакументальных рэсурсаў» (с. 4) і «патэнцыял мясцовых архіваў выкарыстаны недастаткова» (с. 5).

Структурна манаграфія складаецца з пераліку скарачэнняў, уводзінаў, трох глаў, кожная з якіх падзелена на 2–3 падглавы, заключэння і некалькіх дадаткаў. Падобны падзел абгрунтаваны абранай тэматыкай даследавання і пастаўленымі мэтамі і задачамі. Першая глава прысвечана аналізу гістарыяграфіі і крыніц. Пра высокі ўзровень гэтага раздзела сведчыць пералік паддадзеных аналізу навуковых, навукова-папулярных і публіцыстычных прац айчынных і замежных даследчыкаў па гісторыі паўстання 1863–1864 гг. Таксама варта станоўча ацаніць аналіз прыведзеных прац паводле храналагічнага прынцыпу і, так бы мовіць, «нацыянальнай школы» (расійскай, польскай, беларускай), бо кожны з гістарычных перыядаў з 1863 г. і да цяперашняга часу і кожная з гістарыяграфічных традыцый характарызуюцца спецыфічнымі поглядамі на паўстанне, часта залежнымі ад палітычнай кан'юнктуры, аб'ёмам і відавой разнастайнасцю ўжытых у даследаваннях крыніц, ацэнкамі ролі ў падзеях той ці іншай асобы ці цэлых сацыяльных груп і да т.п.

Вынікі праведзенага аналізу выяўленага комплексу дакументальных крыніц пададзены ў другой і трэцяй главах манаграфіі. Другая глава (с. 45–77) падзелена на тры падглавы і прысвечана класіфікацыі і відавой характарыстыцы матэрыялаў беларускіх архівасховішчаў па гісторыі паўстання 1863–1864 гг. Аб'ём прааналізаваных у ёй матэрыялаў сведчыць пра грунтоўныя крыніцазнаўчыя пошукі, праведзеныя пры даследаванні, што павышае давер да зробленых высноў. У падглавах аналізуюцца асобныя віды дакументаў — дакументальныя, тэматычныя апавядальныя і выяўленчыя. У кожным з іх выдзяляюцца і аналізуюцца (вылучаюцца спецыфічныя рысы, вызначаюцца мэты стварэння і функцыянавання і г.д.) асобныя групы і падгрупы крыніц, што ў цэлым робіць аналіз глыбокім і падрабязным. Хаця ёсць высновы, якія не

пазбаўлены некаторых недакладнасцяў. Напрыклад сцвярджэнне, што «назву “цыркуляр” мелі толькі загады міністра ўнутраных спраў і генерал-губернатара, астатнія называліся “распараджэннямі” ці “прадпісаннямі”» (с. 45). Як сведчыць больш шырокі ахоп кола крыніц, назва «цыркуляр» ужывалася таксама і ў адпаведных загадах цывільных і ваенных губернатараў (таксама і віцэ-губернатараў, але толькі калі яны выконвалі абавязкі губернатараў) [7].

Большымі тэарэтызаваннем і аналітычнасцю вылучаецца трэцяя глава манаграфіі (с. 78–102), прысвечаная вызначэнню інфармацыйнага патэнцыялу базы крыніц беларускіх архівасховішчаў і перспектыўных накірункаў для правядзення даследаванняў па гісторыі паўстання. Абгрунтаванне гэтага — «на асобныя аспекты тэмы звернута нязначная ўвага навукоўцаў, некаторыя пытанні патрабуюць дэталізацыі, канкрэтызацыі, пераасэнсавання» (с. 78) — варта прызнаць цалкам слушным. Далейшы аналіз дакументальнай базы праводзіцца ў двух накірунках — нарматыўна-прававой базы дзяржаўнай палітыкі Расійскай імперыі ў беларуска-літоўскіх губернях у 1860-я гг. і ўдзелу грамадскасці беларуска-літоўскіх губерняў у падзеях 1863–1864 гг. Безумоўна, на наш погляд, не варта ўспрымаць абраныя А. Фірыновіч накірункі як вызначальныя альбо найбольш важныя ў гістарыяграфіі паўстання (гэта павінен вызначыць кожны даследчык сам для сябе), хутчэй яны павінны паслужыць прыкладам для гісторыкаў скрупулёзнасці і грунтоўнасці працы з дакументальнай базай. Прычым у главе не робіцца спроба даць усеабдымныя адказы на пытанні, хутчэй паказаць багацце матэрыялаў з айчынных архівасховішчаў. Нават удзел насельніцтва Беларусі ў паўстанні паказваецца на прыкладзе ўсяго толькі трох груп, якія вылучаюцца ў даследаваннях, — службоўцаў, жанчын і навучэнцаў сярэдніх навучальных устаноў, — аднак робіцца гэта з моцнай апорай на дакументы з беларускіх архіваў. І менавіта з адзначанай главы найбольш яскрава бачна (хаця б па колькасці зробленых спасылак на старонку тэксту), наколькі яшчэ не раскрыты і не выкарыстаны патэнцыял айчыннай дакументальнай спадчыны. Таму і са зробленай у «Заключэнні» высновай «корпус дакументаў беларускіх архівасховішчаў адкрывае перад сучаснымі гісторыкамі перспектыўныя накірункі ў даследаванні праблемы» (с. 108) неабходна пагадзіцца цалкам, і, мяркуючы паводле прыведзенага матэрыялу, галаслоўнай яна не выглядае.

Адным з моцных бакоў манаграфіі з’яўляецца публікацыя фотаздымкаў і малюнкаў, выяўленых падчас даследавання, каштоўнасць якіх павышаецца рэдкасцю, а таму ўнікальнасцю падобнага кшталту крыніц у айчынных архівасховішчах. Таксама ў кнізе апублікаваны выявы некаторых цікавых дакументаў. Аднак зручнасць выкарыстання гэтай публікацыі для будучых даследчыкаў ускладняецца адсутнасцю дакладных

каардынатаў крыніц у подпісах пад імі, куды змешчаны толькі назвы сховішчаў, дзе яны знаходзяцца ў цяперашні час, але больш дакладныя звесткі (фонд–вопіс–справа для архіўных матэрыялаў ці інвентарныя нумары для музейных) адсутнічаюць. Яны маюцца ў працы, але ў іншым месцы — напрыклад у падглаве 2.3 «Выяўленчыя матэрыялы» — і толькі пра матэрыялы з НГАБ. Дакладныя каардынаты матэрыялаў з Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея не пададзены. Тут жа варта заўважыць, што ў такім дастаткова вузка спецыялізаваным выданні публікацыя выяўленчых крыніц, узятых з усеагульнай інфармацыйнай сеткі Internet, а значыць, лёгка даступных для любога карыстальніка, не выглядае абгрунтаванай.

Вялізную практычную каштоўнасць для далейшых даследаванняў маюць апублікаваныя ў якасці дадатку да манаграфіі пералікі (у працы — «калекцыі»; пра гэты тэрмін гл. ніжэй) дакументаў, выяўленыя А. Фірыновіч падчас правядзення даследавання, — 469 спраў з НГАБ, 166 спраў з НГАБ у Гродна, 19 спраў з аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, 21 справа з Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, 38 спраў з Цэнтральнага навуковага архіва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Пра каштоўнасць і аб'ём праведзенай працы гавораць ужо хаця б памеры пералікаў, якія займаюць дзве трэці ў кнізе. Невядома ніводная спроба публікацыі падобных пералікаў у папярэдні час. Апублікаваныя пералікі выконваюць у пэўнай ступені функцыю айчыннага міжархіўнага даведніка пра крыніцы па гісторыі паўстання — тое, чаго айчыннаму даследчыку моцна не хапае.

Неабходна згадаць пра вынікі колькасных падлікаў, апублікаваныя ў выглядзе табліц у якасці дадаткаў да манаграфіі. І хаця яны даюць толькі агульнае ўяўленне пра колькасць і ступень удзелу ў паўстанні той ці іншай вызначанай для аналізу групы насельніцтва Беларусі, але выведзеныя працэнтныя паказчыкі могуць быць выкарыстаны пры правядзенні больш грунтоўных даследаванняў. Апрача таго, табліцы садзейнічаюць раскрыццю багатага патэнцыялу беларускіх архіваў для падобнага роду навуковых распрацовак.

Манаграфія не пазбаўлена і пэўных хібаў. Кідаецца ў вочы яўная няпоўнасць змешчаных у дадатках звестак пра дакументы, што захоўваюцца ў беларускіх архівах. Напрыклад, з матэрыялаў НГАБ пададзены толькі 916 дакументаў з 469 спраў. Пры гэтым застаецца незразумелым прынцып адбору дакументаў, інакш кажучы, чаму пададзены менавіта гэтыя 916, бо ў згаданых справах маецца значна большая колькасць дакументаў не меншай навуковай каштоўнасці і інфармацыйнай насычанасці. Ды і спраў у НГАБ, якія адлюстроўваюць розныя бакі паўстання, значна больш. На сённяшні дзень іх выяўлена каля 3 тыс. [5], і гэта яшчэ

далёка не поўная лічба. Выклікае пытанне і ўжыванне ў назве дадаткаў тэрміна «калекцыя», які ў архіўнай практыцы мае хаця і блізкае (дэфініцыю паняцця «калекцыя» гл.: 6, с. 12), але адрознае значэнне, бо ўжываецца да структурна арганізаваных і аформленых комплексаў. Таму віду твора, у выглядзе якога структураваны і апублікаваны архіўныя знаходкі, найбольш адпавядае тэрмін «тэматычны пералік дакументаў», які актыўна выкарыстоўваецца ў архіўнай дзейнасці. Апрача таго, пры ўнясенні дакументаў у пералікі, якія ўяўляюць сабой табліцы на 8 граф, дапушчаны некаторыя некарэктнасці — пры вызначэнні спосабу вырабу дакумента ўжываецца тэрмін «друк» там, дзе павінен быць ужыты тэрмін «машынапіс» ці «лічбавы друк»; загалоўкі шмат якіх дакументаў пададзены з некарэктнасцямі; колькасць разоў выкарыстання дакумента, пададзеная ў апошняй графе «Заўвагі» на падставе запісаў у «Аркушы выкарыстання», прымацаванага да архіўнай справы, не дае гарантыі яго рэальнай частаты прагляду, і да т.п.

Неабходна звярнуць увагу і на разуменне ў манаграфіі тэрміна «крыніца». Яго дэфініцыя пададзена ва «Уводзінах» — «аб'ект, што змяшчае інфармацыю аб мінулым жыцці людзей і ўключаецца ў гістарычнае даследаванне» (с. 5). Аднак некаторыя дакументы, прааналізаваныя ў тэксце і змешчаныя ў дадатках, яўна выходзяць далёка за зададзеныя тэматычныя межы. Так, у «калекцыі выяўленых крыніц па гісторыі паўстання 1863–1864 гг.» уключаюцца таксама перапіска даследчыкаў паўстання XX ст., публікацыі, чарнавікі і копіі літаратурных і публіцыстычных твораў XX ст., рэцэнзіі, каментарыі і водгукі на творы, заўвагі да акцёраў, якія ўдзельнічалі ў пастаноўцы п'ес пра паўстанне, стэнаграмы пасяджэнняў Саюза пісьменнікаў БССР і да т.п. На наш погляд, усе згаданыя і падобныя дакументы могуць служыць крыніцамі да гісторыі беларускай гістарыяграфіі і літаратуры, але да гісторыі паўстання толькі апасродкавана. Нават у такім кароткім вызначэнні крыніцы, якое пададзена вышэй, задаецца залежнасць паміж «крыніцай» і яе ўцягнутасцю ў «даследаванне». Калі ж разумець крыніцу настолькі шырока, як гэта зроблена ў манаграфіі ў класіфікацыі ў падглаве 2.2 (с. 64–71) і ў дадатках А3, А4 і А5 (с. 286–303), то розніца паміж ёй і напісаным на яе падставе навуковым ці літаратурным творам проста знікае, а гэта ўжо з'яўляецца памылковым з метадалагічнага пункту гледжання. Аб'ект даследавання і выпрацаваны на падставе яго аналізу суб'ектам даследавання прадукт не ёсць адно і тое ж.

Трэба адзначыць і спрэчнасць неабходнасці змяшчэння ў якасці дадатку зробленага А. Фірыновіч перакладу на беларускую мову паўстанцкага гімна «Boże, coś Polskę…» («Божа, што Польшчу…») (с. 311–313) пры наяўнасці зробленых і выдадзеных у дапаўстанцкія часы некалькіх варыянтаў перакладу-перароблкі на беларускую мову гэтага ж гімна (ужо

апублікаваных у навуковай і навучальнай літаратуры [гл., напрыклад: 2, с. 300–302; 3, с. 572–573; 10, с. 87–88]). Таксама спрэчным з'яўляецца абраны ў манаграфіі прынцып пакідання без перакладу рускамоўных цытат, што ператварае працу дэ-факта ў двухмоўную.

У пэўнай ступені ўскладняе выкарыстанне манаграфіі адсутнасць асабовага і геаграфічнага паказальнікаў, пры тым, што колькасць прыведзеных у ёй асоб (як удзельнікаў падзей 1863–1864 гг., так і даследчыкаў розных перыядаў) і геаграфічных назваў дастаткова значная.

Аднак выказаныя заўвагі і знойдзеныя хібы ў манаграфіі не зніжаюць яе высокага навуковага ўзроўню; наадварот, іх хутчэй варта ўспрымаць як пажаданні і рэкамендацыі на будучыню. Нягледзячы на пэўныя недахопы, пералікі выяўленых дакументаў з'яўляюцца самымі аб'ёмнымі з апублікаваных да цяперашняга часу і ўводзяць у навуковы ўжытак сотні адзінак захавання. Праца мае вялікае практычнае значэнне для гісторыкаў, бо дапамагае азнаёміцца са складам матэрыялаў па паўстанні і правесці (хоць і не ў поўнай ступені) першасныя пошукі ў тым ці іншым архівасховішчы нават у далечыні ад яго месца знаходжання. Усё гэта робіць абавязковым далейшае выкарыстанне гэтай працы ў навуковых даследаваннях па гісторыі паўстання на тэрыторыі Беларусі. Больш за тое, выхад рэцэнзаванай манаграфіі ў пэўнай ступені стаў адным са стымулаў да складання зборніка дакументаў і матэрыялаў па гісторыі паўстання, выдадзенага ў 2014 г. Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі [7].

Крыніцы і літаратура

1. Буднік, І. Ф. Да падзеяў 1863–1864 гг. на Гарадзеншчыне. — Гродна: ЮрСаПрынт, 2013. — 107 с.: іл., партр., карты.
2. Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIX стагоддзяў. У 2 т. Т. 2. Новая літаратура: другая палова XVIII – XIX стагоддзе / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы; навук. рэд. тома У. І. Мархель, В. А. Чарняўскі. — Мінск: Беларус. навука, 2007. — 582 с.
3. Літаратура другой паловы XIX стагоддзя. У 2 т. Т. 1 / укладанне Л. Г. Кісялёвай, Н. М. Сенкевіч; каментары Л. Г. Кісялёвай; навук. рэд. С. Л. Гаранін. — Мінск: Мастацкая літаратура, 2013. — (Залатая калекцыя беларускай літаратуры; т. 4). — 847 с.
4. Матвейчык, Д. Ч. Паўстанне 1863–1864 гадоў у Беларусі: Нарыс баявых дзеянняў. — Мінск: Медысонт, 2013. — 122 с.: іл.
5. Матвейчык, Д. Ч. Паўстанне 1863–1864 гг.: крыніцы з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі (агульны агляд) // Архівы і справаводства. — 2013. — № 1. — С. 66–77.
6. Правила работы государственных архивов Республики Беларусь / Редкол.: В. И. Адамушко и др. — Минск: БелНИИДАД, 2006. — 256 с.

7. Паўстанне 1863–1864 гадоў у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях : Дакументы і матэрыялы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі / уклад. Д. Ч. Матвейчык; рэдкал.: У. І. Адамушка [і інш.]. — Мінск: А. М. Вараксін, 2014. — 544 с.
8. Смирнов, А. Ф. Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии. — М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1963. — 391 с.
9. Хаценчык, З. А., Канецкі, Д. В. Падзеі паўстання 1863 г. на Вілейшчыне: гістарычныя нарысы. — Мінск: Кнігазбор, 2013. — 67 с.: іл., партр., карты.
10. Штакельберг, Ю. И. Русские переводы польских повстанческих песен // История и культура славянских народов: Польское освободительное движение XIX–XX вв. и проблемы истории культуры. — М.: Наука, 1966. — С. 75–88.
11. Fajnhauz, D. 1863: Litwa i Białoruś / Inst. Historii PAN. — Warszawa: Neriton, 1999. — 357 s.

Д. Ч. Матвейчык

Артыкул паступіў у рэдакцыю 12.09.2014

Niebelski E. *„Wiosna i jesień trwa tu krótko": Księża zesłańcy 1863 roku w syberyjskiej Tunce. — Lublin: Wydawnictwo KUL, 2013. — 220 s.*

Паўстанне 1863–1864 гг. і яго наступствы з'яўляюцца адным з прыярытэтных напрамкаў навуковых даследаванняў у гістарыяграфіі Беларусі і суседных краін. Нягледзячы на тое што да 150-годдзя гэтай падзеі, якая адзначалася ў 2013 г., у Беларусі і сумежных краінах праводзіўся шэраг мерапрыемстваў, асобныя пытанні па-ранейшаму застаюцца маладаследаванымі, у тым ліку і лёс рымска-каталіцкага святарства. У айчыннай гістарыяграфіі маецца некалькі артыкулаў З. В. Антановіч, В. В. Гарбачовай, А. Э. Фірыновіч, дзе ў ліку іншых удзельнікаў паўстання разглядаецца лёс святароў [1; 2; 3; 4; 6]. Згаданыя даследаванні базіруюцца ў значнай ступені на крыніцах, якія захоўваюцца ў Рэспубліцы Беларусь. Пры гэтым архіўныя дакументы па асабістым складзе духавенства (фармулярныя спісы, справы аб прызначэнні, перамяшчэнні духавенства, судовыя справы і іншыя), якія засяроджаны ў найбольш рэпрэзентатыўным

комплексе — архіўным фондзе «Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя» (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі) — не дазваляюць прасачыць лёсы святароў у ссылцы, бо сферай дзейнасці царкоўнага кіраўніцтва ў Расійскай імперыі не ахоплівалася штодзённае жыццё асоб, пазбаўленых правоў ажыццяўлення душпастырскай дзейнасці [5]. Каштоўнай крыніцай пры разглядзе азначанага вышэй пытання з'яўляюцца матэрыялы расійскіх архівасховішчаў і мемуарная літаратура, пераважная большасць якой захоўваецца на тэрыторыі Польшчы.

У акрэсленых умовах значны патэнцыял у пытаннях разгляду асабістага складу духавенства Магілёўскай архідыяцэзіі і Мінскай дыяцэзіі ўвогуле і лёсаў высланага рымска-каталіцкага святарства ў прыватнасці стаіць у тым ліку за польскай гістарыяграфіяй. Калі першае пытанне пачынае даследавацца ў пачатку XX ст. пераважна прадстаўнікамі духавенства, напрыклад Я. Васілеўскім [14], і працягваецца да сённяшняга дня, у тым ліку ў кантэксце дзейнасці польскай дыяспары ў Сібіры [7; 13], то адным з найбольш паслядоўных даследчыкаў другой тэматыкі з'яўляецца Яўгеніуш Нябелькі, польскі гісторык, прафесар і навуковы супрацоўнік Люблінскага каталіцкага ўніверсітэта імя Яна Паўла II. Яго навуковыя працы прысвечаны як асобным святарам (С. Бжосцы), так і высланаму ў аддаленыя губерні Расійскай імперыі духавенству ў цэлым [8; 9; 12]. Акрамя таго, згаданым аўтарам апублікаваны даведачныя і навукова-папулярныя выданні [10; 11]. Да ліку апошніх адносіцца падрыхтаваная на падставе навуковага даследавання «*Tunka: syberyjskie losy księży zesłańców 1863 roku*» (2011 г.) праца «Wiosna i jesień trwa tu krótko: Księża zesłańcy 1863 roku w syberyjskiej Tunce» [12].

У дванаццаці главах выдання аўтарам паступова прасочваецца жыццёвая дарога шараговага святара, адметныя кропкі якой наступныя: прызначэнне пакарання; выезд на месца жыхарства; арганізацыя быту на пасяленні; амністыя 1870-х гг., калі многія атрымалі магчымасць выехаць на Радзіму або ў краіны Заходняй Еўропы, што пазітыўна адлюстроўваецца на ўспрыманні чытачом пададзеных звестак. Аднак пераважная ўвага аўтара належыць святарам, якія засталіся на месцы свайго пасялення або памерлі ў ссылцы — у паселішчы Тунка Іркуцкай губерні. У выданні змешчаны дзве прадмовы. Першая, дзе даецца ацэнка выдання, належыць рэцэнзенту працы доктару Вроцлаўскага ўніверсітэта Барбары Ендрыхоўскай. Другая напісана аўтарам з характарыстыкай мэты і асаблівасцяў падрыхтоўкі.

У працы прасочваецца лагічная структура, у якой можна вылучыць тры тэматычныя часткі: арганізацыя высылкі (главы 1–3) і побыту святарства (главы 4–8), агляд мемуарнай літаратуры і персанальныя звесткі пра духавенства (главы 9–12). У першых трох главах коратка разглядаюцца агульныя пытанні ссылкі духавенства. У першай главе Я. Ня-

бельскім на прыкладах асобных святароў паказаны меры пакарання, якія прымяняліся царскімі ўладамі ў дачыненні да рымска-каталіцкага святарства (с. 13–21). Пераважна яны не адрозніваліся ад прымененых да іншых слаёў насельніцтва. У дадзеным выпадку аўтар канцэнтруецца на ссылцы. Цэнтрам пасялення святароў з'яўлялася згаданае вышэй паселішча Тунка Іркуцкай губерні. У 1866–1876 гг. у ім пражывала каля 156 прадстаўнікоў духавенства ва ўзросце ад 19 да 74 гадоў. Цікава, што пераважная іх большасць належала да сталага ўзросту. Цяжкасці па перамяшчэнні і першыя ўражанні перасяленцаў адлюстраваны ў другой главе (с. 23–42). Трэцяя глава прысвечана асаблівасцям паліцэйскага нагляду і зносінам са знешнім светам. Святары не мелі права пакідаць паселішча, а карэспандэнцыя да 1869 г. абмяжоўвалася чатырма лістамі ў год. Душпастырскія абавязкі сярод іх выконваў іркуцкі пробашч Хрыстафор Швярміцкі (с. 43–54).

Найбольшымі па памеры і інфарматыўнасці са значнай колькасцю прыкладаў побыту святарства з'яўляюцца главы з чацвёртай па восьмую. У чацвёртай апавядаецца аб уладкаванні духавенства на пасяленні. У выніку адсутнасці сродкаў (перасяленцы атрымлівалі па 6 рублёў у месяц), амаль усе вырошчвалі гародніну, а іншыя святары займаліся гандлем і рамёствамі. Сярод іх вікарый Райпольскага касцёла Гаспар Вайткевіч, які стаў краўцом. Цыгарэты вырабляў вікарый Гарбачэўскага касцёла Аўгусцін Лапа. Спажывецкую краму ў Тунцы адкрыў вікарый Іркуцкага касцёла Юзаф-Цібурці Паўлоўскі і г.д. (с. 55–79). Ідэальнай супольнасці святарам арганізаваць не ўдалося, хаця яны аб'ядноўваліся клопатамі паляпшэння матэрыяльнага дабрабыту. Па меркаванні аўтара, выказаным у пятай главе, гэта вынікае з розніцы ў іх характарах, звычках, узросце, ментальнасці і паходжанні з двух асобных рэгіёнаў — Царства Польскага і беларуска-літоўскіх губерняў. Адным з такіх прыкладаў з'яўляецца стварэнне патаемнай капліцы, што адлюстравала міжасабовыя адносіны паміж прадстаўнікамі духавенства (с. 81–112). У шостай главе прааналізаваны склад мясцовых жыхароў і іх стаўленне да новых перасяленцаў. Паводле ўспамінаў святароў адзначаецца, што іх прынялі нядобразычліва і падазрона. Мелі месца напады на святароў і нават забойствы. У 1872 г. вікарыя Іркуцкага касцёла Ю.-Ц. Паўлоўскага, які пражываў на ўскрайку паселішча ва ўласным доме над р. Іркут, абрабавалі і забілі мясцовыя жыхары (с. 113–128). Амністыя ад 25 мая 1868 г. выклікала новыя праблемы, звязаныя з адсутнасцю фінансаў для выезду за межы імперыі і на папярэдняе месца жыхарства (сёмая глава; с. 129–162). Восьмая глава прысвечана святарам, якія засталіся ў Тунцы добраахвотна, у выніку адсутнасці магчымасці выехаць па стане здароўя ці фінансавай незабяспечанасці. На 1 лютага 1875 г. тут заставалася 72 святары, здароўе якіх паводле наяўных звестак выклікала непакой.

Так, на шыі А. Лапо назіралася павелічэнне залозы, якая ў халодны перыяд часу нарывала і распаўсюджвала сып. Былы вікарый Вышкаўскага касцёла Г. Вайткевіч скардзіўся на моцную аддышку, кашаль і хваробу ног. Лекар пацвердзіў у яго двухбаковае запаленне лёгкіх, флегматычны кашаль, праблемы з сэрцам, яго павелічэнне, нізкі ціск (с. 163–174).

Невялікімі па памеры, але інфарматыўнымі з'яўляюцца апошнія главы, дзе змешчана інфармацыя аб дакументальных матэрыялах і ўспамінах святароў, якія перажылі ссылку. Напрыклад у дзявятай главе пазначаны звесткі аб захаванні памяці пра іх (с. 175–190). У дзясятай главе выказваецца меркаванне аб тым, што пас. Тунка быў месцам пакутніцтва польскага духавенства ў Сібіры, высланага па абвінавачанні ва ўдзеле ў паўстанні 1863–1864 гг. (с. 191–194).

Асаблівую каштоўнасць уяўляюць звесткі біяграфічнага характару ў выглядзе спісу святароў, якія пражывалі ў Тунцы. Ён уключае 156 асоб, з якіх 23 чалавекі памерлі і пахаваны на мясцовых і іркуцкіх могілках (адзінаццатая і дванаццатая главы).

У якасці ілюстрацый аўтарам выкарыстаны даўнія здымкі мясцовасці за канец XIX ст. і зробленыя самастойна ў XXI ст., а таксама фотаздымкі святароў канца XIX – пачатку XX ст. У бібліяграфіі пазначана каля 40 найменняў, пераважная большасць якіх прадстаўлена ўспамінамі святароў. У асабовым паказальніку каля 400 імёнаў, якія сустракаюцца ў тэксце.

Манаграфія Я. Нябельскага з'яўляецца значным укладам у тым ліку ў беларускую гістарыяграфію ў вырашэнне пытання аб лёсе высланага ў аддаленыя рэгіёны Расійскай імперыі рымска-каталіцкага святарства, бо, па-першае, навукова-папулярныя выданні па гэтай праблематыцы адсутнічаюць, па-другое, нягледзячы на тое што ў працы засяроджваецца ўвага на прадстаўніках духавенства, якія паходзілі пераважна з Царства Польскага, таксама прыводзяцца звесткі аб шасці святарах з Магілёўскай архідыяцэзіі, што трапілі ў Тунку. Зыходзячы з тыпу выдання, Я. Нябельскі абмежаваўся пры яго падрыхтоўцы пераважна ўспамінамі святароў, якія ў выніку амністыі 1870-х гг. змаглі вярнуцца на папярэдняе месца жыхарства. Адсутнасць разгорнутай бібліяграфіі па тэматыцы і геаграфічнага паказальніка, безумоўна, ускладняе працу з выданнем. Аднак, улічваючы навукова-папулярныя мэты, гэта не ўплывае на яго высокі ўзровень падрыхтоўкі, які разам з даступнасцю ўспрымання робіць манаграфію Я. Нябельскага цікавай для гісторыкаў і шырокіх колаў грамадства.

Крыніцы і літаратура

1. Антановіч, З. В. У барацьбе за веру: Паўстанне 1863–1864 гг. у лёсе ксяндза Антонія Пшыялгоўскага // ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 95–98.

2. Антановіч, З. В., Гарбачова, В. В Лёсы святароў Магілёўскай і Мінскай рымска-каталіцкіх дыяцэзій пасля паўстання 1863–1864 гг. / З. В. Антановіч, В. В. Гарбачова // Беларускі гістарычны часопіс. — 2009. — № 12. — С. 23–28.
3. Антановіч, З. В., Гарбачова, В. В. Паўстанне 1863–1864 гг. у лёсе рымска-каталіцкага сьвятарства Беларусі // ARCHE. — 2010. — № 12. — С. 186–202.
4. Горбачева, О. Восстание 1863–1864 гг. и репрессивные мероприятия царизма в Беларуси / О. Горбачева // Powstanie styczniowe 1863–1864. Walka i uczestnicy. Represje i wygnanie. Historiografia i tradycja / Pod red. W. Cabana, W. Śliwowskiej. — Kielce: Wydawnictwo Akademii Świętokrzyskiej, 2005. — S. 111–117.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далее НГАБ). — Ф. 1781. — Магілёўская рымска-каталіцкая кансісторыя. 1573–1922 гг.
6. Фірыновіч, А. Э. Удзел рымска-каталіцкага духавенства Віцебшчыны ў паўстанні 1863–1864 гадоў // Віцебскія старажытнасці: Матэрыялы навук. канф., прысвеч. 90-годдзю з дня нараджэння Л. В. Аляксеева, Віцебск, 28–29 кастр. 2010 г. — Мінск: Медысонт, 2012. — С. 384–389.
7. Kuczyński, A. Syberia. Czterysta lat polskiej diaspory / A. Kuczyński. — Kubajak: Zakład Narodowy imienia Ossolińskich, Krzeszowice, 2007. — 544 s.
8. Niebelski, E. "Na Bóg żywy, Bracia, nie zasypiajmy sprawy!" Rzecz o ks. Stanisławie Brzósce (1834–1865) / E. Niebelski. — Lublin: Oficyna wydawnicza Z.E.N., 1995. — 194 s.
9. Niebelski, E. Duchowieństwo lubelskie i podlaskie w powstaniu 1863 roku i na zesłaniu w Rosji / E. Niebelski. — Lublin: Wydawnictwo KUL, 2002.
10. Niebelski, E. Słownik lubelskich i podlaskich księży uczestników powstania 1863 roku / E. Niebelski. — Lublin: Wydawnictwo KUL, 2011. — 189 s.
11. Niebelski, E. Ignacy Walicki: zesłaniec 1863 roku i pionier sadownictwa w Rosji. Listy z Wielikina / E. Niebelski. — Lublin: Polska Akademia Nauk Oddział w Lublinie, 2013. — 98 s.
12. Niebelski, E. Tunka: syberyjskie losy księży zesłańców 1863 roku / E. Niebelski. — Wrocław: Polskie Towarzystwo Ludoznawcze, 2011. — 394 s.
13. Prokop, K. Pasterze i rządcy diecezji Mińskiej, Pińskiej i Drochiczyńskiej / K. Prokop. — Drochiczyn: Kurija biskupia w Drochiczynie, 2006. — 320 s.
14. Wasilewski, J. Arcybiskupi i administratorowi archidjecezji Mohilewskiej / J. Wasilewski. — Pińsk: Drukarnia diecezjalna, 1930. — 198 s.

З. В. Антановіч

Артыкул паступіў у рэдакцыю 29.10.2014

Zielecka-Milkołajczyk, W. *Prawosławni i unici w Rzeczypospolitej XVI–XVIII wieku wobec zycia i śmierci w świetle testamentów. — Warszawa: Wydawnictwo Neriton, 2012. — 361 s.*

Патрэба знайсці сваё месца ў зменлівым свеце паўсядзённай дынамікі і пераўтварэнняў вымушае выпрацаваць у сабе ўнутраны імунітэт на знешнія раздражняльнікі і знайсці надзейную крыніцу, якая можа натхняць на самаразвіццё і спрыяць гармоніі паміж сабой і светам. Стомлены адчуваць сябе механічнай прыладай у няспынным рухавіку гісторыі сучаснік, навуковец або аматар усё часцей звяртаецца ў пазнанні мінулага да вопыту, каштоўнасцей, светаўспрымання сваіх папярэднікаў, а таксама да шляхоў фарміравання пералічаных набыткаў чалавечага жыцця.

Кожная праца, мэта якой зірнуць далей дат і статыстыкі, паглыбіцца ў мінулае, каб сведчыць аб нялёгкай жыццёвай дарозе чалавека праз напластаванні стагоддзяў, прадстаўляе значную важнасць для разумення цяперашняга дня і выпрацоўкі каштоўнасных арыенціраў на дзень заўтрашні.

У сучаснай гістарычнай навуцы феномен чалавека пакрысе робіцца асноўным аб'ектам увагі даследчыка і таму патрабуе шырокага далучэння методык і адкрыццяў сумежных навук (філасофіі, тэалогіі, антрапалогіі), неабходных для лепшага раскрыцця складанага і шматграннага разумення асобы.

Тастамент або завяшчанне ўяўляецца якраз той гістарычнай дакументальнай крыніцай, у якой чалавек, знаходзячыся на мяжы жыцця і смерці, вымушаны падводзіць вынікі свайго жыцця, клапаціцца аб зямной маёмасці і грунтоўна задумвацца аб свеце замагільным.

У апошні час асабліва пільную цікавасць да тастаментаў праяўляюць навукоўцы краін, якія некалі ўваходзілі ў палітычную і сацыяльна-культурную прастору Рэчы Паспалітай, а менавіта Украіны, Беларусі і Польшчы.

У 2011 г. пабачыла свет праца Наталлі Белавус з Кіева «Тастаменты кіяўлян XVI – першай паловы XVII ст.», асноўны змест якой прысвечаны аналізу 13 тастаментаў кіеўскіх мяшчан і шляхты [1]. У даследчыцкай частцы манаграфіі вызначаецца стаўленне аўтараў гэтых дакументаў да царквы, жыцця і смерці, прасочваюцца адносіны да маёмасці, родзічаў і блізкіх. У дадатках да выдання, акрамя табліцы са звесткамі

пра тастаменты, публікуюцца непасрэдна іх тэксты, якія падаюцца згодна з патрабаваннямі да перадачы кірылічных тэкстаў.

У наступным годзе публікацыяй тастаментаў адзначыліся і беларусы. У зборнік «Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст.» увайшлі 116 дакументаў, актыкаваных у земскіх, гродскіх, магістрацкіх судах, за 1559–1600 гг. з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі [3]. Супрацоўнікамі аддзела старажытных актаў НГАБ выданне падрыхтавана на вартым навуковым узроўні, суправаджаецца навукова-даведачным апаратам (пералікам скарачэнняў, асабовым і геаграфічным паказальнікамі, тлумачальным слоўнікам), табліцай выкарыстаных архіўных фондаў.

У рамках супольнага праекта даследчыкаў з Расіі, Беларусі і Польшчы ў 2013 г. у выдавецтве Люблінскага каталіцкага ўніверсітэта пабачыў свет рускамоўны зборнік артыкулаў, прысвечаных тастаментам вышэйшых іерархаў уніяцкай царквы XVII ст., а менавіта архімандрыта мінскага і епіскапа холмскага Афанасія Пакосты (А. Гіль), мітрапаліта Іосіфа Вельяміна Руцкага (Д. Лісейчыкаў), епіскапа холмскага Якава Сушы (Р. Казырскі), епіскапа львоўскага Іосіфа Шумлянскага (Р. Казырскі) [2]. Аўтарамі праводзіцца крыніцазнаўчае даследаванне тастаментаў і іх публікацыя.

Польскія даследчыкі Яцак Кавалькоўскі і Вяслаў Навасад апублікавалі ў тым жа годзе 111 тастаментаў польскай шляхты [4]. Выданне дапоўнена слоўнікам малавядомых слоў і скарачэнняў, бібліяграфічным спісам і паказальнікамі.

У той час як вышэй названыя працы ўяўляюць сабой сінтэз даследчыцкай работы і публікацыі або проста зводзяцца да перадачы тэксту дакументаў манаграфія польскай даследчыцы Віялеты Зялецкай-Мікалайчык пад назвай «Праваслаўныя і ўніяты ў Рэчы Паспалітай XVI–XVIII стагоддзяў у прысутнасці жыцця і смерці ў святле тастаментаў» прысвечана выключна навукова-тэарэтычнаму разгляду адзначанай тэмы.

Абраныя канфесійныя групы звяртаць увагу даследчыка, галоўным чынам, да насельніцтва тэрыторый сучасных Украіны і Беларусі, што надае даследаванню асаблівую актуальнасць пры вырашэнні пытанняў, звязаных з развіццём айчыннай прававой думкі, а таксама з вывучэннем разнастайных антрапалагічных феноменаў.

Праца заснавана на матэрыялах архіваў і бібліятэк Польшчы (Галоўны архіў старажытных актаў у Варшаве, Народовая бібліятэка ў Варшаве, Дзяржаўны архіў у Кракаве, Бібліятэка Польскай акадэміі навук у Кракаве), Літвы (Бібліятэка акадэміі навук Літвы, Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў у Вільні, Віленская ўніверсітэцкая бібліятэка), Беларусі (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, Нацыянальны музей

гісторыі і культуры Беларусі), Украіны (Цэнтральны дзяржаўны гістарычны архіў Украіны ў Кіеве) з выкарыстаннем вялікага комплексу навуковай літаратуры па тэме.

Даследаванне складаецца з пяці раздзелаў, прысвечаных юрыдычна-прававым, эсхаталагічна-пахавальным, царкоўна-рэлігійным, сямейна-роднасным і маёмасна-службовым аспектам жыцця чалавека.

Першы раздзел пад назвай «Тастамент і яго структура на фоне рускага і літоўскага права» ахоплівае шырокае кола пытанняў, куды ўваходзяць асаблівасці норм спадчыннага права ў часы старажытнай Русі, асаблівасці літоўскага права ў дачыненні да тастаментаў, адметнасці складання тастаментаў паводле магдэбургскага і канонічнага права, іх актыкацыі і рэалізацыі апошняй волі, структура фармуляра тастамента.

У той час, калі ў пачатку X ст. паводле норм звычаёвага права атрыманне спадчыны адбывалася ў межах сям'і як натуральная з'ява і заключалася ў перадачы бацькамі сваёй маёмасці дзецям, то паводле «Рускай Праўды», першага рускага зводу права, зацверджанага напачатку XII ст. у часы кіравання князя Уладзіміра Манамаха, спадчыннае права замацоўвалася на дзяржаўным узроўні і вызначалася словам «рад». Адзначаецца, што першая кадыфікацыя спадчыннага права адбылася ў Статуце ВКЛ 1529 г., які належаў да «рускай» традыцыі, але змяшчаў «узоры польскага права». Замацаваныя ў ім умовы складання тастамента былі папраўлены ў Статуце 1566 г. У гарадах складанне завяшчанняў рэгулявалася магдэбургскім правам. У структуры тастамента часоў ВКЛ з'явіліся філасофска-этычныя часткі: «арэнга» (прамова з абгрунтаваннем патрэбы складання дакумента) і «рэфлексія» (развага тастатараў адносна недаўгавечнасці жыцця). Літоўскі тастамент адрозніваўся ад польскага адпаведніка паслядоўнасцю структурных элементаў і спецыфічнымі формуламі. У фармуляры прасочваецца ўплыў мясцовай канцылярскай практыкі. Цікавым назіраннем з'яўляецца тое, што праваслаўныя тастатары ў адрозненне ад рыма-каталікоў не рабілі акцэнту на засведчанні сваёй веравызнальнай адметнасці.

Другі раздзел «Прыхільнікі ўсходніх абрадаў паводле эсхаталагічных і фунеральных уяўленняў» прысвечаны прыгатаванням да смерці і пахавання, а менавіта ўпарадкаванню маёмасных пытанняў і клопатам аб лёсе душы пасля смерці цела. Адлюстраванае ў тастаментах праваслаўных і ўніятаў бачанне смерці не адрознівалася нічым ад аналагічнага бачання каталікоў. Пахаванне адбывалася згодна з воляй тастатара, іх урачыстасць і асаблівасці цырыманіялу залежалі ад статусу і заможнасці памерлага. Праваслаўнае і грэка-каталіцкае малітоўныя памінанні памерлых адрозніваліся ад рыма-каталіцкага тэрміналогіяй (паніхіда, екценья, саракауст). Выбар месца пахавання залежаў ад паходжання і канфесіі. Аўтарам робіцца выснова аб тым, што памкненні запісваць

маёмасць за царквой грунтуюцца на радавой традыцыі і асабістай рэлігійнасці тастатара.

Акрамя позіркаў на пераход у вечнасць, тастаменты нярэдка апавядаюць аб жыцці тастатара ва ўлонні царквы. Пытанням канфесійнай прыналежнасці, выбару паміж традыцыяй і навацыяй у галіне рэлігійных уяўленняў, дабрачыннай дзейнасці на карысць царквы, адносінам да іншых канфесій прысвечаны трэці раздзел манаграфіі пад назвай «Царква і рэлігія ў жыцці тастатараў». Аўтар адзначае актыўнасць праваслаўнага мяшчанства XVII–XVIII стст. у падтрымцы свайго веравызнання і яго інстытуцый, агульную зацікаўленасць царкоўнымі справамі праваслаўных іерархаў і шляхты XVII ст., якія асабліва падтрымлівалі тыя цэрквы і манастыры, якімі апекаваліся. У XVIII ст. колькасць праваслаўных фундатараў значна зменшылася і звузілася, галоўным чынам, да мяшчанства. У адносінах да уніятаў захоўвалася большая стабільнасць — мяшчане і шляхта ўстойліва аказвалі падтрымку сваёй канфесіі. Дагматычная і ідэалагічная набліжанасць рыма- і грэка-каталіцтва ўплывала на часты выбар уніятамі ў якасці месца спачыну каталіцкіх касцёлаў, каталікамі — уніяцкіх цэркваў. У сваіх тастаментах вызнаўцы ўсходніх абрадаў часцей згадвалі лікі Прасвятой Троіцы і Багародзіцу. Запісы цэрквам, у якіх знаходзіліся цудатворныя іконы Божай Маці, сведчаць аб асаблівым шанаванні Яе праваслаўнымі і ўніятамі.

Сямейна-роднасныя сувязі асветлены ў раздзеле «У коле сям'і», дзе знаходзяць адбітак адносіны паміж тастатарам і яго сям'ёй, адлюстраваны падзеі асабістага жыцця (жаніцьба, замужжа, стасункі з дзецьмі). Згадванне ў тастаментах прадстаўнікоў сям'і вынікала з неабходнасці абараніць натуральныя правы спадчыннікаў на бацькоўскую маёмасць. Тэксты завяшчанняў сведчаць аб нярэдкай абранасці адных дзяцей у параўнанні з іншымі без уліку звычаю старшынства. Патрыярхальная структура грамадства патрабавала большай увагі да нашчадкаў мужчынскага полу, але пры гэтым вялікай была роля ўдавы, якая карысталася прывілеяваным становішчам, асабліва ў выпадку апякунства над непаўналетнімі дзецьмі.

Асобны раздзел «Тастатары ў святле матэрыяльных спраў» асвятляе парадак распараджэння нерухомасцю, адзеннем, біжутэрыяй, хатнім і ваенным рыштункам, кнігамі, а таксама лёсам нявольнай чэлядзі і асабістых служкаў. Даволі цікавы падраздзел прысвечаны спробе вызначыць пабытова-свядомасныя рысы праваслаўнага і ўніяцкага духавенства, якія адмяжоўвалі іх ад шляхты і мяшчан. Тут увага надаецца вопратцы, матэрыяльнаму дабрабыту, значэнню бытавых і набажэнскіх прадметаў у штодзённым жыцці духавенства. Аўтара таксама цікавіць, які статус мелі асобы, што прайшлі таямніцу пасвячэння ў святары. Кім яны адчувалі сябе самі — духавенствам, шляхтай ці мяшчанствам? Ці можна

казаць аб захапленні прадметамі раскошы прадстаўнікамі духавенства? Дадзеныя пытанні некалькі вылучаюцца з плоскасці толькі матэрыяльнага свету і тычацца вызначэння свядомасных характарыстык.

Выданне дапаўняецца спісам бібліяграфіі, слоўнікам спецыфічных тэрмінаў, пералікам скарачэнняў, асабовым паказальнікам, аднак геаграфічны паказальнік у працы адсутнічае.

Сур'ёзным дадаткам з'яўляецца добра структураваная табліца, у якой пералічаны прадстаўнікі мяшчанства, духавенства і шляхты XVI–XVIII стст., чые тастаменты выкарыстаны ў працы. Акрамя прозвішча, імя і імя па бацьку адзначаюцца іх сацыяльны стан і пасада, дата і месца напісання, веравызнанне, месца знаходжання крыніцы інфармацыі.

Апрача тэкставага дадатку, напрыканцы манаграфіі змяшчаюцца графічныя выявы, а менавіта фотакопія тастамента гетмана польнага Рамана Сангушкі ад 10 мая 1571 г., фотаздымкі царквы ў Кронях, надмагільных пліт Самуэля і Багдана Агінскіх там жа, царквы Святога Духа ў Вільні.

Манаграфія ўяўляе сабой паўнавартаснае каштоўнае выданне, якое на падставе тастаментаў шматбакова асвятляе шырокі спектр пытанняў, звязаных з жыццядзейнасцю праваслаўнага і ўніяцкага насельніцтва Рэчы Паспалітай. Праца можа быць карысна гісторыкам, юрыстам, антраполагам, усім, хто цікавіцца пытаннямі гісторыі права, канфесійнай гісторыі, этнаграфіі, гісторыі штодзённасці і ментальнасці.

Крыніцы і літаратура

1. Білоус, Н. Тестаменти киян середини XVI – першої половини XVII ст. — К.: Вид. дім. "Простір", 2011. — 200 с.
2. Завещания униатских иерархов Киевской митрополии XVII и XVIII вв. как пример религиозной культуры общества Речи Посполитой / сост. А. Гиль. — Люблин, 2013. — 124 с.
3. Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст. (з актавых кніг Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) / склад. А. Ф. Аляксандрава, В. У. Бабкова, І. М. Бобер; Нац. гіст. архіў Беларусі. — Мінск, 2012. — 736 с.
4. Testamenty szlachty Prus Królewskich z XVII wieku / wyd. Jacek Kowalkowski, Wieslaw Nowosad. — Warszawa, 2013. — 392 s.

В. В. Урублеўскі

Артыкул паступіў у рэдакцыю 20.05.2014

Рэзюмэ

Антановіч Зінаіда Васільеўна, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ.

«Асабовы склад кліру і парафіяльнага духавенства Мінскай дыяцэзіі (паводле фармулярных спісаў рымска-каталіцкага святарства за 1867 г.)»

Аналізуецца асабовы склад кліру (біскуп, візітатар, дэфенсар, члены капітула, кансісторыі, семінарыі) і парафіяльнага духавенства (дэканы, пробашчы, адміністратары, вікарыі) напярэдадні скасавання Мінскай дыяцэзіі на падставе фармулярных спісаў за 1867 г. Пераважная частка духавенства паходзіла са шляхты ва ўзросце ад 26 да 89 гадоў. Аўтар прыходзіць да высновы аб крызісе ў кіраўніцтве азначанай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкай царквы, звязаным з недастатковай колькасцю святарства і частымі зменамі ў яго складзе, а таксама са значным лікам адміністратараў і амаль поўнай адсутнасцю вікарыяў, што ўскладняла магчымасці замяшчэння пасад у выпадку абвінавачання ва ўдзеле ў паўстанні 1863–1864 гг. і спачування паўстанцам.

Яе ж, *Рэцэнзія: Niebelski E. „Wiosna i jesień trwa tu krótko": Księża zesłańcy 1863 roku w syberyjskiej Tunce. — Lublin: Wydawnictwo KUL, 2013. — 220 s.*

